ADAM MICKIEWICZ

PAN TADEUSZ

АДАМ МІЦКЕВІЧ

ПАН ТАДЭВУШ

АДАМ МИЦКЕВИЧ

ПАН ТАДЕУШ

БЕЛАРУСКІ ФОНД КУЛЬТУРЫ

МІНСК • 1998

Да 200-годдзя з дня нараджэння
АДАМА МІЦКЕВІЧА

Ілюстрацыі і афармленне
Народнага мастака Беларусі
ВАСІЛЯ ШАРАНГОВІЧА

ADAM MICKIEWICZ

PAN TADEUSZ

CZYLI

OSTATNI ZAJAZD NA LITWIE

АДАМ МІЦКЕВІЧ

ПАН ТАДЭВУШ

АБО

АПОШНІ НАЕЗД У ЛІТВЕ

АДАМ МИЦКЕВИЧ

ПАН ТАДЕУШ

ИЛИ

ПОСЛЕДНИЙ НАЕЗД В ЛИТВЕ

УДК 884-31
ББК 84(4П)6
М70

Выданне кнігі Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве» на польскай, беларускай і рускай мовах ажыццёўлена па заказу Дзяржаўнага камітэта па друку Рэспублікі Беларусь.

Арганізацыйны камітэт па выданню:
У. А. Гілеп *(старшыня)*, А. Р. Бутвілоўскі, М. П. Станкевіч,
А. А. Тоўсцік, В. П. Шаранговіч, Я. Я. Янушкевіч.

Агульная рэдакцыя, прадмова
ЯЗЭПА ЯНУШКЕВІЧА

Пераклад на беларускую мову *ПЯТРА БІТЭЛЯ*

Пераклад на рускую мову *СВЯТЛАНЫ МАР (АКСЁНАВАЙ)*

Укладанне

УЛАДЗІМІРА ГІЛЕПА, УЛАДЗІМІРА МІЛЮКОВА (Масква),
ЯЗЭПА ЯНУШКЕВІЧА

Каментарыі
ВЯЧАСЛАВА РАГОЙШЫ, ЯЗЭПА ЯНУШКЕВІЧА

Польскі тэкст друкуецца па выданню: Adam Mickiewicz. Dzieła, tom IV.
Społdzielnia Wydawnicza «Czytelnik», Warszawa, 1995.

Рускі тэкст друкуецца па выданню: Адам Мицкевич. Собрание сочинений, том 2.
Государственное издательство художественной литературы, Москва, 1949.

Спонсар выдання ТАА «Харвест».

Беларускі фонд культуры выказвае ўдзячнасць за тэхнічную і кансультацыйную дапамогу ў выданні дзяржаўнаму газетна-часопіснаму аб'яднанню «Воскресенье» (Масква), польскаму выдавецтву «Czytelnik», Творчай выдавецкай майстэрні «На ростанях».

Асаблівая ўдзячнасць — Прадстаўніцтву Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Рэспубліцы Беларусь, Праграме Развіцця ААН.

ISBN 985-6523-01-X
©Беларускі фонд культуры, 1998

НАВА́ГРАДСКАЯ ІЛІЯДА

Кожны дуб сваёй дубраве шуміць.

Зямля наваградская нарадзіла яго. 25-гадовым выгнаннікам ён праехаў расійскую імперыю, пасябраваў з Пушкіным. Правандраваў па Германіі, дзе ў Веймары наведаў старога Гётэ. Прайшоўся ля Капітолія плошчамі Вечнага места, затрымаўся ў Парыжы, жыццёвы шлях скончыў у Канстанцінопалі, прах яго навекі спачыў у сталіцы Пястаў пад скляпеннямі каралеўскай рэзідэнцыі на Вавелі. Не жыўшы на зямлі Кароны (этнічнай Польшчы) – стаўся яе геніем.

Такім быў зямны шлях паэта-рамантыка і пілігрыма Адама Міцкевіча. На тым пакутным шляху віфлеемскай зоркай яму ззяла Наваградчына — Радзіма. Тут, 24 снежня (на Куццю) 1798, года геній пабачыў свет. Ён прыйшоў, каб вырваць з нябыту цэлы край, што паволі западаў у небыццё на задворках Еўропы, стаўшы геаграфічна акраінай царскай імперыі, якой пачала лічыцца Беларусь у выніку трох заборчых падзелаў канца XVIII ст. Занепадаў эканамічна, але не духоўна. Бо, як засведчылі яшчэ старажытныя грэкі, дзяржава павінна абапірацца больш на мужнасць духу, чым на сілу зброі. Дзякуючы таленавітым сынам (у сузор'і іх, апроч зоркі Міцкевіча, імёны Яна Баршчэўскага, Яна Чачота, Юзафа Крашэўскага, Уладзіслава Сыракомлі, Элізы Ажэшка) зноў і зноў выплывала Атлантыда старадаўняй Беларусі-Літвы з еўрапейскай культурай. Атлантыда старажытная і вечна новая, бо нязводна хвалюючая. Краіна Вялікага Княства Літоўскага, якая за тры з паловай гады да нараджэння славянскага тытана слова ў выніку згаданых падзелаў перастала існаваць на мапе Еўропы, — працягвала жыць у мастацкіх палотнах. Гэтаксама як працягвала жыць Карона — Рэч Паспалітая ў творах Ю.Славацкага, З.Красінскага, Ц.Норвіда, С.Жаромскага, Б.Пруса, Г.Сенкевіча, М.Канапніцкай.

Праўдзіва: дзеці не выбіраюць сабе бацькоў, а паэты — народаў. Бацька генія Мікалай Міцкевіч, эканом, шляхецкі радавод якога пецярбургскі Сенат так і пакінуў пад пытаннем, вырабіўся на адваката ў Наваградку, куды пераехала сям'я ў 1801 годзе, і змалку першая сталіца Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага стала для Адама зямлёй запаветнай. Удзельнік паўстання Касцюшкі, чалавек перадавых поглядаў, Мікалай нават пісаў вершы, аднак на станаўленне паэтычнага таленту сына, можна сцвярджаць пэўна, найбольшы ўплыў зрабіў парабак Блажэй (па мянушцы Уліс), які сыпаў беларускімі казкамі нібы з рукава, ды служанкі (з шляхецкімі прозвішчамі) Гансеўская і Гарбатоўская, што ведалі безліч розных песень, якіх «і на валовай скуры не спісаць». Пад іх уплывам чуйны да паэтычнага слова Адась пачаў складаць уласныя вершы, бо айчынны фальклор — жывая граматыка, дзякуючы якой не адзін геній спасціг не толькі асновы народнага жыцця, але і вечнай прыгажосці. 11 кастрычніка 1811 года Наваградак напаткаў вялікі пажар; полымя выкачала ладную частку места (у 1881 г. яшчэ большы пажар зруйнуе радзінны дамок Міцкевічаў ушчэнт). На людское гора Адась адгукнуўся вершам. Дырэктар Наваградскай дамініканскай школкі, дзе з 1807 года вучыліся два старэйшыя сыны Мікалая Міцкевіча, Францішак і Адам, не паверыў, што кранальная лямантацыя складзена самастойна (верш атрымаўся вялікі, не змясціўся ў школьным сшытку), і пакараў дванаццацігадовага вучня карцарам. Так нібыта выглядаў першы ганарар юнага пііта. Падлетак яшчэ не ведаў, што яму самому лёсам будзе наканавана пражыць пагарэльцам-бяскутнікам, бо «у чужым краю як на пагарэллі», бо «на чужыне́ што на ражне́».

У 1815 годзе Адась стаў студэнтам Віленскага універсітэта — найстарэйшага адукацыйнага асяродка краю (1579). Там разам з сябрамі заснаваў Таварыства філаматаў (1817), якое акрэсліла мэтай не толькі ўзаемадапамогу моладзі ў паглыбленні ведаў, не толькі творчае ўдасканальванне юных талентаў, а падымала — як найвялікшы гонар — грамадскую працу для дабра паняволенай Бацькаўшчыны. Гэта быў класічны выпадак, калі «зерне падала не на камень». Прафесары Лявон Бароўскі, Ігнат Даніловіч, Іяхім Лелевель чыталі ў старадаўняй Вільні лекцыі, а Готфрыд Гродэк абудзіў у здольнага студэнта прагу да гамераўскіх вобразаў (сам Гродэк у 1784 г. вучыўся ў семінары славутага філолага Хрысціяна Готліба Хайнэ; адтуль, з Германіі, пераможна крочыў па Еўропе новы літаратурны напрамак — рамантызм). Наогул, як заўважыць пазней Міцкевіч у некралогу «Пушкін і літаратурны рух у Расіі» (падпісаным «Сябра Пушкіна»), «прамежак паміж 1815 і 1830 гадамі быў спрыяльным для паэтаў». Характэрнай рысай адзначанага перыяду лічыцца і тое, што ў пачатку XIX стагоддзя ў еўрапейскай паэзіі панаваў «голад» на эпапею. І калі вялікі Гётэ стварыў несмяротнага «Фауста» (1808—1832), Пушкін увасобіў норавы сучаснага яму жыцця ў «Яўгеніі Анегіну» (1830), дык сам Міцкевіч у «Пане Тадэвушу» пакінуў энцыклапедычна дакладныя, шматпланавыя і па-мастацку яркія постаці старога ладу жыцця ў Літве. Апроч дамінантных матываў кахання Тадэвуша і Зосі, драматычна-таямнічай гісторыі ксяндза Робака, геній з Наваградчыны навек высек пяром постаці-паняцці апошніх «возных трыбуналаў» (Пратазы Бальтазар Брахальскі), «ключнікаў» (Гервазы), падкаморых і цэлую галерэю ахвочых да буйнага жыцця шляхціцаў з сакавітымі мянушкамі (Брытэўка-Брытва, Конаўка, Крапіла-Крапіцель-Хрысціцель, Лейка, Прусак). Да сваіх персанажаў, дзяцей высокага творчага духу, пясняр ставіўся як і да гамераўскіх герояў: людзі жывыя роўныя багам, але адыходзяць у нябыт. Так атрымалася разгорнутая эпапея, у якой перад Берлінам, Масквой, Парыжам, Пецярбургам, Рымам — перад усім светам, занятым высокімі палітычнымі інтрыгамі, панарамна зазіхацела краіна чужая для іх, святая для яго. Бо чым для халоднага жалеза агонь і гарніла, накавальня і молат у дужых кавальскіх руках , тым для шэдэўраў Міцкевіча стала Бацькаўшчына-Літва.

«Паўбяруцца ў сілу, як дубы стануць» — здаўна кажуць у краіне над Нёманам і Дняпром пра падлеткаў. Не ўсе юнакі з віленскіх таварыстваў філаматаў і філарэтаў змаглі наталіцца моцай роднай зямлі. Выкрытае ў 1823 годзе (было арыштавана больш за 100 чалавек) краёвае студэнцтва з карэннямі вырвалі з радзімай глебы і параскідалі па вялізнай імперыі. Настаўнік лацінскай мовы ковенскай гімназіі Адам Міцкевіч за 5-гадовую высылку зведаў арыстакратычныя салоны Пецярбурга і Масквы, дзе пазнаёміўся з будучымі дзекабрыстамі Рылеевым і Бястужавым, з паэтамі Баратынскім, Вяземскім, Грыбаедавым, Дэльвігам, Жукоўскім, Палявым. Пушкін, якога памылкова падмаладзіў аўтар «Дзядоў» і «Свіцязянкі» («маладзейшы за мяне на два месяцы») назваў маладога выгнанніка-літвіна «празарлівым і крылатым паэтам». Зведаў пілігрым таксама чарнаморскую Адэсу і крымскія стэпы — мясціны, куды з каханай Літвы не далятала ніводнае рэха. І якую геній так болей і не пабачыў. 15 траўня 1829 года выгнаннік назаўсёды адплыў з Пецярбурга ў Германію. Зямляк Фадзей Булгарын, вядомы сувязямі з III-ім аддзяленнем, дабіўся афармлення пашпарта, даўшы 30-гадоваму дзецюку магчымасць вырвацца з учэпістых кіпцюроў Мікалая I «Палкіна». (Цень жандарскага сакрэтнага аддзялення падзе на высакароднага літвіна плёткай, нібы той выкупіўся ад царызму, даўшы згоду на агентурнае супрацоўніцтва.) Пазней, калі з Пушкіна стануць пацвельвацца — чаму ж таксама не жадае павандраваць па Еўропе? — класік рускай літаратуры дзеля адгаворкі скарыстае аўтарытэт геніяльнага сучасніка. Маўляў, навошта ўзірацца ў пейзажы, калі ў маім уяўленні яны больш прыгожыя, чым на самай справе.

Паехаў бы, хіба, каб пазнаёміцца з вялікімі людзьмі, аднак я знаёмы з Міцкевічам і ведаю, што больш вялікага, чым ён, не знайду. Бо ўжо з-пад пяра «певца Литвы» (Пушкін) паўстаў «Пан Тадэвуш» — найвялікшы ў славянскім свеце шэдэўр, які цяпер слушна называюць эпапеяй польскага нацыянальна-вызваленчага руху пачатку XIX стагоддзя, а тады ўсе замежныя сучаснікі (ад славянафіла І.Аксакава ды аўтара «Мёртвых душ» М.Гогаля) намагаліся прачытаць у арыгінале. Па ахопу падзей, пачуццю гістарызму, майстэрству рэалістычнага бытапісання гэты неўміручы гімн параўноўваюць з сусветна вядомымі помнікамі народнага эпасу «Іліядай» і «Калевалай».

Задума напісаць «шляхецкую быліцу» узнікла восенню 1831 года, калі адчайны пілігрым з Італіі дапаў на Пазнаншчыну, дзе яго напаткала пякучая вестка пра разгром Лістападаўскага паўстання. Роспач ад няўдачы (паэт спяшаўся прыняць удзел у барацьбе з царызмам са зброяй у руках), расчараванне ва ўяўнай еднасці кіраўнікоў, надзея на новы рэвалюцыйны ўздым палякаў — усё гэта на пазнанскай зямлі, прырода якой балюча нагадвала родныя наваградскія абшары, абвастрыла ў Міцкевіча настальгічнае пачуццё, якое і прывяло да задумы напісаць гімн-успамін пра вольны край, дзе жыло хоць трохі шчасця: край маленства. Памяць пра яго чалавек носіць у сэрцы са святой пашанай, як пілігрым жменю бацькоўскай зямлі. Бо чужына не грэе.

Глыбокай восенню 1832 г. Міцкевіч вярнуўся да ранейшага намеру і ў лісце сябру Стафану Гарчыньскаму 12 студзеня 1833 года паведамляў з Парыжа: «Паволі пішу вясковую паэму». Далейшае развіццё задумы можна прасачыць па чарнавых аўтографах паэмы і пісьмах творцы. Напісаўшы IV-ю песню, паэт лічыў працу амаль завершанай. Праз паўгода вымушанага перапынку над працягам «Пана Тадэвуша», скончыўшы V песню, у лісце да Адынца, удакладняў: «Засталося яшчэ тры». Пазней, на думку аўтара, памер твора не павінен быў перавысіць 10 песень, і ў такім аб'ёме «Пана Тадэвуша» рэкламавалі парыжскія кніжныя каталогі. Урэшце, з аўтографу бачна, што кніга XI мела падзагаловак «Кніга апошняя». Дакладны памер шэдэўра не ўяўляўся, пакуль 13 лютага 1834 года геній не паставіў кропку і з радаснай палёгкай ад здзейсненага не ўсклікнуў: «Песень вялікіх дванаццаць!» Мо так доўга вымалёўвалася гэта агромністае палатно славянскага тытана, што падчас яго напісання аўтару мроілася, быццам жыве ў каханай Літве.

Выхад у свет «Пана Тадэвуша» французскія бібліёграфы занатавалі 28 чэрвеня 1834 года. Наклад выдання склаў тры тысячы асобнікаў. У адрозненне ад папярэдняй кнігі «Дзяды. Частка III» (1832), якая на працягу двух гадоў двойчы перавыдавалася, новая кніга паэта разыходзілася вельмі марудна. Здарылася нават наступнае: калі ў 1838 годзе рыхтаваўся першы Збор твораў Адама Міцкевіча, выдаўцы яго ў V—VI тамах змясцілі «Пана Тадэвуша», змяніўшы папярэдне толькі вокладку экземпляраў першавыдання, што заставаліся на складах кнігарняў.

Тагачасная польская літаратурная крытыка, і «айчынная» і «парыжскай эміграцыі», успрыняла паэму, мякка кажучы, неадназначна. Аўтару выстаўлялі поўнасцю супрацьлеглыя абвінавачванні. Напрыклад, газета «Demokrata Polski» (1838) папракала паэта ў «непачцівых» адносінах да высокіх грамадзянскіх ідэалаў Волі, Роўнасці, Братэрства, абвешчаных Вялікай французскай рэвалюцыяй 1789 года. Меліся на ўвазе пэўныя радкі з першай песні «Пана Тадэвуша», за якімі крытыкі ўгледзелі ў Міцкевіча непавагу да разумовага стану Польшчы. Прадстаўнікі правага крыла рабілі паэту закіды за фальшывае, згубнае, ганебнае імкненне да ўсяго замежнага. На думку аднаго з апанентаў, аўтарам паэмы з аднолькавым поспехам мог быць француз, немец ці англічанін, паколькі польскі дух («polszczyzna») у творы адсутнічае. Апошнія з прыведзеных выпадаў нагадваюць наскокі варшаўскіх апалагетаў класіцызму на

творчасць віленскіх філарэтаў і філаматаў канца 10-х—пачатку 20-х гадоў XIX ст., пераклікаюцца з прамымі папрокамі Міцкевічу: «Вы для Літвы, а не для Кароны пішаце... менш дбаеце пра тое, каб Вас разумелі ў Варшаве, абы толькі разумелі Вас у Вільні ці Літве...».

Спрэчкі вакол «Пана Тадэвуша» перажылі ягонага аўтара і перакаціліся ў наступнае стагоддзе. Бо кожнае буйное мастацкае палатно — неспадзяванка для прафесійных крытыкаў, не кажучы пра паспалітага чытача. Але не пра палеміку тут мова. Пачынаючы шляхецкае паданне, Міцкевіч спачатку задумаў паказаць галоўным вобраз манаха Робака, пра што сведчыць першапачатковая назва паэмы — «Жагота». Так у чарнавіках называўся манах (у былым гуляка-падпанак, пыхаваты «шляхціц на загродзе роўны ваяводзе» — карацей, увасабленне бздурства колішняй Рэчы Паспалітай), які пазней становіцца барацьбітом за адраджэнне маладой Польшчы. Аднак прысутнасць гістарычнага погляду, уласцівага кожнаму сапраўднаму творцу, падказала паэту, што асноўным змагаром у будучым вызваленчым руху стане не бунтарна-рамантычны герой (тыпу створанага ім у 1828 годзе ў варожай Маскве вобраза барацьбіта-адзіночкі Конрада Валенрода), а народ. І тыя, хто быў захоплены апошнім міцкевічаўскім творам «Дзяды», чакалі ад генія працягу ў тым самым рэвалюцыйным духу. Але сапраўдны пясняр заўсёды пракладвае новае рэчышча, дзе вада не застаіцца стагоддзямі.

Незразуметая афіцыёзнай крытыкай квінтэсенцыя, закладзеная Міцкевічам у эпапеі, знайшла гарачы водгук сярод прыхільнікаў ягонага таленту і найперш у сэрцы земляка — Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1808–1884), класіка беларускай літаратуры, які першым сярод славян наважыўся перакласці велічную сагу на родную мову. Мажліва, пад уражаннем пякучай весткі ў лістападзе 1855 года пра смерць змагарнага літвіна ў далёкім Канстанцінопалі Беларускі Дудар вырашыў аддаць даніну павагі найвялікшаму паэту XIX стагоддзя, зрабіць пераклад ягонага шэдэўра на мову таго народа, чым багатым і цудоўным фальклорам узгадаваны талент Міцкевіча. Здзейсніць мару «літоўскага вестуна», выказаную ім у «Эпілогу» (пры жыцці генія неапублікаваным) да «Пана Тадэвуша», каб яго вершы, простыя, бы песні сялянак, трапілі пад мужычыя стрэхі. Каб вечным болем і прыгажосцю ўзвышалі свой люд. Каб на радзіме, сагрэтай таленавітым словам, ніхто не пачуваўся сірацінай.

Адначасова з пачынальнікам новай беларускай літаратуры за пераклад эпапеі ўзяліся і рускія літаратары, пра што было спецыяльна адзначана Дуніным-Марцінкевічам у знакамітай «Прадмове перакладчыка». Захады да апублікавання «Пана Тадэвуша» на рускай мове сапраўды мелі месца ў канцы 1850-х гадоў. Журналіст і вайсковы перакладчык Мікалай Берг змясціў у «Русском вестнике» невялікія ўрыўкі з розных песен гімна (цалкам бергаўскі пераклад выйшаў асобным выданнем у Варшаве ў 1875 г.), і даследчык славянскіх літаратур П.Дуброўскі апублікаваў празаічны пераказ паэмы ў 11-й кніжцы «Отечественных записок» за 1858 год. Пазней эпапею перакладалі В.Бенедзіктаў (першае шматтомнае рускае выданне твораў А.Міцкевіча, 1882), С. Мар (Аксёнава) (яе пераклад «Пана Тадэвуша», які прапануецца тут чытачу, увайшоў у 5-томны збор твораў польскага паэта, што выходзіў у 1948—1954 гг. і потым неаднаразова перадрукоўваўся ў дапрацаваным выглядзе). Ёсць таксама пераклад М. Паўлавай, які выходзіў асобным выданнем (1954).

Лёс жа першага беларускага перакладу паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» склаўся трагічна. Пачатковыя дзве «быліцы», што пабачылі свет у Вільні ў 1859 годзе, царская цэнзура канфіскавала і, па няпэўных звестках, увесь наклад выдання спаліла. Не менш трагічны лёс напаткаў і другі беларускі пераклад, здзейснены ў 1931—1932 гадах у лёхах польскіх турмаў вядомым беларускім грамадскім і палітычным дзеячам Браніславам

Тарашкевічам (1892—1938), які ў выніку абмену палітвязнямі з верасня 1933-га жыў у СССР, дзе ў 1937 годзе зноўку быў арыштаваны і як «агент панска-буржуазнай Польшчы» расстраляны. Вывезеныя ім з «белапольскіх» турэмных сутарэнняў пераклады «Іліяды» Гамера і «Пана Тадэвуша» А.Міцкевіча апынуліся ў нетрах падвалаў НКУС, адкуль здолеў выплыць толькі апошні рукапіс, каб праз паўстагоддзе стаць здабыткам культуры (Мінск, 1981; Ольштын, 1984) [1].

Таму калі чарговы (ужо пасляваенны) вязень сталінскіх лагероў Пятро Бітэль узяўся перакладаць шэдэўр сусветнай паэзіі, ён нічога не мог «падглядзець» у сваіх двух пакутных папярэднікаў. Больш шырокаму чытачу на Беларусі П. Бітэль (1912—1991) вядомы пакуль як аўтар паэм «Замкі і людзі» (1968), «Дзве вайны» (1990) і інш. Магчыма, гадаванец Барунскай і Віленскай настаўніцкіх семінарый (1925—1931) і не заняўся перакладам, калі б не малох сталінізму, які ў 1950 годзе кінуў настаўніка нямецкай мовы з Валожыншчыны за турэмныя краты, а потым у Сібір. Там, у лагерных умовах напрадвесні 1953-га хтосьці з нявольнікаў атрымаў з Варшавы на самым дне харчовай пасылкі том паэзіі вялікага генія. Ды лічаныя беларусы разумелі польскую мову, асабліва з маладых (у савецкія «папраўча-працоўныя» лагеры траплялі нават вучні старэйшых класаў). Як вялікая рака пачынаецца з крыштальна бруістай крынічкі, так і гэты пераклад паклікала да жыцця неаднаразовая просьба вязня-падлетка, які прагнуў паэтычнага слова ў тых нялюдскіх варунках. І вось для юнака Лёні Мазуры з Дзятлава пачаў «перастварацъ» паэму П.Бітэль. Першыя слухачы — зняволеныя беларусы, летувісы, ды «крэсовыя» палякі — натхнялі ў адзін голас: перакладай далей!.. Ніхто не дзяліў Міцкевіча на «свайго» ці «чужога». Так ад самага пачатку бітэлеўскі пераклад, як і сам твор, насычаўся духам інтэрнацыяналізму.

Пераклад Пятра Бітэля паўстаў у 1953—1955 гадах паміж лесапавалам-будоўлямі Кемераўскай вобласці і меднымі руднікамі Джэзказгана (новабудоўлі тыя потым залічалі ў актыў маладым камсамольцам-добраахвотнікам). І мала каму цяпер вядома, што замест асадкі скарыстоўваўся самаробны «аловак» з алавянага дроту, выцягнутага патаемна з ізаляцыйнага кабелю. Што замест атласнага чорнага атраманту не адна тысяча звонкіх радкоў выводзілася зялёнкай, вынесенай пакрыёма з медсанчасці знаёмым санітарам. Што замест белых аркушаў паперы разразаліся запыленыя трохслойныя мяхі з-пад цэмента. І першы «ганарар» яму вызначылі канваіры: калі ўжо «Кніга другая» (менавіта з яе пачаў пераклад П. Бітэль) была скончаная і пайшлі сотні радкоў першай кнігі, яго пасля адбою залавілі за гэтым малазразумелым (і ад таго яшчэ больш небяспечным) заняткам. Кара — трое сутак карцару. Так знакаміты твор, перакладзены на нашу мову, увайшоў у кроў і плоць, знітаваўся з імем перакладчыка, які праробленую працу лічыў сваім найгалоўным творчым здабыткам. П.Бітэль прадэманстраваў бліскучае веданне беларускай і польскай моў, здзяйсняючы свой пераклад без адпаведных слоўнікаў пад рукой. Толькі пакутны пераклад каторае дзесяцігоддзе не мог пабачыць свет, і нарэшце гэты «лагерны помнік» выходзіць да 200-гадовага юбілею А. Міцкевіча. Пераклад, які з'явіўся ў далёкай Сібіры дзякуючы рупнасці пчалы, што шчыравала над свойскай кветкай, узрослай на родным палетку. Твор, які паўставаў у салонным Парыжы ў коле блізкіх сяброў-эмігрантаў, перакладаўся ў мядзведжай Сібіры, — вяртаецца на радзіму. (Асобна адзначым, што ў 1980-я гг. беларуская міцкевічыяна ўзбагацілася мастацкім перакладам Язэпа Семяжона. Выданне, праілюстраванае 25 цудоўнымі акварэлямі мастака Васіля Шаранговіча, стала прыкметнай падзеяй у культурным жыцці беларусаў). Фаліянт, які цяпер ласкавы чытач трымае ў руках, папоўнены новымі адмысловымі ілюстрацыямі, выкананымі спецыяльна для гэтага тома.

[1] Першы рукапіс Б.Тарашкевіча, хутчэй за ўсё, згінуў, і беларусы дасюль не маюць нацыянальнага перакладу «Іліяды».

Пройдзе час, і паўстануць новыя пераклады «Пана Тадэвуша» — несмяротнага польскамоўнага шэдэўра пра наш Край. І ў той, ужо недалёкай будучыні, калі беларусы абавязкова зоймуць «свой пачэсны пасад між народамі», на покуці сярод першых нацыянальных песняроў яны з гонарам пасадзяць і Адама Міцкевіча. Гэтаксама, як ужо сёння, напрыканцы XX стагоддзя (чаго не назіралася яшчэ паўвека таму) поруч з першадрукаром Францішкам Скарынам велічна суседзіць Мікалай Гусоўскі, што ў далёкім XVI стагоддзі ўславіў Беларусь-Літву на адной з класічных моў Сярэднявечча — латыні. І калі Мікалай Гусоўскі, заснавальнік лацінамоўнай рэнесансавай паэзіі на Беларусі, напісаную па просьбе тагачасных вышэйшых іерархаў сваю паэму назваў «Песня пра зубра» (першы эпічны шэдэўр пра нашу зямлю адрасаваны еўрапейскаму чытачу, напісаны ў 1520–1522 гг. у Рыме, выдадзены ў 1523 г. у Кракаве) — дык Адам Міцкевіч у XIX стагоддзі склаў «Іліяду», падзагаловак да якой чытаецца «Песня пра Літву». А дакладней, спеў пра Наваградчыну. Развітальны лебядзіны кліч над нёманскімі дубравамі, над якімі ў паднябессі крыляюць верныя буслы і жураўлі перад вечным выраем. Як рэха гэты пракавечны покліч роднай зямлі падхопіць, ужо ў XX стагоддзі, зямляк з-над Нёмана і фамільянт паэта — Кастусь Міцкевіч, вядомы ў свеце як Якуб Колас (1882—1956). Абапіраючыся на неруш шматмоўнага пласта ў нашым прыгожым пісьменстве XIX стагоддзя, што прадвызначыў з'яўленне і праклаў шлях да ўласна нацыянальнай літаратуры, ён складзе гімн «маладой Беларусі» — паэму «Новая зямля» (1911—1923).

«Пан Тадэвуш» — гэта нескароны дух генія, які смагу па родных загонах зганяў летуценнямі ў крынічных, чыстых, як паэтава сэрца, хвалях ракі маленства, памятаючы глыбінную мудрасць свайго народа: чым за морам віно піць, лепей з Нёмана вадзіцу. Кожны дотык да радзіннай зямлі загартоўваў паэтаву душу. Гарт, якому пазайздросціў Ф.Шапэн, назваўшы А.Міцкевіча «здольным вытрымаць яшчэ некалькі эміграцый і не страціць ні розуму, ні энэргіі». Праўдзівы літоўскі дуб-волат, што каранямі ўчапіўся ў радзімы палетак, «усклаўшы на гарбаты карак цяжар пяці стагодзяў» (III, 565). Прымаючы, нібы ўдары маланак, пакуты мільёнаў. Бо вялікага літвіна заўсёды ахінала адвечнае «літоўскае неба» (гл. пачатак кнігі X). Бо пад тым узвышаным небам навекі засталіся магілы бацькоў, дзядоў і прадзедаў (яны надаюць вечную сілу нябёсам). Бо Свіцязь — найчысцейшая Кастальская крыніца на еўрапейскім Парнасе.

«Пан Тадэвуш» — вечна жывая кветка з парыжскага бруку на шляхетную Атлантыду Бацькаўшчыны. Колькі нябеснага нектару, зямнога водару, сыноўняй тугі і святла ў гэтай кветкі? Не ведаю. Спытайцеся ў жытніх хваляў, «у лугоў духмяных, Шырока над блакітным Нёмнам разасланых», у сонца, якое штодня ўзыходзіць, як у часы Адася, з-за волатаўскіх плячэй наваградскіх узгоркаў над Вільняй, Завоссем, Рутай і Туганавічамі, над абломамі наваградскага замка, над крыжамі Наваградскага фарнага касцёла, дзе быў ахрышчаны Адам Бернард Міцкевіч — наш зямляк, наш суайчыннік, аўтар аднаго з найцудоўнейшых твораў сусветнай паэзіі.

Язэп Янушкевіч

НОВА́ГРАДСКАЯ ИЛИАДА

Всякий дуб свою дубраву славит.

Его родила новаградская земля. Изгнанником двадцати пяти лет от роду он проехал по российской империи, подружился с Пушкиным. Пропутешествовал по Германии, где в Веймаре навестил стареющего Гёте. Прошелся возле Капитолия площадями Вечного города, задержался в Париже, жизненный путь окончил в Константинополе, прах его навеки почил в столице Пястов под сводами королевской резиденции на Вавеле. Он, гений Польши, почти не жил на земле Короны (этнической Польши).

Таким был земной путь поэта-романтика и пилигрима Адама Мицкевича. На этом страдальческом пути вифлеемской звездой ему сияла Новаградчина — Родина. Здесь, 24 декабря (в Сочельник) 1798 года, поэт появился на свет. Он пришел, чтобы вырвать из бездны целую страну, исподволь впадающую в небытие на задворках Европы. Именно такой стала Беларусь в итоге трех грабительских разделов в конце XVIII века, после того, как географически оказалась окраиной царской империи. Страна приходила в упадок экономический, но не духовный. Ибо, как засвидетельствовали еще древние греки, государство должно основываться более на стойкости духа, нежели на силе оружия. Благодаря талантливым сыновьям (в созвездии их, кроме звезды Мицкевича, имена Яна Барщевского, Яна Чечота, Юзефа Крашевского, Владислава Сырокомли, Элизы Ожешко) вновь и вновь восставала Атлантида стародавней Беларуси-Литвы с европейской культурой. Атлантида древняя и вечно юная, и всегда непременно волнующая. Держава Великого Княжества Литовского, которая за три с половиной года до рождения славянского титана в итоге упомянутых разделов перестала существовать на карте Европы, продолжала жить в художественных полотнах. Так же, как продолжала существать и Корона — Речь Посполитая в произведениях Ю.Словацкого, З.Красиньского, К.Норвида, С.Жеромского, Б.Пруса, Г.Сенкевича, М.Конопницкой...

Воистину: дети не выбирают себе родителей, а поэты — народы. Отец гения, Миколай Мицкевич — эконом, чью дворянскую родословную петербургский Сенат так и оставил под вопросом, был адвокатом в Новаградке, куда в 1801 году переехала семья. С самого детства первая столица Великого Княжества Литовского, Русского и Жомойтского стала для Адама землёй обетованной. Участник восстания под предводительством Костюшко, человек передовых взглядов, Миколай даже сочинял стихи, но на становление поэтического дарования сына, можно утверждать смело, наиболее повлияли батрак Блажей (прозванный Улиссом), будто из рукава сыпавший белорусскими сказками, да еще служанки (со шляхетскими фамилиями) Гонсевская и Горбатовская, знавшие уйму песен. Под их влиянием чуткий к поэтическому слову Адась начал слагать собственные стихотворения, ибо отечественный фольклор — живая грамматика, благодаря которой не один творец постиг основы не только народной жизни, но и извечной красоты. 11 октября 1811 года Новаградак охватил огромный пожар; огонь уничтожил значительную часть города (в 1881 г. еще больший пожар испепелит родимый дом Мицкевича почти дотла). На это людское горе Адась отозвался стихотворением, в котором звучали костельные и пожарные колокола, перекликающиеся с голосами людей, обезумевших от горя в ночи. Директор Новаградской доминиканской школы, где с 1807 года обучались двое старших сыновей Миколая Мицкевича, Францишек и Адам, не поверил, что взволнованное стихотворение-причитание написано мальчиком самостоятельно (стихотворение вышло огромным, не вместилось в школьной тетрадке), и наказал

двенадцатилетнего ученика карцером. Таким, согласно легенде, злополучным получился первый гонорар юного пиита. Подросток еще не знал, что ему самому суждено будет прожить жизнь бездомным погорельцем, ибо «в чужом краю как на пепелище», ибо «на чужинé что на рожнé».

В 1815 году Адась стал студентом Виленского университета. Там вместе с друзьями основал Общество филоматов (1817), ставившее главными целями взаимную помощь в углублении знаний, совершенствовании юных талантов и подъем общественного труда на благо порабощенной Отчизны. Это был классический случай, когда «зерно падало не на камень». В древнем Вильно читали лекции известные профессора Леон Боровский, Игнатий Данилович, Иоахим Лелевель, а Готфрид Гроддек пробудил у молодого Мицкевича страсть к гомеровским образам (сам Гроддек в 1784 г. обучался в семинаре у реформатора филологического образования Христиана Хейне; оттуда, из Германии, по Европе победоносно шагало новое литературное направление — романтизм). Позже Мицкевич ■ некрологе «Пушкин и литературное движение в России» (подписанном «Друг Пушкина») назовет «промежуток времени между 1815 и 1830 годами периодом, благоприятным для поэтов». Характерной чертой отмеченного периода литературоведы считают ■ то, что в начале XIX ст. в европейской поэзии наблюдался «голод» на эпопею. И если великий Гёте создал бессмертного «Фауста» (1808—1832), Пушкин воссоздал нравы современой ему жизни в «Евгении Онегине» (1830), то сам Мицкевич в «Пане Тадеуше» нарисовал энциклопедично-многоплановые и художественно яркие картины старого уклада жизни в Литве. Кроме доминантных мотивов любви Тадеуша ■ Зоси, драматично-таинственной истории ксендза Робака, гений из Новаградчины запечатлел последних «возных трибуналов» (Протазий-Балтазар Брехальский), «ключников» (Гервазий), «подкомориев» и целую галерею охочих к разгульной жизни шляхтичей (Варфоломей Бритва, Матвей Лейка, Бартек Шило). К своим персонажам, детям высокого творческого духа, автор относился так, как и великий Гомер к своим героям: люди живые равны богам, но отходят в небытие. Так получилась развернутая панорамная эпопея, ■ которой перед Берлином, Москвой, Парижем, Петербургом, Римом ■ всем миром, занятым политическими интригами, впервые предстала страна, чуждая для них, святая для него. Отчизна-Литва стала для шедевров Мицкевича непересыхающим источником вдохновения.

«Подрастут, как дубы станут» — так издавна говорят в краях над Неманом и Днепром о подростках. Далеко не все юноши из виленских Обществ филоматов и филаретов смогли насладиться жизнью на родной земле. В 1823 году (когда было арестовано более 100 человек) «краевое» студенчество с корнями вырвали из родной почвы, разбросав по просторам огромной империи. Учителю латинского языка ковенской гимназии Адаму Мицкевичу ■ течение 5-летней ссылки удалось посетить аристократические салоны Петербурга и Москвы, где он познакомился с будущими декабристами Рылеевым ■ Бестужевым, с поэтами Баратынским, Вяземским, Грибоедовым, Дельвигом, Жуковским, Полевым. Пушкин, которого ошибочно омолодил автор «Дзядов» и «Свитязянки» («на два месяца моложе меня»), назвал изгнанника «прозорливым и крылатым поэтом». Посетил пилигрим также черноморскую Одессу и крымские степи — места, куда из родной Литвы не долетало ни звука. Родину свою Мицкевич не увидит больше никогда. 15 мая 1829 года новоиспеченный эмигрант навсегда отплыл из Петербурга в Германию. Земляк Фаддей Булгарин, известный связями с III-им отделением, добился оформления заграничного паспорта, дав тем самым 30-летнему поэту возможность вырваться из острых когтей Николая I «Палкина». (Тень жандармского секретного отделения упадет на честного литвина кривотолками: мол, откупился от царизма согласием на агентурное сотрудничество.) Позже, когда Пушкина станут донимать, поддразнивая — почему и он не желает попутешествовать по Европе? — классик русской литературы в отговорке

использует, как веский аргумент, авторитет гениального современника: «Красоты природы я в состоянии представить себе в воображении более прекрасными, нежели они в действительности; поехал бы, пожалуй, чтобы познакомиться с великими людьми, но я знаком с Мицкевичем и знаю, что более великого, чем он, не найду».

В это время «певец Литвы», как назвал Мицкевича Пушкин, уже создал поэму «Пан Тадеуш» — самый крупный в славянском мире шедевр, по праву называющийся теперь эпопеей польского национально-освободительного движения начала XIX века. И тогда все русские современники (от славянофила И. Аксакова до автора «Мёртвых душ» Н. Гоголя) стремились прочесть произведение в оригинале. По охвату событий, исторической углубленности, мастерству реалистичного бытописания этот бессмертный гимн справедливо сравнивают со всемирно известными памятниками народного эпоса — «Илиадой» и «Калевалой».

Замысел написать «шляхетскую быль» возник осенью 1831 года, когда Мицкевич из Италии добрался до Познанщины, где его встретила обжигающая весть о разгроме Ноябрьского восстания. Отчаяние вследствие неудачи (поэт спешил принять участие ■ борьбе против царизма с оружием ■ руках), разочарование ■ иллюзорной сплоченности предводителей, надежда на новый революционный подъем соотечественников — всё это на Познанщине, пейзажами своими болезненно напоминающей родные новагрудские просторы, обострило у Мицкевича ностальгическое чувство. Оно зародило у поэта непреклонное желание написать произведение-воспоминание о вольном крае, где он изведал неподдельное счастье, — крае ушедшего детства. Память о нем человек с трепетным благоговением бережно носит ■ сердце, как пилигрим — горсть родной земли. Ибо чужбина не греет.

Глубокой осенью 1832 г. Мицкевич возвратился к своему намерению и в письме другу Стефану Горчиньскому 12 января 1833 года сообщал из Парижа: «Понемногу пишу сельскую поэму». Дальнейшее развитие замысла можно проследить по черновикам поэмы и переписке автора. Написав IV песню, поэт считал работу почти завершенной. Через полгода вынужденного перерыва, окончив V песню «Пана Тадеуша», в письме к Антонию Эдварду Одынцу поэт уточнил: «Осталось еще три». Позже, по мнению автора, размер произведения не должен был превысить 10 песен, и в таком объеме «Пана Тадеуша» рекламировали парижские книжные каталоги. Наконец, как видно из автографа, книга XI носила подзаголовок «Книга последняя». Точный размер саги не представлялся поэту, пока 13 февраля 1834 года он не поставил точку и с радостным облегчением от сделанного воскликнул: «Песен огромных двенадцать!». Это величественное полотно создавалось так долго вовсе не из-за недостатка таланта у автора. По признанию самого мастера, в те минуты, когда он работал над «любимейшим детищем», он не спешил: ему казалось, «что он ■ Литве».

Выход в свет «Пана Тадеуша» французские библиографы аннотировали 28 июня 1834 года. Тираж издания составил три тысячи экземпляров. В отличие от предыдущей книги «Дзяды. Часть III» (1832), переиздававшейся дважды ■ продолжение двух лет, новая книга поэта распространялась весьма медленно. Случилось даже так: когда в 1838 году готовилось первое Собрание сочинений Адама Мицкевича, издатели в V—VI томах поместили «Пана Тадеуша», сменив предварительно только обложку экземпляров первоиздания, остававшихся на книжных складах.

Польская литературная критика, и «отечественная», и «парижской эмиграции», восприняла поэму, мягко говоря, неоднозначно. Автору предъявляли полностью противоположные обвинения. Например, газета «*Demokrata Polski*» (1838) уличала поэта в «непочтительном» отношении к высоким гражданским идеалам Свободы, Равенства, Братства, провозглашенным Великой французской революцией 1789 года. Имелись в виду определенные строчки первой песни «Пана Тадеуша», за которыми критики усмотрели у Мицкевича непочтение к нравственному состоянию Польши.

Представители правого крыла упрекали поэта в губительном стремлении ко всему заграничному. По мнению одного из оппонентов, автором поэмы с одинаковым успехом мог бы считаться француз, немец или англичанин, поскольку польский дух («polszczyzna») в произведении отсутствует начисто. Последнее из утверждений напоминает наскоки варшавских апологетов классицизма на творчество виленских филоматов и филаретов конца 1810-х—начала 1820-х гг., перекликается с прямыми упреками Мицкевичу: «Вы для Литвы, ■ не для Короны пишете... меньше заботитесь о том, чтобы Вас понимали в Варшаве, лишь бы только понимали Вас в Вильно или Литве...».

Споры вокруг «Пана Тадеуша» пережили самого автора и перекочевали в наш век. Потому что крупное художественное полотно всегда в чем-то непостижимо для профессиональных критиков, не говоря о рядовом читателе. Но не о полемике здесь разговор. Создавая свое произведение, Мицкевич вначале намеревался показать главным образ монаха Робака, о чем свидетельствует первоначальное заглавие поэмы — «Жегота». Так в черновиках звался монах (в прошлом гуляка-полупанок, спесивый «шляхціц на загродзе роўны ваяводзе» — короче, олицетворение склочности и разгула Речи Посполитой), ставший позже борцом за возрождение молодой Польши. Однако вещее чутье, присущее каждому гению, подсказало автору, что основным поборником ■ будущем освободительном движении станет не бунтарь-романтик (наподобие Конрада Валенрода — героя одноименной поэмы, созданной Мицкевичем в 1828 г.), а народ. Все те, кто восхищались последним произведением поэта «Дзяды», ждали от Мицкевича продолжения ■ том же революционном ключе. Но истинному гению не пристало послушно ходить на поводу у публики; он прокладывает такое русло, в котором вода не застаивается веками.

Непонятая официозной критикой квинтэссенция, заложенная Мицкевичем в эпопее, нашла горячий отзвук среди многочисленных поклонников его таланта, и в первую очередь, в сердце земляка — Винцента Дунина-Марцинкевича (1808–1884), классика белорусской литературы, первого среди славян отважившегося перевести величественную сагу на родной язык. Возможно, под впечатлением от горькой вести в ноябре 1855 года о кончине непокорного литвина в далеком Константинополе Белорусский Дудар решил отдать дань памяти величайшему поэту XIX столетия, сделав перевод «Пана Тадеуша» на язык того народа, чьим богатейшим, великолепным фольклором был оплодотворен талант Мицкевича. Осуществив тем самым мечту «певца Литвы», высказанную в «Эпилоге» к «Пану Тадеушу» (неопубликаванном при жизни гения), чтобы его стихотворения, простые, как напевы крестьянок, залетели под сельские стрехи. Чтобы вечной болью и красотой возвышали свой люд. Чтобы на родине, согретый талантливым словом, никто не чувствовал себя сиротиной.

Одновременно с зачинателем новой белорусской литературы за перевод эпопеи взялись ■ русские литераторы, о чем специально упомянул Дунин-Марцинкевич в «Предисловии переводчика». Намерения опубликовать «Пана Тадеуша» на русском языке ■ самом деле имели место в конце 1850-х гг. Журналист и военный переводчик Николай Берг поместил в «Русском вестнике» небольшие отрывки из разных песен гимна (полностью перевод Берга вышел отдельным изданием в Варшаве в 1875 г.), а исследователь славянских литератур П.Дубровский пересказал поэму прозой в 11-ой книжке «Отечественных записок» за 1858 год. Позже эпопею переводили В. Бенедиктов (первое многотомное русское издание произведений А.Мицкевича, 1882), С.Мар (Аксенова) (ее перевод «Пана Тадеуша», который предложен здесь читателю, вошел в 5-томное собрание сочинений польского поэта, вышедшее в 1948—1954 годах, и с тех пор неоднократно перепечатывался). Имеется также перевод М. Павловой, опубликованный отдельной книгой в 1954 году.

Судьба же первого белорусского перевода поэмы Адама Мицкевича «Пан Тадеуш»

сложилась трагически. Начальные две «быліцы» (песни), увидевшие свет в Вильно в 1859 году, царская цензура конфисковала и почти весь тираж издания уничтожила. Не менее трагическая судьба была уготована и второму полному белорусскому переводу, осуществленному в 1931—1932 годах в казематах польских тюрем известным белорусским общественным и политическим деятелем Браниславом Тарашкевичем (1892—1938) , которого в сентябре 1933 года польские власти обменяли на писателя Францишка Алехновича (автора позднее неоднократно издаваемой на Западе книги «В когтях ГПУ»). Б. Тарашкевич жил в СССР, где в 1937 году снова был арестован (на этот раз чекистами) и как «агент панско-буржуазной Польши» расстрелян. Вывезенные им из «белопольских» тюремных застенков переводы «Илиады» Гомера и «Пана Тадеуша» А. Мицкевича оказались в подвальных пучинах НКВД, откуда сумела выплыть только последняя рукопись, чтобы через полвека стать достоянием культуры (Минск, 1981; Ольштын, 1984)[1] . В 1985 году белорусская мицкевичиана пополнилась художественным переводом «Пана Тадеуша», выполненным Язэпом Семяжоном. Издание, проиллюстрированное прекрасными акварелями графика Василя Шаранговича, стало значительным событием в культурной жизни Беларуси.

Поэтому, когда очередной (уже послевоенный) узник сталинских лагерей Пятро Битель взялся переводить шедевр мировой поэзии, он ничего не мог «подсмотреть» у двух предшественников-мучеников. Широкому читателю Беларуси П. Битель (1912—1991) известен пока как автор поэм «Замки и люди» (1968), «Две войны» (1990) и др. Возможно, воспитанник Барунской и Виленской учительских семинарий (1925—1931) и не занялся бы переводом, если бы не молох сталинизма, бросивший в 1950 году учителя немецкого языка на Воложинщине в тюрьму, а затем отправивший его в сибирский ГУЛАГ. Там, в одном из лагерей, весною 1953 года кто-то из заключенных получил от варшавских родственников на самом дне продовольственной посылки том поэзии. Но только некоторые белорусы понимали польский язык, особенно молодые (в советские «исправительно-трудовые» лагеря нередко попадали даже старшеклассники). Как могучая река берет свое начало из кристально чистого родника, так новый перевод родился в ответ на многочисленные просьбы юного заключенного, жаждавшего красоты поэтического слова в тех нечеловеческих условиях. И вот для школьника Лёни Мазуры из Дятлова начал пересказывать поэму П.Битель. Первые слушатели — заключенные белорусы, летувисы, «кресовые» поляки — просили в один голос: переводи дальше!.. Никто не делил Мицкевича на «своего» и «чужого». Бителевский перевод, как и сам шедевр, изначально был пропитан духом интернационализма.

Перевод П. Бителя создавался в 1953—1955 годах между лесоповалом-стройками Кемеровской области и медными рудниками Джезказгана (новостройки те потом зачислят в актив молодым комсомольцам-добровольцам). И мало кто знает сейчас, что вместо пера переводчик использовал самодельный «карандаш» из оловянной проволоки. Что вместо атласно-черных чернил тысяча звонких строчек пролились каллиграфической зеленкой, тайком вынесенной из медсанчасти знакомым санитаром. Что вместо лощеных листов бумаги разрезались запыленные трехслойные мешки из-под цемента. И что первый «гонорар» П. Бителю отмерили конвоиры. Когда уже «Книга вторая» (именно с неё он начал переводить) была окончена и потекли сотни строчек первой книги, его после отбоя застали за этим малопонятным (и потому еще более опасным) занятием. Наказание — трое суток карцера. Так знаменитая сага, пересказанная на белорусском языке, вошла в плоть и кровь, отождествляясь с именем переводчика. Перевод «Пана Тадеуша» П. Битель считал своим главным творческим

[1] Первая рукопись Б. Тарашкевича, скорее всего, погибла, и белорусы до сего времени не имеют национального перевода «Илиады».

достижением. Его блестящее знание белорусского и польского языков бесспорно: он осуществлял перевод без соответствующих словарей под рукой. Однако мученический перевод почти полвека не мог увидеть свет... И наконец «лагерный памятник» выходит к 200-летнему юбилею А. Мицкевича. Перевод, вызревший в далекой Сибири благодаря трудолюбию пчелы, усердствовавшей над прекрасным цветком из родимых полей. Произведение, возникшее ■ душном Париже ■ кругу близких друзей-эмигрантов, переведенное в таежной Сибири, возвращается на родину. На этот раз стараниями Пятра Бителя.

Пройдет время, и появятся новые переводы «Пана Тадеуша» — бессмертной саги о нашем крае на польском языке. И в том обозримом будущем, где белорусы обязательно сумеют занять «свой пачэсны пасад між народамі» (Я.Купала), в национальном пантеоне гениев они поместят ■ Адама Мицкевича. Как уже сегодня, ■ конце XX столетия (о чем не мыслилось даже полвека тому назад), рядом с первопечатником Франциском Скориной величаво возвышается Миколай Гусовский, который в вечном Риме восславил свою Родину на одном из классических языков Средневековья — латыни. И, если Миколай Гусовский, яркий представитель латиноязычной ренессансной поэзии в Беларуси, свою поэму, написанную по просьбе высших церковных иерархов, назвал «Песнь о зубре» (эпический шедевр о нашей земле был адресован европейскому читателю, написан ■ 1520–1522 годах в Риме ■ издан ■ 1523 году в Кракове) — то Адам Мицкевич в XIX столетии сложил свою «Илиаду», подзаголовок которой читается как «Песнь о Литве». А точнее, о Новаградчине. Прощальная лебединая песня над неманскими дубравами, где серебряными звездами в поднебесье кружат верные аисты и журавли перед перелетом. Этот вечный таинственный призыв родной земли, как эстафету, подхватит, уже в XX веке, земляк и однофамилец поэта Кастусь Мицкевич, известный под псевдонимом Якуб Колас (1882—1956). Во многом опираясь на многоязыковое наследие ■ истории нашей письменности XIX столетия, ■ значительной степени предопределившее появление собственно национальной литературы, он создаст гимн «молодой Беларуси» — поэму «Новая земля» (1911—1923).

«Пан Тадеуш» — это неугасимый дух гения. Печаль разлуки с родными краями А. Мицкевич омывал поэтическими грезами в родниковых, чистых, как сердце поэта, волнах реки далекого детства, помня древнюю мудрость своего народа: чем за морем вино пить, лучше из Немана водицу. Каждое такое прикосновение в мечтах и снах к родной земле возвышало душу титана. Этой закалке завидовал и Фредерик Шопен, назвавший А. Мицкевича «крепкой головой», «могущей выдержать еще несколько эмиграций и не потерять ни разума, ни энергии». Настоящий «литовский» дуб-исполин, вцепившийся корнями ■ родную почву. Вобравший, словно удары молний, страдания миллионов соотечественников. Его всегда осеняло извечное «литовское небо» (см. начало книги X), отражающееся в наших реках и озерах, в Свитязи — чистейшем Кастальском роднике европейского Парнаса. Ибо под тем возвышенным небом навеки остались могилы праотцов — ведь это они придают вечную силу небесам.

«Пан Тадеуш» — вечно живой цветок с парижской мостовой на духовную Атлантиду Отчизны. Откуда столько небесного нектара, земного аромата, сыновней тоски и света ■ этом цветке? Не знаю. Спросите у волнения зреющих хлебов, обратитесь с этим вопросом «к лесам задумчивым, к зеленым луговинам, Бегущим к Неману по склонам и долинам», спросите у солнца, каждодневно восходящего, как и во времена Адася, из-за исполинских плеч новаградских холмов над Вильней, Заосьем, Рутой и Тугановичами, над руинами новаградского замка, над крестами Новаградского фарного костела, где был окрещен Адам Бернард Мицкевич — наш земляк, наш соотечественник, автор одного из великолепнейших произведений мировой поэзии.

Язэп Янушкевич

ILIADA NOWOGRÓDZKA

Każdy dąb szumi swej dąbrowie.

Był synem Ziemi Nowogródzkiej. Jako 25-letni wygnaniec poznawał Imperium Rosyjskie, zaprzyjaźnił się z Puszkinem. Podróżował po Niemczech, gdzie w Weimarze odwiedził starzejącego się Goethego. Spacerował obok Kapitolu po placach Wiecznego Miasta, zatrzymał się w Paryżu. Życiowy szlak zakończył w Konstantynopolu. Jego zwłoki na wieki spoczęły w stolicy Piastów na Wawelu — rezydencji królów. Nie mieszkał na ziemiach Korony ale stał się geniuszem na miarę Polski i świata.

Takie było życie poety — romantyka i pielgrzyma Adama Mickiewicza. Niczym gwiazda betlejemska przyświecała mu w tej życiowej wędrówce Nowogródczyzna — Ojczyzna. Tu, 24 grudnia, w Wigilię 1798 Wieszcz przyszedł na świat, aby wydobyć z zapomnienia kraj rodzinny, odchodzący po cichu w niepamięć na peryferiach życia Europy. Kraj ten stał się już geograficznym obrzeżem carskiego imperium. Tak właśnie traktowano ziemie białoruskie należące do zaboru rosyjskiego, które trafiły tam w wyniku zbrodniczych rozbiorów końca XVIII wieku. Ziemie te przeżywały upadek gospodarczy ale duch narodowy tylko krzepł. Jak twierdzili przecież jeszcze starożytni Grecy, państwo powinno opierać się bardziej na sile ducha niż broni. Dzięki utalentowanym synom (oprócz gwiazdy Mickiewicza jaśniały też patriotycznym blaskiem nazwiska Jana Barszczewskiego, Jana Czeczota, Józefa Ignacego Kraszewskiego, Władysława Syrokomli, Elizy Orzeszkowej...) znów i znów wyłaniała się Atlantyda dawnej Litwy z jej europejską kulturą. Rzeczpospolita Obojga Narodów, która jeszcze przed narodzeniem Wieszcza zniknęła z mapy Europy — nadal żyła w twórczości. Twórczością takich artystów i pisarzy jak Juliusz Słowacki, Zygmunt Krasiński, Cyprian Kamil Norwid, Stefan Żeromski, Bolesław Prus, Henryk Sienkiewicz, Maria Konopnicka, Jan Matejko żyła Polska, a z nią Rzeczpospolita.

Istotnie, dzieci nie wybierają sobie rodziców, a poeci narodów. Ojciec Wieszcza, Mikołaj — ekonom, którego szlacheckiego rodowodu nie uznały carskie władze, zdobył wykształcenie prawnicze. Zawód adwokata wykonywał w Nowogródku, gdzie osiadł na stałe w 1801 roku. Pierwsza stolica Wielkiego Księstwa Litewskiego stała się dla małego Adasia Ziemią Obiecaną. Ojciec, uczestnik powstania Kościuszkowskiego posiadał ambicje literackie i próbował swych sił w poezji. Największy jednak wpływ na poetyckie wychowanie syna miał parobek Błażej (o przezwisku Ulis), który opowiadał mu ludowe bajki i podania. Pokojówki o szlacheckich nazwiskach Gąsiewska i Gorbatowska znały i śpiewały niezliczone pieśni. Pod wpływem tych bajek i pieśni Adam zaczął pisać własne wiersze — bo ojczysty folklor zawiera w sobie żywą moc słowa. 11 października 1811 roku w Nowogródku wybuchł pożar, który strawił znaczną część miasta (dom rodzinny Mickiewiczów spłonął w wielkim pożarze w r.1881). To przeżycie Adaś uwiecznił w swoim pierwszym wierszu, który niestety nie zachował się do dziś. Dyrektor szkoły dominikańskiej nie uwierzył, że utwór wyszedł spod ręki ucznia (wiersz nie mieścił się w szkolnym zeszycie) i ukarał go. To było pierwsze honorarium, które otrzymał poeta. Tak głosi legenda. Młodzik nie wiedział jeszcze, że los zgotuje mu życie pogorzelca i wiecznego tułacza, dla którego obce kraje są jak pogorzelisko.

W 1815 roku Adam Mickiewicz przyjeżdża do Wilna i zostaje zaliczony w poczet studentów Uniwersytetu Wileńskiego. Jest jednym z założycieli Towarzystwa Filomatów (1817), którego celem była nie tylko pomoc w nauce, nie tylko kształcenie młodych talentów i ich rozwój ale

Odmienia drogę, rad by towarzyszów zmylić,
Lecz go szybkimi kroki ścigają natręty
I zewsząd obwijają tanecznymi skręty;
Więc gniewa się, prawicę na rękojeść składa,
Jakby rzekł: «Nie dbam o was, zazdrośnikom biada!»
Zwraca się z dumą w czole i z wyzwaniem w oku
Prosto w tłum; tłum tancerzy nie śmie dostać w kroku,
Ustępują mu z drogi — i zmieniwszy szyki,
Puszczają się znów za nim. —

Brzmią zewsząd okrzyki:
«Ach, to może ostatni! patrzcie, patrzcie, młodzi,
Może ostatni, co tak poloneza wodzi!» —
I szły pary po parach hucznie i wesoło,
Rozkręcało się, znowu skręcało się koło,
Jak wąż olbrzymi, w tysiąc łamiący się zwojów;

Mieni się cętkowata, różna barwa strojów
Damskich, pańskich, żołnierskich, jak łuska błyszcząca,
Wyzłocona promieńmi zachodniego słońca
I odbita o ciemne murawy węzgłowia.
Wre taniec, brzmi muzyka, oklaski i zdrowia!

Tylko kapral Dobrzyński Sak ani kapeli
Nie słucha, ani tańczy, ani się weseli,
Ręce w tył założywszy, stoi zły, ponury,
Wspomina swe dawniejsze do Zosi konkury:
Jak lubił dla niej nosić kwiaty, pleść koszyczki,
Wybierać gniazda ptasie, robić zauszniczki.
Niewdzięczna! chociaż tyle pięknych darów strwonił,
Choć przed nim uciekała, choć mu ojciec bronił!
On jeszcze! ileż razy na parkanie siadał,
By ją dójrzeć przez okna; w konopie się wkradał,
Żeby patrzeć, jak ona pleła swe ogródki,
Rwała ogórki albo karmiła kogutki.
Niewdzięczna! Spuścił głowę i na koniec świsnął
Mazurka; potem kaszkiet na uszy nacisnął
I szedł w obóz, gdzie stała przy armatach warta;
Tam dla rozerwania się zaczął grać w drużbarta
Z wiarusami, kielichem osładzając żałość.
Taka była dla Zosi Dobrzyńskiego stałość.

Zosia tańczy wesoło; lecz choć w pierwszej parze,
Ledwie widna z daleka; na wielkim obszarze
Zarosłego dziedzińca, w zielonej sukience,
Ustrojona w równianki i w kwieciste wieńce,
Śród traw i kwiatów krąży niewidzialnym lotem,
Rządząc tańcem, jak anioł nocnych gwiazd obrotem:
Zgadniesz, gdzie jest, bo ku niej obrócone oczy,
Wyciągnięte ramiona, ku niej zgiełk się tłoczy.
Darmo się Podkomorzy zostać przy niej sili,
Zazdrośnicy już z pierwszej pary go odbili;
I szczęśliwy Dąbrowski niedługo się cieszył,
Ustąpił ją drugiemu, a już trzeci śpieszył,
I ten, zaraz odbity, odszedł bez nadziei.
Aż Zosia, już strudzona, spotkała z kolei
Tadeusza, i dalszej lękając się zmiany,
I chcąc przy nim pozostać, zakończyła tany.

Idzie do stołu gościom nalewać kielichy.

Słońce już gasło, wieczor był ciepły i cichy,
Okrąg niebios gdzieniegdzie chmurkami zasłany,
U góry błękitnawy, na zachód różany;
Chmurki wróżą pogodę, lekkie i świecące,
Tam jako trzody owiec na murawie śpiące,
Ówdzie nieco drobniejsze, jak stada cyranek.
Na zachód obłok na kształt rąbkowych firanek,
Przejrzysty, sfałdowany, po wierzchu perłowy,
Po brzegach pozłacany, w głębi purpurowy,
Jeszcze blaskiem zachodu tlił się i rozżarzał,
Aż powoli pożółkniał, zbladnął i poszarzał:
Słońce spuściło głowę, obłok zasunęło
I raz ciepłym powiewem westchnąwszy — usnęło.

A szlachta ciągle pije i wiwaty wznosi:
Napoleona, Wodzów, Tadeusza, Zosi,
Wreszcie z kolei wszystkich trzech par zaręczonych,
Wszystkich gości obecnych, wszystkich zaproszonych,
Wszystkich przyjaciół, których kto żywych spamięta,
I których zmarłych pamięć pozostała święta!

I ja tam z gośćmi byłem, miód i wino piłem,
A com widział i słyszał, w księgi umieściłem.

• K o n i e c •

[E P I L O G]

O tym-że dumać na paryskim bruku,
Przynosząc z miasta uszy pełne stuku,
Przekleństw i kłamstwa, niewczesnych zamiarów,
Za późnych żalów, potępieńczych swarów!

Biada nam, zbiegi, żeśmy w czas morowy
Lękliwe nieśli za granicę głowy!
Bo gdzie stąpili, szła przed nimi trwoga,
W każdym sąsiedzie znajdowali wroga,
Aż nas objęto w ciasny krąg łańcucha
I każą oddać co naiprędzej ducha.

A gdy na żale ten świat nie ma ucha,
Gdy ich co chwila nowina przeraża,
Bijąca z Polski jak dzwon ze smętarza,
Gdy im prędkiego zgonu życzą straże,
Wrogi ich wabią z dala jak grabarze!
Gdy w niebie nawet nadziei nie widzą!
Nie dziw, że ludzi, świat, siebie ohydzą,
Że utraciwszy rozum w mękach długich,
Plwają na siebie i żrą jedni drugich!

* * *

Chciałem pominąć, ptak małego lotu,
Pominąć strefy ulewy i grzmotu
I szukać tylko cienia i pogody,
Wieki dzieciństwa, domowe zagrody...

Jedyne szczęście, kto w szarej godzinie
Z kilku przyjaciół usiadł przy kominie,
Drzwi od Europy zamykał hałasów,
Wyrwał się z myślą ku szczęśliwszym czasóm
I dumał, myślił o swojej krainie...

Ale o krwi tej, co się świeżo lała,
O łzach, którymi płynie Polska cała,
O sławie, która jeszcze nie przebrzmiała! —

Кніга чацвёртая

А гэта рэха грала

Книга четвертая

То эхо отзывалось

Księga czwarta

A to echo grało

O nich pomyślić nie mieliśmy duszy.
Bo naród bywa na takiej katuszy,
Że kiedy zwróci wzrok ku jego męce,
Nawet Odwaga załamuje ręce.

Te pokolenia żałobami czarne,
Powietrze tylą klątwami ciężarne,
Tam myśl nie śmiała zwrócić lotów,
W sferę okropną nawet ptakom grzmotów.

O Matko Polsko! Ty tak świeżo w grobie
Złożona — nie ma sił mówić o tobie!

Ach, czyjeż usta śmią pochlebiać sobie,
Że dzisiaj znajdą to serdeczne słowo,
Które rozczula rozpacz marmorową,
Które z serc wieko podejmie kamienne,
Rozwiąże oczy tylą łez brzemienne
I sprawia, że łza przystygła wypłynie —
Nim się te usta znajdą, wiek przeminie.

Kiedyś — gdy zemsty lwie przehuczą ryki,
Przebrzmi głos trąby, przełamią się szyki,
Gdy wróg ostatni wyda krzyk boleści,
Umilknie, światu swobodę obwieści,
Gdy orły nasze lotem błyskawicy
Spadną u dawnej Chrobrego granicy,
Gdy ciał podjedzą i krwią całe spłyną,
I skrzydła wreszcie na spoczynek zwiną! —
Wtenczas, dębowym liściem uwieńczeni,
Rzuciwszy miecze, siądą rozbrojeni
Rycerze nasi! zechcą słuchać pieni!
Gdy świat obecnej doli pozazdrości,
Będą czas mieli słuchać o przeszłości!
Wtenczas zapłaczą nad ojców losami
I wtenczas łza ta ich lica nie splami.

Dziś dla nas, w świecie nieproszonych gości,
W całej przeszłości i w całej przyszłości
Jedna już tylko jest kraina taka,
W której jest trochę szczęścia dla Polaka:

Kraj lat dziecinnych! On zawsze zostanie
Święty i czysty, jak pierwsze kochanie,
Nie zaburzony błędów przypomnieniem,
Nie podkopany nadziei złudzeniem
Ani zmieniony wypadków strumieniem.
Gdziem rzadko płakał, a nigdy nie zgrzytał,
Te kraje rad bym myślami powitał,
Kraje dzieciństwa — gdzie człowiek po świecie
Biegł jak po łące, a znał tylko kwiecie
Małe i piękne, jadowite rzucił,
Ku pożytecznym oka nie odwrócił.

Ten kraj szczęśliwy, ubogi i ciasny!
Jak świat jest boży, tak on był nasz własny!
Jakże tam wszystko do nas należało,
Jak pomnim wszystko, co nas otaczało:
Od lipy, która koroną wspaniałą
Całej wsi dzieciom użyczała cienia,
Aż do każdego strumienia, kamienia,
Jak każdy kątek ziemi był znajomy
Aż po granicę, po sąsiadów domy!

I tylko krajów tych obywatele
Jedni zostali wierni przyjaciele,
Jedni dotychczas sprzymierzeńcy pewni!
Bo któż tam mieszkał? — matka, bracia, krewni,
Sąsiedzi dobrzy. Kogo z nich ubyło,
Jakże tam o nim często się mówiło,
Ile pamiątek, jaka żałość długa
Tam, gdzie do pana przywiązańszy sługa
Niż w innych krajach małżonka do męża,
Gdzie żołnierz dłużej żałuje oręża
Niż tu syn ojca; po psie płaczą szczerze
I dłużej niż tu lud po bohaterze.

I przyjaciele wtenczas pomogli rozmowie,
I do piosnki rzucali mnie słowo za słowem,
Jak bajeczne żurawie nad dzikim ostrowem,
Nad zaklętym pałacem przelatując wiosną
I słysząc zaklętego chłopca skargę głośną,
Każdy ptak chłopcu jedno pióro zrucił,

On zrobił skrzydła i do swoich wrócił.

O, gdybym kiedy dożył tej pociechy,
Żeby te księgi zbłądziły pod strzechy,
Żeby wieśniaczki, kręcąc kołowrotki,
Gdy odśpiewają ulubione zwrotki
O tej dziewczynie, co tak grać lubiła,
Że przy skrzypeczkach gąski pogubiła,
O tej sierocie, co piękna jak zorze
Zaganiać gąski szła w wieczornej porze —
Gdyby też wzięły na koniec do ręki
Te księgi, proste jako ich piosenki!

Tak za dni moich, przy wiejskiej zabawie,
Czytano nieraz pod lipą na trawie
Pieśń o Justynie, powieść o Wiesławie.
A przy stoliku drzemiący pan włodarz
Albo ekonom, lub nawet gospodarz,
Nie bronił czytać i sam słuchać raczył,
I młodszym rzeczy trudniejsze tłumaczył,
Chwalił piękności, a błędom wybaczył.

I zazdrościła młodzież wieszczów sławie,
Która tam dotąd brzmi w lasach i w polu,
I którym droższy niż laur Kapitolu
Wianek, rękami wieśniaczki osnuty,
Z modrych bławatków i zielonej ruty.

OBJAŚNIENIA [POETY]

w tytule utworu:

OSTATNI ZAJAZD NA LITWIE

Za czasów Rzeczypospolitej Polskiej egzekwowanie wyroków sądowych było bardzo trudne w kraju, gdzie władza wykonawcza nie miała prawie żadnej policji pod swymi rozkazami, a obywatele możni trzymali nadworne pułki, niektórzy nawet, jak książęta Radziwiłłowie, kilkunastotysięczne wojska. Żałujący więc, uzyskawszy dekret, musiał po egzekucją udawać się do stanu rycerskiego, to jest do szlachty, przy której była także władza wykonawcza. Zbrojni krewni, przyjaciele i powietnicy ciągnęli z dekretem w ręku i w towarzystwie woźnego zdobywali, często nie bez rozlewu krwi, dobra przysądzone żałującemu, które woźny legalnie tradował lub w posesję oddawał. Taka egzekucja zbrojna dekretu nazywała się z a j a z d e m. — W dawnych czasach, póki szanowano prawa, najmożniejsi panowie nie śmieli się opierać wyrokom, rzadko zdarzały się zbrojne napaści, a gwałt prawie nigdy nie uszedł bezkarnie. Wiadomy z dziejów smutny koniec księcia Wasila Sanguszki i Stadnickiego zwanego Diabłem. — Zepsucie publicznych obyczajów Rzeczypospolitej namnożyło zajazdów, które ciągle mieszały spokojność Litwy.

KSIĘGA PIERWSZA

w. 5–6

Panno święta, co Jasnej bronisz Częstochowy
I w Ostrej świecisz Bramie.

Wszyscy w Polszcze wiedzą o obrazie cudownym N.P. na Jasnej Górze w Częstochowie. W Litwie słyną cudami obrazy N.P. Ostrobramskiej w Wilnie, Zamkowej w Nowogródku tudzież Żyrowickiej i Boruńskiej.

w. 148–149

..ale nie myśl wcale,
Aby w domu Sędziego służono niedbale.

Rząd rosyjski nigdy w krajach zdobytych nie obala od razu praw i instytucji cywilnych, ale je powoli ukazami podkopuje i roztacza. W Małorosji na przykład utrzymano aż do ostatnich czasów Statut litewski, ukazami odmieniony. Litwie zostawiono całe dawne urządzenie sądów cywilnych i kryminalnych. Obierani więc są po dawnemu sędziowie ziemscy i grodzcy w powiatach i sędziowie główni w guberniach. Ale że apelacja idzie do Petersburga, do mnogich różnego stopnia instancji, przy sądach więc miejscowych ledwie pozostał cień dawnej powagi tradycyjnej.

w. 150:

...nim się pan Wojski ubierze.

Wojski *(tribunus)* bywał niegdyś z urzędu opiekunem żon i dzieci szlachty w czasie pospolitego ruszenia. Od dawnego czasu urząd ten, bez obowiązków, stał się tytularnym. W Litwie jest zwyczajem, iż osobom poważnym nadaje się przez grzeczność jakikolwiek tytuł dawny, który używaniem uprawnia się. Mianują na przykład sąsiedzi przyjaciela swego Obożnym, Stolnikiem lub Podczaszym, zrazu w rozmowie tylko i w korespondencji, a następnie nawet w aktach urzędowych. Rząd rosyjski zabraniał podobnych tytułów i pragnąłby je śmiesznością okryć, a wprowadzić na ich miejsce tytułowanie podług rang swojej hierarchii, do której Litwini dotąd wielki wstręt mają.

w. 178:

Podkomorzy już zjechał z żoną i z córkami.

Podkomorzy, niegdyś urzędnik znakomity i poważny, *Princeps Nobilitatis,* za rządu rosyjskiego stał się tylko tytularnym. Sądził jeszcze niekiedy sprawy graniczne, ale na koniec i tę część jurysdykcji utracił. Teraz zastępuje czasem marszałka i mianuje komorników, czyli mierniczych powiatowych.

w. 248:

Wojski z woźnym Protazym ze świecami w sieni...

Woźny albo jenerał, wybrany uchwałą trybunalską lub sądową ze szlachty osiadłej, roznosił pozwy, ogłaszał intromisje, robił wizje, przywoływał aktoraty etc. Pospolicie drobna szlachta urząd ten sprawowała.

w. 439:

Biegali wszyscy za nim jakby za rarogiem.

Raróg, ptak z gatunku jastrzębia. Wiadomo, że za jastrzębiami drobne ptastwo, szczególnie jaskółki, tłumnie upędzają się. Stąd przysłowie: latać jak za rarogiem.

w. 525:

Że Bonapart czarował...

Mnóstwo krąży powieści między prostym ludem rosyjskim o czarach Bonapartego i Suwarowa.

w. 576:

Asesora z Rejentem wzmogła się uparta...

Asesorowie składają policją ziemską powiatu. Wedle ukazów czasem bywają

obierani przez obywateli, czasem naznaczani od rządu; ci ostatni zowią się koronni. Sędziowie apelacyjni zowią się także asesorami, ale tu nie o nich mowa.

Rejenci aktowi zarządzają kancelarią, dekretowi piszą wyroki, wszyscy zaś mianowani z ręki pisarzów sądowych.

w. 790:

Co by rzekł wojewoda Niesiołowski stary.

Józef hrabia Niesiołowski, ostatni wojewoda nowogrodzki, był prezesem rządu rewolucyjnego w czasie powstania Jasińskiego.

w. 796:

Białopiotrowiczowi samemu odmówił.

Jerzy Białopiotrowicz, ostatni Pisarz W. Ks. Litewskiego, czynnie należał do powstania Litwy pod Jasińskim. Sądził więźniów stanu w Wilnie. Mąż dla cnot i patriotyzmu bardzo szanowany w Litwie.

w. 850:

Woźny pas mu odwiązał, pas słucki, pas lity.

W Słucku sławna była fabryka złotogłowu i pasów litych na całą Polskę; udoskonalona staraniem Tyzenhauza.

w. 872:

Była to trybunalska wokanda...

Wokanda, wąska, podługowata książeczka, na której spisywano nazwiska stron procesujących wedle porządku aktoratów. Każdy adwokat i woźny musiał mieć takową wokandę.

w. 923:

Rzucił w oczy Francuzów sto krwawych sztandarów.

Jenerał Kniaziewicz, wysłany przez armią włoską, złożył Dyrektoriatowi zdobyte chorągwie.

w. 924:

Jak Jabłonowski zabiegł, aż kędy pieprz rośnie.

Książę Jabłonowski, dowodzący Legią Naddunajską, umarł w Saint Domingo i cała prawie Legia tam zginęła. W emigracji jest kilku weteranów pozostałych z owej nieszczęsnej wyprawy, między innymi jenerał Małachowski.

KSIĘGA DRUGA

w. 228:

I w organ, i w rozliczne instrumenty grnła.

W dawnych zamkach stawiano na chorach organ.

w. 282:

I czarną mu polewkę do stołu podano.

Czarna polewka, podana u stołu paniczowi starającemu się o rękę panny, oznaczała rekuzę.

w. 501:

Lub z wicin bierze ziarna w najlepszym gatunku.

Wiciny są to wielkie statki na Niemnie, którymi Litwini prowadzą handel z Prusami, spławiając zboża i biorąc w zamian za nie towary kolonialne.

w. 822:

Książę Dominik, kiedym z nim razem polował.

Ks. Dominik Radziwiłł, wielki miłośnik polowania, emigrował do Księstwa Warszawskiego i wystawił własnym kosztem pułk jazdy, którym dowodził. Umarł we Francji. Na nim zgasła linia męska książąt na Ołyce i Nieświeżu, największych panów w Polszcze i zapewne w Europie.

w. 823–824:

...z jenerałem Mejenem...

Mejen odznaczył się w wojnie narodowej za Kościuszki. Dotąd pokazują pod Wilnem okopy Mejenowskie.

KSIĘGA TRZECIA

w. 264–265:

Panienki za wysmukłym gonią borowikiem,
Którego pieśń nazywa grzybów pułkownikiem.

Znajoma w Litwie pieśń gminna o grzybach wychodzących na wojnę pod wodzą borowika. W tej pieśni opisane są własności grzybów jadalnych.

w. 620:

Nasz malarz Orłowski...

Znany malarz rodzajowy; na kilka lat przed śmiercią malować zaczął pejzaże. Umarł niedawno w Petersburgu.

w. 750–751:

> Dwie pjawki...
> Pies zowie się Sprawnikiem, a suka Strapczyną.

Rodzaj psów angielskich, małych i silnych, zwanych pijawkami, służy do łowów na wielkiego zwierza, szczególniej niedźwiedzia.

S p r a w n i k , czyli kapitan sprawnik, naczelnik policji ziemskiej. – S t r a p c z y, rodzaj prokurora rządowego. Urzędnicy ci, mając często sposobność nadużywania władzy, w wielkim są obrzydzeniu u obywateli.

KSIĘGA CZWARTA

w. 9:

> Ukołysany, marzył o wilku żelaznym.

Podług tradycji, wielki książę Giedymin miał sen na Górze Ponarskiej o wilku żelaznym i za radą wajdeloty Lizdejki założył miasto Wilno.

w. 20:

> Ostatni król, co nosił kołpak Witoldowy.

Zygmunt August był podniesiony starożytnym obyczajem na stolicę Wielkiego Księstwa Litewskiego, przypasał miecz i koronował się kołpakiem. Lubił bardzo myślistwo.

w. 27:

> Czy żyje wielki Baublis...

W powiecie rosieńskim, w majętności Paszkiewicza, pisarza ziemskiego, rosł dąb znany pod imieniem Baublisa, niegdyś w czasach pogańskich czczony jak świętość. We wnętrzu tego wygniłego olbrzyma Paszkiewicz założył gabinet starożytności litewskich.

w. 30:

> Czy kwitnie gaj Mendoga pod farnym kościołem.

Niedaleko fary nowogrodzkiej rosły starożytne lipy, których wiele wycięto około roku 1812.

w. 40–41:

> ...wszak ów dąb gaduła
> Kozackiemu wieszczowi tyle cudów śpiewa.

Ob. poema Goszczyńskiego *Zamek Kaniowski.*

w. 248:

> Kołomyjek z Halicza...

Kołomyjki, piosenki ruskie w rodzaju mazurów polskich.

w. 262–263:

> ...znał się dobrze na handlu zbożowym,
> Na wicinnym...

Ob. przyp. do (księga 11, w. 501).

w. 277–279:

> miejsce... zwane pokuciem.

Zaszczytne miejsce, gdzie dawniej stawiano bogów domowych, gdzie dotąd Rosjanie zawieszają obrazy. Tam wieśniak litewski sadza gościa, którego chce uczcić.

w. 536–537:

> Orzeł, gdy mu dziób stary tak się w kabłąk skrzywi,
> Że zamknięty na wieki już gardła nie żywi.

Dzioby wielkich ptaków drapieżnych z wiekiem coraz bardziej zakrzywiają się i na koniec wierzchnie ostrze, zagiąwszy się, dziób zamyka, i ptak z głodu umierać musi. To mniemanie gminne przyjęli niektórzy ornitologowie.

w. 540–541:

> Stąd to w miejscach dostępnych, kędy człowiek gości,
> Nie znajdują się nigdy martwych zwierząt kości.

Rzeczywiście, nie ma przykładu, aby znaleziono kiedy szkielet zdechłego zwierza.

w. 724:

> A co? fuzyjka moja? niewielka ptaszyna.

Ptaszynki są to strzelby małego kalibru, w które kładzie się drobna kula. Dobrzy strzelcy z takich fuzji ptaka w lot trafiają.

w. 825:

> Zaczęło złoto kapać i błyskać na słońcu.

W butelkach wódki gdańskiej bywają na dnie listki złota.

w. 981–982:

> ...taki ziemi kawał,
> Który by się wołową skórą nakryć dawał.

Królowa Dydo kazała porznąć na pasy skórę wołową i tym sposobem zamknęła

w obrębie skóry obszerne pole, gdzie wystawiła Kartaginę. Wojski wyczytał opis tego zdarzenia nie w *Eneidzie,* ale zapewne w komentarzach scholiastów.

Nb. Niektóre miejsca w pieśni czwartej są pióra S t e f a n a W i t w i c k i e g o.

KSIĘGA PIĄTA

w. 330:

Wyrwawszy się Bóg wie skąd, jak Filip z konopi...

Raz na sejmie poseł F i l i p ze wsi dziedzicznej K o n o p i e, zabrawszy głos, tak dalece odstąpił od materii, że wzbudził śmiech powszechny w Izbie. Stąd urosło przysłowie: wyrwał się jak Filip z konopi.

KSIĘGA SZÓSTA

w tytule:

ZAŚCIANEK

Nazywają w Litwie o k o l i c ą lub z a ś c i a n k i e m osadę szlachecką, dla różnicy od właściwych wsi, czyli sioł, osad wiejskich.

w. 169:

On Horeszkom dziesiąta woda na kisielu.

Kisiel, potrawa litewska, rodzaj galarety, która się robi z rozczynu owsianego, płucze się wodą, aż póki nie oddzielą się wszystkie cząstki mączne; stąd przysłowie.

w. 333:

...Wołodkowicz, pan dumny, zuchwały.

Po licznych burdach pochwycony w Mińsku i za dekretem trybunału rozstrzelany.

w. 381:

Obwołał pospolite ruszenie przez wici.

Kiedy król miał zgromadzić pospolite ruszenie, rozkazywał zatykać w każdej parafii drąg wysoki z uwiązaną na wierzchu miotłą, czyli wicią. I to się nazywało: rozdać wici. Każdy człowiek dorosły stanu rycerskiego obowiązany był pod utratą szlachectwa stawić się natychmiast pod chorągiew wojewódzką.

w. 416:

Brała również przydomki, zwane imioniska.

Imioniska są właściwie sobrykiety.

w. 525:

Bronić pana Pocieja...

Aleksander hrabia Pociej, wróciwszy po wojnie do Litwy, wspierał rodaków udających się za granicę i znaczne sumy przesłał do kasy Legionów.

KSIĘGA ÓSMA

w. 77:

Nieco wyżej Dawida wóz, gotów do jazdy.

Wóz Dawida, konstelacja zwana u astronomów *Ursa Maior.*

w. 97–98:

Podobnie pleban mirski zawiesił w kościele
Wykopane olbrzymów żebra i piszczele.

Było zwyczajem zawieszać przy kościołach znajdowane zabytki kości kopalnych, które lud uważa za kości olbrzymów.

w. 109:

Był to kometa pierwszej wielkości i mocy.

Pamiętny kometa roku 1811.

w. 145:

Ksiądz Poczobut, człek sławny, był obserwatorem.

Ksiądz Poczobut, eks-jezuita, sławny astronom, wydał dzieło o zodiaku w Denderach i obserwacjami swymi pomógł Lalandowi do obrachowania biegów księżyca. Ob. *Żywot* przez Jana Śniadeckiego.

w. 233:

W świcie Księcia był książę niemiecki Denassów.

Właściwie książę de Nassau-Siegen. Sławny podówczas wojownik i awanturnik. Był admirałem moskiewskim i pobił Turków na Lemanie, potem sam na głowę pobity od Szwedów. Bawił czas jakiś w Polszcze, gdzie otrzymał indygenat. Pojedynek księcia de Nassau z tygrysem brzmiał wówczas po wszystkich gazetach europejskich.

KSIĘGA DZIEWIĄTA

w. 165:

«A czy Sędzia, rzekł Major, Żółtą Księgę czytał?»

Ż ó ł t a K s i ę g a, od okładek tak nazwana, księga barbarzyńska praw wojennych rosyjskich. Nieraz w czasie pokoju rząd ogłasza prowincje całe za

będące w stanie wojny i na mocy Żółtej Księgi oddaje dowódcy wojskowemu zupełną władzę nad majątkami i życiem obywateli. Wiadomo, że od roku 1821 aż do rewolucji Litwa cała podlegała Żółtej Księdze, której egzekutorem był wielki książę Carewicz.

w. 456–457:

Ciągnie za sobą długie, sążniowate drzewo,
Uzbrojone w krzemienie i w guzy, i sęki.

Maczuga litewska robi się tym sposobem: wypatruje się młody dąb i nacina się od dołu do góry siekierą tak, ażeby korę i miazgę rozerznąwszy, drzewo z lekka poranić. W te karby wtykają się ostre krzemienie, które z czasem wrastają w drzewo i tworzą guzy twarde. Maczugi stanowiły za czasów pogańskich główną broń piechoty litewskiej; dotąd używają się niekiedy i zowią się nasiekami.

w. 468–469:

I jak jeden mieszczanin, zwany Czarnobacki,
Zabił Dejowa i zniósł cały pułk kozacki.

Po powstaniu Jasińskiego, kiedy wojska litewskie ustępowały ku Warszawie, Moskale zbliżyli się do opuszczonego Wilna. Jenerał Dejów na czele sztabu wjeżdżał przez Ostrą Bramę. Ulice były puste, mieszkańcy zamknęli się w domach. Jeden mieszczanin, spostrzegłszy armatę porzuconą w zaułku, kartaczami nabitą, wymierzył ją w bramę i zapalił. Ten jeden wystrzał ocalił wówczas Wilno: jenerał Dejów z kilku oficerami zginął, reszta, lękając się zasadzki, odstąpiła od miasta. Nie wiem z pewnością nazwiska onego mieszczanina.

w. 762:

Taki miał koniec zajazd ostatni na Litwie.

Bywały i poźniej jeszcze zajazdy, lubo nie tak sławne, dosyć jednak głośne i krwawe. Około roku 1817 obywatel U... w województwie nowogródzkim pobił na zajeździe cały garnizon nowogrodzki i dowódców zabrał w niewolę.

KSIĘGA DZIESIĄTA

w. 111:

Ten za bitwę pod Nowi, ten za Prejsiż-Iłów.

Zapewne Preussisch-Eylau.

w. 810:

Targowiczanie potem chcieli mnie zaszczycić.

Zdaje się, że Stolnik zabity został około roku 1791, za czasów pierwszej wojny.

KSIĘGA JEDENASTA
w Treści:

Wróżby wiosenne.

Jeden historyk rosyjski w podobny sposób opisuje wróżby i przeczucia ludu moskiewskiego przed wojną 1812.

w. 12:

Nie biegło na ruń...

R u ń jest to zieleniejąca się ozimina.

w. 43:

Wszyscy na północ: rzekłbyś, iż wonczas z wyraju...

W y r a j w mowie gminnej znaczy właściwie czas jesienny, kiedy ptaki wędrowne odlatują; lecieć na wyraj — jest to lecieć w kraje ciepłe. Stąd przenośnie nazywa lud wyrajem kraje ciepłe i w ogólności jakieś kraje bajeczne, szczęśliwe, za morzami leżące.

w. 117:

Księga ta miała tytuł: *Kucharz doskonały.*

Książka teraz bardzo rzadka, przed stu kilkudziesiąt laty wydana przez Stanisława Czernieckiego.

w. 121:

Którym się Ojciec Święty Urban Ósmy dziwił.

Opisywano wielekroć i malowano ową legacją rzymską. Ob. *Kucharz doskonały,* przemowa: «Ta legacya wszystkiemu zachodniemu Państwu wielkiém będąc podziwieniem, ogłosiła w rozum nieprzebranego Pana jako i splendor domu i apparament stołu..., że jeden z książąt Rzymskich rzekł: Dziś Rzym szczęśliwy, mając takiego Posła». — Nb. Czerniecki sam był kuchmistrzem Ossolińskiego.

w. 218:

Zgodnie konfederackim marszałkiem obrany.

W Litwie za wkroczeniem wojsk francuskich i polskich zawiązano po województwach konfederacje i obrano posłów na sejm.

w. 246:

On to pod Hohenlinden...

Wiadomo, że pod Hohenlinden korpus polski pod dowództwem jenerała Kniaziewicza zdecydował wygranę.

KSIĘGA DWUNASTA

w. 28:

Jest podanie, że książę Radziwiłł-Sierota...

Radziwiłł-Sierota odbył dalekie podróże i wydał opis peregrynacji swojej do Ziemi Świętej.

w. 159:

Ale tymczasem wielki serwis barwę zmienił.

W szesnastym i na początku siedmnastego wieku, w epoce kwitnienia sztuk, uczty nawet były przez artystów urządzane, pełne symbolów i scen teatralnych. Na sławnej uczcie, danej w Rzymie dla Leona X, znajdował się serwis przedstawiający z kolei cztery pory roku, który służył zapewne za wzór Radziwiłłowskiemu. Zwyczaje stołowe zmieniły się w Europie około połowy wieku ośmnastego; w Polszcze najdłużej przetrwały.

w. 189:

Czy to Pinety Panu dał w służbę swe bisy?

Pinety, sławny na całą Polskę kuglarz, kiedy u nas gościł, nie wiemy.

w. 356–357:

«Czy ja Cybulski? rzecze na to Klucznik z żalem,
Co żonę przegrał, grając w mariasza z Moskalem».

Znajoma na Litwie pieśń żałośna o pani Cybulskiej, którą mąż w karty przegrał Moskalom.

w. 405:

Warunkiem intercyzy wyrzec się kontusza.

Moda przebierania się w suknie francuskie grasowała na prowincjach od roku 1800 do 1812. Najwięcej młodzieży przebrało się przed ożenieniem na żądanie narzeczonych.

w. 480:

I o kłótni Rejtana z książęciem Denassów.

Historia sporu Rejtana z książęciem de Nassau, przez Wojskiego nie doprowadzona do końca, wiadoma jest z tradycji. Umieszczamy koniec jej kwoli

ciekawemu czytelnikowi: Rejtan, obruszony przechwałkami książęcia de Nassau, stanął obok niego na przesmyku; właśnie ogromny odyniec, rozjuszony strzałami i szczwalnią, leciał na przesmyk. Rejtan wyrywa książęciu z rąk strzelbę, swoję ciska o ziemię, a ująwszy oszczep i podając drugi Niemcowi: «Teraz, rzekł, obaczym, kto lepiej robi spisą». Już odyniec wpadał, kiedy Wojski Hreczecha, opodal stojący, trafnym strzałem zwierza powalił. Panowie zrazu gniewali się, potem pogodzili się i hojnie wynagrodzili Hreczechę.

w. 555:

Kiedy pan Karp nieboszczyk włościan wyswobodził.

Rząd rosyjski nie uznaje ludzi wolnych prócz szlachty. Włościanie, przez właściciela uwolnieni, są zaraz zapisywani w skazki dóbr stołowych cesarskich i zamiast pańszczyzny muszą opłacać podatek zwiększony. Wiadomo, że w roku 1818 obywatele guberni wileńskiej uchwalili na sejmiku projekt uwolnienia wszystkich włościan i wyznaczyli w tym celu delegacją do cesarza; ale rząd rozkazał projekt umorzyć i nigdy więcej o nim nie wspominać. Nie ma innego sposobu uwolnić człowieka pod rządem rosyjskim, tylko przybrać go do familii. Jakoż wielu tym sposobem uszlachcono z łaski lub za pieniądze.

АДАМ МІЦКЕВІЧ

ПАН ТАДЭВУШ

АБО

АПОШНІ НАЕЗД У ЛІТВЕ

Шляхецкая гісторыя
з 1811 і 1812 гг.
у дванаццаці кнігах
вершам



КНІГА ПЕРШАЯ • ГАСПАДАРКА

Змест: Вяртанне паніча. Першая сустрэча ў пакойчыку, другая за сталом. Важнае павучэнне Суддзі аб ветлівасці. Палітычныя заўвагі Падкаморага пра моды. Пачатак спрэчкі за Кусага і Сокала. Нараканні Войскага. Апошні Возны трыбунала. Позірк на тагачаснае палітычнае становішча Літвы і Еўропы.

Літва! Ты, як здароўе ў нас, мая Айчына!..
Што варта ты, ацэніць той належным чынам,
Хто цябе ўтраціў. Вось красу тваю жывую
Зноў бачу і апісваю, бо скрозь сумую.

Святая дзева, што бароніш Чанстахову
І ў Вострай браме свеціш, што ўзяла ў ахову
Наш слаўны Навагрудак з добрым верным людам,
Як мне жыццё ў дзяцінстве ты вярнула цудам,
(Калі ў адчаі маці пад тваю апеку
Мяне здала, і мёртвае я ўзняў павека
І зразу змог пайсці к тваіх святынь парогу
За вернутыя сілы даць падзяку Богу),
Так цудам зноў нас вернеш на Айчыны ўлонне.
Тым часам пераносъ дух сумны мой сягоння
У край лясных узгоркаў і лугоў духмяных,
Шырока над блакітным Нёмнам разасланых,
Да каляровых ніў, дзе жыта серабрыцца
І залачоная калышацца пшаніца,
Дзе грэчка, быццам снег, свірэпка, як бурштыны,

І дзяцельнік гарыць румянцамі дзяўчыны.
А на мяжы, што стужкай абвіла палеткі,
Маўкліва грушы ціхія паселі зрэдку.

Між гэтых ніў калісьці, над руччом на ўзвышшы
ў бярозавым гаі, у дрэў густых зацішшы
Стаяў на падмуроўцы панскі дом драўляны:
Здалёк бялелі вокны, сцены і парканы,
Бо топалі, што двор ад ветру засланялі,
Іх бель на цёмным лісці рэзка адцянялі.
Той дом, хоць невялікі, але мілы воку;
Ля пуні тры стагі стаяць непадалёку
Снапоў, якіх падстрэшша памясціць не можа.
Відаць, уся акруга тут багата збожжам,
Відаць па ліку бабак сцесненых, як зоры,
Па колькасці плугоў, што йшлі уздоўж разоры
Па чарназёмным, пэўне, дворных ніў папары,
Дагледжаным старанна скрозь на ўсім абшары
І ўзрыхленым не горай агародніх градак,
Што тут ва ўсім дастатак, рупнасць і парадак.
Расчыненая брама ўсім апавяшчае,
Што рады тут гасцям, і ў госці запрашае.

Якраз паніч з'явіўся ў параконнай брычцы:
Аб'ехаў двор, каб каля ганка запыніцца,
З сядзення злез, а коні з брычкаю тым часам
Пайшлі шчыпаць траву ўздоўж плоту самапасам.
Дом быў пусты, ўваход праз ганак быў замкнёны
На зашчапкі, а тыя — палачкай праткнёны.
Прыезджы не пайшоў да чэлядзі пытацца,
Убег, адпёршы, ў дом — хацеў з ім прывітацца,
Даўно не бачыў дому, бо далёка ў месце
Канчаў навукі і канца прыждаў урэшце.
Убегшы, прагна азіраецца навокал
І, як старых сяброў, вітае чула зрокам
Шпалеры, мэблю, ўжытку хатняга прадметы,
Якімі змалку быў акружаны, сагрэты.
Ды ўсё здалося меншым — сцены быццам селі,
Аднак партрэты даўнія на іх віселі.
Касцюшка тут у простай кракаўскай чамары
Аберуч меч дзяржыць, узняўшы вочы ў хмары.

Вось так ён прысягаў за родны край любімы
Загінуць ці прагнаць трох ворагаў радзімы.
Далей сядзіць, апрануты па-польску, ў скрусе
Пан Рэйтан, бо свабоду край утраціць мусіў,
Трымае востры нож, накіраваны ў лона,
А перад ім «*Федон*» і жыццяпіс Катона.
Далей Ясінскі, юны прыгажун схмурнелы,
А поруч Корсак, сябра неадступны, смелы —
Сякуць на шанцах Прагі маскалёў заўзята,
А Прага ўжо навокал полымем абнята.
Курантавы гадзіннік — сябра год дзіцячых —
У шафе каля нішы з радасцю убачыў
І зараз жа ўхапіўся за шнурочак з кісцю,
Каб марш Дамброўскага пачуць, як і калісьці.

Праз дом увесь прабег, шукаючы вачыма
Пакой, дзе жыў перад дзесяткам год хлапчынам.
Убег, ды адступіўся — веры даць не хоча
Сваім вачам: яго пакой — пакой жаночы!
Цікава, чый? Здаўна быў дзядзька адзінокім,
А цётка ў Пецярбургу дзесь жыла далёкім,
І не жыла ж тут ахмістрыня! На раялі
Паперы, ноты, кнігі абы як ляжалі.
Усё раскідана нядбайна, але міла,
Тут, пэўне, не старая ручка лад чыніла!
Вось і сукенка белая з калочка знята,
Чакае некага, на крэсла згіб напята,
А з вокнаў шлюць прыемны водар па пакоі
Вазонікі герані, астраў і леўкоі.
Прыезджы ля акна спыніўся — што за дзіва?
На месцы ўзмежка саду з крапівой куслівай
Цяпер гародчык быў маленькі і стракаты,
Травы ангельскай повен і пахучай мяты.
Драўляны нізкі плоцік бег цераз палетак,
Пакрыты стужкамі іскрыстых ясных кветак.
Відаць, былі нядаўна градкі паліваны,
Стаяў яшчэ кубелец тут з вадой драўляны;
Але гароднічкі няма — кудысь прапала,
Відаць, вось-вось пайшла: яшчэ не перастала
Хістацца брамка, вунь і след віднее ножкі —
Відаць, была без чаравічка і панчошкі.

На белі дробнага пяску, сказаў бы снегу,—
Выразны лёгкі след; пакінуты з разбегу,
Ён тут ад нейкіх ножак дробненькіх застаўся
Таго, хто бегучы, зямлі ледзь дакранаўся.

Спыніўся ля акна, задумаўся прыезджы
І доўга удыхаў тых кветак водар свежы.
Нагнуўся нізка над фіялкі кволым кустам,
Па сцежках бег цікавым вокам, але пуста
Было там. На слядах тады ізноў спыняўся
І адгадаць, чые яны былі, стараўся.
Падняў раптоўна вочы, бачыць — на паркане
Стаіць дзяўчына ў белым ранішнім убранні,
Якое стан яе ледзь да грудзей хавае,
А шыю лебедзя і рукі адсланяе.
Ліцвінка ходзіць гэтак толькі зрання ўдому
І ў тым мужчыне не пакажацца чужому,
Дык хоць адна была, а рукі скрыжавала,
Каб тое засланіць, што сукня не хавала.
А валасы, не ў буклях, але вузялкамі
Пазвязваныя густа з белымі стручкамі,
Галоўку дзіўна упрыгожвалі — на сонцы
Свяцілі, як карона на святой іконцы.
Аблічча не было відаць. А той хвіліне
Яна глядзела ў поле. Убачыўшы ў даліне
Кагось, са смехам жвава пляснула ў далоні,
Зляцела з плоту белай птушкай і ў разгоне
Шугнула цераз кветкі, плоцікі, дарожкі
І ўздоўж прыстаўленай да падаконня дошкі,
Пакуль ён схамянуўся, ціхай яснай зданню
У акно ўляцела, быццам месячнае ззянне;
Узяла сукенку, бегла да люстэрка смела,
Ды госця ўбачыла. З рук сукня паляцела,
Сама ж яна ад страху раптам пабялела.
Твар хлопца загарэўся чырванню жывою,
Як хмарка, калі раннем стрэнецца з зарою.
Прыжмурыў вочы падарожны, засланіўся,
Хацеў перапрашаць, тлумачыць, пакланіўся,
Ступіў назад; дзяўчына ўскрыкнула нязвонка,
Як быццам бы дзіця, жахнуўшыся спрасонку.
Спалохаўся паніч, зірнуў: няма дзяўчыны.

Збянтэжаны пайшоў і нейкія хвіліны
Зусім не ведаў, ці яму цяпер смяяцца
З таго спаткання, цешыцца ці мо стыдацца.

А ў гэты час фальварка ўвагі не мінула,
Што брычка з новым госцем к ганку завярнула.
І ўжо, старым звычаем, коней распрагаюць,
Даюць ім сена і аброку засыпаюць,
Бо не хацеў Суддзя, паводле новай моды,
Скіроўваць у карчму сваіх гасцей падводы.
Хоць слугі не сустрэлі госця ў той жа хвілі,
Не думай, што ў Суддзі ўсе абы-як служылі —
Яны загаду пана Войскага чакалі,
Які за домам быў, дзе страву гатавалі.
Намеснік ён гаспадара, ў адсутнасць пана
Яму прымаць гасцей спрадвеку права дана.
(Сваяк далёкі пана, верны сябра дома),
Гасця заўважыў ён у той жа час, вядома,
Але не мог яму ў кужэльным паказацца,
Дык хуценька тайком пайшоў перапранацца
У вопратку, нарыхтаваную ўжо зрання
На час вячэры між чужых паноў і паняў.

Пазнаў здалёк пан Войскі, стаў, раскрыжаваўся
І з крыкам і цалункамі з гасцём вітаўся.
Гаворка пачалася хуткая — такая,
Якая многіх год падзеі закранае
І вяжа ў рад кароткіх зблытаных пытанняў,
Уздыхаў, выкрыкаў і новых прывітанняў.
Калі ўжо Войскі ўволю распытаў, «навохаў»,
Пачаў навіны дому выяўляць патроху.

«Ну добра, мой Тадэвуш (гэтак называлі
Гасця, яму імя касцюшкаўскае далі
На памятку, што ў час ваенны нарадзіўся),
Ну добра, мой Тадэвуш, што да нас з'явіўся,
Калі гасцюе ў нас паненак так багата,
Бо дзядзька ўжо збіраецца цябе засватаць.
А выбраць ёсць з чаго: у нас тут з'езд, спатканне
Запрошаных сюды на суд размежавання:
Старая спрэчка з Графам вырашацца будзе,

А заўтра, кажуць, і пан Граф сюды прыбудзе.
Пан Падкаморы з жонкай, з дочкамі прыехаў.
Вось моладзь пастраляць у лес пайшла на ўцеху,
А дамы і старыя ля жняцоў, няйначай,
Пад лесам, мо чакаюць юнакоў з удачай.
Калі ахвота, пройдземся, сустрэнем скора
І дзядзьку, і шаноўных дам, і падкаморых».

Ідуць Тадэвуш з Войскім сцежкаю па полі
Пад лес, а гутаркі ніяк ім не даволі.
А сонца круг свой да краёў нябёс каціла,
Яно слабей ужо, але шырэй свяціла,
Пачырванеўшы, як здаровае аблічча
Гаспадара, якога пасля працы кліча
Спачынак і спакой. І вось круг прамяністы
Спускаецца на бор, а шэры змрок імглісты,
Запоўніўшы вяршыні і галлё да краю,
Лес звязвае ў адно, нібы яго злівае.
І бор чарнеў накшталт вялізарнага гмаху,
Над ім гарэла сонца, як пажар на даху,
Пасля апала ўглыб, паміж камлёў іскрыцца,
Як свечка вечарам са шчылін аканіцы,
І пагасае. Ўміг сярпоў звон стаў спыняцца,
І граблі ў лузе больш ужо не мітусяцца,
Бо пан Суддзя здаўна даў гэткае ўказанне,
Каб працу разам з сонцам кідалі сяляне.
«Пан свету знае, колькі працаваць нам трэба.
Калі яго работнік, сонца, сыдзе з неба,
Пара і селяніну падавацца з поля»,—
Так пан Суддзя казаў заўжды, а пана воля
Выконвалася аканомам пільна, свята.
Бывала, сцірта ў полі толькі што пачата,
Калёсы ж ледзь не ўлегцы едуць праз палетак;
І цешацца валы, што везці лёгка гэтак.

А госці ўжо вярталіся вясёлай грамадою:
Наперад — дзеці пад наглядам чарадою,
За імі пан Суддзя з Падкамарынай крочыў,
А побач — Падкаморы ў акружэнні дочак.
Паненкі — за старэйшымі, а моладзь збоку
Ці ззаду за паненкамі, хоць на паўкроку

(Такі ўжо звычай). І хоць там не заклікалі
Нікога да парадку, пар не расстаўлялі,
Ды кожны сам міжвольна пільнаваўся ладу,
Які ў Суддзёвым доме меў здаўна уладу —
Усе звяртаць увагу тут былі павінны
На ўзрост, пасаду, род, заслугі для Айчыны.
«Народы славяцца,— казаў Суддзя,— парадкам
І гінуць з даўняе традыцыі упадкам».
І ўсе звыкаліся з такім жыцця укладам,
Хоць ён не вымушаўся просьбай ці загадам.
Дык той, каму ў Суддзі гасціць пашанцавала,
Прыстойнасць шанаваў, што ў доме панавала.

Не доўга пан Суддзя з пляменнікам вітаўся:
Руку падаў пацалаваць, крыху прыўзняўся
І, ў лоб пацалаваўшы, мовіў штосьці —
Даўжэйшай гутарцы перашкаджалі госці.
Аднак сляза, якую хутка скінуў з вока,
Казала, як любіў Тадэвуша глыбока.

Услед за панам з паш, палёў, лугоў і з бору
Усё вярталася і ў стайню, і ў абору.
Вось прэцца ў вулку гурт авечак шматгаловы
З бляяннем, а за ім тырольскія каровы
У пыле крочаць пры званочкаў перазвоне,
А з луга табуном з іржаннем скачуць коні.
Усе бягуць да студні, што свірснёй ківае
Са скрыпам і ваду ў карыты налівае.

Суддзя, хоць змораны, ды цвёрдаю ступою,
Пакінуўшы гасцей, ідзе да вадапою.
Ён кожны вечар на жывёльны двор загляне,
Каб ведаць, у якім яго жывёла стане.
І гэтага нагляду слугам не паручыць,
Бо знаў: гаспадарова вока коней тучыць.

Пан Войскі і Пратазы, ўзяўшы ў рукі свечкі,
У сенях развялі гаворку кшталтам спрэчкі,
Бо Возны ўпотай, як падаўся Войскі з дому,
Сталы з вячэрай знесці загадаў к пустому
Пад лесам замку, ў старасвецкія руіны,

І там парасстаўляць, не трацячы хвіліны.
Пашто пярэбары? Пан Войскі — злы, крывіўся,
Суддзю перапрашаў. І пан Суддзя здзівіўся,
Ды зроблена, час позні, як цяпер вяртацца?
Рашыў перапрасіць гасцей і ў глуш падацца.
А Возны па дарозе ўжо Суддзі тлумачыў,
Чаму ён панскія парадкі перайначыў:
Няма ў двары ніводнае святліцы,
Дзе б гэтулькі гасцей магло зараз змясціцца,
А ў замку тая зала ў самы раз падходзіць —
Скляпенне ж цэлае, раскол сцяны не шкодзіць,
Без шыбаў вокны — ў летні час не перашкода,
Затое побач пограб — чэлядзі выгода.
Так кажучы, міргаў Суддзі — убачыш з міны,
Што меў ён і хаваў больш важныя прычыны.

А замак быў за домам — тысячы дзве крокаў,
Ён веліччу сваёй паважнай вабіў вока,—
Калісьці ўласнасць слаўнага Гарэшкаў роду.
Загінуў пан падчас дзяржаўнага разброду,
Дык і маёмасць разляцелася без ладу:
Канфіскавана, частка трапіла да ўраду,
Нямала перайшло ў крэдытарскія рукі,
А рэшту занялі пляменнікі ці ўнукі,
А замка ўсе зракліся, бо ў шляхоцкім стане
Нялёгка класці грошы на яго ўтрыманне.
Аж Граф, сусед — багач, Гарэшкам родзіч некі,
Паніч, які ледзь толькі выйшаў з-пад апекі,
Прыбыўшы з вяжа, прыгледзеўся да мура,
Што нібы ў ім гатыцкая архітэктура.
Хоць пан Суддзя яму не раз даказваў потым,
Што дойлід з Вільні быў, таму не мог быць готам,
Граф замка зажадаў. А ў гэтым самым часе
Ахвота тая ж і ў Суддзі чамусь знайшлася.
Судзіцца сталі ў земстве, потым і пры ўрадзе
Ў сенаце, зноў у земстве, у губернскай радзе.
Урэшце, пасля коштаў, актаў і блуканняў
Прыйшла ўся справа зноў на суд размежавання.

І праўду Возны гаварыў, што тая зала
Памесціць і юрыстаў, і гасцей нямала,

Была ж бо велічная, з выгнутым скляпеннем,
З філярамі, з падлогай высланай каменнем.
На сценах гладкіх, стыль якіх быў просты, строгі
Тырчэлі навакола коз, аленяў рогі,
Пад імі подпісы: калі, дзе, кім забіты.
А гербы, ўмацаваныя ў сцяны граніты,
Стральцоў адважных славу неслі ў пакаленні.
Яснеў Гарэшкаў герб — Паўкозіц на скляпенні.

Парадкам госці увайшлі і ў поўным зборы.
За стол з кампаніі перш рушыў Падкаморы —
За важны чын і ўзрост яму быў гонар гэткі,
Ён дамам кланяўся, старым і малалеткам.
Пры ім стаў ксёндз-манах, Суддзя пры бернардыне.
Манах прамармытаў малітву па-латыні,
Мужчыны выпілі гарэлкі, ўсе паселі
І моўчкі жвава халаднік літоўскі елі.
Тадэвуш, хоць юнак, але па праве госця
Высока сеў ля дам пры боку ягамосця,
Але між ім і дзядзькам месца пуставала,
Як быццам госця нейкага яшчэ чакала.
На дзверы, то на крэсла дзядзька азіраўся,
Нібы прыходу нечыйга ўсё спадзяваўся.
Тадэвуш стаў здзіўляцца з дзядзькавых паводзін
І зрок за ім з дзвярэй на крэсла пераводзіў.
Аж дзіва! Гэтулькі было паненак вокал,
Што нават мела б дзе спыніцца прынца вока —
Прыгожыя і роду не абы-якога,
А позірк юнака — там, дзе няма нікога.
Загадка-крэсла гэта цягне неўзаметку.
Няўважлівы, амаль не гляне на суседку,
Ледзь колькі слоў прамовіў да Падкамаранкі,
Талерак не змяніў ёй, не падаў ёй шклянкі;
Паненак ветлівай бяседай не займае,
Сталічнай адукацыі не праяўляе.
Яго пустое месца, як прынада, вабіць,
Ды ўжо яно ад думак не пустое, мабыць,—
Па ім скакалі незлічоныя здагадкі,
Нібы падчас дажджу па лузе жабяняткі;
Між іх — адна ўсё постаць, быццам дзе ў затоне
Азёраў лілія, што свеціць белай скронню.

Падалі страву трэцюю. Пан Падкаморы
Віна падліў дачушцы Ружы і ў дакоры,
Другой падсунуўшы талерку з агуркамі,
Сказаў: «Што ж, трэба мне старэчымі рукамі
Служыць вам, дочкі». Ўзняўся рух між панічамі,
Што нетактоўнасці сваёй не прыкмячалі.
Суддзя тым часам, на Тадэвуша зірнуўшы
І адвароты кунтуша крыху загнуўшы,
Наліў віна і так пачаў: «Вось мы ў сталіцу,
Па новай модзе, моладзь аддаём вучыцца
І не пярэчым, што сыны і нашы ўнукі
Больш за старэйшых маюць кніжнае навукі,
Але, па-мойму, моладзь траціць шмат на гэтым,
Што школы ў нас не вучаць жыць з людзьмі і светам.
У панскі двор ішлі мы ў маладыя годы,
Я сам быў дзесяць год прыдворным Ваяводы,
Ад бацькі вашага прымаў я настаўленні
(Тут Падкаморага пацісную за калені),
Яго няспынная парада і апека
З мяне дзяржаўнага зрабіла чалавека.
Шаную памяць я яго так, як нікога,
І за ўпакой яго душы малю век Бога.
І калі менш за іншых змог я навучыцца
І вось, вярнуўшыся дамоў, ару зямліцу,
У час, калі другія з ласкі Ваяводы
Дабіліся чыноў, пашаны, ўзнагародаў,
Прынамсі, тое вынес, што ў мяне тут дома
Сустрэнуць кожнага заўжды, як вам вядома,
З пашанай, ветліва. Няхай жа моладзь знае,
Што ветлівасць — навука ды і не малая,
Навука трудная, бо тут не ў гэтым справа,
Каб толькі дзе ўхмыльнуцца, ножкай брыкнуць жвава,
Такую ветлівасць назваў бы я мяшчанскай,
Але не старапольскай і не панскай.
Усіх трэ' шанаваць, ды кожнага іначай:
Адна ёсць ветлівасць у гутарцы дзіцячай,
Другая ў мужа з жонкай, між слугой і панам,
І ў кожнай з іх адценне іншае схавана.
Дык трэба доўга, пільна наглядаць, вучыцца,
Каб потым пры здарэнні ў чым не памыліцца.
Вучыліся ж даўней, а панскія ўспаміны

Бывалі ў нас жывой гісторыяй краіны
Так, як шляхоцкія — гісторыяй павету.
Такія гутаркі таксама мелі мэту
Адзначыць, што брат-шляхціц — знаны і ў пашане,
А ён, глядзіш, з таго далікатнейшым стане.
Сягоння чалавека не пытай аб родзе:
Хто ён? дзе жыў? ці што рабіў? Па новай модзе,
Абы не шпег ды не ў рыззі, дык кожны прыме
Яго цяпер. Як той Веспазіян у Рыме,
Не нюхаў грошай, не пытаў аб іх крыніцы.
Вось так і родам перасталі ганарыцца:
Хто важны, на кім штэмпель, той у нас харошы.
Сяброў цяпер шануюць, як габрэі грошы».

І тут Суддзя ўсіх змераў вокам па парадку,
Бо хоць заўсёды гаварыў разумна, гладка,
Ды ведаў, што у моладзі цярпення мала,
Дык мо знудзілася ўжо, слухаць перастала,
Але ўсе слухалі, маўчалі ўсе глыбока.
Тады ён Падкаморага спытаўся вокам,
А той маўчаў і не спяшаўся з пахвалою,
І толькі патакаў паважна галавою.
Такі дазвол працягваць прачытаўшы з твару,
Суддзя падліў віна гасцю, сваю ўзяў чару
І так прадоўжыў: «Ветлівасць — рэч немалая,
Яно бо чалавеку зважыць дазваляе
Другіх людзей узрост, заслугі, род, асвету
І ўласную сваю цану пазнаць праз гэта.
Свайго цяжару мы датуль пазнаць не зможам,
Пакуль каго супроць на шалі не паложым.
Але з увагай асаблівай і няспыннай
Пра ветлівасць к жанчынам моладзь дбаць павінна,
Тым больш, калі дом знатны і фартуны дбаласць
Ўпрыгожвае краса прыродная і ўдаласць.
Адтуль шлях да афектаў, а далей, не скрыю,—
Саюз дамоў. Так колісь думалі старыя.
Дык вось...» Тут пан Суддзя насунуў грозна бровы
І кінуў на Тадэвуша пагляд суровы,
Відаць, што падыходзіў к вывадам прамовы.

Ды ў табакерку залатую Падкаморы

Пастукаў і сказаў: «Даўней было шмат гарай!
Цяпер ці мода ўсіх вядзе другой дарогай,
Ці моладзь лепшая,— менш прыкладу благога.
Вось я успомніў зараз з гэтае нагоды
Эпоху панавання ў нас французскай моды,
Калі панічыкаў разбэшчаная зграя
ўварвалася з чужыны к нам, накшталт нагаяў,
І ганіць пачала законы, веру ў Бога
І вопратку — усё да самага малога.
Аж жаль было глядзець на гэтых неданоскаў,
Што гаварылі ў нос, а то й зусім бязносых.
Ад іх пайшлі ў народ брашуры і газеты
З законам новай веры, права, туалетаў.
І мелі ж моц яны ў людзей праз тую моду,
Бо калі Бог ссылае кару для народу,
То ўперад розум адымае грамадзянам.
Дык вось, адпору не было хлюстам паганым
І, як чумы, народ збаяўся баламутаў,
Бо ўжо ўнутры сябе адчуў расткі атруты.
На моднікаў крычалі, а праз час каторы
Мянялі мову, веру, звычаі, уборы.
Быў гэта карнавальны маскарад, сваволле,
Пасля чаго настаў вялікі пост — няволя.

У час майго маленства, у павет Ашмянскі
У дом маіх бацькоў прыбыў аднойчы панскі
Сынок, сусед Падчашыч, на французскай брычцы.
Ён першы ў нас стаў жыць па чужаземнай звычцы.
Народ хадзіў за ім, як за якім рарогам,
Зайздросцілі ўсе тым, перад чыім парогам
Спынялася яго двухкольная дрындулька,
Якую называлі ў той час карыюлькай.
Заместа лёкаяў — сабачак ззаду пара,
На козлах — немец, як драўляная пачвара:
Панчохі на худых нагах, як тычкі ў хмелі,
А клямары камашаў серабром блішчэлі.
Каса ад парыка ў гарбайталі з прарэхай...
Старыя з той павозкі пырскалі ад смеху,
Сяляне аж хрысціліся: маўляў, па свеце
Венецкі чорт у швабскай гойсае карэце.
Падчашыча апісваць — цяжкае заданне,

Даволі, што нам здаўся чортам, малпай, зданню.
Парык, якім ён выхваляўся ўсюды многа,
Мы прыраўноўвалі да каўтуна рудога.
Калі хто і лічыў, што польскае убранне
Шмат прыгажэйшае за моды малпаванне,
Маўчаў тады, бо моладзь подняла б трывогу,
Што ён адстаў, з прагрэсам не ступае ў ногу.
Вось гэтак модзе той пракладвалі дарогу!

Падчашыч аб'явіў, што новыя рэформы
Праводзіць будзе, дасць жыццю другія формы,
Тлумачыў, што ў той час французскія пісакі
Адкрылі, быццам людзі між сабой аднакі,
Хоць гэта сказана даўно ў святым законе
І кожны ксёндз гаворыць тое ж на амбоне.
Тут справа не ў навуках, але ў іх здзяйсненні!
Але ў той час былі ўсе ў гэткім зацямненні,
Што ўжо ніхто не верыў ні ўва што на свеце,
Пакуль таго ў французскай не чытаў газеце.
Падчашыч, пры ўраўненні, тытул меў маркіжа,
А тытулы, вядома, прыбылі з Парыжа,
А ў той час самы модны тытул быў маркіжа.
Пазней, па новай модзе, тытул той быў зняты,
І пан маркіж прысвоіў тытул дэмакрата,
А ўрэшце, новай модай, за Напалеонам,
Прыехаў дэмакрат з Парыжа ўжо баронам.
Ка́б жыў даўжэй, дык можа б новай альтарнатай
Перахрысціўся б потым зноўку ў дэмакрата.
Парыж мяняе моду і хвалу ёй трубіць,
А што француз змудруе, тое ў нас палюбяць.

Дык дзякуй Богу, што калі ў нас хто за межы
Сягоння выязджае, дык не для адзежы,
Не ў пошуках законаў на чужых паліцах
Ці, скажам, вымаўлення па кафэ вучыцца.
У Францыі сучаснай, пад Напалеонам,
Няма дзе зараз разгуляцца пустазвонам,
Там — зброі гук, і нашы сэрцы б'юцца жвава,
Што зноў ідзе па свеце пра палякаў слава.
А слава ёсць, дык будзе і Рэч Паспаліта!
Бо дрэва волі ў лаўр бывае апавіта.

Ды сумна, што час цягнецца марудным крокам,
Бяздзейна, а яны ўсё так ад нас далёка!
Чакаць дадзела. Рэдка можна ўчуць навіну!
Вы, ойча Робак (зніжыў голас к бернардыну),
Я чуў, ізноў з-за Нёмна вестку атрымалі.
Мо вам сябры пра войска наша напісалі?»
«Ды не,— ксёндз Робак у адказ скрывіўся горка
(Відаць, што не цікавіла яго гаворка).—
Палітыкай нуджуся, а калі з Варшавы
Прыходзіць ліст, дык манастырскія ў ім справы,
Не след аб іх размову весці пры вячэры,
Ды ёсць тут свецкія, ім што да той паперы?»

Так кажучы, скасіўся трохі ўбок, дзе ў ліку
Гасцей сядзеў маскоўскі капітан, пан Рыкаў.
Стары салдат, ён быў у вёсцы на кватэры;
Суддзя праз ветлівасць прасіў яго к вячэры.
Еў Рыкаў смачна, у гаворку не мяшаўся,
Ды на ўспамін Варшавы зараз адазваўся:
«Пан Падкаморы! Ой вы! Пан усё цікавы
Пра Банапарта. Цягне ўсё вас да Варшавы!
Айчына! Га! Не шпег я, хоць па-польску ўмею.
Айчына! Я ўсё гэта добра разумею!
Я — рускі, вы — палякі, зараз не ваюем,
Бо — амністыцыюм, дык разам п'ём, балюем.
На фронце ў нас з французам часта, як брат з братам,
Гарэлку п'юць. А — ўра!— пачнуць страляць з гарматаў.
У нас ёсць прыказка: з кім б'ёмся, тога любім,
Або сказаць інакш: як любім — дык і чубім!
Вайна, па-мойму, будзе ў нас, бо да маёра
Плута прыбыў са штаба ад'ютант заўчора:
Да маршу рыхтавацца! Пойдзем ці пад турка,
Ці на француза. Ох, той Банапарт — фігурка!
А без Суворава ён можа нас патузаць.
У нас расказвалі ў паходзе на француза,
Што Банапарты чараваў, так і Сувораў
Стаў чараваць супроць французскіх загавораў.
Аднойчы ў час бітвы знік раптам Банапарты,
А ён, бач, лісам стаў. Уцяміў тыя жарты
Сувораў,— стаў хартом. Пачуў француз пагоню,
Катом зрабіўся, наш тады змяніўся ў поні.

Кніга пятая
Белая лілея

Книга пятая
Белая лилия

Księga piąta
Biała lilia

Дык гляньце ж, як закончылася гэта справа...»
Тут Рыкаў закусіў, і тут з чацвертай стравай
Слуга ўвайшоў, і дзверы адчынілі справа.

Ўвайшла прыгожая і маладая госця.
Сваім з'яўленнем нечаканым, прыгажосцю
Звярнула вочы ўсіх. Усе яе віталі,
Апроч Тадэвуша, відаць, здаўна ўжо знаді.
Яе і постаць зграбную, і бюст прывабны
Сціскаў ружовай сукні матэр'ял ядвабны.
Глыбокі горс, карункавы каўнер, рукаўкі
Кароткія. Круціла веер для забаўкі
(Бо душна не было), той веер залацісты
Пры кожным руху сыпаў зорак дождж іскрысты.
А ў косы, што сышліся ў круг, і ў завітушкі
Былі уплецены ружовыя істужкі,
З-паміж якіх брыльянт выглядваў ненарокам
І, як з каметы зорка, ззяў іскрыстым вокам.
Зусім парадны выгляд! Шэптаў адгалоскі
Пайшлі, што шыку лішне буднім днём для вёскі.
Не ўбачыш ножак, хоць кароткая сукенка,
Так хуценька перастаўляла іх паненка
І сунулася, быццам лялечка з батлейкі,
Якой, схаваўшыся, штукар кіруе нейкі.
Усіх паклонам лёгкім, бегучы, вітала,
Заняць жа тое месца, што яе чакала,
Было нялёгка. Нехапіла многім крэслаў,
Дык чэлядзь да сталоў чатыры лавы ўнесла.
Выходзіла: рад рушыць ці скакаць праз лаву.
Ўшчамілася між радам і сталом і жвава,
Заваяваўшы шлях сабе нялёгкі гэты,
Як шар більярдны, пакацілася да мэты,
Тадэвуша кранула, бо ў адно імгненне,
Заблытаўшы фальбану ў нечыя калені,
Нязручна паслізнулася і ў той хвіліне
Знайшла сабе апору ў маладым хлапчыне.
Перапрасіўшы ветліва, на месца села
Між ім і дзядзькам, але есці не хацела.
Ківала веерам у розныя кірункі,
То зноў каўнерыка брабанцкія карункі
Пагладжвала, то лёгкім дотыкам далоні

Кранала валасы і стужкі каля скроні.

Гаворка запынілася, усе маўчалі
Хвіліны тры, а потым ціха зашапталі,
І гэтак пачалося гукаў нарастанне.
Мужчыны абмяркоўваць сталі паляванне:
Асэсар з Рэентам, стралкі два і гулякі,
Узнялі шум наконт куртатага сабакі,
Якім пан Рэент, гаспадар яго, хваліўся
І ўсё цвярдзіў, што ён за зайца перш хапіўся.
А вось Асэсар са свайго даводзіў боку,
Што гэту славу заслужыў яго хорт Сокал.
Дапытваліся ў іншых, але розна ў залі
Пра Сокала і курту госці меркавалі,
Адны як знатакі, а іншыя як сведкі.
Суддзя паўголасам звярнууся да суседкі:
«Прабач, прашу, што мы з вячэрай не чакалі,
Не выпадала адкладаць, бо спагадалі,
Што госці стомленыя, ды і час не ранні.
Я думаў, мо не прыйдзеш на вячэру, пані».
І з Падкаморым пры напоўненым кяліху
Размову палітычную павёў паціху.

Калі ўсе зноў да страў вярнуліся з ахвотай,
Тадэвуш на суседку стаў глядзець употай.
Прыпомніў, што, не могучы вачэй адвесці
Ад крэсла, адгадаў, хто тут павінен сесці,
Дык чырванеў, бо ў сэрца краўся непарадак,
Хоць з ім разгадку ўбачыў тайнаў і здагадак.
Магчыма, суджана было, каб тут ля боку
Сядзела прыгажуня, стрэтая ў паўзмроку.
Прызнацца, паказалася вышэйшай быццам,
Але ж магла ад вопраткі перамяніцца.
І колер валасоў у той, нібы, не гэткі,
А ясна-залаты, а гэта — тып брунеткі.
Ды ў тым віна, магчыма, сонца немалая —
Яно ж так чырванню пры захадзе палае.
Тады не ўбачыў твару — вельмі хутка знікла,
Але яго ўяўляць ужо душа прывыкла.
Ён там угадваў чорненькія вачаняты,
Твар белы, вусны, быццам вішанькі-блізняты.

І тут убачыў тыя ж вусны, твар і вочы,
Ды вось з узростам думка зладзіць штось не хоча:
Гароднічка была дзяўчынкай загарэлай,
А гэта паняй вопытнай здалася, смелай,
Ды ў метрыкі красунь юнак не заглядае,
Для хлопца кожная жанчына маладая,
І ён прызнаць равесніцай любую можа,
Цнатлівай — кожную, што з выгляду прыгожа.

Тадэвуш, хоць налічваў год ужо дваццаты,
У Вільні жыў, дзіцём яшчэ адбыўшы з хаты,
Пад вокам у ксяндза, што меў заданне
Яму суровае, даўнейшае даць выхаванне.
Дык вось, прывёз Тадэвуш у свой дом айчынны
Жывое сэрца, ясны розум, дух нявінны
І з тым ахвоту немалую пасваволіць.
Ужо зараней ён рашыў сабе дазволіць
Нацешыцца даўно чаканаю свабодай.
Быў малады і неабдзелены прыродай:
Здароўем, сілай мог сапраўды ганарыцца.
Сапліцам зваўся, а вядома, што ў Сапліцаў
Мужчына кожны быў шыракаплечы, дужы,
Ваяка добры, хоць да кніг і менш дасужы.

Тадэвуш ад дзядоў сваіх не адрадзіўся:
І пешшу мог хадзіць, і на каня садзіўся.
Тупы не быў, ды ад вучобы ўзяў не многа,
Хоць дзядзька для яго не шкадаваў нічога.
Ён ахвотней страляў ці шабляй забаўляўся,
Бо для вайсковай службы змалку рыхтаваўся,
Каб быць у згодзе з бацькавай апошняй воляй.
Дык сумаваў па бубне, седзячы у школе.
Ды вось намер чамусьці колішні змяніўся,
І дзядзька даў наказ, каб ехаў, ажаніўся
І стаў гаспадаром. Казаў, што на пачатак
Яму дасць вёску, а пасля і ўвесь дастатак.

К Тадэвушу цягнулі гэтыя прычыны
Цікаўны зрок суседкі, ўважлівай жанчыны.
Яна памерала крытычным быстрым вокам
Яго плячыстасць, стан, грудзей разлёт шырокі,

Паглядвала на твар, што мігам загараўся,
Калі з яе вачыма хлопец сустракаўся,
Бо ўжо нясмеласць першая ў яго прапала.
Глядзеў ён вокам смелым, што агнём палала,
Глядзела і яна гарэзліва, заўзята,
І тлелі зрэнкі іх, як свечкі ў час ратаў.

Перш па-французску да яго загаварыла:
Прыбыў са школы, дык перш кнігі зачапіла,
А ўслед — пісьменнікаў і новыя выданні;
З яго адказаў зноў высноўвала пытанні.
А потым павяла гаворку аб культуры,
Мастацтве, танцах, музыцы, а на'т скульптуры!
Дала намёк, што знае пэндзаль, ноты, друкі.
Ажно аслупянеў Тадэвуш з той навукі,
Пабойваўся, каб так пасмешышчам не стацца,
Пачаў, як на экзамене, ўжо заікацца.
На шчасце, тут настаўнік мілы быў, не строгі:
Суседка разгадала гэтыя трывогі
І гутарку звяла з вышыняў і узлётаў
Да спраў вясковага жыцця, нуды, залётаў
І як праводзіць час, і чым заняцца,
Каб жыць і ў вёсцы весела, з нудой не знацца.
Тадэвуш пасмялеў, і справы беглі далей.
За паўгадзіны ўжо амаль сябрамі сталі,
З'явілася спрачацца, жартаваць патрэба.
Ўканцы паставіла пры ім тры галкі хлеба —
Асобы тры на выбар; першую ўзяў зблізку.
Падкамаранкі вочы апусцілі нізка,
А тая засмяялася ды не сказала,
Каго шчаслівая галушка азначала.

Іначай на другім канцы стала гулялі.
Там раптам Сокала староннікі паўсталі
І на прыхільнікаў куртатага усселі.
Вялікай стала спрэчка, дык ужо не елі,
А стоячы пілі; паток слоў звонка ліўся,
А Рэент найстрашней цецеравіўся,
І не было канца ўжо тому такаванню
І рук яго нястомнаму практыкаванню.
(Даўней быў адвакатам Рэент, пан Балеста,

І меў мянушку прапаведніка за жэсты.)
Дык зразу, падагнуўшы рук абедзвюх локці
І вострыя настаўіўшы на пальцах ногці,
Ён двух хартоў прысутным вобразна паказваў
І так заканчваў: «Вычха! мы пусцілі разам
Сабак, як быццам зразу два куркі рванулі
І з двух стваловў адначасова саданулі.
Пайшлі! А заяц — скок! і полем паімчаўся.
Сабакі вось! (гаворачы, перамяшчаўся
З рукамі ўздоўж стала, малюючы пагоню).
Сабакі — вось! ад лесу мо ўжо з гоні.
Тут Сокал — смык! Сабака добры, ды гарачы,
На палец вырваўся, не больш, я гэта бачыў
І ведаў, што дасць маху. Заяц справу знае,
Мастак! у поле рве, а псарня ж, брат, дурная!—
Уся — за ім! Ён гэта ўбачыў ды — пстрык! жвава
У правы бок, сабакі — ўслед за ім управа,
Дык ён улева раптам як махне два сусы!
Пакуль сабакі ўлева, ён — у лес, ■ Кусы
Мой — цап!!!» На стол далей пан Рэент нахіляўся
І пальцамі ў другі яго канец перамяшчаўся,
І «цап!» раўнуў Тадэвушу над самым вухам.
Ад гэтакага выбуху міжвольным зрухам
Тадэвуш і суседка пасярод размовы
Падскочылі, рвануўшы ўраз свае галовы
У два бакі, нібы вяршаліны двух хвояў
Пад націскам вятроў, і з-пад стала абое
Рванулі рукі, што ляжалі ўжо бок з бокам,
А твары чырванню набеглі ў момант вока.

Тадэвуш, каб збянтэжаным не паказацца,
Прамовіў: «Праўда, пане Рэент, мне, прызнацца,
Ваш Кусы спадабаўся, а калі ён хопкі...»
«Ці хопкі?— крыкнуў Рэент,— Гэтакі таропкі
Сабака ды каб быў не хопкі!» Дык нанова
Яму прыхільнае Тадэвуш мовіў слова
І шкадаваў, што бачыў гончага выпадкам
І часу мала меў, каб ацаніць парадкам.

Тут задрыжэў Асэсар, выпусціў кілішак
І ўбіў зрок у Тадэвуша, як базылішак.

Асэсар менш крыклівы, не такі рухавы
І шмат драбнейшае за Рэента паставы,
Быў страшны на шляхоцкіх зборышчах, бывала.
Казалі ўсе, што ў языку ён мае джгала,—
Такія ён прыдумваў анекдоты, жарты,
Што кожны з іх у каляндар быў трапіць варты,
А вострыя ж усе! Даўней ён жыў багата,
Ды спадчыну бацькоў і ўсю маёмасць брата
Пусціў, разгульваючы па вялікім свеце.
Цяпер служыў, каб быць хоць нечым у павеце.
Любіў ён паляванні ці то для забавы,
Ці мо таму, што голас труб і час аблавы
Яму прыносілі ўспамінаў шмат з былога,
Калі стральцоў прыдворных меў і гончых многа.
З той псярні толькі два сабакі засталіся,
А тут з іх аднаго прыніжваць узяліся.
Дык падышоў, твар, бакенбардамі пакрыты,
Пагладзіў і сказаў з усмешкай ядавітай:
«Бясхвосты хорт — як шляхціц, службай не заняты.
А пан сцвярджае, быццам лепшы хорт куртаты?
Па-мойму, хорт з хвастом заўсёды болей ходкі,
Лепш мо на суд здамося вашай, пане, цёткі.
Хоць пані Талімэна век жыла ў сталіцы
І ж нам нядаўна толькі рачыла з'явіцца,
Ды знае паляванне лепш, чым хто між намі,—
Навука ж бо прыходзіць і сама з гадамі».

Тадэвуш, на якога з боку інтрыгана
Зваліўся гром, падняўся з месца ўсхвалявана
І моўчкі стаў глядзець саперніку у вочы...
На шчасце, Падкаморы чхнуў магутна двойчы.
«Віват!» — сказалі ўсе. Ён дзякаваў ад сэрца
І пальцамі пачаў званіць па табакерцы,
Што з золата была, з брыльянтавай апраўай,
З партрэтам унутры манарха Станіслава —
Ад караля падарак бацьку ўласнаручны.
Яе ён даставаў у кожны момант зручны
І звонам знак даваў, што хоча адазвацца.
Дык вось замоўклі ўсе, не смелі больш спрачацца.
А ён сказаў: «Браты і шляхта дарагая!
Таму, што форум паляўнічых — поле з гаем,

Дык гэтых спраў у хаце я не вырашаю,
А пасяджэнне на наступны дзень склікаю,
Бо рэплік на сягоння ўжо даволі.
Гэй, Возны! Адклікай на заўтра справу ў поле.
А заўтра Граф і паляўнічых больш прыедзе.
І пан Суддзя падасца з намі. Так, суседзе?
І пані Талімэна, ўсе паненкі, пані
Захочуць, думаю, пабыць на паляванні,
І Войскі, спадзяюся, рушыць з намі з дому».
Пры гэтым табакерку падаваў старому.

А Войскі, седзечы ў канцы стала далёкім,
Сачыў за ўсім прыжмураным разумным вокам.
І хоць яму пытанні моладзь задавала,
Бо знаўцаў гэтакіх, як ён, было ўжо мала,
Сядзеў зусім без слоў і без ніякіх рухаў,
Табаку ў шчопцях важыў, а пасля панюхаў
І чхнуў, аж памяшканне загудзела рэхам.
Тады прамовіў з лёгкім, гаркаватым смехам:
«О, як жа сумна мне старому! Я ў здзіўленні!
Бо што ж сказалі б у мінулым пакаленні,
Каб у кампаніі такой, як тут мы бачым,
Пачаў мірыць хто спрэчку аб хвасце сабачым!
І што сказаў бы Рэйтан, каб цяпер прачнуўся?
Напэўна б у свой ляхавіцкі склеп вярнуўся!
Што б Несялоўскі нам сказаў, які трымае
І зараз мо найлепшыя на свеце зграі
І мае сотні дзве стралкоў, звычаем панскім,
І сецяў сто вазоў у замку Варанчанскім,
А столькі год, як той манах, сядзіць удому,
І нельга ўпрасіць яго ўжо ў лес нікому —
Белапятровічу і то паслаў адмову!
Чаго ж яму чакаць ад сённяшняга лову?
Было б прыгожа, каб ён, пан старога роду,
Ганяць па полі шаракоў, як вы, ўзяў моду!
У мой час, пане, згодна мовы паляўнічых,
Дзік, лось, мядзведзь ды воўк шляхоцкай быў здабычай,
А вось без рог, клыкоў ці кіпцюроў звярына
Была здабычаю слугі ды селяніна.
Ніхто з паноў не ўзяў бы стрэльбы ў рукі потым,
Калі б яе спаганіў нехта дробным шротам!

Трымалі і хартоў, ды толькі для забавы.
Калі з-пад ног шмыгне шарак пасля аблавы,
Тады за ім сабак, бывала, выпускалі,
А следам панічы на коніках скакалі
Пад вокам у бацькоў, што ў той бок ледзь глядзелі,
Ні то што каб пасля сварыліся, гудзелі.
Дык хай яснавяльможны Падкаморы рачыць
Адклікаць той загад і мне няхай прабачыць,
Што не магу на гэта ехаць паляванне
І што ніколі там нага мая не стане!
Завуць мяне Грачэха, а ад часаў Леха
За зайцам не ганяўся ні адзін Грачэха!»

Тут смех падняўся і гучаў праз час каторы.
Усталі з-за стала. Перш рушыў Падкаморы —
За важны чын і ўзрост яму тут гонар гэткі.
Ён кланяўся старым і дамам, і падлеткам.
За ім пайшоў манах, Суддзя — пры Бернардыне.
Суддзя ў дзвярах падаў руку Падкамарыне,
Тадэвуш — Талімэне, Асэсар — Крайчанцы,
А на канцы пан Рэент — Войскай Грэчашанцы.

Тадэвуш з маладзейшымі ў гумно падаўся,
Ды быў збянтэжаны і думкай заглыбляўся
У дзень мінулы і ў здарэнняў чаргаванне:
Суседка ля стала, а перад тым спатканне,
І асабліва слова «цётка» каля вуха
Дакучліва гудзела, быццам тая муха.
Хацеў пра Талімэну ў Вознага спытацца,
Але без сведкаў не ўдалося з ім спаткацца.
І Войскага не бачыў — той без затрымання
Падаўся за гасцямі, маючы заданне
Адвесці дамам і старэйшым для спачынку
Пакоі адпаведныя ў жылым будынку.
А маладых Тадэвушу загад быў даны
Завесці ў пуню, ў сена торп падрыхтаваны.

Праз паўгадзіны ціш была вакол, якая
Мо ў кляштары, як змоўкне звон начны, бывае,
І толькі вартаўнік у цемры адзываўся.
Паснулі ўсе. А сам Суддзя яшчэ не клаўся,

Яшчэ ён планаваў наступнага дня справы
І будучыя ў полі для гасцей забавы.
Загад даў войтам, ахмістрыні, аканомам
І ўсім, хто ў доме працаваў і па-за домам,
А потым у рахунках дня стаў разбірацца.
Нарэшце клікнуў Вознага: час распранацца.
Перш Возны пояс зняў з яго шырокі, літы
Работы слуцкай — кручаны і віты,
Залататканы з кутасамі шляк багаты,
А сподам чорна-серабрысты шоўк у краты.
Той пояс носяць толькі важныя асобы —
На светлы бок днём свят, на чорны — ў дні жалобы.
Тут толькі Возны ўмеў яго завязваць, скласці,
Дык вось складаў і бараніўся ад напасці:

«І што ж, што я сталы занёс сягоння ў замак?
Ніякіх страт, а цяжбе новы дан напрамак.
За замак жа вядзецца ў нас сягоння справа.
З сягонняшняга дня — у нас на замак права,
І як бы супраціўны бок не завіхаўся,
Я маю доказы, што замак нам дастаўся,
Бо хто гасцей у замку за сталом прымае,
Той сведчыць, што бярэ яго ці што трымае.
Саміх праціўнікаў мы выставім у сведкі.
Вядомы мне ўжо не адзін выпадак гэткі».

Суддзя ўжо спаў, дык Возны выйшаў ціха ў сені,
Ля свечкі сеў і выняў кніжачку з кішэні,
Што, быццам малітоўнік, век яму служыла.
Гартаць яе было старому вельмі міла.
Была гэта ваканда трыбунала: радам
У ёй стаялі спісы спраў, што прад урадам
Сам Возны выклікаў іх у даўнейшым часе,
Ці аб якіх пасля ўжо вестка разышлася.
Ваканда для чужога — проста спіс іменняў,
А для ўладальніка — вялікі збор здарэнняў.
Чытаў і ўспамінаў: Агінскія з Візгірдам,
Дамініканцы з Рымшам, Рымша з Вышагірдам,
Радзівіл з Верашчакам, Гедрайць з Радултоўскім,
З кагалам Абуховіч, Юрага з Пятроўскім,
З Міцкевічам Малеўскі і на заканчэнне

З Сапліцам Граф. Пераглядзеўшы ўсе іменні,
Зноў бачыць справы ўсе, іх ход цікавы, рэдкі,
І ажываюць зноў бакі: і суд, і сведкі.
І бачыць сам сябе, як некалі, бывала,
У сінім кунтушы ён, служка трыбунала,
Абпёршыся на шаблю, стол рукой пакажа,
Нязгодных выкліча і «сціхніце» прыкажа.
Між гэтых дум, малітву шэпчучы, памалу
Заснуў апошні ў Княстве Возны трыбунала.

Так забаўляліся, жылі ў былыя годы
ў літоўскай ціхай вёсцы, а ў той час народы
Сцякалі кроўю і слязьмі, бо ён, Бог войнаў,
Акружаны палкамі, гнаў народ свой збройны
І спрэжаных арлоў срабрыстых з залатымі
То ў Лівію, то зноў між Альпамі крутымі
За громам кідаў гром, то ў Піраміды, Табар,
Марэнга, Ульм, Аўстэрліц. Смерць, Насілле, Забар
Ішлі за ім і перад ім. А тая сіла
Пранесла славу заваёўнікаў ад Ніла
Ажно на поўнач, дзе ля Нёмна паваротаў
Адбілася, нібы ад скал, ад царскіх ротаў,
Што сцераглі Літву жалезнаю сцяною
Ад весткі для Расіі, як памор, страшное.

А ўсё ж не раз навіна, быццам камень з неба,
Ў Літву трапляла. Дзед, што рад куску быў хлеба,
Бязрукі ці кульгавы, дар прымаў набожна,
Але навокал азіраўся асцярожна.
Калі ж нідзе ў двары ярмулак не заўважыў,
Не бачыў ні салдат, ні ўлады царскай стражаў,
Тады казаў, кім быў: салдатам з легіёнаў,
Што нёс старыя косці да сваіх загонаў,
Бо сіл не меў іх бараніць. О, як прымалі
Яго, і як паны і слугі абдымалі
І плакалі наўзрыд! Тады, сагрэты ласкай,
Ён праўдай дзіўнай забаўляў усіх, як казкай.
Казаў пра тое ім, як генерал Дамроўскі
З Італіі прывесці хоча корпус польскі
Дамоў, сабраўшы сілы на Ламбардскім полі,
І як Князевіч жыў у замку Капітолі,

І як французам кінуў сто сцягоў крывавых,
Здабытых ад патомкаў кесараў шматслаўных,
Як з'ехаў Ябланоўскі ў край вясны бясконцай,
Дзе цукар вараць і дзе перац спее ў сонцы,
А лес цвіце духмяна. З Легіяй Дуная
Ён тужыць па сваіх і неграў пакарае.

Крадком навіна старца вокал вандравала,
І хлопца ў ціхай вёсцы часта спакушала:
Лясамі, праз балоты брыў ён ноччу цёмнай
І ад пагоні кідаўся ў глыбіні Нёмна,
Нырцом да Княжаства Варшаўскага падходзіў,
Дзе радасны прыём у землякоў знаходзіў.
Ды перш чым адысці, з узгорка ці з каменняў
Гукнуў праз Нёман маскалям: «Да пабачэння!»
Так перайшлі Гурэцкі, Пац і Абуховіч,
Пятроўскі, Абалеўскі, Ружыцкі, Яновіч,
Брахоцкі, Міжыеўскія, Бернатавічы
І Купсць, і Гедымін... ды ўсіх не пералічыш.
Бацькоў, край родны свой, маёмасць пакідалі,
Якую цараняты ўміг канфіскавалі.

Здаралася, ў Літву з манастыра чужога
Манах з'яўляўся і, асмелены нямнога,
Газету выпараў з-паміж сваіх шкаплераў,
А ў ёй быў спісаны дакладна лік жаўнераў
І камандзіраў прозвішчы, чыны і званні,
І іх геройстваў або смерцяў апісанні.
І першы раз за шмат гадоў сям'я пазнала,
Што сына недзе смерць ці пахвала спаткала.
Прымаў жалобу дом, не смеючы прызнацца,
Па кім яна была, і толькі здагадацца
Маглі суседзі. Толькі сум таёмны гэты
Ці радасць панская служылі за газеты.

Ксёндз Робак гэтакім манахам быў, здаецца.
Бывала, што ў пакоі ён з Суддзём запрэцца,
Пра штосьці гутарыць, а потым і навіна
Расходзіцца ў суседстве. Выгляд Бернардына
Казаў, што не заўсёды быў ён служкам Божым
І жыў не век за манастырскай агароджай.

Над правым вухам меў ён, трохі вышай скроні,
Кавалак скуры здзёрты ў шырыню далоні
І след у барадзе ад стрэлу ці мо ўдару.—
Не мог ля алтара ён так пашкодзіць твару.
І не адны шрамы, зрок, голас забіяцкі,
А кожны рух яго і голас быў салдацкі.

У час імшы, калі з паднятымі рукамі
Звяртаўся да людзей, гаворачы «Пан з вамі»,
То часам павярнуўся гэткім спрытным рухам,
Нібы яму «кругом!» скамандваў хто над вухам,
І словы літургіі гэткім мовіў тонам,
Як быццам не служыў, а кіраваў швадронам.
Прыслужнікі заўсёды заўважалі гэта.
І ў справах палітычных, што кіравалі светам,
Больш Робак разбіраўся, чым у справах веры.
У горад часта ездзіў, нейкія паперы
Ці пісьмы атрымоўваў, ды ў чужых ніколі
Тых пісьмаў не чытаў. І іншых спраў даволі
Ў яго было: ён рассылаў ганцоў кудысьці
І часта ў ноч ішоў для нейкае карысці,
Паноў наведваў і са шляхтаю шаптаўся.
Знаёмая была яму і бедната ўся,
З сялянамі ў карчме любіў разгаварыцца
І ўсё пра розныя падзеі за граніцай.
Цяпер Суддзю, што спаў ужо каля гадзіны,
Ішоў будзіць, меў, пэўне, важныя навіны.

КНІГА ДРУГАЯ • ЗАМАК

З м е с т : Паляванне з гончымі на асочанага. Госць у замку. Апошні з прыдворных расказвае гісторыю апошняга з Гарэшкаў. Позірк у сад. Дзяўчына ў агурках. Снеданне. Пецярбургскі анекдот пані Талімэны. Новы выбух спрэчкі за Кусага і Сокала. Інтэрвенцыя Робака. Прамова Войскага. Заклад. У грыбы!

Хто з нас юнацкіх год не помніць, як, бывала,
Ішоў са стрэльбай полем, свішчучы удала,
Калі ні плот, ні вал ніякі не спужае,
Калі мяжа не спыніць нават і чужая.

Бо у Літве стралок, як тое судна ў моры,
Куды захоча, вольна ходзіць па прасторы.
Ён, як прарок, глядзіць у неба, дзе ў аблоку
Шмат знакаў для стралецкага адкрыта зроку,
Або з зямлёй гаворыць, што для мешчаніна
Глухая, а яму штось шэпча безупынна.

Вось драч на сенажаці рэзка адазваўся
І, як шчупак у Нёмне, у траве схаваўся,
А тут над галавою раззвінеўся песняй
Званочак ранні — жаўранак, вястун прадвесняў.
А там арол зашастаў крыллямі над пашай
І, як цара камета, вераб'ёў настрашыў.
А ястраб, узляцеўшы высака ў блакіты,
Трапечацца, як шпількай матылёк прыбіты,
І, зайца ўгледзеўшы ці птушку вострым зрокам,
Нырне раптоўна долу, быццам зорка ў змроку.

Калі ж вярнуцца нам з вандроўкі Бог дазволіць,
Каб жыць зноў мірна ўдому, працаваць на полі,
У конніцы служыць, што зайцаў даганяе,
Або ў пяхоце, што на птушкі стрэльбы мае,
Не ведаць іншых, як каса і серп, рыштункаў,
Другіх газет, апроч дамашніх разрахункаў?

Над Сапліцовам сонейка ўзышло і ўпала
На стрэхі, шчылкамі ўглыб пуні завітала.
І па зялёным, свежым і пахучым сене,
З якога далятала моладзі храпенне,
Паўзлі з мігценнем светлым залатыя смужкі
З дзіры ў страсе і выглядалі, быццам стужкі.
І вось казыча вусны спячых промень ранка,
Як каласком дзяўчына, будзячы каханка.
Вось вераб'і цвіркочуць, скачучы па стрэхах,
Гусак загагаў тройчы, а за ім, як рэха,
Увесь птушыны двор стаў адклікацца ў хоры,
І статак зарыкаў, выходзячы з аборы.

Усталі ўсе. Тадэвуш сну прагнаць не можа,
Бо найпазней заснуў. Збянтэжыў, растрывожыў

Яго ўчарашні дзень, дык пеўні ўжо запелі,
А ён не сплюшчыў вока і ў сваёй пасцелі
Круціўся так, што ў сене ледзьве не ўтапіўся.
Ён моцна спаў, ды вось ад ветру падхапіўся,
Калі старыя дзверы заскрыпелі звонка
І бернардын ксёндз Робак стаў ля застаронка.
Ён крыкнуў: «*Surge, puer!*» — і жартліва ўзняты
Паказваў пояс свой манаскі вузлаваты.

А на дзядзінцы гоман, крыкі, пераклічкі.
Стральцы выводзяць коней, пад'язджаюць брычкі,
Аж двор таго натоўпу агарнуць не ў сіле.
Вось граюць трубы, вось і псярні адчынілі.
Сабачы гурт вясёла скача і скавыча,
Убачыўшы ўкруг коней, зброю, паляўнічых.
Харты перш па дзядзінцы скачуць, як дурныя,
Пасля ў аброжкі самі падстаўляюць шыі.
Удачу варажылі гэткія прыкметы;
І ўсе за Падкаморым рушылі да мэты.

Перш егры ехалі адзін каля другога,
Але за брамай расцягнула іх дарога.
Асэсар з Рэентам трымаліся ўсё ж пары,
І хоць ім злосць крывіла час ад часу твары,
Вялі размову мірна, з гонарам, як людзі
Перад судом, дзе лёс іх вырашацца будзе.
З іх слоў не ўбачыш, як заўзятасці ў іх многа.
Асэсар вёў Сакола, а Рэент Кусога.
На брычках дамы ехалі ў канцы калоны,
А побач — моладзі натоўп вясёлы конны.

Ксёндз Робак па двары хадзіў павольным крокам,
Відаць, чытаў малітвы, але кідаў вокам
У бок Тадэвуша. З затоенай усмешкай
Даў знак. Тадэвуш да яго пад'ехаў спешна,
А ён ля носа пальцам пагражаць стаў строга.
І як Тадэвуш ні прасіў тады старога,
Каб той сказаў, што гэты знак пагрозы значыў,
Ды ксёндз шаптаў малітвы і не растлумачыў.
А як пайшоў, каптур націснуўшы на вочы,

Падцяў каня Тадэвуш і за браму скочыў.

А паляўнічыя якраз паход стрымалі
І нерухомай кавалькадаю стаялі.
Адзін другому знак маўчаць даваў рукамі,
І ўсе з цікаўнасцю глядзелі на той камень,
Дзе пан Суддзя стаяў. Ён звера ўжо убачыў
І жэстамі рукі загад здалёк тлумачыў.
Дык ясна ўсім: стаяць. Адны к яму паволі
Асэсар і пан Рэент трухаюць па полі.
Тадэвуш быў бліжэй, дык змог іх папярэдзіць;
Спыніўся ля Суддзі, каб перш за іх углядзець.
Даўно не быў на полі, на сівым прасторы
Не бачны заяц між каменняў у разоры.
Суддзя паказвае яго — шарак стуліўся,
Ля каменя ляжыць, з зямлёю шэрай зліўся,
Чырвоным вокам, у свой бок накіраваны,
Злавіў варожы зрок і, як зачараваны,
Са страху ад яго адняць не можа вока
І пад апокай мёртвы быў, нібы апока.
Тым часам поле курыцца ўсё бліжай, бліжай,
Ляціць на смычы Кусы, побач Сокал хіжы.
Тут Рэент і Асэсар «вычха!» ўраз раўнулі
І разам з гончымі ва ўзняты пыл нырнулі.

А ў час, як заяц быў прадметам інтарэсу,
З'явіўся раптам Граф ля замкавага лесу.
Уся акруга знала графава дзівацтва,
Што ён не мог нікуды на пару сабрацца.
Заспаў і сёння, дык вымову даў халопам,
Заўважыў паляўнічых і скакаў галопам.
Сурдут ангельскі белы свой суконны
На вецер расхінуў, а ззаду — слугі конна
У чорненькіх брыльках, аж лак на іх ільсніцца,
У ботах, куртачках і белых нагавіцах.
А слугі, што фарсяць у гэткай вось ліўрэі,
Завуцца ў графавым палацыку жакеі.

Скакала чвалам цераз поле чарада ўся,
Ды Граф заўважыў раптам замак і стрымаўся.
Ён першы раз тут быў уранні і не верыў,

Што гэта быў той самы мур, да гэткай меры
Адсвежыліся ранкам рысы пабудовы.
Здзівіў надзвычай Графа выгляд замка новы.
Вось вежа, што над ранняю імглой тырчэла,
Вышэйшаю здалася мо ўдвая; бліщчэла
На блясе сонца — дах, як золатам, быў крыты,
Вясёлкамі цвілі кавалкі шыб пабітых.
Зямлю ахутала туману павалока
І скрыла шчыліны і выламы ад вока.
Далёкі гону крык, прынесены вятрамі,
Адбіўся некалькі разоў паміж мурамі;
Прысягу даў бы, што крык з замка, што ў тумане
Мур, аднавіўшыся, людскім стаў памяшканнем.

Любіў Граф захапляцца кожнай з'явай новай
І рамантычнай, як казаў. Ён рамансовай
Зваў галаву сваю, але на самай справе
Ён быў дзівак. Здаралася, што на аблаве
Раптоўна стане і ўгару глядзіць жалосна,
Як кот, калі заўважыць вераб'ёў на соснах.
Не раз без стрэльбы, без сабак блукаў у гаі,
Як дэзерцір, што бездарожжамі кульгае,
То пазіраў на хвалі нерухомым зрокам,
Як чапла, што ўсю рыбу зжорла б хцівым вокам.
Такія дзіўныя былі ў яго звычаі.
Казалі ўсе, што Графу «трошкі не хапае»,
Аднак пашану меў, бо пан быў з прапрадзеда,
Багач, дабрак для мужыкоў, друг для суседа
І на'т габрэя.

Графскі конь убок з дарогі
Праз поле пад замковыя пабег парогі.
Самотна уздыхнуў Граф, стоячы ля муру,
Дастаў паперу і пачаў чарціць фігуру.
Аж вось, зірнуўшы ўбок, за дваццаць, можа, крокаў
Заўважыў чалавека. Моўчкі адзінока
Стаяў ён, рукі ўсунуўшы ў кішэні,
Задраўшы галаву, нібы лічыў каменні.
Пазнаў яго пан Граф, ды, пэўне, са тры разы
Гукнуў, пакуль на кліч той адказаў Гервазы.
Быў гэта шляхціц, колішні слуга Гарэшкі,

Кніга пятая
Звада

Книга пятая
Ссора

Księga piąta
Kłótnia

Апошні з тых, якія тут таптаді сцежкі.
Стары быў рослы і сівы, твар меў здаровы,
Але маршчыністы, пануры і суровы.
Даўней са шляхтай весяліўся пастаянна,
Ды з дня, ў якім ягонага забілі пана,
Гервазы адмяніўся. Хоць гады ляцелі,
Не быў больш на кірмашы, ані на вяселлі.
І з той пары ўжо больш не жартаваў ніколі,
Ніхто й яго усмешкі ўжо не бачыў болей.
Насіў Гарэшкаву ліўрэю беззаменна,
Хоць жоўты колер курткі захаваўся дрэнна,
Галун зжаўцеў і перастаў іскрыцца,
Ды ўсё ж віднеў яшчэ паўкозіц на пятліцах —
Гарэшкаў герб. Таму, не дзеля жарту злога,
Паўкозіцам празвалі шляхціца старога,
Таксама ад прымоўкі, што без перастанку
Ён паўтараў, народ дражніў яго Мапанку
Ці Шчэрбам, бо на лысіне рубцоў меў многа,
А зваўся ён Рамбайла, герба ж быў якога,
Не ведалі. Ён Ключнікам тытулаваўся,
Бо ключнікам спрадвеку ў замку заставаўся.
Дагэтуль пук ключоў ля боку, як калісьці,
Насіў на стужцы з кутасамі, хоць карысці
Цяпер з ключоў тых не было, бо дзверы замка
Даўно стаялі насцеж. Дык замкі і клямкі
Прыладзіў да дваіх дзвярэй сваім стараннем
І штодня забаўляўся іхнім адмыканнем.
Знайшоў сабе прытулак у адным з пакояў,
Хоць мог у Графа жыць у поўным супакоі,
Ды ўсюды сумаваў і чуўся слабым, хворым,
Аж покуль не вяртаўся зноўку ў гэты хорам.

За шапку, Графа ўгледзеўшы, стары схапіўся
І сваяку паноў даўнейшых пакланіўся,
Схіліўшы лысіну бліскучую пад сонца,
Якое асвяціла ўміг рубцоў бясконца.
Падходзіў, гладзячы яе, яшчэ раз нізка
Прыгнуўся і сказаў: «Мапанку, мой паніска!
Даруй, што так кажу, мой ясны Графе пане,
З прывычкі гавару, а не з неўшанавання.
«Мапанку» прымаўляць Гарэшкі мелі моду,

Апошні Стольнік, пан мой, так казаў заўсёды.
Ці праўда, што, мапанку, сталі вы скупіцца
На суд і замак здумалі аддаць Сапліцам?
Не верыў я ды чутка гэта ходзіць вокал».
Тут, гледзячы на замак, уздыхнуў глыбока.

«А што ж тут,— Граф сказаў,— за дзіва? Кошт і нудна.
Хачу канчаць, ды мо сумысля так марудна
Вядзецца справа. Ведае стары: знуджуся,
Не вытрымаю доўга. Сёння ўжо здаюся,
Прыму умовы згоды так, як суд падкажа».
Гервазы ўскрыкнуў: «Згоды? Што пан гэта кажа?!
З Сапліцамі, мапанку, згода?— Тут скрывіўся,
Як быццам сам сваёй гаворцы задзівіўся.—
З Сапліцам згода! Што, мапанку, гэта хіба
Жарт! Замак, вечная Гарэшкава сяліба
Сапліцам пераходзіць! Хай пан толькі рачыць
З каня сысці. Няхай пан толькі сам убачыць!
Не знаеш, пан, што робіш! Не ўпірайся, пане,
Злазь, пан!»— І стрэмя ў рукі ўзяў для прытрымання.

Пайшлі у замак, сталі пры ўваходзе ў сені.
«Вось тут,— сказаў Гервазы,— ў пышным акружэнні
Паны у крэслы, паабедаўшы, сядалі.
Сялян мірыў тут пан, а часам дні бывалі,
Што ён расказваў нешта весела і складна
Ці слухаў жарты і аповесці спагадна.
А моладзь фехтавала на двары заўзята,
А не, дык аб'язджала маладых бахматаў».

Далей стары працягваў: «Вось пад тым скляпеннем
Няма ў паркеце залы гэтулькі каменняў,
Якую колькасць бочак він яна глынула.
На паясах іх шляхта з пограба цягнула,
Прыбыўшы к нам на імяніннае гулянне,
Або на сейм, на сеймік ці на паляванне.
А вунь на хорах там капэлія стаяла,
Яна ў арган і іншыя інструменты іграла.
Як мы ўзнімалі чары, трубы безупынна,
Як судным днём раўлі, а тосты гучна, чынна
Ішлі чаргой: найперш за караля, а далей

За прымаса, за каралеву выпівалі,
Пасля ў чэсць шляхты і ўсяе Рэч Паспалітай.
А там ужо, за пятай шклянкаю дапітай,
«Кахаймася» пілі ўжо ўсе без затрымання,
І тост, пачаты ўдзень, канчаўся толькі зрання,
Калі запрэжак падрыхтаваных багата
Чакала, каб адвезці кожнага дахаты».

Пайшлі далей. Гервазы моўчкі ў задуменні
То зрок запыніць на сцяне, то на скляпенні:
Яго ўспамінаў розных хваля агарнула,
Здавалася, хацеў сказаць: «Усё мінула!»
То галавой кіўне, а то махне рукою,
Відаць, што згадкі не давалі супакою.
Відаць, іх адганяў; аж крокі затрымалі
Наверсе, у люстэркавай вялікай залі,
Дзе ад люстэркаў засталіся толькі рамы,
Без шыбаў вокны, галерэя супраць брамы.
Схіліў стары тут голаў ад душэўнай мукі
І твар далонямі прыкрыў, пасля зняў рукі,
Ды боль і роспач засталіся на абліччы.
Хоць Графу тут было ўсё цьмяным, таямнічым,
Кранула ўсё ж яго старога хваляванне,
Руку яму пацiснуў, і тады маўчанне
Парушыў той. Падняўшы ўверх руку-правіцу,
Сказаў: «Няма, мапанку, згоды між Сапліцам
І ўсёй Гарэшкавай крывёй! А пан жа крэўны,
Па маці Лоўчыне, як знаеш сам, напэўна,
Народжанай другою дочкай Кашталяна,
Які быў, як вядома, дзядзькам майго пана.
Паслухай пан гісторыю, што адбылася
Ў тваёй сям'і, вось тут не ў вельмі даўнім часе.

Нябожчык Стольнік, пан мой, знатны пан, мой пане,
Які ў павеце ў самай большай быў пашане,
Дачку красы анёльскай меў, таму нямала
Багатых панічоў рукі яе шукала.
Між шляхтай славіўся тады задзіра знаны,
Сапліца Яцак, Ваяводаю празваны,
Бо ён сапраўды многа ў ваяводстве значыў:
У ім правадыра ўвесь род Сапліцаў бачыў,

Дык трыста галасоў трымаў ён сільнай воляй,
А сам не меў нічога, проч кавалка поля
Ды шаблі і вусоў даўгіх, як у нікога.
Вось Стольнік заклікаў малойчыка ліхога
І ў замку частаваў, бо выбараў парою
Ён меў шмат галасоў з сябрамі і раднёю.
Пасля таго так абнаглеў Вусач-Сапліца,
Што ўздумаў у зяці да Стольніка ўкруціцца.
Ужо няпрошаны у замку ён з'яўляўся,
А потым, нібы ўдому, ў нас абсталяваўся.
Ужо збіраўся сватаць, ды чакаць не сталі
І чорнай поліўкай яго пачаставалі.
Як быццам Стальнічанцы ён упаў у вока,
Ды ад бацькоў таіла пачуццё глыбока.

Было ўсё гэта пры Касцюшцы. Пан збіраўся
За «Трэці май» змагацца, з шляхтаю звязаўся
І да канфедэратаў браць хацеў напрамак,
Ды раптам уначы Маскаль напаў на замак.
Ледзь быў час выпаліць з марціры на трывогу,
Ход ніжні заваліць, і вось — прымай аблогу!
У замку быў пан Стольнік, я, паненка, паня,
Кухмайстар і два кухты, п'яныя дазвання,
Ксёндз, лёкай, гайдукі чатыры — больш нікога.
Мы з стрэльбамі — да вокнаў. Вораг ля парога
«Ура!» крычыць і рвецца сілаю вялікай.
Мы ў дзесяць стрэльбаў пальнулі: а хто вас клікаў!
Усё закрыла цемра. Слугі знізу білі,
А з гэтай галерэі пан і я палілі.
Ішло ўсё вельмі спраўна, хоць і у трывозе.
Ляжала дваццаць стрэльбаў тут вось на падлозе,
Мы выстралім з адной, другую нам падносяць —
Ксяндзу заняцца гэтай справай давялося,
Таксама пані і паненцы і дзяўчатам.
Стралялі тут мы ўтрох няспынна і заўзята.
А маскалі тым часам куль не шкадавалі,
Мы зрэдку, але метка ім адказ давалі.
Разы тры гэта хамства дзверы штурмавала,
Ды з кожным разам трое ногі задзірала.
Тады ўцяклі пад свіран, а ўжо быў і ранак.
Пан Стольнік выйшаў радасны з ружжом на ганак

І, як салдат які, матнуўся ў завуголлі,
Ён стрэл даваў і не мыляўся аніколі —
Кашкет за кожным разам у траву валіўся.
Пасля таго ўжо ўвесь атрад да сцен туліўся.
Убачыўшы, што вораг топчацца трывожна,
І што яго ўручную выбіць будзе можна,
Пан шаблю ўзяў і гучна слугам даў наказы;
Звярнуўшыся ка мне, сказаў: «За мной, Гервазы!»
Тут бахнуў стрэл з-пад брамы. Стольнік заікнуўся,
Пачырванеў, збялеў, крывёю папярхнуўся.
Тады заўважыў я насупраць сэрца пляму,
А пан з хістаннем паказаў рукой на браму.
Пазнаў я зразу лотру! Я пазнаў Сапліцу
Па росце і вусах! Ён толькі мог рашыцца
На гэткі крок! Я бачыў! Стрэльбу ўверх узняўшы,
Стаяў латруга. Дым яшчэ не быў апаўшы,
Калі я ўзяў яго на цэль. Ён быў, як скамянелы.
Я стрэліў аж два разы, і абодва стрэлы
Не трапілі. Са злосці маху даў ці з жалю...
Як глянуў — пан не жыў... наўкол лемантавалі».

Тут змоўк стары Гервазы і слязьмі заліўся,
І так канчаў: «Маскаль на дзверы наваліўся,
А мне са смерцю пана розум адабрала,
І што было вакол, не разумеў ні мала.
На шчасце выручыў нас пан Парахвяновіч,
Міцкевічаў прывёўшы дзвесце з Гарбатовіч,
А шляхта там навокал — чалавек у чалавека,
І на Сапліцаў маюць злосць яшчэ спрадвеку.

Так згінуў пан набожны, пан вялікай славы,
Што меў у родзе крэслы, стужкі і булавы,
Сялянам бацька, шляхце брат. З яго асобай
Загінуў род. Не меў ён сына, хто б над гробам
Адпомсціць прысягнуў; у кроў з ягонай раны
Я меч свой памачыў, Сцізорыкам празваны.
(Пан, пэўне, чуў пра мой Сцізорык, ён быў слаўны
На сеймах, сейміках у часе старадаўнім.)
Я вышчарбіць яго пакляўся на Сапліцах
І стаў усюды з імі пры сустрэчы біцца.
У спрэчцы двух забіў і двух у паядынку,

А аднаго ў драўляным падпаліў будынку,
Як з Рымшам на Карэлічы наезд рабілі.
Ён спёкся, як пяскар; вушэй жа, што згаліў я,
І не злічу, і толькі з іх адзін застаўся,
Што з памяткай маёй дагэтуль не спазнаўся,
Бо родны брат таго вось Вусача-Сапліцы
Жыве яшчэ, сваім багаццем ганарыцца
І межамі сваімі замак закранае,
Яго шануюць, бо ён пост суддзі займае.
Яму здасце вы замак?! Каб зладзеяў ногі
Сцiралі кроў Гарэшкаву з тае падлогі?
О не! Пакуль яшчэ душа ў Гервазым тлее,
Пакуль ён толькі пальцам зварухнуць здалее
Сцізорык свой, заўсёды на сцяне вісячы,
Датуль Сапліцам замка гэтага не бачыць!»

«О!— ўскрыкнуў Граф з паднятымі ўгару рукамі,—
Любіў я гэты мур, надгрызены вякамі,
Хоць і не ведаў, колькі ён багаццяў крые:
Сцэн драматычных столькі, жудасці такія!
Як толькі гэты продкаў замак адваюю,
Цябе сюды сваім бургграфам накірую.
Я зацікавіўся аповесцю тваёю.
На жаль, не трапіў я сюды начной парою,—
Акрыўшыся плашчом, прысеў бы на каменні,
А ты б мне маляваў крывавыя здарэнні.
Шкада, што слабы маеш дар апавядання.
Чытаў і чуў я шмат вось гэтакіх паданняў.
У Англіі, Шатландыі усе палацы
І замкі ўмеюць жудасцямі выхваляцца.
Амаль у кожным слаўным і магутным родзе
Пра здрады і забойствы знойдзеш звестак годзе,
А помста ў новыя зыходзіць пакаленні,
А вось у Польшчы — рэдкасць гэткія здарэнні.
Я чую, як ва мне Гарэшкаў кроў зайграла,
І справа гонару мне яснай зараз стала.
Вось так! Перагаворы я сарву з Сапліцам,
Гатоў на шпагах з ім ці пісталетах біцца
За гонар свой!» Тут рушыў урачыстым крокам,
А ўслед ішоў Гервазы і ўздыхаў глыбока.
З сабой гаворачы, ля брамы Граф спыніўся,

На замак глянуў, ля каня замітусіўся
І так заканчваў сам з сабой бяседу:
«Мне жаль, што жонкі не прыйшлося мець суседу,
Або дачкі, ў якую мог бы закахацца,
А потым немагчыма з ёй было б пабрацца.
Вось новы вузел зблытаў бы апавяданне:
Тут — сэрца, там — сумленне! Помста і каханне!"

Так шэпчучы, даў шпоры, ў бок двара падаўся,
А тут гурт паляўнічых з лесу паказаўся.
Любіў Граф паляванне, ледзь стральцоў убачыў,
Забыўся ўміг пра ўсё, да іх насустрач скача,—
Мінае браму, плот, гарод. На паваротце
Зірнуў і запыніў каня пры плоце.
Быў сад.

Уздоўж стаялі дрэвы рад ля рада
І зацянялі плошчу поля. Сподам — грады.
Капуста да зямлі тут лысіны зніжае,
Нібы пра лёс гародніны ўсё разважае.
Там боб струкі свае ўплятае моркве ў косы
І тысячай вачэй за ёю сочыць скоса,
А там залоціцца на сонцы кукуруза
І дзе-нідзе гарбуз з бацвіння выпнуў пуза,
Залезшы па сцябліне са сваіх загонаў
У госці да натоўпу буракоў чырвоных.

На ўзмежках гэтай рознаколернай паляны
Шарэнгамі, як войска, лес стаў канапляны.
Гародных кіпарысаў водар, ліст зялёны
З'яўляюцца для град надзейнай абаронай,
Бо гадзіна не смее праз лісты прабрацца,
А вусені-пачвары паху іх баяцца.
А далей мак узняў бялявыя сцябліны,
На іх як быццам рой рассеўся матыліны,
Трапечучыся крыльцамі,— у іх мігценні
Гараць вясёлкі ды каштоўныя каменні —
Такім багаццем колераў мак позірк кліча.
Між кветак, як між зорак месяца аблічча,
Сланечнік велічны багаты расцвітае
І цэлы дзень за сонцам твар свой павяртае.

Пад плотам грады без кустоў, без дрэў і кветак —
Гарод на агуркі займае ўвесь палетак.
Прыгожа выраслі і лісцем лапушыстым
Пакрылі плошчу, быццам дыванам пушыстым.
Сярэдзінай дзяўчына ў ранішнім адзенні
Ішла, а зелень ёй сягала па калені.
Сыходзячы ў барозны, быццам не ступала,
А па лістах плыла і ледзь-ледзь іх кранала.
На скронях пад брылём шырокім саламяным
Дзве стужкі колерам ірдзеліся румяным
У пасмах светлых валасоў яе дзявочых.
Трымала кошык на руцэ. Спусціла вочы,
Руку наставіла, як быццам для хапання,
Нібы дзяўчо, калі ў купальні гнацца стане
За рыбкаю свавольнай. Так уздоўж загонаў
Згінаецца з кашолкай над гурком зялёным,
Які кране нагою ці прыкмеціць вокам.

Пан Граф, які заўважыў з'яву ненарокам,
Цішком стаяў. Жакеям, што ўслед над'язджалі,
Рукой даў знак спыніцца, дык і тыя сталі.
Ён шыю выцягнуў, глядзіць, як той дзюбаты
На варце журавель, старанна тым заняты,
Каб толькі не заснуць, як гурт адпачывае,
І камень у падкурчанай назе трымае.

Ды вось пачуўся Графу шэлест каля скроні.
Быў гэта Робак і трымаў ён у далоні
Падняты ўверх манаскі пояс вузлаваты:
«Гуркоў вам хочацца? Іх тутака багата!
Не лезь у шкоду, пане, бо на гэтым полі
Чужы ўраджай, тваім не быць яму ніколі!»
І, пальцам строга паківаўшы, ўбок падаўся.
Дык і пан Граф тут доўга ўжо не заставаўся.
Хоць засмяяўся, ды не рад быў перашкодзе.
Вярнуўся вокам у гарод, але ў гародзе
Яе ўжо не было, і толькі у аконцы
Мільгнула сукня, стужка ўспыхнула на сонцы.
На градах знаць, якой трымалася дарогі,
Бо цёмны ліст, які кранулі яе ногі,
Падняўся ўгору, задрыжаў і стаў на месца,

Так, як вада, калі к ёй птушка дакранецца.
І толькі, дзе стаяла, кошычак з ракіты
Угору дном ляжаў, са сполаху забыты.
Гуркі згубіўшы, ён на лісці затрымаўся
І на зялёнай хвалі лёганька хістаўся.

Праз момант навакол было бязмоўна, глуха;
На дом Граф пазіраў, напружваючы вуха,
І думаў, а жакеі воддаль нерухома
Стаялі. Раптам у глухім маўклівым доме
Пачуўся шум і гоман, потым крык вясёлы,
Як у вуллі, калі ў яго ўлятаюць пчолы:
Быў гэта знак, што госці едуць з палявання
І чэлядзь завіхаецца наконт снядання.

Ва ўсіх пакоях рух, бо слугі ў той хвіліне
Стаўлялі ежу і бутэлькі, і начынне.
Зялёных вопратак мужчыны не змянялі,
А ў тым, у чым прыйшлі, закусваць пачыналі.
З талеркамі ў руках расходжвалі свабодна
Ці, вушакі падпёршы, гутарылі згодна.
Суддзя і Падкаморства ля стала, паненкі ж
Шапталіся асобна воддаль каля сценкі.
Не той быў лад, як пры вячэры ці абедзе,
Такая мода за граніцай выйшла недзе.
Суддзя, хоць звычаю таго не пахваляе,
Ды рад не рад, яго аднак жа дазваляе.

Мужчын і дам асобнай частавалі ежай:
Разносіць посуд пачалі для кавы свежай,
Дык на падносах, хораша размаляваных,
Дыміўся рад пахучых чайнікаў бляшаных,
Стаялі пазалочаныя філіжанкі,
А побач — дробныя гарнушкі для смятанкі.
Няма такой, як наша, кавы ў іншым краі,
Бо ў Польшчы, дзе жывуць старыя абычаі,
Жанчына ў доме адмысловая бывае,
Кавяркай званая. Яна і здабывае
У горадзе або ў віціннікаў зярняты
І варыць так, як кажа вопыт ёй багаты,
Каб кава моккай пахла, як бурштынірдзела,

Чарнела, як вуголь, і вязкасць мёду мела.
Вядома, чым для кавы добрая смятана,
На вёсцы ёсць яна. Кавярка, ўстаўшы рана,
Паставіць чайнікі, ў малочную ступае
І лёгка свежы белы цвет збанкоў згартае
У дробненькі прыгожы посуд філігранны —
Для кожнай філіжанкі свой вяршок смятанны.

Старэйшыя з жанчын пілі ўжо каву зранку,
Цяпер другі напітак мелі пры сняданку,
Напітак, на які ніхто не гляне крыва:
Гарачае з вяршкамі, з свежым сырам піва.

А для мужчын ляжала розная вяндліна:
Гусяціна, валовіна, язык, свініна
Найлепшага гатунку, спосабам мясцовым
Увэнджаная дбайна дымам ядлаўцовым.
А на астатак зразы чэлядзь падавала.
Дык вось як снедалі ў Суддзі ў той час, бывала.

У дзве святліцы побач разышліся госці.
Пры століку малым старыя ягамосці
Вялі бяседу перш аб справах гаспадарскіх,
А потым аб законах і указах царскіх.
Крануў пан Падкаморы і вайны пытанні,
І вывады свае рабіў і меркаванні.
Вайшчанка акуляры сінія ўзлажыла
І Падкаморысе на картах варажыла,
А моладзь абмяркоўваць стала паляванне.
Гутарылі спакойна ўсе, без хвалявання,
Бо Рэент і Асэсар, роўныя ў рыхтоўцы
Страляць і звера гнаць, вялікія прамоўцы,
Маркотныя былі, глядзелі сумна, гнеўна.
Так добра пацкавалі, кожны з іх быў пэўны,
Што хорт ягоны тут здабудзе перамогу,
Ды шнур сялянскай ярыны закрыў дарогу:
Шарак нырнуў, і з ім харты з вачэй прапалі,
І вось загад Суддзі, каб мігам гон стрымалі,
Выконваць мусілі, хоць грызла злосць, трывога.
Вярнуліся сабакі, і ніхто нічога
Не ведае, ці звер уцёк, ці ў зубы трапіў

Абодвум, ці ў адну якую-небудзь ляпу.
Пра гэта розна тутка сёння гаварылі,
Але сапернікаў ізноў не памірылі.

А Войскі па пакоях сноўдаў адзінока
І пазіраў, нібы рассеяна, навокал.
Удзелу не прымаў ані ў адной бяседзе,
Відаць, што думкамі блукаў далёка недзе.
Насіў на мухі бітку; пастаіць без руху,
Падумае і біткай той прыстукне муху.
Тадэвуш з Талімэнай у свабоднай позе
Паміж пакоямі стаялі на парозе.
Таму што іх пачуць маглі ў абодвух залах,
Дык шэптам гаварылі. Вось яму сказала
Тут цётка Талімэна, што жыве заможна,
Прытым сказаць амаль з упэўненасцю можна,
Што блізкае радство іх між сабой не вяжа,
Ды мо радства ніхто наогул не дакажа,
Хоць дзядзька і заве яе сваёй сястрою —
Так іх бацькі зраднілі даўняю парою.
Пасля ж, калі яна ў сталіцы пражывала,
Паслуг Суддзі зрабіла розных там нямала,
Дык вось дзеля таго ён ганарыўся ёю
І зваў ахвотна пры людзях сваёй сястрою,
Чаго яна, па дружбе, не забараняла.
Тадэвуша ўсё гэта міла хвалявала.
Яшчэ багата спраў яны абгаварылі,
І здарылася гэта ўсё ў кароткай хвілі.

А побач, маючы на ўвазе Асасора,
Прамовіў Рэент: «Я казаў яшчэ і ўчора,
Што ўдацца паляванне сёння ў нас не можа,
Яшчэ зарана, бо не ўсё пажата збожжа,
І мужыкі сваіх шнуроў не пакасілі,
І Графа ўсё няма, хоць мы і запрасілі.
А справы ж палявання Граф дакладна знае
І правілы заўсёды нам напамінае.
Ён за граніцай атрымоўваў выхаванне
І варварствам заве такое паляванне,
Калі палююць так, зусім без далягляду
І без увагі на закон і ўказы ўраду,

Калі не ў лік капцы чужыя ні граніцы,
І грунт чужы таптаць ніхто ў нас не баіцца.
Любой парой стралкі ў нас ходзяць полем, гаем,
Палююць на ліса тады, як ён ліняе,
Хоць бачаць, як харты рвуць котную зайчыху,
Ды мірацца са шкодніцтвам такім паціху.
Таму зусім не дзіва, што на нас Граф валіць
І кожны раз маскоўскія парадкі хваліць,
Бо там цара указы ёсць пра паляванні,
Паліцыі нагляд і розныя спагнанні».

Тут Талімэна слова мовіла дарэчы,
Хусцінкай абвяваючы свой твар і плечы:
«Клянуся мамай,— пачала,— у курсе справы
Пан Граф. Расію знаю я, парадак там цікавы.
Не верылі вы мне, як я не раз казала,
Якая строгасць там заўсёды панавала.
Не раз у Пецербургу быць мне давялося.
О мілы час! А колькі ж згадак засталося!
Цудоўны горад! Быў хто з вас мо ў гэтым месце?
Я маю ў бюрку план. А мо сюды прынесці?
Улетку пецярбургскі свет жыве на дачы,
Ў палацыках вясковых (дача — вёска, значыць).
Я над Нявой жыла ў палацы адзінока,
Не вельмі блізка ды не так, каб і далёка,
На ўзгорачку насыпаным, наколькі знаю.
Цудоўны домік! План яшчэ у бюрку маю.
Вось, на бяду, наняў якраз дом у суседстве
Чыноўнік нейкі дробны, што служыў у следстве.
Трымаў ён гончых. Ну і даўся ж ён мне ў знакі!
Бяда — чыноўнік дробны і яго сабакі!
Бывала, ледзь прайдуся з кніжкаю садочкам
На месяц глянуць ці падыхаць халадочкам,
Ураз бяжыць сабака і хвастом віляе.
А можа ён шалёны, хто яго там знае!
Спужалася не раз я. Сэрца падказала
Бяду мне ад сабак, вось так яно і стала.
Калі я з кніжкай выйшла ў сад аднога ранка,
Ля ног маіх майго загрыз хорт выхаванка —
Баноньчыка! Век буду помніць тую псінку!
Мне князь Сукін прыслаў яе дзеля ўспамінку —

Разумная і, як вавёрачка, жывая!
Яе партрэцік я і сёння ў бюрку маю.
Я, смерць яе пабачыўшы, у альтарац'і
Самлела, спазмы сталі, сэрца пальпітац'і.
Мо больш бяды здарэнне б тое натварыла,
Ды вось прыбыў з візітам на той час Кірыла
Гаўрылыч Казадусін, сам вялікі лоўчы.
Спытаў, як чуюся,— адказ не быў станоўчы.
Ён загадаў цягнуць чыноўніка за вушы.
Той пабялеў, увесь дрыжыць, ды слухаць змушан.
«Як смееш ты, наглец,— крычыць Кірыл грымотна,—
Пад царскім носам здзекавацца над ланню котнай?»
Дарма чыноўнік аслупелы заклінаўся,
Што паляваць зусім яшчэ і не збіраўся,
Што, з іхняй светласці ласкавым пазваленнем,
Сабачкам быў той звер, а не аленем...
«Ах ты, прахвост,— крычыць Кірыла,— як ты смееш
Сцвярджаць, што лепей паляванне разумееш,
Чым я сам, Казадусін, царскі егермайстар?
Няхай жа нас рассудзіць зараз паліцмайстар!»
Тут клічуць паліцмайстра, следства пачынаюць.
«Я,— кажа Казадусін,— гэтым вось сцвярджаю,
Што гэта лань, а ён: сабачка, кажа, пане!
Скажы, хто знае лепш звяроў і паляванне!»
А паліцмайстар знаць парадак справы змушан —
Здзівіўся вельмі той зухваласцю чынушы,
Набок яго адвёў і стаў, як брату, радзіць
Прызнацца да віны і гэтым грэх загладзіць.
Змякчэлы лоўчы абяцаў, што ён прадставіць
Цару ўсю справу, дык і суд мо кару збавіць.
У выніку вяроўкі гончым прысудзілі,
А пана іх аж на два тыдні пасадзілі.
Пасля таго было нам на ўвесь вечар смеху,
Бо хтосьці анекдот прыдумаў на пацеху
Аб тым, як лоўчы за сабачку заступаўся.
І ведаю напэўна, што й сам цар смяяўся».

Абапал смех паўстаў. У той час з Бернардынам
Суддзя граў у мар'яш. Ксёндз, страціўшы ўсе віна,
Ужо ледзь дыхаў, і Суддзя канчаць збіраўся,
Але даслухваннем аповесці заняўся

Настолькі, што, угору галаву задраўшы
І карту для біцця ў руцэ прырыхтаваўшы,
Сядзеў без руху і ксяндза трывожыў гэтым.
Пачуўшы заканчэнне, ход зрабіў валетам
І, смяючыся, так сказаў: «Няхай хто хоча
Ці немцаў хваліць, ці з Масквой нам лезе ў вочы,
Няхай Велькапаляны вучацца ад Швабаў
Судзіцца за лісу, казённых клікаць драбаў,
Каб гончага чужога захапіць у гаі.
У нас старыя, Богу дзякаваць, звычаі,
Хапае нам звярыны, хопіць для суседства,
За справы гэткія мы не праводзім следства.
І збожжа ў нас даволі, не агаладаем,
Калі сабакі полем прабягуць ці гаем,
А ніў сялянскіх нельга нішчыць паляваннем».

Тут адазваўся Аканом: «Маспане,
Не трэба патураць вясковаму народу,
Бо мужыкі і рады, як да іх у шкоду
Ускочыць хорт. Хай дзесяць каласочкаў жыта
Саб'е, то пан капу даеш, і то не квіта,
Ці раз яны ў прыдатак талер атрымалі.
Павер мне, пан, што абнаглеюць, калі далей...»
Але далейшых разважанняў Аканома
Не мог Суддзя пачуць, бо тут падняўся гоман,
Абапал пачалося гутарак з дзесятак,
Апавяданняў, жартаў, спрэчак на астатак.

Тадэвуш з дамаю, забытыя усімі,
Сябе ўсё ж помнілі. Гаворка зноў між імі
Пайшла. Тадэвушу жарт пані спадабаўся,
Дык ён ёй камплiменты выказаць стараўся.
Тым часам Талімэна голас суцішала,
А ён, нібы таму, што так шумела зала,
Не мог пачуць, дык прыхінуўся бліжай тварам,
І скронь жанчыны любым палыхнула жарам.
Ён прагна вуснамі лавіў суседчына ўздыханне
І вокам ясных воч яе праменяванне.

І вось мільгнула ім між вуснамі знянацку
Перш муха, а за ёю скураная «цацка».

Ў Літве даволі мух. Вядуцца між другімі
Такія, што шляхоцкіх атрымалі імя.
Па колеру і форме быццам тая ж муха,
Аднак шырэйшая за іншых, з большым брухам,
Лятаючы, гудзе дакучліва і звонка,
Такой не спыніць павучыная пляцёнка,
А ў сетку ўблытаная, тры дні будзе рвацца,
Ёй сіл хапае нават з павуком змагацца.
Праверыў гэта Войскі і даўно даводзіў,
Што з гэтых мух звычайны дробны род паходзіў,
Што мухі гэтыя — нібы для рою маткі,
Што з іхнім вынішчэннем згінуць мух астаткі.
І хоць ні ахмістрыня, ані ксёндз вясковы
Не вельмі верылі ў той вывад навуковы
І думалі па-свойму аб мушыным родзе,
Стары знішчаў іх пільна пры любой нагодзе —
Ледзь муху ўбачыў гэткую, забіць стараўся.
І вось яму над вухам «шляхціц» той азваўся.
Два разы Войскі пляснуў, але не пацэліў,
Махнуў яшчэ, аж шыбы ледзь не паляцелі.
Ад стукату такога муха у трывозе,
Убачыўшы людзей, што сталі на парозе,
Рашыла хутка прашмыгнуць паміж іх твараў,
І тут жа Войскі біткаю па ёй ударыў.
Так моцна пляснуў, што адскочылі галовы,
Як быццам дрэва гром разбіў на дзве паловы;
Абое з сілаю аб вушакі даліся,
Што сінякі пасля таго ў іх засталіся.

На шчасце, не зважаў ніхто, бо ў гэтым часе,
Пасля спакойнай, хоць і шумнай, пачалася
Гаворка бурная, аж перайшла у крыкі.
Так гоніць лесам ліса гурт стральцоў вялікі:
Чуваць трэск лому, стрэлы, рэдкі брэх сабачы,
Аж раптам нехта нечакана дзіка ўбачыў,
Даў знак, і гул падняўся ў паляўнічай гушчы,
Як быццам загудзелі дрэвы ва ўсёй пушчы,—
Так з гутаркай бывае — роўненька пляцецца,
Пакуль, як на дзіка, на нешта не наткнецца.
Тут дзікам гутаркі працяг быў спрэчкі ўпартай,
Ці хорт Асэсараў, ці Рэентаў больш варты.

Усё трывала толькі міг, ды ў той кароткай хвілі
Адзін другому гэткіх слоў нагаварылі,
Што вычарпалі раптам спрэчкі ўсе тры часці:
Насмешкі, гнеў, абразу — толькі рукі ўскласці.

Шугнулі ўсе да іх з суседняга пакоя,
Не тоўпячыся ў дзверы, бурнаю ракою,
І пару маладых, падобную да Бога,
Да Януса двухтварага, змялі з парога.

Тадэвуш з Талімэнай ледзь свае прычоскі
Паправілі, як сціх той крык і гоман порсткі,
І толькі смех і шматгалосы шум застаўся.
Зноў мір настаў, бо ў сварку Робак умяшаўся:
Хоць пажылы, ён быў прысадзісты, плячысты,
Дык вось, калі падбег Асэсар да юрыста,
Калі абодва ўжо махалі кулакамі,
Схапіў іх каўняры абедзвюма рукамі
І двойчы моцна стукнуў іхнія галовы,
Як яйкі на вялікдзень, потым, без размовы,
Раскінуў хутка рукі ўбок дарожным знакам
І ў два куты пакоя кінуў забіякаў.
Праз момант так стаяў з прасцёртымі рукамі
І «*Pax,*— казаў ім,— *pax vobiscum,* мір між вамі!»

Хоць гэта ім было не вельмі да спадобы,
Але, з пашаны да духоўнае асобы,
Ўсё ж засмяяліся. Пасля ж такое спробы
Больш не пасмелі пры манаху задзірацца.
А той, убачыўшы, што гнеў пачаў сцішацца,
Трыумфу не шукаў у тым, што здзейсніў міры,
Больш слова не сказаў ніводнаму задзіры,
Каптур паправіў, рукі залажыў за пояс
І моўчкі выйшаў.

А тым часам у пакоі
Суддзя і Падкаморы між двума бакамі
Стаялі. Войскі выступіў, развёў рукамі,
Ён раптам, быццам разагнаў сваю дрымоту,
Паправіў вус сівы і абцягнуў капоту,
А вока ўсіх прысутных мігам ахапіла.

І дзе яшчэ быў шум, ён, быццам ксёндз крапілам,
Сцішаючы, памахваў біткай скураною,
Пасля, падняўшы тронкі па-над галавою,
Нібы жазло маршалка, аб'явіў маўчанне:

«Суцішцеся,— казаў,— трэ'ж мець апанаванне.
Вы, паляўнічыя найлепшыя ў павеце,
Нязгоды вашай прыклад майце на прыкмеце!
Надзея краю, наша моладзь дарагая,
Што ўжо і так пра славу пушч не вельмі дбае,
Калі ў яе і зараз лоўля не ў пашане,
Пасля зусім закінуць можа паляванне,
Убачыўшы, замест братэрскае нарады,
Адны нязгоды пасля лоўлі, спрэчкі, звады.
Дык слухайце мяне, старога: не палічыш,
Якіх і дзе, і колькі знаў я паляўнічых.
Я шмат разоў судом судзіў іх палюбоўным.
Ну хто ў лясах літоўскіх Рэйтану быў роўным
Ці то зрабіць аблаву, ці сустрэцца з зверам?
З Белапятровічам каго мы зараз змерым?
Хто гэтак, як страляў Жагота, можа стрэліць,
Што ў зайца на бягу мог з пісталета ўцэліць?
Бывала, Тараевіч, ідучы на дзікаў,
Не браў з сабою іншай зброі, апроч пікаў.
Будрэвіч браўся ўпол і з медзвядзём, бывала.
Дык вось якіх герояў наша пушча знала!
А паспрачаўшыся, як справу разбіралі?
Ды суддзяў набіралі і заклад стаўлялі.
Агінскі за ваўка прайграў валок сто лесу,
Тры вёскі Несялоўскаму барсук звёў к бесу.
І вам жа можна весці справу даўнім ладам,
І спрэчку меншым, хай сабе, рашыць закладам.
Гаворка — вецер, ёй канца на век не будзе,
А дзеля зайца языка не варта трудзіць,
Дык выбірайце зараз палюбоўных суддзяў,
І іх рашэнне хай для вас законным будзе.
Я папрашу Суддзю, каб ён дазволіў еграм
Закончыць гон, каб на'т звярына ў збожжа ўбегла,
І ласку гэту атрымаць я спадзяюся».
Сказаўшы гэта, да кален Суддзі нагнуўся.

«Каня!— ускрыкнуў Рэент,— я каня са збруяй
Стаўляю і абавязацельства бяру я
Суддзі ў salarium аддаць пярсцёнак гэты!»
«А я,— сказаў Асэсар,— здам для той жа мэты
Аброжку з яшчура — цудоўная работа!
Шаўковы павадочак, колцаў пазалота,
Каштоўны камень — зззяе ўсё здалёк і свеціць.
Калісьці ў спадчыну мо атрымалі б дзеці,
Каб ажаніўся. Даў яе мне, каб вы зналі,
Князь Домінік, калі мы раз з ім палявалі
Ды з Маршалам Сангушкам і з тым генералам
Меенам. Што мая там псярня вытварала,
Паверыць трудна. Вось была, скажу вам, штука:
Аж шэсць зайцоў мая злавіла запар сука!
А гэта адбылося на Купіскім полі.
Князь Радзівіл не бачыў гэткага ніколі,
З каня сышоў, абняў маю харціху Каню
І тройчы ў лоб пацалаваў на знак прызнання,
А потым, тройчы пляснуўшы рукой па пысцы,
Сказаў: «Дык будзь цяпер княгіняю Купіскай».
Вось так Напалеон сваім маршалам многім
Даў тытулы князёў ад месцаў перамогі».

Абрыдла Талімэне гутарка ўся скора,
Хацела ў лес пайсці, падшуквала партнёра.
Зняла з калочка кошык. «Вам, панове, мусіць,
І дома добра, я дык на рыжкі прайдуся,
Прашу са мной, хто ласкаў»,— ветліва сказала
І шаль чырвоны з кашаміру завязала.
Руку падкамаранцы падала, другою
Фальбоны прыўзняла, перш чым ступіць нагою.
Тадэвуш у грыбы за ёй падаўся следам.

Суддзя быў рад праходцы той перад абедам,
У ёй ён бачыў спосаб на сцішэнне крыкаў.
«Прашу у лес, панове!— весела заклікаў,—
Хто сёння з вас рыжка найлепшага дабудзе,
З найпрыгажэйшай побач той абедаць будзе,
Сам выбярэ яе. А калі знойдзе дама,
Найпрыгажэйшага хай выбера таксама!»

КНІГА ТРЭЦЯЯ • ЗАЛЯЦАННІ

З м е с т : Графаў паход у сад. Таямнічая німфа пасе гусей. Падабенства грыбнікоў да элізейскіх ценяў. Гатункі грыбоў. Талімэна ў Святыні дум. Нарада ў справе Тадэвуша. Граф — пейзажыст. Мастацкія заўвагі Тадэвуша пра дрэвы і хмары. Графавы думкі наконт мастацтва. Звон. Білецік. Мядзведзь, маспане!

Вярнуўся Граф, але прытрымваў верхавога
І на гарод глядзеў. Там не было нікога,
Ды вось яму здалося, быццам у акенцы
Ізноў мільгнула штосьці ў беленькай сукенцы,
І нешта лёгкае зляцела ў зяляніну
І, прашмыгнуўшы цераз грады, праз хвіліну
Паміж зялёнымі свяцілася гуркамі,
Як свеціць промень сонца, трапіўшы часамі,
З-за хмар на крэмень палявы ў заранай скібе
Ці ззяе між травы ў вады маленькай шыбе.

Граф злез з каня, адправіў слуг, што сталі ззаду,
А сам пачаў крадком скіроўвацца ў бок саду.
Знайшоў дзіру ў паркане і не без напору
Праціснуўся ў гарод, як воўк які ў абору.
Няшчасцем закрануў куст агрэсту сухога.
Гародчыка спужалася, і хоць нічога
Вакол сябе не ўбачыла, ды ў момант вока
Ускочыла і апынулася далёка.
А Граф між шчаўя конскага, паміж павою
Праз лапушыную густэчу поўз травою,
Скакаў, як жаба, і, падкраўшыся ўжо блізка,
Заўважыў від цудоўны ў ясных сонца бліках.

Раслі ў той палавіне саду вішні зрэдку,
А паміж імі мешанка на ўсім палетку:
Пшаніца, кукуруза, боб, ячмень вусаты,
Гарошак, проса, кветкі, рад кустоў пукатых.
Гародчык гэты зрыхтавала ахмістрыня,
Калісьці слаўная ў акрузе гаспадыня,
Какошніцкая, з дому Ендыкавічанка,
Для свойскіх птушак. Гэта вось дзялянка —
Адкрыцце цэлае. Той спосаб беззаганны
Спярша быў толькі ёй самою скарыстаны

І найбліжэйшымі сяброўкамі ў сакрэце,
Аж покуль каляндар не раструбіў па свеце
Пра *«Спосаб супроць шулякоў, або Сакрэты
Гадоўлі свойскай птушкі»* — пра гародчык гэты.

Дык вось ледзь толькі певень, вартаўнік кашлаты,
На месцы стаўшы з дзюбаю ўгару паднятай
І грабяністы чуб звярнуўшы трохі бокам,
Каб тым лягчэй нацэліцца ў нябёсы вокам,
Заўважыць дзесьці ў хмарах ястраба цень буры
І ўскрыкне — уміг хаваюцца ў садочак куры,
А нават гусі, павы, і лятуць ад страху
У сховак гуртам галубы з крутога даху.

Цяпер быў без драпежнікаў блакіт высокі,
Ён толькі дыхаў жарам сонечнае спёкі,
Дык птушкі халадок знайшлі ў сваім садочку,
Ляжаць на мураве, купаюцца ў пясочку.

Сярод галоў птушыных у высокім зеллі
Галоўкі дробныя дзіцячыя бялелі
І шыйкі голыя да плечак. З дзецьмі тымі
Была дзяўчына з валасамі больш даўгімі.
За дзетварой сядзеў паўлін. Нібы ў вясёлцы,
Свяціліся ў яго хвасце кругі і колцы.
Галоўкі дзетак на тым фоне цёмна-сінім
Блішчэлі асабліва, быццам на карціне,
Абведзеныя кругам воч паўліных гожа,
Што, як вяночак з зор, прасвечвалі між збожжа,
Між палак кукурузных, распусціўшых коскі,
Між траў ангельскіх, маляваных у палоскі,
І між каралаў шчыру, што з зялёным слязам
І колеры, і формы скрыжавалі разам,
Як быццам срэбра з золатам пераплялося,
Накшталт заслоны лёгкай з кветак, траў, калосся.

Над гушчаром бадылля, кветак, зяляніны
Узняўся балдахін імглісты матыліны —
Рой лёгкіх бабак, што трасуць на небе сінім
Празрыстым светлым крыллем, быццам павуціннe.
Калі яны ў паветры ўюцца лёгкім пухам,

Хоць бзыкаюць, здаецца, што вісяць без руху.

Дзяўчына ўзмахвала пучком уверх узнятым,
Як быццам з пер'я страўса, веерам багатым,
Падумаў бы, што ім дзяцей абараняла
Ад залатога матылёў дажджу. Трымала
Апроч таго ў другой руцэ прадмет якісьці
І дзецям па чарзе давала піць ці ўгрызці
Таго чагосьці залацістага крутога,
Падобнага зусім да Амальтэі рога.

Хоць так занятая, а ўсё ж не давярала
Кусту, што шалясцеў, і ў той бок пазірала.
Не ведала, што вораг абышоў здалёку
І вужам праз загоны поўз з другога боку.
Вось выскачыў з былля. Убачыла — быў блізка,
Праз град чатыры мо, і кланяўся ёй нізка.
Дык адвярнулася, рукамі ўзмахнула
І спуджанаю краскай з месца пырханула,
Ступнямі лёгкімі мільгнуўшы над гародам.
Тут дзеці, спуджаныя Графа надыходам
І ўцёкамі дзяўчыны, крыкнулі трывожна.
Пачула, зразумела, што ніяк не можна
Дзяцей малых пакінуць у перапалоху.
Вярталася назад, зближалася патроху,
Як неахопны дух, прыкліканы закляццем.
Падбегла да найбольш крыклівага дзіцяці,
Прысела да яго, туліць да ўлоння стала,
Другое гладзіла, суцішвала ласкава.
Памалу сціхлі ўсе, галоўкі затулілі
Ў яе падол, як птушаняты маці ў крыллі.
Яна тады прамовіла: «Ну ці ж прыгожа
Крычаць так? Вас спалохацца пан гэты можа.
Пан страшыць не прыйшоў, не старац ён хаджалы,
А госць, пан добры, гляньце — вунь які ўдалы».

І глянула сама. Прыемна Графу стала,
Ён усміхнуўся ёй за ўсе яе пахвалы.
Агледзелася, змоўкла, апусціла вочы,
І фарба ружы ўкрыла твар яе дзявочы.

А ён і быў удалы: ростам быў высокі,
Хоць з твару і худы, а свежыя меў шчокі
І вочы сінія, а волас белаваты,
Даўгі, хоць, праўда, ў гэты час крыху калматы
І поўны лісту, цэлы бо вянок зялёны
Уплёўся Графу ў чуб, як лез ён праз загоны.

«О ты! Якім бы я цябе ні ўважыў званнем,—
Прамовіў ён,— багіняй, німфаю ці зданню,
Кажы, ці ўласнай воляй ты к зямлі прыстала,
Ці ўлада ворага цябе тут прыкавала?
Ах, здагадаўся: не інакш, любоўнік злосны
Якісьці пан-багач ці апякун зайздросны
Цябе замкнёнаю трымае ў парку гэтым!
Ты, вартая быць рыцарскіх баёў прадметам
І гераіняю раманаў, эпасаў жалосных,
Даверся мне ў сваіх цяжкіх, магчыма, лёсах,
Я буду збаўцам! Дык валодай жа ў спакоі,
Ты, сэрцаў уладарніца, маёй рукою!»
І выцягнуў руку.

Яна ў румянцы кволым,
Але з абліччам слухала яго вясёлым.
Так за малюнкам дзіцянё вачыма водзіць
І ў водбісках лічыльнікаў гульню знаходзіць,
Перш, чым пазнае вартасць іх; так слых ласкала
Ёй гутарка яго, а змест даходзіў мала.
Дык проста запытала: «Скуль пан прыбывае?
Чаго, пан дабрадзей, па градах тут шукае?»

Збянтэжыўся, здумеўся Граф, адкрыўшы вочы,
Маўчаў. Пасля сказаў, зірнуўшы ў твар дзявочы,
Інакшым тонам: «Выбачайце, перашкодзіў,
Відаць, я ў гулях! Ах, я тутка вось праходзіў
На снеданне — пара ўжо, не хацеў спазніцца.
Дарогай, ведама, прыйшлося б мне кружыцца,
А праз гарод, здалося мне, прасцей намнога».
Яна сказала: «Вось, ягомасць, тут дарога,
Але не трэба град псаваць, там ёсць ля дрэва
Сцяжынка». Граф спытаў: «Направа ці налева?»

Гароднічка, падняўшы вочкі са спакоем,
Старалася уцяміць, што тут ёсць такое,
Бо дом — за крокаў тысячу, як на далоні,
А ён пытае пра дарогу? Ды Граф сёння
Ахвоту меў пагаварыць, шукаў нагоду
Да гутаркі. «Вы жывяце тут, ля гароду?
Ці ў вёсцы? У двары, чамусьці, я не бачыў
Паненкі. Тут даўно? Прыезджая, няйначай?»
Яна крутнула галавой. «Прабач, паненка,
Ці панна там жывеш, дзе тое вунь акенка?»
І думаў: «Што ж, няхай яна не гераіня
Рамансаў, але ёсць чароўнасць у дзяўчыне.
Бывае, мысляў скарб, захованы глыбока,
Як ружа між лясоў, цвіце дзесь адзінока,
А вынесі яго на свет, дзе сонца ззяе,
Адразу тысячамі фарбаў задзіўляе!»

Гароднічка тым часам моўчкі з месца ўстала,
Малое падняла, што больш за ўсіх крычала,
Другое ўзяўшы за руку, ўсім карагодам,
Нібы за гуртам гусак, рушыла гародам.

А азірнуўшыся, сказала: «Ці не можа
Пан птушак спуджаных сагнаць назад у збожжа?»
«Я — птушак заганяць?»— спытаў Граф са здзіўленнем.
Яна тым часам знікла па-за дрэваў ценем.
Хвіліну з-за кустоў, з-паміж зялёных звояў
Яшчэ свяціла штосьці, як бы вочак двое.

Граф доўга ў садзе думаў адзінока,
Душа яго зацягвалася шэрым змрокам
І, як зямля з заходам сонца, астывала.
Хацеў памарыць, але мараў не ставала.
Прачнуўся, сам не ведаў, на каго злаваўся,
На жаль, знайшоў не многа — лішне спадзяваўся!
Бо ў час, калі к пастушцы падпаўзаў загонам,
Гарэла ў галаве, а сэрца біла звонам —
Такую прыгажосць ён у русалцы бачыў
І ўсё вакол цудоўна так тлумачыў!
А ўсё знайшоў інакш: твар, праўда, быў прыгожы,
А стан зусім яшчэ не складзены. Быць можа,

Што тая шчок акругласць і румянца жывасць,
Малюючы яе прасцяцкую шчаслівасць,
Не сведчаць, што спіць думка, сэрца спачывае,
Ды вёска ж праз яе адказы праглядае!
«Няма сумнення,— крыкнуў,— я ўжо ўпэўнен цалкам:
Гусей пасе мая таемная русалка!»

А са знікненнем німфы чар быў зразу зняты
З усёй карціны той: вось залатыя краты
І стужкі ўміг саломай сталі з каласкамі.

Граф з заламанымі глядзеў цяпер рукамі
На жменьку шэрай, звязанай травой мятліцы,
Што пер'ем страўсавым умела серабрыцца.
А конаўка, што ў дзеўчыны руках так ззяла,
Той Амальтэі рог, звычайнай морквай стала —
Ён бачыў, як дзіця яе жавала хціва.
Дык і расплыўся чар, развеялася дзіва.

Юнак, калі цыкорыі заўважыць кветку,
Што вабіць мяккасцю далонь, і неўзаметку
Дыхне, узяўшы ў рукі, дык з паветра рухам
Рассыплецца ўся тая кветка лёгкім пухам.
І вельмі здзівіцца дапытлівы хлапчына,
Як з кветкі застанецца голая сцябліна.

Граф, капялюш націснуўшы, назад вяртаўся,
Але дарогу ўсё ж пакараціць стараўся:
Па агародніне, праз кветкі, агрэст крочыў,
Аж уздыхнуў, як агароджу пераскочыў.
Прыпомніў, што казаў пра снеданне дзяўчыне.
А можа бачыў хто яго а той хвіліне,
Як быў з ёй у гародзе? Мо пачнуць шуканне?
І што падумаюць пра гэткае спатканне?
Вярнуцца выпадала. Дык крадком за плотам,
Праз зелле меж, зрабіўшы сотні паваротаў,
Нарэшце выбраўся шчасліва на гасцінец,
Што проста ў дворны накіроўваўся дзядзінец.
Ішоў ля плоту, ды ад саду твар адводзіў,
Як злодзей ад каморы, у якой нашкодзіў,
Ці думае пабыць у ёй у зручным часе.

Хітрыў Граф, хоць за ім мо сочка не вялася.
У супроцьлеглы саду бок глядзеў — управа.

Быў скрозь травой заросшы гай стары, радкавы.
Як па кілімах, ля бярозак беластвольных
Пад навессю шатроў зялёных і прывольных
Снавалі постаці. Нагадвалі іх рухі
То танцы дзіўныя, то нейкіх дзіўных духаў
Блуканне ў бляcках месяца. Адны у чорных
І цесных вопратках, другія ў больш прасторных
І белых, быццам снег. Той з голай галавою,
Той пад брылём шырокім, тыя, бы чалмою,
Як светлым воблакам, галовы агарнулі
І, як камета хвост, канцы яе цягнулі.
У кожнага свой выгляд: з месца той не сходзіць,
Адно вачыма, долу спушчанымі, водзіць,
Той, гледзячы наперад, быццам сонны, крочыць,
Як па канаце, і нікуды ўжо не збочыць.
А ўсе згінаюцца к зямлі памалу, сонна,
Зусім, як быццам адбіваючы паклоны.
Калі ж адзін супроць другога раптам стане,
Маўчаць і разыходзяцца без прывітання.
Усе ў задуме, ўсе ва ўладзе летуценняў.
Граф думаў, што ён бачыць элізейскіх ценяў,
Што хоць не ведаюць зямных клапот і ліха,
Блукаюць сумныя павольна, моўчкі, ціха.

Ды хто пазнаў бы ў гэтых марах ледзь рухомых,
У тых людзях маўклівых, нам ужо вядомых
Гасцей, сяброў Суддзі? З шумлівага снядання
Пайшлі ўсе на ўрачыстае грыбоў збіранне.
Як людзі з розумам, што ўмеюць карыстацца
І рухамі, і мовай, каб дапасавацца
Да кожнага выпадку, месца і звычаю,
Яны прад тым, як рушыць за Суддзём да гаю,
Від новы прынялі і вопраткі другія:
Плашчы кужэльныя, шырокія, даўгія
Панацягалі зверху на свае кунтушы,
Брылі-капялюшы насунулі на вушы,
Дык і бялелі, быццам тыя ў чысцы душы.
І моладзь перапранена, ’проч Талімэны

І тых-сіх моднікаў французскіх.

Гэтай сцэны
Не ўцяміў Граф, не знаў вясковага звычаю,
Дык здзіўлены надзвычай падбягаў да гаю.

Грыбы ўрадзілі. Хлопцаў просяць пакланіцца,
У песнях слаўныя, румяныя *лісіцы* —
Дзявоцтва сімвал, бо іх чэрві не з'ядаюць
І, дзіўна, насякомыя не абсядаюць.
Паненкі дык *баравіка* ўсё выглядалі,
Якога песні ў нас палкоўнікам назвалі.
А ўсе *рыжка* шукаюць; ён хоць і сціплейшы,
І менш у песнях слаўны, але найсмачнейшы
Ці солены, ці свежы, у любую пору.
А Войскі дык збірае толькі *мухаморы*.

І іншыя грыбы, пакінутыя ў браку
З прычыны ядавітасці ці злога смаку,
Карысць сваю даюць: звярыне служаць ежай,
Гняздом кузуркам, гай малююць фарбай свежай.
На абрусе зялёных траў лясной паляны,
Нібы сталовае суддзё парасстаўляны:
Судзіначкі чырвона-жоўтых *сыраежак*
З вінам празрыстым, серабрыстым, ясным, свежым,
Казляк, як быццам кубка дно, пукаты, клейкі,
Як смуклыя шампанскія кілішкі — лейкі,
А *белякі* далёка свецяць між паляны,
Як малако ў вялікіх кубках паліваных
І, пылам шэрым поўная, сядзіць у цені,
Як перачніца, *порхаўка*. Другіх найменні
Мо толькі ёсць у зайчай або воўчай мове,
Іх людзі ж не хрысцілі, гай і так іх повен.
Ніхто ні зайчых, ані воўчых не збірае,
А хто, нагнуўшыся, сваю памылку заўважае,
У гневе зломіць грыб або нагой падкіне.
Не месца гэтакім слядам на зеляніне.

Людскіх ні воўчых Талімэна не збірае,
Рассеяная, нудна вокал пазірае,
Задраўшы галаву. Пан Рэент дык у гневе

Казаў, што мо прыйшла шукаць грыбоў на дрэве.
Асэсар з’едліва назваў яе ільвіцай,
Што месца выглядае, дзе б гняздом спыніцца.

Яна ж, відаць, шукала ціхай адзіноты
І, ў грамадзе хадзіць не маючы ахвоты,
Да ўзгорачка ляснога крокі скіравала,
Дзе ценю больш, дзе больш магутных дрэў стаяла.
Між дрэў прасвечваў камень; ручаёк пад глыбай
Журчаў і пырскаў, а пасля шкляною шыбай,
Як бы шукаючы цяньку, хаваўся ў зелле,
Якое над вадой буйное лісце сцеле.
Там шустры той дуронік, у траву спавіты,
Лістамі падасланы, ад вачэй закрыты,
Знячэўку пачынае ціханька шаптаці,
Падобным стаўшы да крыклівага дзіцяці,
Якому зыбку маці ахіне ў радзюжку
І макаўя, каб спала, ўложыць пад падушку.
Ахвотна Талімэна тут адпачывае
І гэты кут *Святыняй думак* называе.

На бераг ручая на зелень разаслала
Свой шаль кашміровы колеру карала,
А потым, як плыўчыха, што к вадзе хінецца
Памалу, покуль першы раз не акунецца,
Укленчыла і стала нахіляцца бокам
І, схопленая тым каралавым патокам,
Апала на яго і цела распасцёрла,
Аблакацілася, рукамі твар падпёрла,
Схіліла галаву. І ў той жа міг у зеллі
Лісты французскай кнігі ярка заблішчэлі.
Над алебастрам распасцёртага рамана
Вілася косаў смоль істужкай пасплятана.

Ў травы смарагдзе, на крываўнікавым шалі,
У доўгай сукні — яснай пляме на карале,
З канца якой блішчэў прычоскі кок вялікі,
А на другім канцы чарнелі чаравікі
І ззяла бель між імі рук, панчошак, твару,
Яна была зусім, як вусень, што з гушчару
Павольна выпаўз на кляновы ліст.

Ды толькі
Малюнка гэтага краса, прынадаў столькі
Дарма чакалі знатакоў — ніхто не гляне
Ў той бок, так захапіла ўсіх грыбоў збіранне.
Аднак Тадэвуш наглядаў, пастрэльваў вокам
І ледзь прыкметна пачынаў зближацца бокам,
Як паляўнічы, што ў рухомай з голля будцы
Стараецца на колцах к дрофам падцягнуцца
Ці, севак ловячы, канём сябе прыкрые,
Ідзе каля сядла, або пад конскай шыяй
І быццам барануе ці мяжой праходзіць,
А сам што раз бліжэй да птушак падыходзіць.
Так краўся і Тадэвуш.

Мусіў запыніцца
Аднак, бо вось Суддзя зближаўся да крыніцы.
Гулялі з ветрам полы апранахі белай
І хустка, што канцом на поясе вісела,
А саламяны брыль, падвязаны за вухам,
Хістаўся, як лапух, услед за кожным рухам,
То ападаючы на плечы, то на вочы.
Вось гэтак з посахам Суддзя палянай крочыў.
Перш чым прысесці, к Талімэне прыступіцца,
Нагнуўся, рукі вымыў з берага ў крыніцы,
Апёрся на слановай булдавешцы кія,
На камень сеў і словы стаў казаць такія:

«Бач, ваша, з часу, як да нас прыбыў у госці
Тадэвуш, неспакой мяне гняце чагосьці.
Я сам стары, бяздзетны, гэты ж вось хлапчына
Ўсяго маёй уцехі, і такім вось чынам
Майго багацця ён наследнік. З ласкі неба,
Пакіну неблагі яму кавалак хлеба.
Пара падумаць пра яго усталяванне,
Ды толькі вось на клопат мой хай ваша гляне:
Мой брат, пан Яцак, бацька Тадавушкаў, знаеш,
Які дзівак,— яго намераў не згадаеш.
Вандруе і не хоча да сваіх вяртацца,
Не хоча сыну нават, што жыве, прызнацца,
А ўсё кіруе ім. То ў легіён меў планы
Яго паслаць... Я гэтым быў засумаваны

І ледзь дабіўся згоды, каб застаўся ён тут дома
І ажаніўся. Ажаніўся б ён, вядома,
Я пару ўжо нагледзеў. У ва ўсёй акрузе
Для Падкаморага па знатнасці, заслузе
Няма раўні. Старэйшая іх дочка Ганна
На выхадзе — прыгожая, з пасагам панна,
Спытаць хацеў я». Талімэна пабялела,
Зложыла кнігу, паднялася раптам, села.

«Клянуся мамай,— мовіла,— мой пане браце,
Які ж тут сэнс? Дзе ж ваша аб жыцці паняцце?
Дык думаеш Тадэвушу стаць дабрадзеем,
Зрабіўшы юнака такога грэчкасеем?
Завяжаш свет яму, павер, клясці вас будзе!
Такія таленты ў сяле зглуміць, у брудзе!
Павер, ён здольнае дзіця, як я пазнала,
І варта, каб ён свет пабачыў многа-мала.
Брат, добра зробіш, як пашлеш яго ў сталіцу,
Напрыклад, у Варшаву. Ці мо лепш спыніцца
На Пецярбурзе? На зіму туды, быць можа,
Ізноў паеду я. Мо ў гэта падарожжа
Тадэвуша б паслаць? Я там знаёмствы маю,
Уплывы. Гэта ж на карысць было б, я знаю.
З маёй падмогай ён прыняты ўсюды будзе,
А калі важныя яго пазнаюць людзі,
Чын атрымае, ордэн. Ну тады б падацца
Мог і ў адстаўку і дамоў сабе вяртацца,
Здабыўшы і значэнне, і знаёмства свету.
А, брат, як думаеш?» «Яно, у пору гэту,—
Сказаў Суддзя,— хлапцу праветрыцца шмат значыць,
Паміж людзьмі працерціся і свет пабачыць.
Я сам у маладосці выездзіў нямала,
Быў у Пятркове, ў Дубне. То за трыбуналам
Я палястрантам вандраваў, то зноў па справе
Пабыць мне давялося нават і ў Варшаве.
І скарыстаў не мала! Дык скажу зараней,
Што хлопца выправіў бы ў свет для вандравання,
Як шлюць рамесніка, каб практыкі набраўся,
Няхай бы ён са светам трохі запазнаўся,
А не для ордэнаў і ранг! Прашу прабачыць,
Ну што той ордэн царскі ў нас сягоння значыць?

Які ж у нас з паноў, ні то што каб важнейшых,
А толькі так між шляхтай трохі багацейшых
Пра гэту дробязь дбае? Але ж у *estymie*
Яны ў людзей, бо мы шануем род і імя,
А калі чын, дык земскі, выбарам прызнаны
Грамадскім, а не з нечай ласкі дараваны».
«Тым лепш,— сказала Талімэна,— дык брат можа
Яго як ваяжыра слаць у падарожжа».

«Хацеў,— сказаў Суддзя на гэта ў задуменні,—
Ды новыя, сястра, паўсталі затрудненні.
Пан Яцак не спускае з-пад апекі сына
І мне прыслаў якраз на карак бернардына
Рабака. Ён прыбыў з-за Віслы, з-за Варшавы,
Прыяцель брата, ведае ўсе нашы справы.
Яны рашылі аб Тадэвушавым лёсе
І хочуць, каб Тадэвуш ажаніўся з Зосяй,
З Васпані выхаванкай. Мелі б ва ўладанні,
Апроч маёй фартункі, Яцкавы ўкладанні
У капіталах. Ваша, ведаеш, што мае
Ён капітал, грош не малы ў мяне трымае
І можа ім распараджацца. Ваша, зможаш
Усё абмеркаваць, ці справе дапаможаш.
Іх трэба пазнаёміць. Можа ранавата
Для Зосі замуж, ды не шкодзіць гэта сватам.
Пара б ужо нам Зосі не трымаць у хаце,
Бо, мабыць, вырасла яна ўжо з дзіцяняці».

А Талімэна ў сполаху і ў задзіўленні
Прыпадымалася, устала на калені,
Перш пільна слухала, пасля далоні рухам
Пярэчыла, рукой махаючы над вухам
І, быццам мух, зганяючы за словам слова
Назад прамоўцы ў вусны.

«А вось гэта нова!
З чаго Тадэвуш будзе ў выйгрышы ці ў шкодзе,—
Сказала з гневам,— думай сам, васпан дабродзей,
Бо мне ён што? Як хочаце аб ім судзіце,
Зрабіце аканомам ці ў карчму садзіце,
Хай шынкаруе ці звярыну з лесу носіць,

З ім вы што хочаце рабіце, але... Зосі!
Васпанству што да Зосі? Я, без умяшання,
Яе рукой кірую! Што на выхаванне
Яе даваў пан Яцак грошы, што выплачваў
Ёй пенсійку, што, быццам, большую назначыў,
То не купіў яшчэ яе! Для вас сакрэту
Няма, і ведама ўсяму наўкола свету,
Што вашы шчодрасці для нас не без прычыны,—
Гарэшкам жа Сапліцы тое-сёе вінны!»
(Суддзя канец прамовы выслухаў на дзіва
Збянтэжана, у жалі і амаль гідліва,
Нібы баяўся слоў далейшых, нахіліўся,
Рукой патакваў, але твар крывёй наліўся.)

«Я ёй сваячка,— Талімэна так казала,—
Я апякунка, Зосю я узгадавала,
І клопат толькі мой аб выхаванкі лёсе!»
«А мо знайшла б у тым замужжы шчасце Зося?—
Сказаў Суддзя, падняўшы зрок.— Мо Тадавушка
І ўпадабала б?» «Гэта — на вярбе ігрушка.
Палюбіць, не палюбіць — гэта мала важна!
Хоць Зося і не будзе вельмі ўжо пасажнай,
Ды не з абы сяла яна, абы шляхцянка:
Яна — з яснавяльможных і ваявадзянка
Ад маці Гарашчанкі! Мужа ўміг дастане!
Мы ж так стараліся, каб даць ёй выхаванне!
Хіба б здзічэла тут». Суддзя ўсё пільна слухаў,
У вочы гледзячы, пасля сабраўся з духам
І весела сказаў: «Ну што ж, сястрыца,
Бог бачыць, шчыра я хацеў дагаварыцца,
Прашу не гневацца. Што ж, ваша, я з тым згодзен,
Пярэчыць мае права; дык размовы годзе
Пра гэту справу. Я пытаў па просьбе брата.
Ганьбуеш, ваша, маладога, дык для свата
Цяпер пісьмом даць звестку Яцку застаецца,
Што Зося за Тадэвуша не аддаецца.
Цяпер сам буду дзейнічаць, мо з Падкаморым
Сватоўства распачнём і справу абгаворым».

Праз той час Талімэне трохі астывала:

«Памалу, браце, я зусім не ганьбавала!
Брат сам казаў, што ранавата ім пабрацца,
Дык пачакайма, паглядзім, чаго ж спяшацца?
Вось пазнаёмім маладых і асцярожна
Разважым. Шчасцем іх рызыкаваць не можна.
Прашу аднак вас, пане браце, устрымацца
З намовамі яго у Зосю закахацца,
Бо сэрца не нявольнік, не прызнае пана
І ў кайданы сілком не можа быць скавана!»

Затым Суддзя ў задуме ад яе падаўся.
З другога боку пан Тадэвуш набліжаўся,
Від робячы, што грыб яго ў глыб лесу зводзіў.
І Граф у гэтым жа напрамку падыходзіў.

У той час, як Суддзя сядзеў тут з Талімэнай,
За дрэвам Граф стаяў. Задзіўлены той сцэнай,
Дастаў з кішэні алавік, лісток паперы,
Што пры сабе насіў, і, мастакоў манерай
Апёршыся на ствол, заняўся пільна маляваннем,
Гаворачы з сабой: «З такім вось згрупаваннем
Не часта стрэнешся: яна ў траве, і ў пары
З ёй ён на камені — кантраставыя твары,
Тыповыя галовы!»

Падыходзіў бліжай,
Спыняўся, цёр ларнет і вочы, гнуўся ніжай
І ўсё глядзеў: «Няўжо ўсе цені, фарбы, ўзбліскі
Загінуць, зменяцца, калі падыдзеш блізка?
Той аксаміт травы абернецца ў бацвінне,
І ўбачыш, што русалка — проста ахмістрыня?»

Хоць Граф і перад гэтым з Талімэнай знаўся,
Бо з ёю у Суддзёвым доме сустракаўся,
Ды ўвагі асаблівай не звяртаў, бывала,
Дык дзіву даўся, што яна мадэллю стала
Яго малюнку. Месца пышнасць, густ убрання
Змянілі выгляд памятны яму да-звання.
Яшчэ гарэлі вочы непатухшым гневам,
А твар, ажыўлены лясных вятроў павевам,

Кніга пятая

Ваенная нарада

Книга пятая

Военный совет

Księga piąta

Rada wojenna

Размоваю з Суддзём, з'яўленнем хлопцаў гожых,
Стаў шмат свяжэйшым, больш румяным і прыгожым.

«За смеласць,— Граф сказаў,— прашу прабачыць, пані.
Прыходжу перапрошваць і нясу прызнанні:
Прашу прабачыць, што сачыў я пані крокі,
І дзякую, што сведкам дум быў адзінокім.
Я так зняважыў! Вінаваты вельмі многа!
Я ж перашкодзіў думкам, ды, сваёй дарогай,
Натхненне зведаў. Гневайся на чалавека,
Ды мастаку даруй, усцеш сваёй апекай!
Адважыўся на шмат, ды большае наважыў:
Судзі!»— укленчыў і падаў свае пейзажы.

Судзіла Талімэна малявання спробы
З прыхільнасцю мастацтвы знаючай асобы:
Хваліла скупа, а ахвоты паддавала.
«Віншую, Граф,— сказала,— таленту не мала!
Адно не закідай, пан! Асабліва трэба
Шукаць красы ў натуры. Шчаснае ты, неба
Італіі! Сады цазараў, руж прынады,
Класічныя на вечным Тыбры вадаспады
І Паўзыліпа страшныя пячоры, скалы!
Вось, Граф, дзе край мастацтва! А наш край адсталы!
Дзіця муз, зданае ў Сапліцаве на мамкі,
Памрэ напэўна. Граф, я ўстаўлю гэта ў рамкі,
Або ўлажу ў альбом. Малюнкі я збіраю
Даўно і многа іх у бюрку ўжо хаваю».

І павялі размову пра блакіты, горы,
Пра водары вятроў, пра шумы хваль у моры,
Прымешваючы ўсцяж, турыстаў злым звычаем,
То тут, то там насмешкі, жарт над родным краем.

А ў той жа час ля іх ва ўсёй красе бясконцай
Літоўскія лясы шумелі ў бляску сонца.
Чаромхі, пасплятаныя вянкамі хмелю,
Рабіны, што румянцам маладым гарэлі,
Ляшчына ў зелені жазлоў, нібы мянада,
Уся ў арэхах, як у гронках вінаграда.
А нізам песціцца з шыпшыннікам каліна,

І туліць да малін свой чорны твар ажына.
Кусты і дрэвы лісцем рукі працягнулі,
Як хлопцы і дзяўчаты, распачаўшы гулі
Навокал пары маладых. А ў гэтым коле
Ёсць пара, што ўзвышаецца над наваколлем
Высмукласцю і колераў сваіх прывабам,—
Бяроза белая, нявеста, з мужам-грабам.
А рэшта, як старыя, на дзяцей і ўнукаў
Глядзяць маўкліва: тут паважных колькі букаў,
Там цёткі-топалі і, мохам барадаты,
Дзед-дуб, што пяць вякоў усклаў на хіб гарбаты.
Стаіць ён, быццам на слупах грабніц разбітых,
На скамянелых трупах продкаў знакамітых.

Тадэвушу размова доўгая задзела
Таму, што ён не мог прымаць у ёй удзелу.
А як пачуў чужой прыродзе гімн няспынны,
Калі расхвальваліся поўдня ўсе расліны:
Лімоны, кіпарысы, апяльсін, мігдалы,
Альвасы, кактусы, магоні ды сандалы,
Павой, гарэхі, нават фігі і масліны —
За надзвычайныя іх кветкі і сцябліны,
Тадэвуш больш яшчэ стаў гневам загарацца
І ўрэшце ўжо ад злосці сіл не меў стрымацца.

Быў ён прасцяк, ды з сэрцам чулым і уменнем
Адчуць красу прыроды, дык сказаў з натхненнем:
«Не раз я ў Вільні ў батанічным агародзе
Глядзеў на тыя дрэвы, што растуць на ўсходзе
Ці дзесь пад італьянскім сонечным сугрэвам.
Якую ж з тых раслін зраўняеш з нашым дрэвам?
Ці той альвас-грамаадвод з зялёных палак,
Ці карліцу-лімон за золата тых галак,
Што ў лакавых лістах блішчаць спіной пукатай,
Як модніца старая ў вопратцы багатай?
Ці той мо кіпарыс худы і даўганогі,
Які не сум наводзіць, а нуду, трывогі?
Ён, кажуць, сумна выглядае на магіле,
Бо ён, як лёкай той, якому узлажылі
Жалобу, што ні рук ні ўзняць, ані схіліцца,
Хоць ён і так парушыць этыкет баіцца.

Ці ж горшы выгляд нашай сціплае бярозы,
Што як сялянка, калі лье па сыну слёзы,
Або ўдава па мужу — рукі заламае,
Струменні кос распусціць і стаіць нямая
І боль пастаццю ўсёй сваёю выражае!
Чаму ж пан Граф, калі мастацтва паважае,
Дрэў нашых не малюе, што вось зеляняцца?
Сапраўды, і суседзі будуць з вас смяяцца,
Што, ва ўраджайнай нашай жывучы краіне,
Малюеце ўсё скалы толькі ды пустыні».

«Мой дружа,— Граф сказаў,— уся краса ў прыродзе
Ёсць толькі формай, тлом, матэрыяй і годзе.
А творчаю душой з'яўляецца натхненне
І густу паліроўка, правілы і ўменне.
Не хопіць рэчаіснасці ці на'т запалу,
Мастак ляцець павінен к сферам ідэалу!
Не ўсё прыгожае павінна добра выйсці!
Пра гэта ў кнігах прачытаеш, пан, калісьці.
Што тычыцца мастацтва: для малюнка трэба
Ансамбля, групы, пунктаў гледжання і неба
Італіі. Таму і цвіў там жанр пейзажа,
Цвіце і будзе цвісці, гэта кожны скажа.
Бо вось, 'проч Брэйгеля, але не Ван дэр Гэлле,
А пейзажыста (бо былі аж два Брэйгелі),
І апроч Рэйсдаля, на поўначы, прызнацца,
Не знойдзеш чым у пейзажыстаў захапляцца.
Нябёс, нябёсаў трэба!» «Наш мастак Арлоўскі,—
Сказала Талімэна,— густ меў сапліцоўскі.
(Прашу не забываць сапліцаўскай хваробы:
Апроч Айчыны ім нішто не да спадобы.)
Арлоўскі, што жыццё правёў у Пецярбурку
(Яго эцюдаў некалькі я маю ў бюрку),
Жыў ля цара ў двары, ну проста, нібы ў раю,
А не паверыш, Граф, усё тужыў па краю.
Любіў расказваць нам з дзяцінства успаміны
І ў Польшчы ўсё хваліў: лес, неба і даліны...»

«І розум меў!— сказаў Тадэвуш з жарам жвава,—
Бо небу італьянскаму за што ў нас слава?
Пустое, сіняе яно, як шыба лёду.

Па-мойму, неба прыгажэе ў непагоду.
У нас даволі вочы ўзняць, і ў рухах хмары
Убачыш мноства фарбаў, сцэн, малюнкі, чары,
Бо хмары розныя. Асенняю парою,
Як чарапаха, хмара сунецца гарою,
Пузатая вадой, к зямлі спускае косы —
Дажджу шырокія празрыстыя палосы.
А хмара з градам сунецца аэрастатам,
Блакітна-цёмная з адценем жаўтаватым —
Вялікі шум чуваць вакол. І проста хмаркі
Цікава выглядаюць, бег іх лёгкі, шпаркі.
Яны, як лебедзі ці гусак гурт плывучы,
А вецер, быццам сокал, гоніць іх да кучы,
Дык ціснуцца, растуць, грубеюць... што за дзіва?
Вось шыі выгінаюць, распускаюць грывы
І, выставіўшы ног рады, па неба склепе
Ляцяць, як дзікіх коней табуны па стэпе —
Усе, як срэбра, белыя. Зноў замяшанне:
Праз момант з каркаў мачты, ветразь з грыў устане —
Табун стаў караблём, і вось па сіняй далі
Яго пад ціхім ветрам хвалі загайдалі».

Граф з Талімэнай пазіралі пільна ўгору,
Тадэвуш хмару паказаў і ў тую ж пору
Другой рукой пацііснуў ручку Талімэны.
Мінула некалькі хвілін той ціхай сцэны,
Граф ліст паперы палажыў на капялюшык
І алавік дастаў. Аж раптам рэзнуў вушы
Удар у дворны звон, і ўслед за першым рэхам
Азваўся ціхі лес гуканнем, крыкам, смехам.

Граф галавой кіўнуў, прамовіў сумным тонам:
«Вось гэтак лёс канчае ўсё на свеце звонам —
Разлікі думак нашых, уяўленні, планы,
Нявінную гульню і дружбы гарт каваны,
І сэрцаў чулых голас. Хай медзь зарыкае,
І ўсё мяшаецца і рвецца, і знікае!»
На Талімэну глянуўшы, пасля хвіліны
Спытаў: «А што ж нам застаецца?» «Успаміны»,—
Прамовіла і, каб пацешыць Графа ў смутку,
Дала яму, сарваўшы, кветку-незабудку.

Граф кветку к вуснам прыпаднёс, чапляў к жакету.
Тадэвуш кусцік расхінаў у пору гэту,
Заўважыўшы, што нешта між лістоў бялее
Што раз бліжэй. Была там ручка, як лілея.
Схапіў яе і вуснамі тануў паціху
У ёй, нібы пчала у лілii кяліху.
Пачуў на вуснах холад, ключ заўважыў шэры
І побач, трубкай скручаны, лісток паперы.
Схапіў, схаваў, не ведае, што ключ той значыць,
Ды беленькі лісток, напэўна, растлумачыць.

А звон званіў, і з нетраў лесу разам з рэхам
Нясліся галасы з гуканнямі і смехам —
Хор розных поклічаў склікання і шукання —
Сігнал закончанага ўжо грыбоў збірання.
Не сумна звон званіў, і Граф таго не ведаў,
Што звон быў не хаўтурны, а склікаў к абеду.
Звон гэты кожны поўдзень з-пад страхі гукае
І ўсіх гасцей і чэлядзь на абед склікае.
Як адгалосак даўняга ў дварах звычаю,
Ён захаваўся і ў Суддзі. Дык зараз з гаю
Выходзіць гуртам госці пачалі з кашамі,
Кашолкі поўныя набраўшы, з вузялкамі.
Паненкі неслі у руках дзеля паказу
Вялізны б а р а в і к , як веер або вазу,
А побач, быццам кветкі, што растуць ля сцежкі,
А п е н ь к і і ўсялякіх фарбаў с ы р а е ж к і .
А Войскі нёс свой м у х а м о р . Ды толькі дрэнна
Грыбы збіралі Граф, Тадэвуш, Талімэна.

Парадкам госці увайшлі. Праз час каторы
За стол з паўкруга першы рушыў Падкаморы.
(За важны чын і ўзрост яму тут гонар гэткі.)
Ён дамам кланяўся, старым і малалеткам.
Пры ім стаў ксёндз-манах, Суддзя пры бернардыне.
Бернардын памаліўся хутка па-лаціне,
Пасля далі гарэлку, а затым паселі
І халаднік літоўскі моўчкі жвава елі.

Абед цішэйшы быў, чым іншым днём бывала.

І хоць Суддзя бадзёрыў, гутарылі вяла,
Бо тыя, хто за гончых сёння быў у звадзе,
Спынялі, пэўне, думкі на сваім закладзе,
А веліч дум, звычайна, вусны зачыняе.
Размовы толькі Талімэна не спыняе:
З Тадэвушам гаворыць, Графу слоўца кіне
І зрок спыняе на Асэсаравай міне.
Вось гэтак, на шчыглоў нарыхтаваўшы сетку,
Лавец пільнуе вераб'ёў. А на суседку
Глядзяць Тадэвуш з Графам. Кожны з іх шчаслівы,
Напоўнены надзеяй і таму маўклівы.
Граф штораз з гонарам свой зрок звяртаў на кветку,
Тадэвуш на кішэнь касіўся неўзаметку,
Ці ключык той не ўцёк, і поўны неспакою
Лісточак непрачытаны круціў рукою.
Суддзя, хоць Падкамораму віна ў кяліхі
Ўсё падліваў і кланяўся, і сам быў ціхі,
І гутарыць не меў звычайнае ахвоты,
Відаць, перажываў ён нейкія клапоты.

Міналі стравы, моўчкі сходзіў час абеду,
Аж раптам уварваўся ў нудную бяседу
Неспадзяваны госць — ляснік. Паходкай жвавай,
Нягледзячы на час абедні, з нейкай справай
Падбег да пана. Адгадаеш з рухаў, з міны,
Што пасланец ён нейкай важнае навіны.
Звярнулі вочы на яго паны і пані,
А ён, адсопшыся, сказаў: «Мядзведзь, маспане!»
І рэшту адгадалі ўсе: што з цёмнай гушчы
Звер выйшаў і што краўся з Занямонскай пушчы,
Што трэ'дагнаць яго. У момант зразумелі,
Хоць абсудзіць той справы часу йшчэ не мелі.
Супольнасць думак праявілася адразу
Праз жэсты рук, праз сэнс загаду ці наказу,
Якіх хоць многа загуло ў хвіліну гэту,
Ды ўсе яны адну на ўвазе мелі мэту.

«Ў сяло,— сказаў Суддзя,— хай сотнік скача жвава!
Паклікаць дабравольцаў, бо чуць свет — аблава!
Хто з пікай вырушыць ахвотна, без адказу,

Таму спісаць пяць дзён і дзве шарваркі зразу!»

А Падкаморы крыкнуў: «Зараз жа на Сівай
Скакаць ка мне у двор і, захапіўшы жыва
Дзве п'яўкі, слаўныя заядласцю й навукай —
Сабака Спраўнікам завецца, Страпчай — сука,—
Ў мяхі ўвапхнуць, у морды затычкі заправіць
І конна, для паспешнасці, сюды даставіць!»
«Гэй, Ванька!— закрычаў Асэсар рускай мовай,—
Цясак бруском звядзі! Каб мне было гатова
Усё! Цясак — Сангушкі князя падарунак,
Паняўў Правер і ў пасе кожную з ладунак!»
«Рыхтуйце стрэльбы!» — ўсе крычалі ўсхвалявана.
Асэсар волава шукаў. «Куль трэба алавяных!—
Крычаў.— Я форму ў торбе маю!» «Да плябана,—
Сказаў Суддзя,— паслаць ганца, каб заўтра рана
Прыбыў імшу адправіць у лясной капліцы —
Святому Губерту за ўдачу памаліцца».

Пасля загадаў тых усе пазамаўкалі,
Задумаліся, быццам між сабой шукалі
Кагосьці. І міжволі ўсіх прысутных вочы
Твар Войскага старога цягне, адзіночыць.
Відаць, правадыром яго ўсе выбіралі
І моўчкі булаву яму перадавалі.
Падняўся Войскі, зразумеў сваё заданне
І, стукнуўшы рукою ў стол, сярод маўчання
Дастаў з-за пазухі ланцуг, які на вушку
Трымаў грубы гадзіннік з добрую ігрушку.
«Паўпятае,— прамовіў,— заўтра ля капліцы
Сабрацца ўсім ганцам, ды толькі не пазніцца».

Тут рушыў з-за стала, за ім без затрымання
Пайшоў ляснік. Ішлі абдумаць паляванне.

Вось так і камандзіры пры чаканні бою,
Калі байцы адпачываюць, чысцяць зброю
Ці спяць на шынялях, ці сядуць сілкавацца,—
Цішком вядуць нарады доўгія ў палатцы.

Абед спыніўся, дзень прайшоў у неспакоі,—

У клопатах пра коней, пра сабак, аб зброі.
А ў час вячэры госці вельмі мала елі
І на'т ахвоты спрэчкі прадаўжаць не мелі
За ганчакоў. Мір заключыўшы ў тым разгары,
Асэсар з Рэентам ідуць пад рукі ў пары —
Шукаюць волава. Другія пасля працы
Пайшлі спаць рана, каб на досвітку падняцца.

КНІГА ЧАЦВЕРТАЯ • ДЫПЛАМАТЫКА І ЛОВЫ

З м е с т : З'ява ў папільётках будзіць Тадэвуша. Запозненае асэнсаванне памылкі. Карчма. Эмісар. Спрытнае ўжыванне табакеркі звяртае дыскусію на патрэбную дарогу. Матачнік. Мядзведзь. Тадэвуш і Граф у небяспецы. Тры выстралы. Спрэчка Сагалясоўкі з Сангушкоўкай, вырашаная на карысць Гарэшкаўскай аднастволкі. Бігас. Аповесць Войскага пра паядынак Давэйкі з Дамэйкам перарвана цкаваннем зайца. Канец аповесці пра Давэйку і Дамэйку.

Равеснікі князёў літоўскіх слаўных, дрэвы
Панараў, Свіцязі, пушч цёмных, Кушалева!
Вы ж ценем прыкрывалі каралёў галовы:
Вітэна грознага, вялікага Міндовы
І Гедыміна ў час, як на хрыбце Панараў
Ля вогнішча на скуры медзвядзя ён марыў,
Заслуханы у песні мудрага Ліздэйкі,
І ўсплёскамі Вяллі, і пошумам Вялейкі
Закалыханы, сніў ваўка ў жалезнай зброі.
А потым, згодна з воляю багоў святою,
Ён горад Вільню ўзнёс, што між лясоў-суседзяў
Сядзіць, як воўк між зубраў, дзікаў і мядзведзяў.
А з горада таго, як з рымскае ваўчыцы,
Паходзяць Ольгерд, Кейстут і Альгердавічы —
Праслаўленыя звераловы і героі,
Што звера ўмелі гнаць, былі майстрамі бою.
Сон паляўнічага адкрыў нам тайны неба,
Што для Літвы заўжды лясоў, жалеза трэба.

Лясы! Апошні прыязджаў да вас на ловы
Кароль, што Вітаўтаў насіў каўпак сталёвы,
Кароль апошні з Ягелонаў ваяўнічы,

Манарх апошні, што быў добрым паляўнічым.
Маёй радзімы дрэвы! Неба мо адкрые
Яшчэ мне к вам дарогу. О, сябры старыя,
Ці вас тады застану? Помню, як раслі вы,
А я вакол вас поўзаў у свой час шчаслівы.
Ці той Баўбліс расце, старэча дуплаваты,
Ў якога жарале, не меншым добрай хаты,
Дванаццаць чалавек за стол сядала ўкола?
Ці ёсць Міндоўгаў гай ля фарнага касцёла?
А там на Украіне на ўзбярэжжы Росі
Ля дома Галавінскіх, ці яшчэ ўсё ўзносіць
Старая ліпа крону, пад якой, бывала,
Сто юнакоў і сто паненак танцавала?

Вы нашы помнікі! О як жа вас без меры
Зжыраюць царскіх слуг і гандляроў сякеры!
Не пакідаюць месца птушкам лёгкакрылым,
Ні песнярам, якім ваш цень таксама мілы.
Бо ліпа ж Чарналеская натхніла Яна
На столькі слаўных рыфмаў! Шмат падыктавана
І песняру-казаку дубам-многабаем.

А колькі ж вінен я лясам і нашым гаям!
Стралок слабы, я ад сяброўскіх жартаў злосных
Хаваўся ў вашым цені, векавыя сосны.
І колькі ж дум упаляваў, калі ў глухмені
Адзін на купіне сядзеў у задуменні.
Між пнямі мох сівы, бывала, серабрыцца,
Заліты сінявой растоптанай чарніцы,
А воддаль чырванеюць верасоў узгоркі,
Прыбраныя ў брусніц каралавыя зоркі.
Наўкола цемра, а ўгары на ўсім абшары —
Галіны, як зялёныя густыя хмары.
Віхор гуляў дзесь там над склепам нерухомым
З выццём і шумам, з лёскатам і громам:
Гул дзіўны, ап'яняючы! І мне здалося,
Што мора нада мной шумела шматгалоссем.

А нізам, як руіны гарадоў: пень дуба
Тырчыць з зямлі, як частка велічнага зруба,
На ім апёртыя, як сцен, калон руіны,

Гнілыя пні, калоды, з суччам верхавіны,
Абвітыя травой, імхом. У тыя гушчы
Заглянуць страшна — там жывуць магнаты пушчы:
Ваўкі, дзікі, мядзведзі. Ля ўваходу — косці
Неасцярожных, што зайшлі сюды у госці.
Шугнуць часамі з зелені лясной аблогі
Уверх, нібы фантаны два, аленя рогі,
Ці іншы звер мігне істужкай жаўтаватай
Між дрэў і гасне, як прамень між зелені кашлатай.

І зноў на нізе ціха. Дзяцел на яліне
Пастукае і далей адлятае, гіне,
Схаваўся, але дзюбай дзесьці ў дрэва тыча
І, як дзіця, знайсці сябе ў схаванцы кліча.
Арэх грызе вавёрка, скокнуўшы на хвою,
І, кутасок павесіўшы над галавою,
Нібы пяро над стройнай шапкай кірасіра,
Усё галоўкай круціць ды працуе шчыра.
А госця ўбачыўшы, лясная танцаўшчыца
Мігае з дрэў на дрэвы, быццам бліскавіца,
Пасля ў дупле якімсьці нечакана гіне,
Нібы дрыяда, грэчаскіх лясоў багіня.
Зноў цішыня.

Шасціць галінкай, пэўне, вецер.
Ды не. З-паміж разгорнутага веццяў
Яснее тварам, прыгажэйшым чым рабіна,
Збіральніца ляснае ягады, дзяўчына,
З кашолкі лыкавай частуе назбіранай
Брусніцай, быццам вусны у самой, румянай.
З ёй побач хлопец крочыць, гне ляшчыннік стромкі,
І ловіць дзеўчына арэхавыя гронкі.

Аж раптам брэх сабак чуваць і рога гранне,
Дык адгадаўшы, што надходзіць паляванне,
Паміж гушчараў лісця, поўныя трывогі,
З вачэй знікаюць раптам, як лясныя Богі.

А ў Сапліцове ўзняўся рух ужо ад рання.
Але ні зычны голас труб, ні коней ржанне,
Ні брэх сабачы, ані зборы ўсе ў дарогу

Тадэвуша з пасцелі выцягнуць не могуць.
Ён спаў апрануты, нібы байбак, і ў дому
Шукаць яго на думку не ўзбрыло нікому,
Бо кожны быў заняты, меў сваё заданне.
І сонны сябра быў забыты ў гэта ранне.

Ён хроп, а сонца праз дзіру, што ў аканіцы
Кшталт сэрца мела, зазірнула ў глыб цямніцы,
І слупам вогненным твар хлопца асвяціўся.
Ён падрамаць яшчэ хацеў, дык пакруціўся,
Хаваючыся ў цень. Ды раптам стук раздаўся,
І сон прапаў. Вясёлым сёння прачынаўся
І чуўся рэзвым, лёгкім, быццам птушка ў полі,
Пасмехваўся, шчаслівым чуўся, як ніколі.
Нагадваў дзень мінулы, што прайшоў так міла,
Ўздыхаў і чырванеў, і сэрца моцна біла.
Зірнуў на свет, вось дзіва! ў косах залацістых
У сэрцы тым блішчала пара воч празрыстых,
Расчыненых шырока. Гэтак вось бывае,
Калі хто з яснасці дня ў цемру заглядае.
І ручку ўбачыў дробную, як веер збоку,
Настаўленую к сонцу для аховы зроку.
А пальцы дробныя, што зменшыць бляск хацелі,
Наскрозь, як бы рубінавыя, зіхацелі.
І вусны ўбачыў, што цікавасць расхінала,
І зубкі, што цвілі, як перлы між каралаў,
І тварык, хоць ад сонца даланёй прыкрыты
Ружовай, свежых ружаў фарбай быў заліты.

Тадэвуш ля акна спаў. Сам прыкрыты ценем,
Ляжаў і разглядаў з цікавым задзіўленнем
Здань тую проста над сабой, над самым тварам.
Не разумеў, ці гэта быль, ці толькі мара —
Адзін з тых ясных мілых тварыкаў дзіцячых,
Якія ў снах дзяцінства мы часамі бачым.
А тварык нахіліўся. І тады разгледзеў
З пачуццем страху, што яго ён бачыў недзе.
Прыпомніў волас залацісты і кароткі
У беласнежныя завіты папільёткі,
У серабраныя стручкі, што так на сонцы
Свяцілі, як карона на святой іконцы.

Ускочыў, з'ява спуджаная адляцела.
Чакаў дарма — вяртацца не хацела,
Але пачуў стук лёганькі па аканіцы
І словы: «Уставайце, каб вам не спазніцца
На паляванне». Мігам з ложка падарваўся
І аканіцу пхнуў, што толькі трэск раздаўся,
Калі аб сцены грукнулі дзве палавіны.
Задзіўлены глядзеў вакол са дзве хвіліны —
Нікога не заўважыў, і слядоў ні звання.
Непадалёк быў сад. Нязначна на паркане
Лісточкі і галоўкі хмелю ўздрыганулі.
Магчыма, што іх рукі лёгкія кранулі?
Ці вецер рушыў мо? Тадэвуш прыглядаўся
Да іх, ды ў сад ісці адвагі не набраўся.
Падняўшы вочы, затрымаў іх на паркане
І, палец к вуснам прылажыўшы для маўчання,
Каб словам не зрабіць у думках блытаніны,
У лоб сябе пастукаў, будзячы ўспаміны.
А ўрэшце пальцы закусіў мо аж да косці
І: «Гэтак мне і трэба!»— закрычаў у злосці.

А двор пасля ўсёй мітусні, неразбярыхі
Замоўк і, як магільнік, стаў глухім і ціхім —
Паехалі ўсе ў лес. Тадэвуш доўга слухаў,
Прыставіўшы далоні да вушэй, ды глуха
Гудзеў спачатку вецер, потым з нейкай далі
Данёсся голас труб і тых, што палявалі.

У стайні конь чакаў яго ўжо асядланы,
Дык скокнуўшы ў сядло, з ружжом, як апантаны
Ляцеў да карчмаў, што стаялі ля капліцы,
Дзе ўранні паляўнічым трэ' было спыніцца.

Абапал той дарогі дзве карчмы сядзелі
І вокнамі варожа на сябе глядзелі.
Адна не перастала замкавай лічыцца,
Другую збудаваў, на злосць старой, Сапліца.
У першай, нібы дома, рэй вадзіў Гервазы,
А ў новай рассядаўся ў покуці Пратазы.

Навейшая карчма нічым не задзіўляла,

А вось старая больш цікава выглядала.
Стыль гэткі склалі Тырскія калісьці цеслі,
А на ўвесь свет яго габрэі ўжо разнеслі —
Архітэктурны від, якога мы не зналі,
А толькі ў спадку ад габрэяў перанялі.

Карчма, як карабель, а ззаду, як святыня:
Чатырохгранная, як тога Ноя, скрыня,
Вядомая пад простай назваю стадолы.
Там — козы барадатыя, з другой жывёлы —
Валы, каровы, коні, ўверсе птушак хмара
І насякомыя, і паўзуноў хоць пара.
Палова задняя, як дзіўная святыня,
Нагадвае гмах Саламона, што ў краіне
Сіонскай першыя умельцы ўзнеслі —
Гірамавы, далёка ведамыя цеслі.
Габрэі і сягоння так будуюць школы,
А рысы школаў маюць карчмы і стадолы.
Дах з дранкі і з саломы востры і уздзёрты,
Як той каўпак габрэйскі, змяты і пацёрты.
А пад шчытом балкона канты вытыркаюць
І на драўлянай каланадзе спачываюць.
Калоны тыя, архітэктарам на дзіва,
Трываюць, хоць згнілі, хоць стаўленыя крыва,
Нібы ў Пізанскай вежы. Грэчаскіх мадэляў
Тут не заўважыш, бо няма зусім тут капітэляў,
А вяжуць у адно калон тых верхавіны,
Сагнутыя пад стыль гатыцкі, лукавіны.
Паверх іх упрыгожанні ідуць выкрутам,
Не долатам, а простым сечаныя склютам,
Крывыя, як падсвечнікавы завітушкі;
Звісаюць з лукавін, як гузікі, галушкі,
Як тыя, што габрэі к лобу прыкладаюць
У час малення і што «цыцэс» называюць.
Здалёк нагадвае сабой карчма крывая
Габрэя, што ў час мольбаў тулавамківае:
Як шапка, дах над стрэшкай-барадой калматай,
А сцены ў дыме й брудзе, як палы халата,
Разьба ж з канца — нібы на лобе багамолы.

Карчма раздзелена накшталт габрэйскай школы:

Адна палова — збор каморачак парожніх
Для паняў і паноў і іншых падарожных,
Другую скрозь займае зала. Ў гэтай зале
Уздоўж ля сцен сталы шматногія стаялі,
Пры іх, ніжэйшыя,— радамі табурэты,
Як дзеці ля бацькоў.
Вось тутака ў дзень гэты
Сядзела шмат сялян, сялянак, шляхты дробнай —
Усе падрад, а аканом сядзеў асобна.
Пасля імшы ў капліцы, бо была нядзеля,
Зайшлі да Янкеля глынуць хмяльнога зелля.
Ля кожнага шумела ўжо з сівухай чарка,
А навакола з бутлем бегала шынкарка.
Сам Янкель-арандар у доўгім аж па пяты
Халаце, што быў спераду на гафткі ўзяты,
Адной рукой пагладжваў бараду сівую,
А за шаўковы пояс залажыў другую.
Паглядваючы вокал, аддаваў загады,
Вітаў гасцей, мірыў, калі ўзнікалі звады,
Спыняўся часам слова мовіць аднаму-другому,
Сачыў за ўсімі, але не служыў нікому.
Стары габрэй быў навакол здаўна ў пашане
За чэснасць, бо хоць жыў даўно тут, ні сяляне,
Ні шляхта на яго не мелі крыўд ніколі,
Бо і за што? Напіткаў добрых меў даволі,
Цану загадваў правільна, без ашуканства,
Падвыпіць дазваляў, хоць і не зносіў п'янства.
Ахвотнік быў да гульняў: у яго вяселлі
І хрэсьбіны спраўлялі. Кожнае нядзелі
К сабе ў карчму з суседняга сяла ён клікаў
З дудою і басэтляй ведамых музыкаў.

І сам знаў музыку, граў з талентам, бывала,
На слаўным іхнім інструменце, на цымбалах.
З двара ў двор ходзячы, здзіўляў мастацкім граннем
І песняў чыстым і прыгожым выкананнем.
Хоць і габрэй, валодаў добра польскай мовай,
Любіў парадаваць народнай песняй новай,
Прывозіў з занямонскай кожнае выправы
Прыпеўкі з Галіча, мазуркі з-пад Варшавы.
І чутка ёсць, ці цалкам пэўная, не знаю,

Што першы ён прывёз да нас з чужога краю
І першы распаўсюдзіў у ва ўсім павеце
Праслаўленую сёння песню ў цэлым свеце,
Якую першы раз дзесь на зямлі Аўзонаў
Зайгралі гучна трубы польскіх легіёнаў.
Музычны талент у Літве здаўна ў пашане,
Прыносіць славу ён, багацце і каханне.
Дык Янкель жыў заможна, але ў веку сталым
Павесіў на сцяне шматструнныя цымбалы,
Асеў з сям'ёю у карчме, заняўся шынкам,
Апроч таго быў у мястэчку падрабінкам.
Усюды і заўжды ён госцем быў жаданым:
Парадзіць мог у выпадку якім складаным
І на віцінным гандлі збожжам добра знаўся,
І славай добрага паляка карыстаўся.

Старыя спрэчкі паміж карчмамі уладзіў.
Абедзве арандуючы, трымаў ва ўладзе
Задзір і змусіў з воляю сваёй лічыцца
Усіх староннікаў Гарэшкі і Сапліцы.
Дык шанаваў старога карчмара і грозны
Гарэшкаўскі ключар і неспакойны Возны.
Пры ім спынялі, за даўнейшыя абразы,
Гервазы грозную руку, язык Пратазы.

Гервазага няма, падаўся на аблаву,
Бо ведаў, што на небяспечную забаву
Паехаў Граф, дык каб не стрэўся з небяспекай,
Рашыў яму служыць і радай, і апекай.

На пастаянным месцы Ключніка ў святліцы,
На п о к у ц і сягоння бернардын садзіцца —
На гэта месца Янкель Робака падводзіць,
Відаць, яго шануе, бо, як можа, годзіць:
Як толькі заўважаў яго пустую чарку,
Адразу да манаха падклікаў шынкарку,
А тая падлівала ліпавага мёду.
Чуваць, калісьці мелі не адну нагоду
Сустрэцца дзесьці за кардонам. Ксёндз заходзіў
Не раз і ўночы у карчму і час праводзіў
На тайных гутарках. Сёй-той плёў пад сакрэтам

Пра кантрабанду, ды паклёп, відаць, быў гэта.
Ксёндз Робак гаварыў, а шляхта прыўставала,
З увагай слухала яго і акружала,
І сунула насы к манаскай табакерцы
Ды нюхала чаргой і чхала ўжо ад сэрца.

«*Reverendissime,*— сказаў ксяндзу Скалуба,—
Вось гэта дык табака! Дастае да чуба!
З тых дзён, як нос нашу (тут доўгі нос пагладзіў),
Такой не нюхаў я (і чхаць ізной заладзіў),
Мо бернардынская і, пэўне, з Коўна родам,
Бо горад той табакай славіцца і мёдам.
Я быў там год ужо...» Ксёндз мовіў: «На здароўе
Усім вам, паважаныя мае панове!
Што ж тычыцца табакі, дык змыліўся груба
Наш вельмі паважаны дабрадзей Скалуба.
Яна аж з Яснае гары, яе паўліны
У Чанстахове труць з табачнае расліны,
У месцы цудамі праслаўленай іконы
Прачыстай, каралевы польскае кароны;
Народ яе ў нас і літоўскай называе.
Яна Карону і цяпер абараняе,
Літву ж дык вельмі схізма ўжо апанавала!»
«Аж з Чанстаховы?— мовіў Вільбік,— год не мала
Таму я ў споведзі там быў. Даходзяць весці,
Што быццам бы француз, гасцюючы ў тым месце,
Касцёл задумаў разваліць і скарб заграбіць,
Ды лжэ «*Кур'ер Літоўскі*», як заўсёды, мабыць?»
«Няпраўда,— мовіў Робак,— пан наш найяснейшы
Напаляон — католік сёння найшчырэйшы,
Яго ж памазаў папа; паміж імі згода,
Дык лечаць норавы французскага народа,
Што трохі папсаваўся. Праўда, з Чанстаховы
Аддалі многа серабра на скарб вайсковы
Для бацькаўшчыны Польшчы. Гэтак, з волі Божай,
Заўжды яго алтар радзіме дапаможа.
У Княжастве Варшаўскім вось, з народу волі,
Сто тысяч войска ёсць, а хутка будзе болей,
А хто аплаціць войска? Можа, вы, літвіны?
Вы ж плаціце Маскве са шкодай для краіны».
«Чорт даў бы,— крыкнуў Вільбік,— гвалтам забіраюць!»

Кніга шостая
Дыялог Робака і Суддзі

Книга шестая
Диалог Робака и Судьи

Księga szósta
Rozmowa Robaka z Sędzią

«Ой, дабрадзею,— селянін азваўся з краю
З паклонамі ксяндзу і, пачасаўшы ў чубе,—
Яно, сказаць, і шляхту ўсю вядуць к загубе,
А з нас дзяруць, як лыка». «Хам!— тут голас зычны
Падаў Скалуба,— што табе? ты ўжо прывычны,
Што як вугра цябе дзяруць, а г е р б а в а н ы м ,
Вяльможным, у свабодах залатых хаваным,
Як нам? Даўней, браты, хто у шляхоцкім родзе...
(«А як жа,— крыкнулі ўсе,— роўны ваяводзе!»)
А сёння нам правоў шляхоцкіх адмаўляюць:
Вось дакажы паперай, хто ты,— заяўляюць!»
«Вашэці меней крыўдна,— тут сказаў Юрага,—
Вашэці род мужыцкі, прадзед твой стаў шлягай,
Але вось я! з князёў! Мяне маскаль пытае,
Калі я вольным стаў? Бог толькі гэта знае!
Няхай ён пойдзе ў лес, спытаецца ў дубіны
Правоў расці над іншыя ўсе дзеравіны».
«Гэй, князь!— азваўся Жагель,— бай каму другому,
Тут знойдзеш мітры ледзь не ў кожным дому».
«У гербе крыж,— сказаў Падгайскі,— значыць, скрыта
Алюзія, што род ідзе ад неафіта».
«Фальш!— крыкнуў Бірбаш,— я з графоў татарскіх, знаю,
А крыж у гербе «Карабель» таксама маю».
«Парай»,— Міцкевіч крыкнуў,— гэта герб князёўскі,
Пра гэта многа піша ведамы Стрыйкоўскі!»

Тут спрэчкі пачаліся, доказы, праверкі.
Ксёндз бернардын звярнуўся зноў да табакеркі,
Прамоўцаў частаваў, і ў хаце заціхала,
Бо шляхта з ветлівасці нюхала і чхала.
Ксёндз з перапынку скарыстаў і мовіў далей:
«Ад гэтае табакі многія ўжо чхалі!
Паверце, гэта табакерка генерала
Дамброўскага разы чатыры частавала!»
«Дамброўскага?»— спыталі. «Я не памыліўся,
Я быў пры ім, як ён пад Гданьскам біўся.
Ён сеў пісаць і вось, каб сон яго не змарваў,
Нюхнуў і, чхнуўшы, па плячы мяне ударыў:
«Так, ксенжа Робак,— кажа,— ксенжа бернардыне,
За год які мо ў вашай стрэнемся краіне.
Скажы, няхай сустрэнуць там мяне з табакай,

Да з Чанстахоўскай, я не нюхаю ўсялякай».
Прамова гэта узбудзіла хваляванне
І радасць так, што ў зале зразу ўсе дазвання
Замоўклі, потым той-другі прамовіў слова
І паўтараў: «Табака з Польшчы? Чанстахова?
З Італіі? Дамброўскі?»... Потым раптам разам
Як быццам словы з думкі аднае наказам
Злучыліся ў адзін, хоць і не стройны голас:
«Дамброўскага» ўсе заспявалі навакола.
Хапіліся ў абдымкі ў радасці бяскрайняй
Мужык і граф, крыж з мітрай, карабель з параем.
Забыліся пра ўсё і на'т пра бернардына,
Крычалі весела: «Гарэлкі! Мёду! Віна!»

Ксёндз Робак тую песню слухаў, усміхаўся,
Ды каб спыніць яе, за табакерку ўзяўся
І гэтак чхнуў, што ўраз мелодыю ім зблытаў,
І, пакуль ладзілі яе, працягваў спрытна:
«Табаку хваліце, паны і дабрадзеі,
Ды гляньце ў табакерку — што там за падзеі».
Тут хусткай донца ад табакі выцер чыста
І армію вакол паказваў, што ўрачыста,
Як дробных мушак рой, стаяла. У гэту гушчу
Ўмяшаўся коннік-камандзір, падобны хрушчу.
Каня ўзнімаў, як быццам рваўся да нябёсаў,
Рука на повадзе, другая каля носа.
«Зірніце,— мовіў Робак,— на таго вунь мужа,
Хто ён, згадайце!» Ўсім было цікава дужа.
«Вялікі чалавек і цар, хоць без адзнакі,
Але не рускі — ў іх не нюхаюць табакі».
«Вялікі,— мовіў Цыдзік,— а чаму ў капоце?
Вялікія, звычайна, ўсе у пазалоце,
Бо ўзяць у маскалёў, ледзь генерал, маспане,
То ўвесь у золаце, як рыба у шафране».
«Я,— мовіў Рымша,— бачыць колісь меў нагоду
Касцюшку, камандзіра нашага народа.
Ён чын меў важны, а хадзіў вось у сукмане
Ці ў той чамарцы». «Ды ў якой чамарцы, пане?—
Пярэчыў Вільбік.— Гэту ж звалі тарататкай».
«Дык тая ж фрэндзлі мела, а тут крой быў гладкі!»—
Міцкевіч крыкнуў. І ўзняліся зараз свары

За формы крою тарататкі і чамары.

А ксёндз, убачыўшы, што зноў бяседа рвецца,
Ізноў яе да вогнішча сабраць імкнецца —
Да табакеркі. Частаваў, нанова чхалі,
Здароўя зычылі, а ён працягваў далей:
«Калі Напаляон падчас бітвы прымае
Табаку, гэта знак, што ён перамагае.
Так пад Аўстэрліцам было. Француз гарматы
Паставіў, а на іх ляцеў маскаль заўзяты.
Вось кесар моўчкі пазіраў: французы стрэляць
І войскі маскалёў на землю так і сцелюць —
Полк за палком ляцеў, і гінулі ваякі.
Што полк зляціць, то кесар прыме нюх табакі.
Дык Аляксандар той ды са сваім брацішкам
Тым Канстанцінам і з нямчынаю Францішкам
Давай рваць з поля. Кесар бачыць — бой суняўся,
Дык з пальцаў строс табаку, ціха засмяяўся.
Хто з вас у войску кесара на службе будзе,
Няхай маіх слоў гэтых не забудзе».

«Ах мілы ксенжа наш!— сказаў ізноў Скалуба,—
Калі ўжо тому быць? Лічыць ужо нялюба
Дзён каляндарных. Вочы нашыя збалелі
Іх выглядаць у святы, ледзь ні штонядзелі.
А цар нам злезці з шыі ўсё ніяк не хоча.
Раса нам, покуль сонца ўзыдзе, выесць вочы».

«Маспане,— ксёндз сказаў,— хай бабы наракаюць,
І шынкары, злажыўшы рукі, хай чакаюць,
Пакуль каго ў карчму не прывядзе дакука.
Пабіць з Напаляонам маскалёў не штука,
Бо ён і немцам ажно тройчы лазню справіў,
Стаптаў і прусакоў, і Англію адправіў
Назад за мора, дык і маскалям дагодзіць,
Але глядзіце вы, што з гэтага выходзіць:
Вось мы збяромся на каня тады садзіцца
І шаблі возьмем, як не будзе ўжо з кім біцца,
А кесар, сам стаптаўшы ворагаў пад ногі,
Спытае: «Хто вы? Мне не трэба вашай дапамогі»,
Калі гасцей чакаюць, шчыра ў хату просяць,

Дык іх рыхтуюцца сустрэць, сталы пазносяць,
Дом чыста прыбяруць, павымятаюць смецце...
Рыхтуюць дом, рыхтуюць, паўтараю, дзеці!»

Маўчанне наступіла, потым запыталі:
«Што значыць «дом рыхтуюць»? Мы не разгадалі.
Мы ўсё ахвотна зробім, што у нашай сіле,
Але б вас, дабрадзею, выясніць прасілі...»

А ксёндз глядзеў цераз акно на двор за браму,
Убачыў штосьці там, аж высунуўся ў раму,
Пасля ўстаў, кажучы: «Пара мне. Пры сустрэчы
Яшчэ пра розныя пагутарым мы рэчы.
Я заўтра ў места еду, але, пэўне, скора
Наведаю ўсіх вас, як вырушу па зборы».

«Дык хай жа ў Негрымова ксёндз заехаць рачыць,—
Сказаў аконам,— вас Харонжы хоча ўбачыць.
Далёка між людзьмі такая ходзіць мова:
Шчасліва трапіў, быццам ксёндз у Негрымова».
«Да нас,— сказаў Зубкоўскі,— просім, калі ласка,
Бо знойдзецца і ў нас сувойчык, масла фаска,
Кароўка ці баран, бо і пра нас ёсць слова:
Яму, нібы ксяндзу, што трапіў у Зубкова».
«І к нам»,— прасіў Скалуба. Побач Тараевіч
Сказаў: «Галодны ксёндз не выйшаў і з Пуцэвіч».
І гэтак кожны абяцаў штосьць бернардыну,
Праводзячы яго. Ён спешна ўсіх пакінуў,

Бо перш ужо ў акне Тадэвуша угледзеў,
Як той скакаў у лес гасцінцам на мядзведзя,
Прыгнуўшыся, без шапкі, з скрыўленым абліччам,
Каня і шпорачы, і сцёбаючы бічам.
Ад гэты бернардына задзівіў, узрушыў,
Дык хуткім крокам за хлапцом дарогай рушыў
У пушчу, што, як толькі зрок людскі акіне,
Займала цэлы краявід сцяною сіняй.

Хто ж зведаў пушч літоўскіх змрочныя абшары
Аж да сярэдзіны, да глыбіні гушчару?!
Рыбак дно мора толькі ля ўзбярэжжа знае,

Сталок, звычайна, нетры пушчаў абмінае,
Ён толькі з большага знаёмы з іх абліччам,
А іх нутро і застаецца таямнічым,
Бо што там — казка, чутка знае мо пра тое.
Калі б ты бор мінуў і падшыццё густое,
Наткнуўся б на абвалы пнёў, калод, каменняў,
Акружаных дрыгвою, тысячай струменняў,
Заросшых сеткай зелля, мураўёў капцамі,
Шаршнёў, вужакаў гнёздамі, лазы дубцамі.
Калі б і гэта не стрымала чалавека,
Дык большая прад ім паўстала б небяспека —
Далей, як ямы воўчыя, на кожным кроку
Сустрэнуцца азёры, скрытыя ў асоку,
З такою глыбінёй, што дна іх не прамераць.
(Сядзяць там чэрці, калі толькі чуткам верыць.)
Вада тых студняў свеціцца іржой крывавай,
Смярдзіць і ўдзень, і ўночы, дыміцца плюгава,
Аж дрэвы навакола чахнуць і хварэюць:
Лісты, кару губляюць, не растуць, чарвеюць,
Сукі іх пакрывае мох каўтунаваты,
А кожны пень і ствол грыбамі барадаты.
Лес гэты над вадою — быццам ведзьмаў група,
Што грэе рукі над гаршком, дзе вараць трупа.

За гэтыя азёры ўжо не толькі крокам,
Але дарэмна нават заглыбляцца вокам,
Бо там усё агорнута імглістым змрокам,
Што вечна з той дрыгвы распаранай шыбае.
А ўжо за той імглой (як казка ў сёлах бае)
Багатая зямля ляжыць — не надзівіцца,
Галоўная раслін і зверыны сталіца.
Там зберагаецца ўсіх дрэў і траў насенне,
З якога новае ўзрастае пакаленне.
Там, як у Ноя, з кожнага жывёлін роду
Хаваецца па некалькі пар для заводу.
А ў самым цэнтры пушчы занялі абшары
Тур, Зубр, Мядзведзь, якія ў пушчы валадараць.
На дрэвах побач з імі Рысь рассеўся быстры
І хцівец-Расамаха, нібы два міністры.
Далей, як падуладныя князям васалы,
Сялібы маюць Дзік і Воўк, і Лось удалы.

Над галавою ўюцца Сокалы з Арламі,
Накшталт нахлебнікаў, што жывяцца з панамі.
І гэтак пары патрыярхаў тых звярыных
Жывуць нябачнымі ў нязведаных глыбінах,
Дзяцей сваіх пускаюць за лясоў граніцы,
А самі без турбот бытуюць у сталіцы.
Ад стрэльбы ці мяча яны не прападаюць,
А толькі натуральнай смерцю паміраюць.
І маюць могільнік, куды ў часіну смерці
Ідуць звяры і птушкі поўсць ці пер'е здзерці.
Мядзведзь, калі сваёй жаваць не можа стравы,
Алень, калі бяссільным стане і кульгавым,
Шарак, калі ўжо кроў яго ўся ў жылах крэпне,
Крумкач, як пасівее, сокал, як аслепне,
Арол, якога дзюба так у круг сагнецца,
Што ўжо замкнутай назаўсёды застанецца,
Ідуць на могільнік. Звер ранены ці хворы
Бяжыць у родны кут праз нетры і заторы.
Таму у месцах тых, дзе чалавек праходзіць,
Ніхто касцей звярыны дохлай не знаходзіць.
Чуваць, што ў той лясной сталіцы між звярамі
Пануе лад, яны яго наводзяць самі;
Не сапсаваныя культураю людскою,
Уласнасці не ведаюць, і разам з ёю
Ні паядынкаў, ні ваеннае навукі,
І, як дзяды ў раю жылі, жывуць унукі
І дзікія, і свойскія — усе ў яднанні,
Ніхто не думае пра бойкі ці кусанні.
Каб трапіў нават чалавек туды бяззбройны,
То мог бы між звяроў ісці зусім спакойна,
Яны б услед глядзелі зрокам задзіўлення
Так, як калісьці ў той апошні дзень тварэння
Іх першыя бацькі глядзелі на Адама,
Пакуль не раз'ядналіся за райскай брамай.
Ды, шчасцем, чалавек не зойдзе ў тыя нетры,
Бо Мукі, Страх і Смерць там тояцца ў паветры.

Адно заядлыя сабакі ў час пагоні,
Знячэўку ўскочыўшы ў балоцістыя тоні
І нешта жудаснае стрэўшы ненарокам,
Бягуць назад у жаху з ашалелым зрокам.

І доўга потым пад ласкаваю рукою
Дрыжаць ля ног стралка ў вялікім неспакоі.
Глыбіні гэтых нетраў змрочных, таямнічых
Завуцца «м а т а ч н і к а м і» між паляўнічых.

Дурны мядзведзь! Каб ты ў сваёй сядзеў бярлозе,
Не стаў бы Войскі на тваёй лясной дарозе.
Але ці пасекі вяла цябе духмянасць,
Ці мо да спелага аўса замілаванасць,
На бераг пушчы выбраўся ты ў лес радкавы,
А там і высачыў цябе ляснік цікавы;
І вось шпіёны сталі пад яго падказку
Выследжваць твой начлег і кожную папаску.
А зараз хітры Войскі ладзіў акружэнне
І ў матачнік табе адрэзаў адступленне.

Тадэвушу сказалі, што ўжо з паўгадзіны
Мінула, як сабакі сочаць троп звярыны.

Зацішша. Дарма паляўнічыя без руху
Стаяць, прыкладваюць далоні трубкай к вуху
І слухаюць маўчанне лепей за прамовы,
Ды ў далях толькі граюць нетры і дубровы.
Сабакі ў пушчы, як у моры вадалазы,
Ныраюць, а стралкі, гатовыя біць зразу,
За Войскім сочаць. Вухам ён зямлю пытае.
Як зрок сяброў з аблічча лекара чытае
Надзею на жыццё ці смерць асобы мілай,
Вось так і ў Войскім вочы грамада тапіла
З пачуццямі надзеі, з халадком трывогі.
«Ёсць, ёсць!»— сказаў сцішка і хутка ўстаў на ногі.
Ён чуў! другія не маглі 'шчэ разабрацца.
Аж вось сабака звягнуў, потым два, тры, дваццаць!
І ўсе рассыпанай араваю зайгралі.
Злуюцца, душацца, на след, відаць, напалі,
Бяруць. І гэта не спакойнае ўжо гранне
Сабак за шараком, лісіцай або ланню,
А брэх абрывісты, заядлы і высокі.
Відаць, не толькі ўскочылі на след далёкі —
На вока гоняць. Часам гон свой гвалт спыняе,

То ўзніме зноў. Мо звер сябе абараняе,
Калечыць, пэўне, ў шале, бо пасля маўчання
Чуваць між брэху енк сабачага канання.

Стральцы стаялі, стрэльбы ўжо нарыхтаваўшы,
З напружаннем галовы ў той бок скіраваўшы.
Чакаць даўжэй не могуць! Вось пасты кідаюць
То тут, то там і ў лес глыбей перабягаюць,
Каб звера чым хутчэй сустрэць. Хоць Войскі строга
З каня яшчэ раз папярэджваў, што такога,
Хто кіне пост, адсцёбае аброжкай з ходу,
Якога б ён ні быў становішча ці роду,—
Не слухалі. Усе, супроць яго прыказу,
Пабеглі ў лес. Тры стрэльбы грукнулі адразу,
А потым — кананада, аж мацней за стрэлы
Раўнуў мядзведзь, і рэха праняло лес цэлы.
Рык страшны болю, шалу, роспачы, трывогі!
За ім сабачы гвалт, трубы зык, выкрык строгі
Грымелі з нетраў пушчы. А стралкі з засады
Ў лес беглі, ўзводзілі куркі, былі ўсе рады,
І толькі Войскі жаласна крычаў, што маху далі.
Стральцы з нагоншчыкамі крута павярталі
Звяру наперарэз, між нетрамі і пушчай.
Мядзведзь, спалоханы людзьмі, сабачай гушчай,
Звярнуў назад — туды, дзе слаба пільнавалі,
Ў бок поля, дзе стральцы пасты папакідалі,
Дзе толькі засталіся з ланцуга аблавы
Тадэвуш, Войскі, Граф і той-сёй менш рухавы.

Тут лес радзейшы быў. Аж вось чуваць трэск лому,
І вырваўся, як з хмар, мядзведзь навалай грому,
За ім — сабакі: брэшуць, рвуць. Ён стаў на ногі
І, рыкам страшачы, хоць поўны сам трывогі,
Хапаўся лапамі за дрэвы, за карэнні,
За пні смалістыя, за ўросшыя каменні
І кідаў у сабак, людзей, ды вырваў дрэва
І, як даўбнёй ім круцячы управа, ўлева,
Рвануўся на апошніх стражнікаў аблавы —
Тадэвуша і Графа. Тыя бой крывавы
Прымаюць, выткнулі ў звяра ствалоў па пары,

Як два грамаадводы ў масу чорнай хмары,
І, як адзін, абодва за куркі рванулі.
(Неспрактыкаваныя!) Стрэльбы ўраз раўнулі,
Не трапілі. Мядзведзь скакаў, яны ў той хвілі
За раз абодва піку ўткнёную ўхапілі
І вырывалі хто сабе. А тут жа блізка
Клыкоў рады бялеюць з велічнага пыска,
І над галовамі павісла лапа звера.
Збялелі, скочылі назад, пад пушчы бераг
І уцякалі. Звер з узнятай лапай гнаўся:
Махнуў, не трапіўшы упаў, ізноў падняўся,
Браў светлы графаў волас чорнай лапай груба...
Сарваў бы чэрап з галавы, як шапку з чуба,
Ды Рэент і Асэсар выскачылі збоку,
Гервазы быў наперадзе на сто мо крокаў,
За ім — ксёндз Робак, хоць без стрэльбы, і тут з раду
Утрох тры стрэлы далі, быццам па загаду.
Мядзведзь уверх падскочыў, як шарак ад хартаў,
І рынуў долу галавой. Яшчэ упарта
Млынком крутнуўся, і ўсё той разгону сілай
Дагнала туша Графа і на землю збіла.
Яшчэ ўставаў і роў, ды ўжо на ім віселі
Са Страпчай Спраўнік і яшчэ жывога елі.

Тут Войскі падхапіў, тасьмой прымацаваны,
Буйволлі доўгі рог, круты пакарбаваны,
Як боа-вуж, паднёс да губ, аберуч сціснуў,
Як буталь, твар надзьмуў, крывавым вокам бліснуў,
Павекі прычыніў, сцягнуў углыб паўбруха,
У лёгкія паслаў усе запасы духу
І граць пачаў. Рог, быццам віхру на пацеху,
Панёс па пушчы голас, паўтараны ў рэху.
Стральцы замоўклі, сталі гоншчыкі ў здзіўленні,
Пачуўшы гукаў моц, іх чыстыя адценні.
Стары, што славіўся даўней сваім мастацтвам,
Рашыў з ім зноўку паляўнічым паказацца.
Жыццём уміг напоўніў нетры і дубровы,
Нібы спусціў сабак і распачаў уловы;
Ігрой ён ход аблавы пераказваў хутка:
Спачатку рэзкі, звонкі зык трубы — пабудка,

Пасля за енкам енкі — брэх сабачы смелы,
А месцам цвёрды тон, як гром, — няйначай, стрэлы.

Тут змоўк, а рог трымаў; тады ўсім выдавала,
Што Войскі граў яшчэ, а гэта рэха грала.

Падзьмуў ізноў. А рог, здавалася, мяняўся
І ў вуснах Войскага грубеў, цянеў, згінаўся
І зверам галасіў: то, быццам, воўчай шыяй
Выцягваецца доўга і панура вые,
То зноў, нібы раскрыўшыся ў мядзведзя горла,
Раўнуў; і вецер зубра рыканне раздзёрла.

Тут змоўк, а рог трымаў; тады ўсім выдавала,
Што Войскі граў яшчэ, а гэта рэха грала.
Пачуўшы музыкі шэдэўр — той песні гукі,
Дуб дубу паўтараў іх, неслі букам букі.

Вось дзьме ізноў. Мо сто рагоў ірвецца з рога:
Разносіцца вакол цкаванне, гнеў, трывога
Стральцоў, сабак і зверыны. Аж Войскі ўдарыў,
Падняўшы рог, трыумфу гімнам проста ў хмары!

Тут змоўк, а рог трымаў; тады ўсім выдавала,
Што Войскі граў яшчэ, а гэта рэха грала.
І колькі дрэў, рагоў гудзела столькі з бору,
Адны другім насілі песню, бы ў хор з хору.
І музыка ўсё станавілася шырэйшай,
Далейшай і чысцейшай, што раз выдатнейшай,
Аж знікла ў далях дзесьці ля нябёс парога!

І Войскі рукі, апускаючы ад рога,
Раскрыжаваў. А рог на поясе раменным
Апаў і калыхаўся. З позіркам праменным,
З прыбракшым тварам Войскі, музыкай натхнёны,
Стаяў, яшчэ лавіў знікаючыя тоны.
Тым часам загрымелі навакол музыкі
Віваты, віншаванні, воплескі і крыкі.

Памалу сціхла ўсё, і вочы ад музыкі

Звярнуліся ізноў на звера труп вялікі.
Ляжаў, скрываўлены і кулямі прашыты,
Грудзьмі уплецены ў траву і ў зямлю ўбіты.
Развёў пярэднія шырока накрыж лапы,
Яшчэ ўздыхаў, а кроў лілася цераз храпы.
Расплюшчваў вочы, ды ўжо галавы не зрушыць,
Бо п'яўкі Падкаморавы ўпіліся ў вушы:
Па левай — Страпчая, а Спраўнік злы прыссаўся
Па правай старане і кроўю напіваўся.

Аж прут, па Войскага загаду, ушчамілі
Сабакам між зубоў і ляпы так раскрылі.
Перавярнулі дагары цяпер мядзведзя,
І зноў трайны віват аж хмары зрушыў недзе.

«А што? — Асэсар крыкнуў, стрэльбу ўзняўшы ўдала,—
А што мая стральбінка? Наша, наша брала!
А што? Мая стральбінка — дробненькая пташка,
А вось што паказала! Гэта ёй не цяжка.
Ніводзін дарма не пайшоў з яе ладунак!
Мне князь Сангушка гэткі справіў падарунак».
І тут паказваў стрэльбу дзіўнае работы,
Хоць дробную, і выхваляў яе даброты.
«Бег я,— прамовіў Рэент, пот абцёршы з твару,—
Бег я за медзвядзём, а Войскі тут з гушчару
Крычыць мне: «Стой!» Як тут стаяць? Мядзведзь у поле,
Як заяц скача, хоча вырвацца на волю,
Аж дух мне заняло — дагнаць няма надзеі,
Управа глянуў, бачу: кепскія падзеі,
З засады вырвецца, дык стой, кажу, маруха!
На вока ўзяў, і вось ляжыць, сабачы юха.
Вось стрэльба, вось сапраўдная Сагалясоўка,
Кляйма: «Сагаляс, Лондан а Балабаноўка».
(Там жыў наш слесар, бо і там жывуць палякі,
Рабіў ён стрэльбы, што такія маюць знакі.)».

«Як так?— Асэсар пырснуў,— сотня сот мядзведзяў!
Дык гэта, быццам, пан забіў? Што пан там збрэдзіў?»
«Паслухай,— мовіў Рэент,— тут не следства, пане,
А тут аблава! Кожны тут за сведку стане».

Дык зараз пачаліся спрэчкі і дакоры,
Хто стаў пры Рэенце, а хто пры Асасоры.
Ніхто Гервазага не ўспомніў, забягалі
З бакоў, а што было наперадзе, не зналі.
Прамовіў Войскі: «Ну цяпер хоць ёсць прычына,
Бо гэта ўжо не то што нейкі там зайчына,
А тут мядзведзь, тут варта змераць мэту
І дабівацца праўды, хоць і з пісталета.
Змірыць вас вельмі цяжка, дык старым звычаем,
Змагацца вам у паядынку дазваляем.
Адну я помню між суседзямі нязгоду:
Жылі ў мой час два шляхціцы старога роду
Абапал над прыгожаю ракой Вялейкай.
Адзін Дамэйкам зваўся, а другі Давэйкам,
І гэтак жа ў адну мядзведзіцу стралялі,
А потым, так як вы цяпер, спрачацца сталі.
Уздумалі страляцца ледзь ні дула ў дула —
Праз скуру медзвядзя — так злосць іх агарнула.
Той паядынак нашумеў даўней нямала,
Бо песні на'т спявалі пра яго, бывала.
Я секундантам быў і з самага пачатку
Глядзеў на іх, дык раскажу вам па парадку».

Але ў той момант спрэчку пагасіў Гервазы.
З увагай медзвядзя ён абышоў два разы,
Узяў цясак і пысу ім рассек надвое,
Намацаў кулю, выняў і абцёр палою,
Пасля агледзеў моўчкі, а калі праверыў,
Ці ўходзіць у патрон, і з дулам стрэльбы змерыў,
Узняўшы з куляю далонь над галавою,
Сказаў: «Вось куля, ды яна не з вашай зброі,
Панове, а з старой гарэшкаўскай куркоўкі
(І стрэльбу ўзняў уверх, спавітую ў аборкі),
Ды выстраліў не я. О, як жа хутка, смела
Там трэ' было страляць! Аж мне ў вачах цямнела,
Бо панічы абодва ў мой напрамак беглі,
А звера кіпцюры на Графа ледзь не леглі —
Апошняга з Гарэшкаў! хоць і па кудзелі.
Ой, Божа! крыкнуў я і покуль мы глядзелі,
Ксёндз Бернардын якраз падбег на дапамогу.

Ён засароміў нас! Вось гэта ксёндз! Трывогу
Стрымоўваў я, дрыжаў, хацеў страляць, не стрэліў,
Ён стрэльбу вырваў з рук маіх, даў стрэл, пацэліў.
Між двух галоў страляць! Сто крокаў! І папасці!
Якраз у ляпу! Зубы так яму пакласці!
Паны! Даўно жыву і заяўляю смела:
Адзін мог толькі гэткім пахваліцца стрэлам.
Адзін той злыдзень мог страляць вось гэткім чынам,
Той, што выстрэльваў коркі на хаду жанчынам,
Той лотра слаўны, лепш бы век мне з ім не знацца,
Той Яцак, той Вусач... Лепш з прозвішчам стрымацца.
Ды ўжо яму ганяцца за мядзведзем годзе —
Сядзіць ён у смале пякельнай, як у мёдзе.
Хвала ксяндзу! Ён двух людзей ад смерці збавіў,
А мо і трох. Я справу так сабе паставіў,
Што, каб апошняе дзіця з Гарэшкаў роду
У зубы звера трапіла, я асалоду
Знайшоў бы ў тым, каб і мае скрышыў ён косці.
Дзе ксёндз? Трэ' выпіць за здароўе ягамосця».

Дарма ксяндза шукалі, ён чамусьці скрыўся.
Вядома толькі, што на момант быў з'явіўся,
Да Графа і Тадэвуша што сіл падскочыў
І, ўбачыўшы жывымі, ўзняў на неба вочы,
Падаўся ўбок і стаў шаптаць малітву ціха,
Пасля пабег праз поле, чым далей ад ліха.

Тым часам з Войскага загаду пні і сучча,
Лісты і верас пачалі скідаць да кучы.
Шугнуў агонь, падняўся дым уверх сасною
І шэрым балдахінам стаў над галавою.
Над полымем стральцы зладжылі ў козлы пікі,
На іх катлы падвесілі, пад шум і крыкі.
З вазоў нясуць гародніну, муку, прыправы
І хлеб.

Суддзя куфэрак свой у гонар той аблавы
Дастаў, адкрыў, і пляшак бліснулі галовы.
Ён выняў самы большы буталь адмысловы
(Багаты падарунак ад ксяндза Рабака).

Гарэлка з Гданьска, дарагая для паляка.
«Няхай жыве!— сказаў Суддзя з паднятай чашай,—
Наш горад Гданьск, зноў быць яму ва ўладзе нашай!»
І па чарзе ўсім наліваў лікёр срабрысты.
Пакуль дно залатым не заблішчала лістам.

Бігос варылі ў кацялках. Сказ многаслоўны
Не перадасць той колер, пах і смак цудоўны.
Пачуе мешчанін звон рыфмаў, слоў парадак,
А смак і застанецца толькі ў цьме здагадак.
Каб песні ацаніць літоўскія і стравы,
Здаровым трэба быць, вяртацца трэ' з аблавы.

Ды і без тых прыправаў вельмі смачнай ежай
Бігос бывае. Ўраз з гароднінаю свежай
Капуста квашаная да яго бярэцца,
Што, згодна прыказкі, у рот сама кладзецца.
Закрытая ў катле з прыправамі і з мясам,
Гатуецца, пакуль уся не сойдзе квасам,
Пакуль агонь яе не змякчыць і не сцісне,
А з берагоў начыння з парай вар не свісне
І не напоўніцца паветра араматам.

Бігос гатоў. Стральцы бягуць і зухавата
З бадзёрасцю штурмуюць лыжкамі начынне.
Медзь звоніць, і бігос, як камфара, ўміг гіне.
Знік, паляцеў. І толькі пара ў нетрах чанаў
Бурліць, нібы ў патухшых кратарах вулканаў.

Калі ўжо ўсе даволі падпілі, пад'елі,
На воз усклалі звера і на коней селі,
Усе вясёлыя, апроч двух: Асасора
І Рэента. Яны больш злыя, чым учора,
Бо паспрачаліся за стрэльбу Сангушкоўку
І за балабаноўскую Сагалясоўку.
І Граф з Тадэвушам зрок долу апускалі
З няёмкасці, што прамахнулі і ўцякалі,
Бо на Літве, хто звера выпусціць з аблавы,
Шмат мусіць працаваць, каб зноў дабіцца славы.

Граф гаварыў, што першы кінуўся да пікі,
Ды перашкодзілі яму, на жаль вялікі;
Тадэвуш жа доказваў, што ён, як дужэйшы
І да ўжывання пікі больш, чым Граф, спраўнейшы,
Яму на выручку спяшыў. Так прымаўлялі
Сабе між гоману і ехалі зноў далей.

А Войскі ехаў рады. Чалавек шаноўны
Вясёлы быў на рэдкасць і таму шматслоўны.
Дык памірыць задзір паставіўшы заданне,
Канчаў пачатае раней апавяданне:
«Пан Рэент, калі я хацеў, каб з Асесарам
Вы біліся, дык не таму, што страціў сорам
І прагнуў вашае крыві, о крый вас, Божа!
Хацеў вас памірыць, настрой падняць, быць можа.
Жарт думаў узнавіць, які год тому сорак
Прыдумаў. Дзіўны жарт. Было аб ім гаворак!
Вы маладыя, вам не ў памяць жарт той даўны,
Ад гэтай пушчы колісь да Палесся слаўны.

Бывала, прозвішчы Давэйкі і Дамэйкі
Пазблытвалі не раз, змяшалі ў вузел нейкі,
Са шкодаю для іх. Вось выбараў парою
Сябры Давэйкі, стоячы за ім гарою,
Шапнуць каму: «Глядзі, дай голас за Давэйку!»
А той, не ўчуўшы, галасуе за Дамэйку.
Аднойчы на банкеце тост узняў Рупейка:
«Віват, Дамэйка!» Іншым выдала: Давэйка!
Дык закрычалі гучна, але бесталкова,
Па-свойму паўтарыўшы кінутае слова.

Раз горш было. У Вільні нейкі шляхціц п'яны
З Дамэйкам біўся шабляй і панёс дзве раны.
Пасля той шляхціц, едучы, відаць, дадому,
Выпадкам стрэў Давэйку недзе ля парома.
І вось, калі абодва ехалі Вялейкай,
Пытае той: «Ты хто?» Ён адказаў: «Давэйка».
А той рапіру выняў моўчкі з-пад кірэйкі:
Чах, чах! і за Дамэйку вус адсек Давэйку.

А ўрэшце ўжо, ўсё роўна як на завяршэнне,
Яшчэ такое падключылася здарэнне:
Ў аблаве, побач стоячы, на радасць ліху,
Стралялі цёзкі ўдвух зараз у медзвядзіху,
І тая ўмомант паваліласся без духу,
Але ўжо несла перш з дзесятак куль у бруху.
З адным калібрам стрэльбаў шмат было ў аблаве,
Дык хто забіў? Як тут рашыць, чыёй быць славе?

А тут яны крычаць: «Даволі нам цягацца!
Ці Бог, ці чорт злучыў нас — трэба разлучацца!
Нас двух, як сонца два, відаць, зашмат на свеце!»
Дык шаблі ў рукі і становяцца на меце.
Тут шляхта ўся ўгаворвае іх, просіць, годзіць,
А злосць на іх тым часам штораз горш находзіць,
Дык шаблі кінулі, схапілі пісталеты.
Мы ў крык, што зблізілі яны занадта меты!
Яны тады, на злосць нам, пакляліся здуру
Страляцца дула ў дула!— праз мядзведзя скуру.
Стралялі вельмі добра. «Секундуй, Грачэха!»
«Я згодзен,— ім кажу,— ўраз будзе вам пацеха:
Няма ’шчэ ямы. Ды падумайце ж вы самі,
І ў бойцы трэба быць людзьмі, не разнікамі.
Збліжацца годзе, бачым, што няма ў вас страху.
Ці ж баіцеся, каб не даць часамі маху?
Паслухайце мяне: ну згода, што на пісталеты,
Ды толькі не з бліжэйшай, ні з далейшай меты,
Як праз мядзведзя скуру — будзь тут ваша воля!
Я сам яе расцягваць буду сярод поля
І вас парасстаўляю. На хвасце мядзведзя
Вы станеце, а вы на носе, мой суседзе».—
«Мы згодны! Дзе? Калі?» — «Чуць свет — карчма над Ушай».
Я ўзяў Віргілія: як быць з той калатушай?»

Тут крык спыніў апавяданне, бо з-пад коней
Шмыгнуў шарак. Вось Сокал з Кусым у пагоні!
Хартоў узялі на аблаву, бо дарогай,
Вяртаючыся, ў полі можна стрэць касога.
Харты ішлі ля коней і ледзь зайца ўчулі,
За ім адразу без цкавання сіганулі.

Асэсар з Рэентам хацелі конна скочыць,
Ды Войскі крыкнуў: «Стоп! Хай кожны з месца сочыць!
Нікому нават крокам рушыць не дазволю —
Адгэтуль добра бачым: заяц верне к полю».
А заяц, чуючы пагоню ад дарожкі,
Скакаў у поле; вушы склаў, як сарна рожкі,
І над раллёй пабліскваў, выцягнуты ў струнку.
У сіле лап сваіх шукаючы ратунку,
Здавалася, што да зямлі ледзь дакранаўся,
Як ластаўка, цалуючы ваду, ўзвіваўся.
За зайцам — пыл, харты — за пылам, і ляцела
Праз поле гэта дзіўнае даўгое цела,
Як быццам прапаўзаў гад злосны і заўзяты:
Дзе заяц — галава, а шыя — пыл узняты,
Сабакі — хвост двайны рухомы і кудлаты.

Асэсар з Рэентам, стрымаўшыся ля куста,
Глядзяць без духу. Рэент пабялеў, як хуста,
Бляднее і Асэсар — што там за падзея?
Убачылі, што вуж чым далей, тым даўжэе,
Што рвецца напалам, што не зрасціся гаду,
Што галава пад лесам, а хвасты — дзе ззаду!
Мільгнула галава яшчэ раз пад навесам
Лясным і знікла, хвост пакінуўшы пад лесам.

Сабакі, так абдураныя непрыемна,
Шукалі, быццам абвіняліся ўзаемна,
Пасля вярнуліся назад павольным крокам,
Стуліўшы вушы і хвасты, з прытухшым зрокам.
Прыбегшы, з сораму вачэй падняць не смелі
І не збліжаліся к панам, а воддаль селі.

Пан Рэент галаву павесіў невясёла,
Асэсар сумным вокам кідаў навакола,
А потым пачалі тэорыі разводзіць,
Што ў гэткай справе гончым ход свабодны шкодзіць,
Што заяц раптам скочыў і не быў цкаваны
І што, каб хіба быў сабака падкаваны,
Тады дагнаў бы мо па гэткай камяніцы.

Разумна ўмелі на дэталях запыніцца.
Каб слухачы хацелі, многа б скарысталі,
Але не слухалі. Адны пасвістваць сталі,
Пасмейвацца другія, іншыя ў той хвілі,
Мядзведзя ўспомніўшы, аб ім загаварылі.

А Войскі толькі раз за зайцам вокам кінуў
І, ўбачыўшы, што той між дрэў у лесе згінуў,
Вось так свой сказ канчаў: «Дык жа на чым мы сталі?
Ага! на тым, што слова мне абодва далі
Страляцца праз мядзведзя скуру. Шляхта гнеўна
Крычыць: «Дык гэта ж дула ў дула! Смерць! Напэўна!»
Я ў смех, бо чуў ад Мара, мудраца старога,
Што скурай звера можна змерыць вельмі многа.
Вядома вам, панове, што Дыдо-царыца,
Прыбыўшы ў Лівію, рашыла там спыніцца
І гэтакі зямлі палетак старгавала,
Які б накрыць адной валовай скуры стала.
На тым кавалку поля вырасла Карфага!
Вось гэта абмяркоўваў я ўначы з увагай.

Ледзь стала днець, Давэйка едзе ў тарадэйцы
На зборны пляц, насустрач коннаму Дамэйцы.
Глядзяць, ажно праз рэчку мост ляжыць касматы
З мядзведжай скуры, зрэзанай на паскі-латы.
Паставіў я Давэйку на хвасце мядзведзя,
Дамэйцы ж месца выпала за рэчкай недзе.
«Цяпер страляйцеся,— кажу,— хоць і да смерці,
Але без згоды з месц вас не пушчу, паверце».
Яны — у злосць, а шляхта поўзае ад смеху.
Тут я з ксяндзом давай адводзіць іх ад грэху
Евангеллем, законам. Просім грамадою.
І так прыйшлося ім адмовіцца ад бою.

Выпадак гэты да іх дружбы прычыніўся.
З Дамэйкавай сястрой Давэйка ажаніўся,
Тады Дамэйка шваграву сястру засватаў.
Маёмасць роўна падзялілі, як брат з братам,
А месца, што праславілася справай гэткай,
Карчму паставіўшы, зваць пачалі Мядзведкай».

КНІГА ПЯТАЯ • ЗВАДА

З м е с т : Паляўнічыя планы Талімэны. Гароднічка рыхтуецца ў вялікі свет і выслухоўвае навукі апякункі. Стральцы вяртаюцца. Вялікае здзіўленне Тадэвуша. Паўторнае спатканне ў Святыні дум і згода, наладжаная дзякуючы мурашак. За сталом пачынаецца гутарка пра паляванне. Перапыненая аповесць Войскага пра Рэйтана і князя Дынасаў. Спробы перамоў паміж бакамі, таксама перапыненыя. Постаць з ключом. Звада. Граф з Гервазым праводзяць ваенную нараду.

Вяртаецца пан Войскі з перамогай з бору,
А Талімэна дома, вочы ўзняўшы ўгору,
Распачынае ўловы. Праўда, нерухома
Сядзіць, на грудзі склаўшы рукі, ды без стомы
У думках гоніць двух звяроў і разважае,
Як іх злавіць абодвух. Думкай абкружае
Тадэвуша і Графа. Граф, хоць і прыгожы,
І з роду знатнага, кахае ўжо, быць можа,
Ды гэткага пачуцці могуць адмяніцца,
Прытым, хто знае, ці захоча ажаніцца
З жанчынаю старэйшай! і не так багатай!
А свет што скажа? Сваякі? Лепш іх не кратай!

І з думкамі такімі Талімэна ўстала,
На пальчыкі ўзнялася, быццам падрастала.
Адкрыла трохі грудзі, выгнулася бокам
І доўга на сябе глядзела пільным вокам:
Што скажа ёй люстэрка, ведаць захацела,
Пасля ўздыхнула, вочы апусціла, села.

Граф — пан! А панскі густ, звычайна, не трывалы,
Ды Граф бландзін! Бландзін бывае рэдка сталым.
Ну а Тадэвуш? Прасцячок! Хлапчына мілы!
Амаль дзіця! Але з усёй кахае сілы!
Адно глядзець, дык першай не парве завязкі,
Ды ўжо для Талімэны мае абавязкі.
Мужчына малады, хоць трохі ў думках зменны,
Бывае цвёрды ў пачуцці, бо ён сумленны.
І доўга сэрца хлопца носіць успаміны
Пра шчасця час і ўдзячнасць за яго хвіліны.
І хлопец радасна прымае асалоду,
Нібы вясёлую сяброўскую прыгоду.

І толькі п'яніца, віном спаліўшы кішкі,
Гідліва потым пазірае на кілішкі.
Пра гэта Талімэна вельмі добра знала,
Бо розум мела ды і вопыту не мала.

Аднак, што скажуць людзіў Можна б перабрацца
Ў другое месца і ад злых вачэй схавацца,
Або зусім у іншы край перасяліцца.
Найлепш для гэтага падходзіла б сталіца —
Там можна б хлопца вывесці у свет, у людзі,
Пакіраваць, дапамагчы, дзе трэба будзе,
Кахаць, выхоўваць, сябра ў ім мець дарагога
І, покуль сілы служаць, пагуляць нямнога!

І з марамі такімі весела і смела
Прайшлася па пакоі, потым зноў прысела.

Не шкодзіла б падумаць і аб Графа лёсе.
Ці не ўдалося б як яму падсунуць Зосю?
Хоць небагатая, але ж — з арыстакратаў,
Так, як і Граф. Няўжо б яе ён не засватаў?
Каб толькі іх у пару звесці удалося,
Дык бы і Талімэне месца ў іх знайшлося
У будучым. Сваячка Зосі, Графа сваццця,
Была б у доме маладых, як быццам маці.
Закончыўшы з сабою гэткую нараду,
Падходзіць да акна і кліча Зосю з саду.

А Зося ў лёгкім плацці з галавой адкрытай
Стаяла на двары, высока ўзняўшы сіта;
Каціўся да яе клубок курэй стракатых,
З другога боку — статак пеўнікаў чубатых
Імчыцца, патрасае шышакоў каралам,
Вяслуе праз кусты, баразны дружна, валам,
Ускідваючы ўгору шпорыстыя ногі.
Індык за імі сунецца надзьмуты, строгі
І жонкі крык сцішае гнеўнай балбатнёю.
А павы, як плыты, хвастамі над травою
Плывуць. І, пакідаючы вышынь прасторы,
Ляціць шматочкам снегу голуб белапёры.
І на кругу зялёным з кветак, зелля, траваў

Сціскаецца рухомы круг крыклівы, жвавы,
Абведзены навокал галубоў істужкай,
Мігцеў той карагод рознакалёрнай птушкай,
Дзе з пер'я мітуслівага, як рыбкі з хвалі,
Чубкі чырвоныя і дзюбы вытыркалі,
Выцягваліся ўгору, быццам водныя цюльпаны,
І, быццам сотні зорак, ясна ззялі вочы.

А над натоўпам птушак — Зосін стан дзявочы.
Яна ўся ў белым — глянеш, і здаецца,
Што там фантан між кветак круціцца і б'ецца.
А Зося сыпала на крыллі і галовы
Рукой, як перлы, белай град густы пярловы
Ячменных круп, прызначаных для хатняй стравы
І ў некаторыя расолы для прыправы.
Так Зося, крупы беручы тайком са скрыні,
Наносіць шкоду гаспадарцы ахмістрыні.

Пачула — клічуць: «Зося!» — Гэта голас цёткі!
Сыпнула зразу птушкам той прысмак салодкі
І, сітка круцячы, як бубен танцаўшчыца,
І стукаючы ў такт, не ў сілах запыніцца,
Давай скакаць праз курак, галубоў і паваў,
Аж птушкі фуркнулі ўгару ад той забавы.
А Зося ледзь ступнямі зямлю закранала
І быццам з галубамі ўгору падлятала,
Якія, нібы ўпрэжаныя ў калясніцу,
Ляцелі нізка, не паспеўшы ў неба ўзвіцца.

І Зося з крыкам праз акно ў пакой зляцела,
Задыханая, цётцы на калені села,
А тая з пацалункам, гладзячы, як маці,
З уцехай заўважае прыгажосць дзіцяці
(Бо выхаванку шчыра ад душы любіла).
Але вось перад ёй сур'ёзны твар зрабіла,
Устала і, прайшоўшыся уздоўж пакоя,
На вуснах з пальцам, мовай пачала такою:

«Ну, Зося дарагая, ты ўжо забываеш
Пра ўзрост і стан свой. Ты ж распачынаеш
Год чатырнаццаты, пара кідаць чубаткі —

Гульня з курмі ніяк не для арыстакраткі!
І з дзетварой мужыцкай бруднай, мне здаецца,
Займацца досыць. Зося! Мне аж сэрца рвецца —
Ты ж загарэла, усё роўна як цыганка,
А рухаешся, ходзіш, як парафіянка.
З сягонняшняга дня ўжо гэтага не будзе,
Сягоння выведу цябе на свет, у людзі,
К гасцям. Гасцей, як ведаеш, цяпер тут многа.
Глядзі ж, каб сораму не выйшла мне якога».

Тут Зося ўскочыла і пляснула ў далоні,
І, ўпаўшы радасна на цётчынае ўлонне,
Смяялася, аж пераходзячы да плачу.
«Ах, цёця! Я ўжо так даўно гасцей не бачу!
З тых пор, як сябрам стаў мне птушнік наш вялікі,
Адзіны госць ка мне заглянуў — голуб дзікі.
Было мне трохі сумна, міленькая цёця,
Аж пан Суддзя ўжо спачуваў маёй самоце».

«Суддзя даўно,— сказала цётка,— ў людзі хоча
Цябе увесці і здаўна тым коле ў вочы,
Што ты ўжо вырасла. Не знаецца на гэтым
Дзядуля наш, з вялікім не абжыты светам.
Мне лепш вядома, колькі трэба рыхтавацца
Паненцы, каб нарэшце свету паказацца.
Хто між людзьмі расце, няхай сабе прыгожы,
Няхай разумны, ўражання зрабіць не можа,
Таму што ўсе к яму прывыклі ад дзіцяці.
А досыць толькі новай выплысці пастаці,
Што выхаваннем і красою бліснe хоць нямнога,
Тады к ёй ціснуцца адзін цераз другога,
Каб толькі як найлепш разгледзець тварык новы,
Рух кожны ацаніць, паслухаць свежай мовы.
Як стане моднаю асоба маладая,
То на'т яе той хваліць, хто й не ўпадабае.
А як вясці сябе, ты, спадзяюся, знаеш,
Расла ў людзях. Хоць тут другі год пражываеш,
Ды, пэўне, не забылася аб Пецярбурку.
Дык туалет распачынай. Вазьмі у бюрку
Усё патрэбнае табе для прыбірання,
Ды хутка, бо прыедуць зараз з палявання».

Тут пакаёўку клікнула. Загад дзяўчыне
Дала вады ў сярэбранае ўліць начынне.
І Зося, быццам птушачка ў пясочку, мые
З падмогаю дзяўчыны рукі, твар і шыю.
А цётка пецярбургскія бярэ прылады,
Духоў вымае пляшкі, слоікі памады
І лепшымі духамі пырскае на Зосю
(Аж пах ідзе вакол), памадзіць злёгку косы.
І Зося ўсцягвае ажурныя панчошкі
І туфлікі варшаўскія кладзе на ножкі.
Тым часам пакаёўка шнуравала станік,
Пасля, накінуўшы на плечы пударманік,
Да месца пачала загортваць папільёты
І волас недаўгі звівала ў два заплёты,
А грыўку гладка па-над тварам разабрала
І жменьку васількоў, што толькі вось сабрала,
Падносіць Талімэне. Тая іх счапіла
І к Зосінай галоўцы ўмела прышпіліла
Па правай старане. І васількі прыгожа
У светлых валасах цвілі, як паміж збожжа.
Вось знялі пударманік, толькі засталося
Сукенку ўскінуць, вось зусім гатова Зося:
Стаіць у белі, хустачка ў руцэ бялее,
І выглядае ўся, як водная лілея.

Папраўіўшы сукенку, валасы рукою,
Прайсціся цётка Зосю шле уздоўж пакоя
І пільна сочыць збоку свецкай дамы вокам
За кожным рухам выхаванкі, кожным крокам,
Муштруе гнеўна, кожную драбніцу бачыць:
«О я няшчасная! Глядзі, што гэта значыць
Жыць між гусей і пастухоў! Так расстаўляеш
Калені, як хлапец, вачыма так страляеш,
Як маладзіца! Ну зрабі паклон! Няўдала!»
«Ах, цёця! Ці ж я вінна, што такою стала?—
Сказала Зося.— Чым жа мне было заняцца?
Любіла з дзецьмі быць, за птушкай паганяцца,
Але як між людзьмі я трохі абжывуся,
Убачыш, цётачка, якой тады зраблюся!»

«Ужо,— сказала цётка,— лепей, пэўне, з птаствам
Гуляць, як з тым, што гасцявала ў нас, плюгаўствам.
Прыпомі толькі, хто збіраўся ў нас ля пляшкі:
Вось ксёндз, што ўсё маліўся ды іграў у шашкі,
Ды з люлькамі юрысты. Вось дык кавалеры!
Ад іх пераняла б ты слаўныя манеры.
Цяпер гасцюе таварыства ў нас, прызнацца,
Зусім адменнае, дык ёсць каму хоць паказацца.
Зважай жа, Зося, ёсць тут граф адзін прыгожы,
Ён родзіч ваяводы, быў у падарожжы,
З ім ветліваю будзь...»

Чуваць і коней ржанне,
І гоман шматгалосы: едуць з палявання!
Узяўшы Зосю за руку, пабегла ў залю.
Адразу з ходу месц мужчыны не займалі —
Перапранущца ўся кампанія жадала,
Бо ў куртках каля дам сядзець не выпадала.
Найперш прыйшлі у залю юнакі, вядома.

А Талімэна сёння ў ролі пані дому
Гасцей вітае, садзіць, мовай забаўляе
І ўсім пляменніцу парадкам прадстаўляе.
Тадэвуша знаёміць, як з сваячкай блізкай.
Прысела злёгку Зося, ён схіліўся нізка,
Хацеў прамовіць, вусны расчыніў нямнога
І ў вочы глянуў ёй. Ды тут прыйшла трывога,
Аж занямеў, і твар яго пачаў мяняцца,
Бо ў тым, што бачыў, быў не ў сілах разабрацца.
Пазнаў яе і ўміг адчуў сябе няшчасным,
Пазнаў па ўзросце і па воласе тым ясным:
Галоўку, постаць гэту бачыў на паркане,
І голас той будзіў яго на паляванне.

Аж Войскага ўзялі за юнака трывогі:
Убачыўшы, што той збялеў, аслаб на ногі,
Параіў адысці ў пакой для адпачынку.
Тадэвуш стаў у кут, апёрся на камінку
І моўчкі пераводзіў позірк свой туманны
То на аблічча цёткі, то на тварык панны.

Дык не магла тут не заўважыць Талімэна,
Што з хлопцам адбылася раптам перамена,
Хоць не згадала, што было яе прычынай.
Занепакоеная, сочыць за хлапчынам
І, выбраўшы хвіліну, хутка падбягае.
Што сталася? Здароў? Адказ даць налягае,
Напамінае Зосю трохі жартаўліва.
Тадэвуш, абапёршыся, стаяў маўкліва
І толькі вусны выкрыўляў і моршчыў бровы.
Здзівіў яе, разгневаў выгляд той суровы,
Дык твар й бяседы тон тады перамяніла,
Устала і са злосцю з ім загаварыла,
Сыпнуўшы градам слоў, якіх не падбірала.
Тадэвуш усхапіўся, быццам бы ад джала,
Зукоса глянуў, адапхнуў нагою крэсла
І, сплюнуўшы, пабег, нібы яго што несла,
З таго пакоя вон. На шчасце гэтай сцэны
Ніхто больш не заўважыў, апроч Талімэны.

За браму выбегшы, пакіраваў ў бок поля.
Як той шчупак, якому восць хрыбет праколе,
Нырае і плыве, жыцця, свабоды прагне,
Але ўсё шнур з жалезам за сабою цягне,
Так і Тадэвуш валачыў свае згрызоты
Цераз шырокія палі, платы, балоты,
Блукаючы зусім без мэты і дарогі.
Нарэшце ўжо, ці то яго прынеслі ногі
Выпадкам, ці сумысля, ды накіраваўся
ў той гай, які нядаўна сведкам шчасця стаўся,
Дзе той лісток любоўны быў яму паданы,—
На ўзгорачак лясны, Святыняй дум прызваны.
І ў час, як спадзяваўся быць тут адзінокім,
Заўважыў Талімэну ў роспачы глыбокай:
Сядзіць яна, ўжо не такая, як учора,
А скамянелая на камені ад гора,
Твар утуліўшы у адкрытыя далоні.
Відаць адразу, што ў слязах гаручых тоне.

Дарма Тадэвуш са спагаднасцю змагаўся,
Змякчэла сэрца з жалю, і хлапчына здаўся:
Сачыў за ёй хвіліну, стоячы за дрэвам,

І, уздыхнуўшы, сам сабе тлумачыў з гневам:
«Дурны! Яна ж не вінна, што я ашукаўся».
Дык да яе з-за дрэў памалу выхінаўся.
Аж раптам Талімэна ўскоквае на ногі
І рвецца ўправа, ўлева, поўная трывогі,
З распушчанай касою, з пабялеўшым тварам,
На землю падае, ўстае, бяжыць гушчарам,
Зноў падае, качаецца па зяляніне,
Відаць, што страшна мучыцца, бо па хвіліне
Хапаецца за грудзі, шыю, за калені.
Тадэвуш хутка скочыў да яе ў здзіўленні,
Падумаўшы, што звар'яцела мо жанчына
Ці страшна захварэла. Але тут прычына
Была другая.

Пад бярозаю старою
Мурашнік быў вялікі. Стуль мурашкі роем
Наведвалі штодня Святыню дум ад рання
Як месца працы, ці пляцоўку для гуляння.
З свайго узгорка, з мурашынае сталіцы
Дарогу пратапталі аж па ўскрай крыніцы.
Тым разам Талімэна села на дарожку.
Мурашкі, беленькую ўбачыўшы панчошку,
Узбеглі і пайшлі скрозь ласкатаць, кусацца.
Прыйшлося Талімэне бегчы, атрасацца,
Лавіць нарэшце, сеўшы воддаль той дарогі.

Не мог адмовіць ёй Тадэвуш дапамогі.
Сукенку чысцячы, схіліўся аж да ножкі,
А потым скроні вуснамі кранўўся трошкі.
Так дружна сядзячы, хоць і не гаварылі
Пра ранішнюю спрэчку, згоду ўстанавілі.
Няведама дакуль цягнулася б размова,
Каб іх не разбудзіў звон гучны з Сапліцова.

Пара вячэраць, час вяртацца ўжо дадому,
Тым больш, што недалёка трэск пачуўся лому.
Шукаюць, можа? Разысціся давядзецца.
Дык Талімэна ўправа, пад гарод, крадзецца,
А ён скіроўваецца ўлева — да дарогі.
Прыйшлося ім тады зазнаць крыху трывогі:

Раз Талімэне паказалася, што з куста
Аблічча Робака мільгнула, быццам хуста,
А пан Тадэвуш бачыў, пэўне, са два разы
У гушчары цень нейкі белы, даўгавязы.
Што там было, не знаў — падказвала пачуцце,
Што гэта Граф быў у даўгім сваім сурдуце.

Вячэралі у замку, бо стары Пратазы,
Нягледзячы на ясныя Суддзі наказы
Больш замка не займаць, зноў дзейнічаў з сакрэтам
І ў залу тую самую прыбыў з буфетам.
Парадкам госці увайшлі. Праз час каторы
За стол з паўкруга першы рушыў Падкаморы.
За важны чын і ўзрост яму тут гонар гэткі,
Дык дамам кланяўся, старым і малалеткам.
Манаха не было, і месца бернардына
Была запрошана заняць Падкамарына.
Калі Суддзя гасцей так, як жадаў, расставіў,
Кароткую малітву над сталом адправіў;
Мужчыны выпілі гарэлкі, і ўсе селі,
І халаднік забелены маўкліва елі.

Пасля падалі ракаў, куранят, шпарагі,
Наставілі венгерскіх вінаў і малагі.
Ядуць і п'юць усе, але маўчаць. Ніколі,
Як замак замкам, у яго застоллі,
Дзе гэтулькі калісьці чулася віватаў,
Ускрыкаў, тостаў розных тысячы мо ўзнята,
Напэўна, не было сумнейшае вячэры.
І толькі коркаў стук, талерак звон за дзверы
Перадавала рэха праз пустыя залы,
А вусны ўсім як быццам нешта завязала.

Прычын было сягоння многа для маўчання:
Прыбыўшы ў неблагім настроі з палявання,
Стральцы раздумаліся дома над аблавай
І ўбачылі, што выйшлі з невялікай славай.
Бо трэ' ж было, каб поп якісьці прыблукаўся
І ў справу, як Піліп з канопляў, умяшаўся,
Зацьміўшы ўсіх стральцоў павету. Вось і выйдзе
Наверх той сорам і ў Ашмянах, і у Лідзе,

Якія з гэтым век змагаюцца паветам
За першынство ў стральбе! Дык думалі аб гэтым.

Асэсар з Рэентам успомнілі няўдачы
Аблавы і той промах ранішні сабачы.
І зараз зрок іх дражніць заяц, што пад гаем
Так гончых абдурыў: ён хвосцікам мігае
І сэрцы іх абодвух сцёбае, як бічам,—
Сядзелі над талеркамі з тупым абліччам.
Асэсар меў маўчаць і іншыя прычыны,
Калі сапернікаў разглядваў ля жанчыны.

К Тадэвушу сядзела Талімэна бокам
Збянтэжанай, не смеўшы змераць хлопца вокам.
Хацела Графа сумнага крыху забавіць,
У гутарку ўцягнуць, настрой яго паправіць,
Бо вельмі кіслы Граф прыбыў з гуляння
Ці, па Тадэвушавай думцы, з падглядання.
На словы Талімэны галаву Граф горда
Падняў, насупіўся, зірнуў варожа, цвёрда
І зараз жа падаўся чым бліжэй да Зосі:
Талеркі ёй мяняе, шклянкі ёй падносіць,
Гаворыць кампліменты, часам скосіць вока,
Паклоніцца, ўсміхнецца і ўздыхне глыбока.
Ды так, што ўсё змагло заўважыць акружэнне,
Што ён хацеў за штосьці помсціць Талімэне,
Бо, павяртаючыся, быццам ненарокам,
Штораз у бок жанчыны ўзбліскваў грозным вокам.

Не знала Талімэна, што ўсё гэта значыць,
Пацiснула плячамі, падумала: дзівачыць.
Пасля і рада нават з ходу спраў такога,
Увагу ўсю сваю звярнула на другога.

Тадэвуш хмурны быў, да ежы неахвочы
І слухаў гутарку, ў талерку ўбіўшы вочы,
Дык лье яму віно, гуторыць, не сціхае.
Ён за руплівасць злы, маўчыць і пазяхае.
Яму не да спадобы (вось дык перамена!),
Што так ахвочая к залётам Талімэна,
Што гэтак выразаны на грудзях глыбока,

Няскромна горс. А вышай прыпадняўшы вока
І зрок хвіліну на яе стрымаўшы твары,
Спалохаўся, бо ўжо глядзеў не цераз мары,
І разгадаў сакрэт, як напускала чары!
Мой Бог! Намаляваная!

Ці там бяліла
Было благое, ці выпадкам адсланіла
Сапраўдны колер твару — адгадаць не можна.
А мо ў Святыні дум ён сам неасцярожна,
Заблізка размаўляючы, абцёр карміны,
Лягчэйшыя за пух на крылцах матыліных?
А дома Талімэна часу мела мала
І, пэўне, ў спешцы твару не падпудравала.
Ля вуснаў асабліва фарба абляцела,
І месцам выступіў смуглявы колер цела.
Адкрыўшы першае знячэўку сфальшыўленне,
Тадэвуш адшукаў і больш іх са здзіўленнем:
Зубоў двух не хапае, на ілбе маршчыны,
О, нават сотні іх на шыі у жанчыны!

Тадэвуш адчуваў, што цалкам непатрэбна
Красу дакладна разглядаць, і што ганебна
Шпіёніць так каханку, і што непрыгожа
Так сэрца адмяніць, ды хто ж з ім зладзіць можа!
Дарма каханне хоча замяніць сумленнем
І адагрэць душу вачэй яе праменнем,
Ды зрок яе, як месяц, свеціць, а не грэе
Глыбінь душы, а толькі звонку прамянее.
Дык дакараў сябе за нораў свой распусны,
Нагнуўся над талеркай і прыкусваў вусны.

А тут слоў некалькі падслухаць давялося,
Дык хочацца пачуць размову Графа з Зосяй.
Дзяўчына, ўбачыўшы, што Граф ёй так заняты,
Перш чырванела і спускала вачаняты,
Пасля смяяцца сталі і ў найлепшай згодзе
Спатканне ўспаміналі нейкае ў гародзе
І нейкі ход па лапухах, кустах, па шкодзе.
Тадэвуш, вушы навастрыўшы што меў сілы,
Лавіў і словы горкія, і зык іх мілы

І страшна мучыўся. Гадзюка гэтак злая
Перш яд з раслін двайным джыгалам выпівае,
Пасля ў клубок саўецца і на сцежцы ляжа,
Ўсім пагражаючы, хто ледзь ступню пакажа.
Так і Тадэвуш, зайздрасці атрутай п'яны,
Стараўся скрыць, які быў злы і ўсхваляваны.

Ў любой кампаніі, няхай хто заслуецца,
Яго настрой на іншых зараз разальецца.
Стральцы і так маўчалі, рэшта заўважала
Тадэвушаву злосць і галасы зніжала.
Пануры быў таксама сёння Падкаморы
І моўчкі пазіраў са смуткам час каторы
На дочак, што хоць і былі ўжо ў самым цвеце,
З пасагам, першыя паненкі у павеце,
А вось сядзелі моўчкі ў поўным занядбанні.
Таміўся і Суддзя у гэтакім маўчанні.
Аж Войскі ўжо не мог сцярпець. Выдатны лоўчы
Назваў вячэру гэту не людской, а воўчай.

Грачэха на маўчанне слых меў вельмі чуткі,
Сам гаварун і іншых слухаў бы ўсе суткі.
Не дзіва! ўсё жыццё правёўшы ў вандраваннях —
На радах, на наездах ці на паляваннях,
Прывык, каб вечна штось яму гудзела ў вуху,
Калі і сам маўчаў ці біткаю на муху
Замерваўся, ці марыў, прычыніўшы вочы.
Удзень шукаў гаворкі, ноччу быў ахвочы
Малітвы слухаць да пазна, старыя казкі.
Таму вось у яго не мела люлька ласкі,
Як выдумка нямецкая, што чужаземчыць
Народ, бо перш маўчаць навучыць, потым немчыць.
Ён, гаварун стары, адпачываў пры мове,
Будзіўся ад маўчання на апошнім слове.
Так мельнік, задрамаўшы, ўміг на ногі стане,
Калі млын спыніцца і сціхне грукатанне.

Вось Падкамораму пан Войскі пакланіўся,
Рукой ад вуснаў знак Суддзі зрабіў, спыніўся:
Прасіў даць слова. Дык абодва пахілілі
Галовы ў знак, што думку выступіць хвалілі.

Тады сказаў:

«Прасіў бы вас я, кавалеры,
Па-старадаўняму праводзіць час вячэры
І моўчкі не жаваць. Няўжо мы тут святошы?
Бо за сталом маўчанне — звычай не харошы.
Маўчаць, скажу вам, бы ў ствале зарад іржавіць.
Таму век гаварлівасць продкаў буду славіць:
Яны сядалі, не каб з'есці і напіцца,
А каб і ўдосталь, ад душы нагаварыцца
І сэрцы аблягчыць. Былі ў іх абгаворы
І ловаў, і стральцоў. Бывала, што каторы
І крык там узнімаў, і ўсе гудзелі жвава,
І раз яшчэ перажывалася аблава.
Сягоння ясна ўсім, чаго з вас той-сёй хмурны:
Каптур манаскі, пэўне, ўнёс настрой хаўтурны!
За промахі вам брыдка? Дарма духам палі!
Я лепшых знаў стральцоў, што часам не траплялі.
Пацэліць, прамахнуць, паправіць кожны можа.
Я сам, хоць ад дзяцінства ўжо страляў прыгожа,
Было, што не трапляў так, як і сам Тулошчык,
Не кожны раз трапляў і пан Райтан, нябожчык.
Пра Рэйтана скажу пазней. А ў гэтай справе,
Што панічы не дастаялі на аблаве
І не змагаліся з мядзведзем грудзі ў грудзі,
Хоць мелі піку, мы ані хваліць не будзем,
Ні ганіць, бо ўцякаць з зараджанаю зброяй
Той будзе, хто ніяк не варт імя героя.
А выстраліць наслепа (бо бывае й гэта),
Калі звер не падпушчан, задалёка мэта,
Ёсць ганьбай. Але хто прыцэліцца без страху
І выстраліць, калі і дасць часамі маху,
Без сораму ўжо можа ўзад падацца,
Таксама можа пікаю абараняцца,
Але не з мусу, бо бяруць на паляванне
Для абароны піку, не для нападання.
Здаўна вядзецца так. Паслухайце вось рады:
У сэрцы не прымайце вашай райтарады
І ты, Тадэвуш, і вы, шаноўны Графе!
А як прыпомніце аб гэтым трафе,
Не забывайце важнае перасцярогі:

Адзін другому не заходзьце больш дарогі
І не страляйце разам у адну звярыну».

Як толькі Войскі слова вымавіў «звярыну»,
Асэсар буркнуў спадцішка «дзяўчыну»,
Другія «брава» ўскрыкнулі і цераз смехі
Перасцярогу сталі паўтараць Грачэхі:
Апошняе са слоў крычалі: той звярыну,
А іншы, смеючыся, паўтараў: дзяўчыну.
«Кабету»,— буркнуў Рэент, і на заканчэнне:
«Какету»,— сыкнуў злы Асэсар к Талімэне.

А Войскі не збіраўся дапякаць нікому,
Да шэптаў тайных справы не было старому.
Ён рады быў, то дамам повад даў для смеху,
Дык і стральцам хацеў знайсці што на пацеху,
І так казаў, віна сабе падліўшы ў чару:

«Я тут не бачу бернардынавага твару.
Хацелася б, каб ён выпадак чуў цікавы,
Падобны да здарэння з сённяшняй аблавы.
Такога, як ксёндз Робак, мастака страляння
Знаў Ключнік аднаго, як нам расказваў зрання,
А я другога ведаў. Ён сябе праславіў
І стрэлам двух паноў ад пэўнай смерці збавіў,
Калі ў лес Налібоцкі, шмат таму ўжо часу,
Тадэвуш Рэйтан прыязджаў і князь Дынасаў.
І зайздрасці к стральцу паны не праяўлялі,
А нават тосты за яго здароўе ўзнялі,
І падарункаў паназносілі без ліку
І дзіка скуру. Вось хачу аб гэтым дзіку
І пра той стрэл вам зараз даць расказ асобны,
Бо той выпадак і да нашага падобны,
А здарыўся стральцам найлепшым нашых часаў —
Паслу Райтану разам з князем фон Дынасаў».

А тут Суддзя сказаў, віна падліўшы ў чашы:
«П'ю Робака здароўе. Войскі, ў рукі вашы!
Калі наш дар ксяндза не вельмі мо ўзбагаціць,
Дык хай тады яму за порах хоць заплаціць —
Лічу, што тушы з сённяшняга палявання

Кніга шостая
Ксёндз Робак

Книга шестая
Ксендз Робак

Księga szósta
Ksiądz Robak

Для манастырскай кухні на гады два стане,
А скуры не аддам. Гатоў на'т пасварыцца,
Калі не пажадае ксёндз са мной мірыцца,
А не, сплачу яе хоць нават сабалямі,
Бо скураю распараджацца мы павінны самі.
Калі пяршынства славы ў нас слуга ўзяў Божы
То скуру прысудзіць пан Падкаморы можа
Таму, хто з нас другой узнагароды варты».

Задумаўся тут Падкаморы не на жарты.
Стральцы загаварылі, кожны ўсхваляваўся:
Той гаварыў, як звера спудзіў, той — як гнаўся,
Той — як сабак склікаў, а той — як вёў аблогу.
Асэсар з Рэентам паднялі зноў трывогу:
Адзін усё сваёй хваліўся Сангушкоўкай,
Другі — балабаноўскаю Сагалясоўкай.

Тут мовіў Падкаморы: «Пан Суддзя, суседзе!
Па праву ў пераможцы вамі ксёндз узведзен,
Ды цяжка меркаваць, хто быў другім між вамі,
Чыёй заслугі больш. Вы ж ведаеце самі,
Што роўныя вы ўменнем, спрытам і адвагай.
Але, абмеркаваўшы справу ўсю з увагай,
Сцвярджаю: Граф з Тадэвушам — два чалавекі,
Што сёння найбліжэй былі ад небяспекі,
Дык скура ім належыць. Але мне здаецца,
Што ад яе Тадэвуш зараз адрачэцца,
Як маладзейшы, а пан Граф трафей той прыме,
Дык хай ён упрыгожыць дом яго і імя.
І гэта памятка сягонняшняй аблавы,
Як сімвал, хай вядзе вас, Граф, да новай славы».

І з думкай, што уцешыў Графа, сеў у крэсла.
Не ведаў, што прамова Графу боль прынесла,
Бо той, на першае трафея ўспамінанне
Падняў міжвольна зрок на лбы аленяў, ланяў,
На рогі, што тырчэлі, быццам лес лаўровы,
Хаваныя ў вянкі нашчадкам на галовы,
На рад партрэтаў, што ўпрыгожвалі філяры,
На герб Паўкозіц на скляпення ўсім абшары,
І часы даўнія над ім загаварылі.

Прачнуўся, ўспомніў, дзе гасціў у гэтай хвілі.
Сваяк Гарэшкаў у свой дом гасцём прыняты,
З Сапліцаю балюе, з ворагам заўзятым!
А рэўнасць горкая, якой не мог пазбыцца,
Тым больш распальвала яго супроць Сапліцаў.

Дык мовіў горка: «Дзе ў маім змясціцца доме
Падарку вашаму багатаму такому!
Пакінем лепш мядзведзя тут пакрасавацца,
Пакуль яго Суддзя мне не аддасць з палацам».

Уцяміўшы, куды хінецца Графа мова,
Пан Падкаморы табакеркай просіць слова.

«Пахвалы варты вы,— прамовіў,— Граф, суседзе,
Што ў думках справы маеце на'т пры абедзе,
Не так, як большасць панічоў такого ўзросту,
Што рахаваць не любіць. Я скажу па-просту,
Што суд ураз закончыць згодай мы маглі бы,
Бо справа тут датычыць дворнае сялібы.
Я маю і праект, як можна замяніцца
Зямлёй»... І стаў казаць, задумаўшы спыніцца
Над тым, якія мае ён замены планы.
Ужо ў паўмовы быў, ды рух неспадзяваны
Падняўся пры канцы стала: адны штось заўважалі,
Паказвалі другім. І ўсе звярнулі ў залі
Галовы ў кут, як каласы, што іх кранула
Уздыхам ветру і у іншы бок нагнула.

З кута, дзе быў партрэт старога пана,
Апошняга Гарэшкі, з форткі, што схавана
Была дасціпна за масіўныя філяры,
З'явілася пастаць, падобная да мары:
Гервазы. Па аблічы, росце распазналі
І па той куртцы, што Паўкозіцы ўкрывалі.
Ступаў ён, быццам слуп, прамы, нямы, суровы,
Не зняўшы шапкі, не шануючы прамовы.
Трымаў ён ключ вялікі, як кінжал блішчасты,
І стаў у шафе штось пакручваць, нечым шастаць.

У двух кутах каля філяраў у той залі

У шафах двух старых гадзіннікі стаялі,
Два дзівакі, што з сонцам не былі ўжо ў згодзе:
Паўдня паказвалі тады, як дзень сыходзіў.
Гервазы папраўляць не думаў тых машынаў,
Але і без дагляду ўсё ж іх не пакінуў
І катаваў ключом штовечар вельмі дбала,
А зараз вось пара накручвання настала.
У час, як Падкаморы кіраваў увагу
На важнасць справы, Ключнік пацягнў за вагу —
Заскрыгатаў у шафе механізм іржавы.
Спыніўся Падкаморы ад такое справы.
«Браток,— сказаў,— спыніся з працай пільнай гэтай».
І прадаўжаў далей. А той са злоснай мэтай
Яшчэ мацней загрукатаў другою гірай.
Тут гіль, што зверху быў, кіўнуўся над задзірай
І, крыллямі б'ючы, куранты грацъ сабраўся.
Ён спрытна змайстраваны, толькі сапсаваўся,
Дык заікаўся і пішчаў штораз то горай.
Тут госці ў смех, зноў мусіў змоўкнуць Падкаморы.
«Гэй, Ключнік,— крыкнуў,— або лепш, пугач-начніца,
Калі шануеш дзюбу, раджу прыпыніцца!»
Гервазы, не ўстрашаны гразьбой такою,
Апёрся на гадзіннік праваю рукою,
А леваю узяўся ў бок і ў той паставе:
«Падкамарэньку,— мовіў,— жартаваць вы ўправе,
Хоць меншы верабей за пугача, ды дома
Ён многа адважнейшы — гэта вам вядома.
А Ключнік не пугач, вось хто ў чужую хату
Ўлез ноччу, той пугач, і я яму дам плату».
«Вон! Вон яго!»— ўзарваўся Падкаморы.

«Пане,
Пан Граф,— азваўся Ключнік,— хай пан толькі гляне:
Ужо і так ваш гонар пляміцца даволі,
Што вы з Сапліцамі п'яце ў адным застоллі.
І трэба ж, каб мяне, замковага служаку,
Гарэшкаў ключніка лічылі за сабаку
Ў паноў маіх палацы? Як пан гэта зносіць?»
Тут закрычаў Пратазы: «Сціхніце ўсе! Досыць!
На ўказ! Вось я, Пратазы Бальтазар Брахальскі,
Імён двух, генерал калісьці трыбунальскі,

Па-просту — Возны, тут выказваю сцвярджэнне,
У сведкі беручы ўсё гэта акружэнне
І заклікаючы на следства Асасора,
Бо на законах і правах мая апора,
У справах шанаванага Суддзі Сапліцы
З прычын інкурсіі — наезду на граніцы
І ў замку гвалту: праўна ім Суддзя ўладае,
А доказ вось: у замку ён за стол сядае».
«Брахун!»— ускрыкнуў Ключнік,— на вось за заслугі!»
І пук сваіх ключоў, рвануўшы ад папругі,
Крутнуў над галавой і выпусціў з размахам.
Жалезны жмут мільгнуў, як з прашчы; простым шляхам
Ён пэўне б лоб Пратазаму разбіў на чвэрці,
Ды, шчасцем, той схінуўся і не даўся смерці.

Усе ўсхапіліся і нейкі час маўчалі,
Суддзя ўскрыкнуў: «Гэй, хлапцы, чаго пасталі?
Звязаць яго!» І чэлядзь кінулася жвава
Праходам вузкім між сцяной і лавай,
Але ім крэслам Граф загарадзіў дарогу
І, на апоры той умацаваўшы ногі:
«Стоп!— крыкнуў,— не дазволю, пан Суддзя, нікому
Майго слугу пакрыўдзіць у маім жа дому!
Хто мае скаргу на яго, сказаць мне можа!»

Тут глянуў Падкаморы на яго варожа:
«Без вашай дапамогі пакараць я ў сіле
Шляхцюшку злоснага, [redacted] вас мы б, Граф, прасілі
Прыпомніць, што прысвойваць замак 'шчэ зарана,
Мы за сталом не ў вас мо, а ў другога пана.
Сядзіце ціха і ўшануйце, як не гэту
Сівую галаву, дык першы чын павету!»

«А што мне? — буркнуў Граф,— даволі слоў між намі.
Нудзіце іншых паважаннем і чынамі!
Даволі глупства, што заняўся з вамі п'янствам,
Якое вось заканчваецца грубіянствам.
Вы мне яшчэ адкажаце за ўсе абразы!
Убачымся цвярозымі! За мной, Гервазы!»
Адказу гэтага ніяк не спадзяваўся
Пан Падкаморы, ён віна падліць узяўся,

Ды збіты Графа грубасцю, як громам,
Апёрся на кілішак бутлем нерухомым.
Схіліўшы галаву убок, наставіў вуха
І вочы шырака раскрыў, сказаў штось глуха,
Пасля зноў моўчкі чарку з гэткай сілай сціснуў,
Што звонка пырскнула, струмень віна аж свіснуў
У вочы і, нібы ў душу падсыпаў жару —
Так бліснуў зрок, і чырвань хлынула да твару.
Ўсхапіўся гаварыць і перш штось невыразна
Малоў, пакуль праз зубы выціснуў: «Ад... блазна...
Вось я! Ах ты, Графчук! Тамаш! Дзе шабля? Я тут
Табе навучку дам! Ты, блазан! Пойдзеш к кату!
Урады, ўвагі нудзяць вушка без прывычкі!
Вось зараз паласну цябе праз завушнічкі!
За дзверы! Вон! Тамаш, дай шаблю мне ў той хвілі!»

Тут Падкаморага наўкола абступілі,
Суддзя ўхапіў за рукі: «Гэта наша справа!
Я першы вызваны. За мной адпомсціць права!
Пратазы, шаблю! Зараз ён мне тут паскача!»
Тадэвуш прыпыніў Суддзю: «О не! Задача
Утаймаваць яго павінна мне застацца,
А вам няёмка з гэткім фарсуном вязацца.
Пакіньце гэта мне, я дам яму навуку.
А ты, што на старых сваю ўзнімаеш руку,
Пакажаш заўтра нам, якога ты пакрою,
Што ты за рыцар, заўтра знойдзем пляц і зброю,
А сёння, покуль цэл, ідзі!»

І добра радзіў,
Бо Ключнік з Графам апынуліся ва ўладзе
Абураных людзей, дзе адыход быў цяжкі,
А тут ужо з канца стала ляцелі пляшкі
Над Графа галавой. Жанчыны ўсе ў трывозе —
У плач, а Талімэна ў слабасці к падлозе
Хінуцца стала, раптам крыкнуўшы жалосна,
Пасля на рукі Графу ўпала і павісла млосна
Грудзьмі на грудзі у бяспамяцтве ад жаху.
А Граф, хоць злы, стрымацца мусіў у размаху,
Стаў церці, ажыўляць.

У той жа час Гервазы

Пад градам пляшак, табурэтаў, хоць не зразу,
Хістацца стаў. А чэлядзь, ссунуўшы рукавы,
Натоўпам бегла да яго. Ды тутка ў справы
Ўступіла Зося: хутка скокнула к старому
І засланіла ад напасці і пагрому.
Стрымаліся. Гервазы трохі ўзад падаўся
І знік з вачэй. Шукалі, дзе пад стол схаваўся,
А ён з канца другога вынырнуў, як з тоні,
І, лаву падхапіўшы ў дужыя далоні,
Крутнуўся, як вятрак. Уміг суцішыў залу,
І разам з Графам сталі адступаць памалу,
Заслоненыя лавай, к дзверцам за філяры.
А тут стары, зірнуўшы ворагам у твары,
Няўпэўнена хвіліну думаў: адступіцца
Ці ў бітву з новай зброяй раз яшчэ пусціцца.
Другое выбраў: лаву, як таран для муру,
Узад падаў дзеля размаху, ўсю фігуру
Напружыў і хацеў папхнуць, зрабіць дарогу,
Ды Войскага заўважыў і адчуў трывогу.
Сядзеў спакойна Войскі і з прыжмурам вока,
Здавалася, задумаўся над чымсь глыбока.
Але як з Падкаморым Граф пачаў спрачацца
І пагражаць Суддзі, стары аддаў табацы
Належнае і стаў ацэньваць Графа крокі.
Пан Войскі быў Суддзі якісь сваяк далёкі
І, жывучы здаўна ў яго гасцінным доме,
Так сябру спачуваў, як, пэўне, больш нікому.
Дык зацікаўлены ўсёй гэтай валтузнёю,
Руку на стол дастаў угору даланёю
І палажыў на ёй нож тронкамі да ногця
Ўказальніка, лязом павернуты да локця,
І стаў ківаць рукою, быццам забаўляўся,
Прытым у Графа безупынна углядаўся.

Мастацтва кідання нажоў, страшное ў звадзе,
У той час у Літве было ўжо ў заняпадзе
І між старымі. Ключнік кідаў нож нярэдка,
Але ніхто так не пускаў, як Войскі, метка.
Відаць па руху рук, што нож запусціць з жарам,
А па вачах, што ў Графа цэліцца з ударам
(Ў апошняга з Гарэшкаў, хоць і па кудзелі).

Не ўсе з прысутных рухі тыя зразумелі.
Збялеў Гервазы, засланяе Графа лавай,
Здае к дзвярам. А вокал крык: «Лавіце! Жвава!»

Як воўк, калі яго над падаллю застануць,
Рванецца ў гурт сабак, убок не ўспеўшы глянуць,
І гоніць іх: вось-вось рване, ды сярод брэху
Пачуе трэск курка — на новую памеху
Вачыма косіць. Бачыць: цалкам недалёка
Стралок прыкленчыў, к стрэльбе прытуліўшы вока,
Кранае спуск і рулю на яго наводзіць.
Воўк туліць хвост і ўміг на ўцёкі пераходзіць,
А псярня з брэхам жудкім клубіцца зноў ззаду,
За кудлы рве. Ён на сабак знайшоў бы раду,
Бо ледзь зірне, пашчэмкай плясне, клык аголіць,
Уся арава рассыпаецца й скуголіць.
Так і Гервазы грознай адступаў паставай,
Вачыма ворага спыняючы і лавай,
Пакуль не ўскочылі абодва ў цьму фрамугі.

«Лаві!» — крычалі, бегучы за імі, слугі.
Аж раптам над галовамі неспадзявана
На хорах Ключнік паявіўся ля аргана
І з трэскам алавяныя пачаў рваць трубы.
І, пэўне, шмат каго прывёў бы да загубы,
Ды госці ўжо таўпіцца пачалі ў парозе.
І слугі не ўстаялі, хутка ўсе ў трывозе,
Ледзь што-мага хапіўшы, следам падаліся
І розных рэчаў, і начыння шмат зракліся.
А хто ж, не чуткі ні на ўдары, ні абразы,
Апошнім адступіў? — Брахальскі Пратазы.
Ён, стоячы ў Суддзі за крэслам непарушна,
Цягнуў асведчанне ўсё тое ж раўнадушна
І, толькі скончыўшы, пляц кінуў апусцелы,
Дзе засталіся грузы і пабітых целы.

Людскіх ахвяраў не было, але ўсе лавы
Амаль без ног былі, а голы стол кульгавы
Злёг на талерак, місак гурт, вінам заліты,
Як рыцар на шчыты, з каня ў змаганні збіты.
А ўкруг ляжаць індычак, куранятак цельцы,

А з іх тырчаць нажы і ўбітыя відэльцы.

І хутка ўжо ў старым Гарэшкаўскім будынку
Вяртацца пачало ўсё зноў да супачынку.
Згушчаўся змрок. А рэшткі панскае вячэры
Ляжаць, як ежа для дзядоў, што, згодна веры
Народнай, сходзяцца на заклінанняў словы.
З-пад даху адгукнуліся ўжо тройчы совы,
Як гусляры, нібы ўсход месяца віталі,
Якога водбліск пранікаў з надхмарнай далі
З дрыжаннем светлым. І сярод начное цішы
Праз дзіры пацукі павылезлі і мышы,
Грызуць і п'юць. І толькі часам стукне глуха
Шампанскага бутэлька за здароўе духаў.

А на другім паверсе ў той жа час у залі,
Якую некалі люстэркаваю звалі,
Стаяў Граф на балконе насупроціў брамы
І ветрам халадаўся. Рухам з нейкай драмы
Сурдут з пляча спусціў, палою ахінуўся
І быццам у плашчы шырокім апынуўся.
Гервазы ў кут з кута хадзіў цяжкой ступою,
І кожна повен дум гутрыў сам з сабою.
Граф мовіў: «Пісталеты, а як не — палашы!»
Гервазы паўтараў: «Зямля і замак нашы!»
«Пляменніка і дзядзьку,— ўскрыкваў Граф,— кліч к бою!
Увесь іх род!» «Калі вы хочаце спакою,—
Выкрыкваў Ключнік,— замак, землі адбірайце,
Пан Граф, нічога ім не пакідайце!
Нашто судзіцца вам, мапанку? Суд кароткі:
Чатыры сотні год жылі тут вашы продкі.
Зямлі аднялі шмат дзялягі Таргавіцы
І перадалі, як пан ведаеш, Сапліцы.
Усё забраць ад іх, не толькі нашу долю,
За кошты ўсе судовыя, за самаволю!
Я вам не раз казаў: наездам праў дабіцца!
Я вам не раз казаў: даволі ўжо судзіцца!
Даўней бывала так: хто раз зямлю здабудзе,
Той пан. У полі выйграй, дык прысудзяць суддзі.
А што датычыцца з Сапліцам даўняй звады,
Дык тут не суд, а мой Сцізорычак дасць рады.

А як Мацей паможа з Розгай весці спрэчку,
То мы, мапанку, ўдвух з Сапліцаў зробім сечку».
«О брава!— ўскрыкнуў Граф.— Твой план гота-сармацкі
Мілейшы мне на шмат, чым гоман адвакацкі.
Ты ведаеш, на ўсю краіну шуму будзе,
Бо аб падобных справах і не помняць людзі,
Дык пагуляем. За маё тут прабыванне,
За два гады, хто біўся? За мяжу сяляне!
А ў тым нашэсці нашым кроў паліцца можа.
Я раз, калі яшчэ бываў у падарожжах,
Такі паход праводзіў з князем у Сыцылі.
Тады ў яго бандыты зяця захапілі
І выкупу ад сваякоў патрабавалі.
Мы хутка слугаў і васалаў пазбіралі
І — к ім. Я сам аж двух забіў з таго іх зброду,
У табар іхні ўскочыў, вязню даў свабоду.
Ах, дарагі Гервазы! Што за трыумфальны
Быў наш зварот дамоў геройска-феадальны!
Народ нас з кветкамі сустрэў, а дочка князя
На грудзі ўпала мне ва ўдзячнасці й экстазе.
Калі ж прыбыў я ўжо ў Палерма, ўсе газеты
І ўсе жанчыны славілі выпадак гэты.
І на’т раманс надрукавалі аб здарэнні,
Дзе прозвішча маё названа і найменні.
Раманс завецца «*Граф, або Пра таямніцы*
Бірбанта-рокка замка». Ці тут ёсць цямніцы?»
«Ёсць,— адказаў Гервазы,— варта падзівіцца.
Было ў іх і віно, ды выпілі Сапліцы».
«Жакеяў,— Граф сказаў,— таксама ўзброіць можам,
Васалаў клікнем з сёл». «Лакеяў? Крый вас, Божа!—
Гервазы ўскрыкнуў.— Вы разважце толькі самі,
Які ж наезд з лакеямі ды з мужыкамі?
Не цяміце ў наездах, бачу, вы нічога.
Вусалаў — рэч другая. Вусачы — падмога!
А мы ў засценках лёгка знойдзем іх, мапанку!
Адно даць знаць у Добрынь, Центычы, Рубанку.
Здаўна там шляхта рыцарская пражывае
І ад вякоў Гарэшкаў роду спачувае,
Яны Сапліцаў ненавідзяць усе чыста,
Адтуль вось і збяру я вусачоў са трыста.
Мая ў тым справа. Вы ж вяртайцеся ў палацы

Паспаць, бо заўтра вас чакае многа працы.
Пара даўно: пяюць другія пеўні, пане.
Я папільную замка, покуль дзень настане.
І ў Добрынь вырушу, як след, з самога ранку».

На словы гэтыя Граф адступіўся з ганку
І глянуў, адыходзячы, ў дзіру байніцы.
А ўбачыўшы агнёў шмат у двары Сапліцы:
«Ілюмінуйце!— крыкнуў,— заўтра будзе змрочна
Ў вас, а ў замку светла — гэта ідавочна!"

Гервазы сеў у кут, да сценкі прытуліўся
І галавою, поўнай дум, уніз хіліўся,
А месяц асвяціў ягоны чэрап лысы.
На ім стары вычэрчваў пальцам знакі, рысы —
Відаць, што распрацоўваў новы план ваенны.
На вочы стаў насоўвацца цяжар каменны,
Дык рушыў галавой, каб цалкам не забыцца,
І, па штодзённай звычцы, спрабаваў маліцца.
Але паміж адной малітвай і другою
Пачалі мары плысці доўгай чарадою:
І Ключнік бачыць зноў паноў з Гарэшкаў роду —
Усе яны са зброяй, з імі шмат народу.
А кожны круціць вус, глядзіць сурова,
Замерваецца шабляй грозна, хоць без слова.
За імі воддаль ціхі цень адзін крануўся
З крывавымі грудзьмі. Гервазы здрыгануўся,
Бо Стольніка пазнаў, пачаў хрысціцца скора,
Гнаць сон цяжкі. А каб вярнуць сабе бадзёрасць,
Маліцца зной пачаў за ўсіх памёршых душы.
Зноў склеіліся вочы, зазванілі вушы.
І бачыць гурму шляхты, сонечную зброю:
Наезд! Карэлічы! Вядзе ўсіх Рымша к бою!
І бачыць сам сябе, як конны з грозным крыкам
Ляціць у бой з мячом бязлітасным вялікім;
Расшпіленая рвецца ўгору тарататка,
І з вуха з'ехала назад канфедэратка.
Ляціць ён і сустрэчных валіць, рэжа, коле
І на канец Сапліцу паліць у стадоле.
Ды вось паблыталіся думкі бесталкова,
І так заснуў апошні ключнік Гарашкова.

КНІГА ШОСТАЯ • ЗАСЦЕНАК

Змест: Першыя ваенныя рухі наезду. Паход Пратазага. Робак з панам Суддзём радзяцца пра грамадскія справы. Працяг бескарыснага паходу Пратазага. Урывак пра каноплі. Шляхоцкі засценак Дабрын. Апісанне сялібы і асобы Мацька Дабрынскага.

Няўзнак світанне кралася з сырога змроку,
Дзень без румянца несучы, без свету ў воку.
Хоць дзень настаў, ён ледзь прыкметны праз туманы.
Імгла вісела над зямлёй, як саламяны
Застрэшак над хацінай літвіна. На ўсходзе
Відаць на небе па рассветленым абводзе,
Што сонца ўстала, што ўзнімаецца над нівай,
Але, яшчэ заспанае, ідзе ляніва.

Па прыкладу нябёсаў і зямля заспала.
Пазней на луг жывёла выйшла, крочыць вяла
І зайцаў спозненых трывожыць пры сняданку.
Звычайна ў гай яны ўжо скачуць на світанку,
А ў сённяшняй імгле то хрумстаюць макрыцу,
То скачуць парамі, то ў гурт прабуюць збіцца,
Капаюцца ў раллі, гуляюць на прасторы.
Спалоханыя, ў лес бягуць уздоўж разоры.

І ў лесе цішыня. Не хочацца птушыне
Пяяць, расу атрэсла, сеўшы на галіне,
Галоўку ўціснула ды жмурыцца ў дрымоце
І ўсё чакае сонца. Дзесьці на балоце
Клякоча бусел і, абмокшыя, ўсё ранне
Працяжна каркаюць вароны у тумане,
Абрыдлыя сялянам, бо варожаць слоту.
Сяляне ўжо даўно ўзяліся за работу.

Пачаўся жнеяў спеў працяглы і маркотны,
Так сумны, аднастайны, як дзень гэты слотны,
І тым сумнейшы, што ў імгле без рэха гіне.
Вось хруснулі сярпы у спелай азіміне,
І рад касцоў сячэ атаву на лагчыне,
Насвістваючы песню; а ў канцы пакосаў
Спыняюцца ўсе, менцяць або клеплюць косы.

Людзей не ўбачыш, толькі чуецца ў тумане
Звон кос, сярпоў ды песняў стройнае гучанне.

А аканом, на сноп прысеўшы сярод збожжа,
Маркоціцца, за працаю сачыць не можа,
На тракт, на скрыжаванне хіліць зрок цікавы,
Дзе незвычайныя заўважыў справы.

Гасцінцам, па дарогах з самага ўжо ранку
Снуюць падводы. Вось мужыцкую фурманку
Мінае брычка, быццам пошта, ў поўным чвале,
За ёй бяжыць другая, трэцюю дагналі.
Налева пасланец матнуўся, бы ў пагоні,
А справа праскакала больш дзесятка коней.
Куды спяшаюцца ўсе гэтак — невядома.
Дзівіла гэта ўсё надзвычай аканома,
Устаў ён са снапа і доўга над дарогай
Стаяў, хацеў спытаць, ды не спыніў нікога
І не пазнаў. Мігаюць коннікі, як цені,
І толькі стук капыт чуваць у аддаленні
І, што больш дзіўна, бразганне халоднай зброі.
Дык аканом і рад, і трохі ў неспакоі,
Бо хоць тады ў Літве быў час зусім спакойны,
Ды чуткі нейкія насіліся пра войны,
Пра Францыю, Дамброўскага, пра Банапарта.
Няўжо вайну той рух варожыць? Ведаць варта.
І аканом пабег Суддзі пра ўсё данесці,
Ну і даведацца пра тое-сёе ўрэшце.

А ў Сапліцове ўсе пасля ўчарашняй звады
Усталі ў злым настроі і з сябе не рады.
Дарма Вайшчанка дамам пасіянсы ставіць,
Дарма нясуць мужчынам карты, не цікавіць
Нішто. Мужчыны з люлькамі ў кутках сядзелі,
Жанчыны ж заняліся дамскім рукадзеллем.
Спяць нават мухі.

Войскі, стомлены нагладка
Маўчаннем, вырушыў на кухню да чалядкі
Паслухаць гоману і ўбачыць, чым заняты
Бурклівы кухар, ахмістрыня, кухараты.

Прысеўшы там, аддаўся ўвесь прыемным марам
Пад рух ражноў, што павярталіся над жарам.

Суддзя, замкнуўшыся ў сябе, пісаў ад рання,
А Возны на двары таміўся ад чакання.
Аж вось Суддзя закончыў, Вознага ў дом кліча
І ўголас іск чытае, схмурыўшы аблічча,
На Графа за знявагу гонару, абразы,
За гвалты і разбой, што дапусціў Гервазы,
А на абодвух за пагрозы і за шкоды,
Учыненыя імі з гэтай жа нагоды.
Іск трэба вусна аб'явіць, абавязкова
Да сонца заходу. Пратазы рад, без слова
Прымае ад Суддзі пакет для даручэння,
А сэрца скача ў самаго з задавальнення.
Ад думкі аднае пра суд — адмаладзіўся,
Успомніў, колькі з іскамі ён нахадзіўся
Па гузакі і, як-ніяк, па ўзнагароды.
Так вось салдат, які правёў у войнах годы,
І ў больніцы ляжыць калекам адзінокім,
Пачуўшы бубна стук ці кліч трубы далёкі,
Праз сон ускрыкне: «Ў бой, браты салдаты!» —
І на назе драўлянай скача вон з палаты
Так хутка, што ніхто дагнаць яго не можа.

Пратазы апранацца стаў у падарожжа,
Ды не ўскладае кунтуша ані жупана —
Адзежа гэта на пару судоў схавана.
Ён для дарогі мае іншае адзенне:
Шырокія райтузы, куртку па калені,
Якой на гузіках падшпільваюцца полы
Або спускаюцца. Таксама могуць долу
Спускацца ўверх падвязаныя шапкі вушы.
Апрануты так, з палкай пехатою рушыў,
Бо Возны перад справай, як шпіён ваенны,
Пад выгляд маскіруецца зусім адменны.

Каб Возны не так спешна выйшаў у дарогу,
То іскам тым пацешыўся б зусім не многа,
Бо ў Сапліцове перайначыліся планы.
Ксёндз Робак да Суддзі прыбег усхваляваны

І кажа: «Вось бяда, Суддзя, нам з цёткай гэтай,
З той Талімэнай, ветрагонам і какетай.
Як Зося апынулася ў сірочым стане,
Аддаў яе пан Яцак ёй на выхаванне,
Пачуўшы, што яна разумная, свет знае,
А бачу, што яна муціць нам пачынае.
Тадэвуша звяла інтрыгамі сваімі
І Графа баламуціць — круціць абудвымі.
Дык абмяркуйма, як пазбыцца гэтай цёткі,
Бо не агледзешся, як тут паўстануць плёткі,
Злы прыклад, нават звады з гэтае нагоды
І перашкодзяць з Графам вам прыйсці да згоды».
«Да згоды?!— закрычаў Суддзя усхваляваны,—
Са згодай скончана, план згоды разарваны!»
«А гэта што?— ускрыкнуў Робак.— Дзе ж галовы?
Што, ваша, баеш? Зноў скандал якісьці новы?»
«Віна тут не мая,— сказаў Суддзя,— вось суддзям
Даказана ўсё Графава нахабства будзе.
Латруга і Гервазы. Ды суд прыме меры!
Шкада, што не былі вы, ксенжа, на вячэры,
Пасведчылі б, як страшна Граф мяне абразіў».
«Пашто ж, пан,— крыкнуў Робак,— у руіны ўлазіў?
Я гэтак замка не цярплю. І больш нічога
Мяне туды не ўцягне. Вось зноў кара Бога!
Як там было? Скажы! Зноў трэба ўсё наладзіць.
Мяне дурнота ваша пачынае гадзіць.
Важнейшыя ёсць справы, чым мірыць разлады,
Ды раз яшчэ зміру». «Змірыць? Без вашай рады
Абыдзецца. А вы лепш ціхенька сядзіце,—
Сказаў Суддзя са злосцю.— На табе! Глядзіце!
Якісьці там манах мне дасць загад мірыцца!
Знай, ваша, што мірыцца не прывык Сапліца,
Падаў у суд, дык выйграе. Выпадкі ў нас бывалі,
Што ў шостым пакаленні суд мы выйгравалі.
Даволі глупства, што па вашаму жаданню
Я трэці раз склікаю суд размежавання,
А сёння згоды ўжо няма, няма між намі!
(Выкрыкваў і хадзіў, і біў як вол нагамі.)
Апроч таго, за свой нахабны, злосны ўчынак
Хай Граф нас перапросіць, не — дык паядынак!»
«Што ж будзе, як аб тым даведаецца Яцак?

Памрэ ад жалю, бо не можна забывацца,
Што замак ад Сапліцаў вынес шмат благога.
Ах, брат, глядзі, каб гора не было замнога!
Ты ведаеш, што землі замка Таргавіца
Забрала, а пасля перадала Сапліцам,
І Яцак за грахі пакляўся перад Богам,
Што верне ўсё назад да самага малога,
Дык у апеку ўзяў Гарэшкі ўнучку Зосю.
Плаціць за выхаванне многа ўжо прыйшлося.
А ён хацеў яе з Тадэвушам сасватаць
І гэтак дзве нязгодныя сям'і пабратаць,
Наследніцы аддаць, на што ў яе ёсць права».
«Што мне?— сказаў Суддзя.— А мне якая справа?
Я нават і не бачыўся ніколі з Яцкам,
Ледзь чуў і аб жыцці ягоным гайдамацкім.
У езуітаў я вучыўся ў тыя годы,
Пасля прыдворным быў у замку ваяводы.
Маёмасць далі, я узяў, прыняў і Зосю,
Глядзеў яе і дбаю аб далейшым лёсе,
Ды бабская гісторыя ўжо мне дадзела!
Пасля, чаго Граф лезе ў не свае надзелы?
З якім да замка правам? Скуль яно узята?
Гарэшкам ён — вадой на кісялі дзесятай!
Ён лаецца, а я павінен з ім мірыцца?!»
«Брат,— ксёндз сказаў,— прычыны ёсць, пашто таіцца.
Ты помніш, Яцак думаў слаць у войска сына,
Пасля ў Літве пакінуў. Што тут за прычына?
Вось ён радзіме тутка больш патрэбным будзе.
Ты ж ведаеш, пра што вакол гавораць людзі,
Пра тое ж гаварыў і я не раз, бывала,
А вось цяпер сказаць усё пара настала!
Тут справы важныя, мой брат: вайна і годзе!
Вайна за Польшчу! Браце! Будзем на свабодзе!
Вайна вось-вось пачнецца! Едучы таёмна
Сюды, фарпосты бачыў я ўжо каля Нёмна.
Напаляон збірае гэтулькі народу,
Што свет не помніць, чалавек не бачыў з роду.
З французамі ідзе і польскі корпус цэлы:
Дамброўскі, Панятоўскі і арол наш белы!
Яны ўжо блізка. Хай па першаму наказу
Праз Нёман ступяць, і Радзіма ўскрэсне зразу!»

Суддзя уважна слухаў, склаўшы акуляры,
Глядзеў ксяндзу у вочы: ці ж сапраўды мары
Здзяйсняюцца? Ўздыхнуў, сляза ў вачах свяціла...
Пасля схапіў ксяндза за шыю са ўсёй сілы:
«Ах, ксенжа,— ўскрыкваў,— ды ці толькі гэта праўда?
Ах, ксенжа,— паўтараў,— ці толькі гэта праўда?
Нас столькі зводзілі! А помніш, як казалі:
Напаляон ідзе! І мы тады чакалі.
Казалі: ён у Польшчы, ў Прусах, ля граніцы,
Да нас ідзе! А ён у Тыльжы стаў мірыцца.
Ці толькі гэта праўда? Мо ізноў памылка?»
«Як Бог на небе, праўда!» — мовіў Робак пылка.
«Хай Бог благаславіць вас тым, чаго вам трэба,—
Сказаў Суддзя з паднятымі рукамі ў неба,—
Не скаешся ў пасольстве, божы чалавеча,
Я дам на манастыр твой сотні дзве авечак.
Ты ўчора на каштанку, ксенжа, заглядаўся,
Гняды мой, ведаю, табе быў спадабаўся,
Сягоння запрагаю я ў твой воз абое.
Прасі, што хочаш зараз, я аддам любое,
Ды толькі ведай: з Графам згоды ў нас не будзе,
Аб гэтым не прасі, няхай рашаюць суддзі,
І ўсё тут».

Ксёндз, упёршыся ў Суддзю вачыма,
Аж рукі заламаў. Паціснуўшы плячыма,
Сказаў: «Калі Напаляон нясе свабоду
І свет дрыжыць, ты можаш думаць пра нязгоду?
Такіх падзеяў незвычайных ход пазнаўшы,
Няўжо чакаць спакойна будзеш рукі склаўшы,
Калі ўжо дзейнічаць пара?» «Што на думцы маеш?» —
Спытаў Суддзя. «Няўжо яшчэ не адчуваеш
Душой сваёю дум маіх? Ах, браце мілы!
Калі ў табе Сапліцаў кроў і досыць сілы,
Глядзі: французы рушаць спераду ў змаганне,
А што, каб ззаду нам узняць тады паўстанне?
Як думаеш? «Пагоня» хай заржэ, на Жмудзі
Няхай «Мядзведзь» раўне, і ўміг паўстануць людзі.
Каб з тысячу спачатку ці хоць з палавіну
Сабраць, а там паднялі б мы і ўсю краіну.
І вось, каб мы, здабыўшы тутка перамогу,

Кніга шостая
Мацей з Дабрына

Книга шестая
Матек с Добжина

Księga szósta
Maciek z Dobrzyna

Сустрэць выбаўцаў нашых выйшлі на дарогу!
Ідзём, а імператар, здзіўлены не мала,
Пытае: «Хто там?» Мы крычым: «Літва паўстала!
Дазволь нам, кесар, з арміяй тваёй злучыцца!»
Спытае ён: «Хто камандзір?» «Суддзя Сапліца!»
Хто смеў бы папракнуць тады нас Таргавіцай?
Браток, пакуль стаяць Панарам, Нёмну плысці,
Датуль Сапліцаў імю з памяці не выйсці!
Унукаў, праўнукаў Ягайлава сталіца
Паказваць будзе пальцам: «Гляньце, вось Сапліца,
З Сапліцаў тых, што першыя ўзнялі паўстанне».

Суддзя на гэта: «Хто ды што казаць там стане,
Дык гэтым галава мая найменш занята.
Нічым не вінаваты я ва ўчынках брата,
Палітыкай таксама я не забаўляўся,
А толькі абавязкі выканаць стараўся.
Я — шляхціц і ахвотна сцёр бы пляму дому.
Ахвотна паслужу я краю дарагому.
Душу яму аддам. Не лепшы я з ваякаў,
Ды й мой палаш таму-сяму пакінуў знакаў.
Раз я на сейміку адным у бой паклікаў
І ў паядынку зраніў двух братоў Бузвікаў,
Што... ды не ў гэтым справа. Як тут разабрацца,
Ці трэба неадкладна ў поле выбірацца?
Стралкоў сабраць не цяжка. Пораху мы маем
І некалькі гарматак у ксяндза хаваем,
А ў Янкеля, я знаю, ёсць жалезкі к пікам,
Што будуць годныя і якасцю і лікам.
Жалезкі гэтыя прывезены з Крулеўца
Тайком, а зараз мы да іх наробім дрэўкаў.
І шабляў хопіць. Шляхту конна ўміг пасадзім,
Я — на чале з пляменнікам, а там — паглядзім!»

«Вось кроў паляка!— ўскрыкнуў бернардын,— не скрыю,
Я гэтага й чакаў! — і згроб Суддзю за шыю. —
«Ты сын Сапліцаў, ты прыслужышся радзіме
І з братніх він цяжкіх сваё ачысціш імя.
Ты быў мне мілы заўсягды, а з гэтай хвілі
Ты мне, як брат, нас справы зараз параднілі.
Мы падрыхтуемся, бо рушым не адразу,

Я месца вызначу і час, чакай наказу.
Я знаю, цар ганцоў паслаў да Банапарта —
Прадоўжыць мір ён дабіваецца упарта,
Але цяпер яго старанне мала варта.
Француз Біньён з напалеонаўскае рады
Гаворыць, што нічым закончацца нарады,
Што быць вайне. А наш князь Юзаф тому рады,
Мяне сюды ў Літву направіў ён з наказам
Разведаць, ці не хочаце вы з Польшчай разам
За кесарам ісці, як многія народы,
І ў чым ваш доказ, што чакаеце свабоды.
Тым часам, браце, з Графам трэба ўсё наладзіць.
Хоць ён дзівак, фантаст, радзіме ён не здрадзіць,
Ён добры патрыёт і справе дапаможа.
Бо кожны з дзівакоў карысць прынесці можа,
І нават могуць дурнаватыя змагацца,
Калі захочам імі мы апякавацца.
Граф — пан і ў шляхты навакольнай у пашане,
Па прыкладу яго і ўвесь павет паўстане.
Маёмасць знаючы яго, разважыць кожан:
Калі паны ідуць, быць рызыкі не можа.
Дык вось бягу к яму». «Хай так сябе не ўзносіць,—
Сказаў Суддзя,— няхай прыедзе, перапросіць
Мяне, бо я ж старэйшы ды і пост займаю!
А справу хай зноў суд арбітраў разбірае...»
Тут ксёндз дзвярыма стукнуў. «Ну дык едзьце з Богам»,—
Сказаў Суддзя.

Ксёндз сеў на воз адразу за парогам,
Б'е пугай, лейцамі сваю варушыць пару.
Загрукатала брычка, ўзняўшы пылу хмару,
Аж ледзь руды каптур з той цемры гляне,
Нібы арол, калі ў аблоках віцца стане.

А Возны быў ужо ад дома Графа блізка.
І, быццам знюхаўшы здалёку сала, ліска
Бяжыць к яму ды безупынна ўсё гадае,
Ці ежа не атручана, ўсё разглядае,
Спыняецца, а то на задніх сядзе лапах
І веерам-хвастом ганяе пах па храпах,—
Так Возны ўбок звярнуў з дарогі, полем крочыць,

Махае палкай, пільна за сялібай сочыць
І, быццам быдла ўбачыўшы, што ўлезла ў шкоду,
Праз луг ідзе, але крадзецца ў бок гароду.
І раптам, нібы гончы драча балотам,
Пабег сагнёны і ў каноплях знік за плотам.

У гэтай цёмналістай і густой расліне
Ля дому ёсць прытулак птушцы і звярыне,
І людзям. Часта заяц, спуджаны ў капусце,
Шукае сховішча ў каноплях, а не ў кусце,
Бо ў гэтых гушчарах няма для харта ходу,
Ганчак жа там яго не зветрыць ад смуроду.
Дваровы там ад бізуноў ці аплявухаў
Хаваўся і сядзеў, пакуль пан гневам бухаў.
Нярэдка ўцёкшым ад ракрутчыны сялянам
Здаралася хавацца ў лесе канапляным.
Таму ў час бітвы ці наездаў, дратаванняў
Бакі абодва не шкадуюць намаганняў,
Каб толькі затрымаць каноплі за сабою,
Бо тым яны карысныя ў хвіліну бою,
Што з хмелевым далей злучаюцца спляценнем,
Спрыяючы атакам ды і адступленням.

Пратазы, хоць быў смелы, не пазбыўся страху,
Бо ўспомніў зараз ад расліны гэтай паху
З даўнейшых часаў некаторыя выпадкі,
Як доказ, што шлях службы Вознага не гладкі:
Прыпомніў Тэльшы і шляхцюгу Дзіндалета,
Які, упёршы ў грудзі дула пісталета,
Пад стол загнаў адчытваць іск сабачым брэхам,
Ды памаглі каноплі — скончылася смехам.
Другі раз Валадковіч, злоснік небывалы,
Што разганяў нарады, ганьбіў трыбуналы,
Прыняўшы раз ад Вознага з суда паперы,
Парваў іх і паставіў гайдукоў на дзверы,
А сам крычаў, падняўшы меч над галавою:
«Зжары свае пісулькі, не дык вось раскрою!»
Стаў есці, аж на лобе ўсталі поту кроплі,
Ды бухнуў праз акно і шуснуў у каноплі.

Хоць на Літве тады была пара другая

І не ўжываў ніхто ні шаблі, ні нагаяў
На Возных, толькі мо хто дзе аблаяў,
Не знаў Пратазы перамены абычаяў.
Даўно ўжо вельмі з іскамі ён не насіўся,
Хоць быў ахвотнік прыслужыцца і прасіўся,
Але Суддзя з увагі на старыя годы
Яму ўсё адмаўляў і скарыстаў з нагоды
Сягоння.

Возны пільна вушы настаўляе —
Навокал ціха, дык рукамі расхінае
Канопляў лес густы, высокі і пахучы
І сунецца, як той плывун, нырнуўшы з кручы.
Ўзняў галаву — наўкола ціш. К сцяне крадзецца —
Наўкола ціш. Праз вокны глянуць давядзецца —
Нікога. Узышоў на ганак, цісне клямку
Са страхам — пуста, быццам дзе ў заклятым замку.
Іск дастае, чытае ўголас аб'яўленне.
Тут стук калёс пачуў і ў сэрцы мітусенне.
Ўцякаць хацеў, ды штосьці дзверы засланіла —
Ксёндз Робак! Вельмі іх сустрэча задзівіла.

А Граф кудысьці вырушыў з дварнёю,
Бо на'т пакінуў дзверы насцеж за сабою.
Відаць, што зброю браў. Ляжалі на падлозе
Двухстволкі, стрэльбы, шрубштакі, пры дапамозе
Якіх наладжвалі, відаць, старую зброю.
Валяўся порах і клакі сярод пакоя.
Ці Граф на паляванне вельмі так спяшаўся?
Пашто ж яму запас халоднай зброі здаўся?
Вось шабля без галоўкі, зломаная шпага —
А зброя падбіралася, відаць, з увагай
З таго, чым шмат гадоў ніхто не карыстаўся.
Ксёндз Робак доўга думаў, пільна прыглядаўся,
Нарэшце ў фальварак распытаць падаўся,
Шукаючы людзей, што ведалі ці чулі,
Дзе Граф. І вось спаткаў нарэшце дзве бабулі,
Якія расказалі, што з сваёй дружынай
Узброены пан Граф падаўся ў бок Дабрына.

Здаўна ў Літве Дабрынскі славіцца засценак

Адвагай шляхціцаў, прыгожасцю паненак.
Даўней багаты, людны, бо калі Ян Трэці
Праз віці вёў мабілізацыю ў павеце,
То прыбыло тады з Дабрына к ваяводзе
Шэсцьсот узброеных мужоў. Сягоння ў родзе
Іх менш, усе збяднелі. Некалі, бывала,
Дабрынскіх шмат на лёгкім хлебе працавала
У войску ці ў паноў вялікіх у палацах,
А зараз мусяць самі аб сабе старацца
І працаваць, як простыя сяляне з вёскі.
Сярмяг не носяць, а капоты у палоскі,
А святам кунтушы. У бедных на'т шляхцянак
Адзежа розніцца ад вопраткі сялянак:
Яны ўсе ў крамных ходзяць блузах і спаднічках,
Кароў пасуць не ў лапцях, але ў чаравічках
І збожжа жнуць, а на'т прадуць у рукавічках.

Дабрынскіх распазнаць было ў натоўпе проста,
Бо выдзяляліся і моваю, і ростам,
Вачыма чорнымі, арлінымі насамі
І чорнымі (кроў чыстых ляхаў) валасамі.
З зямлі Дабрынскай некалі прывандравалі
І хоць чатырыста гадоў тут пражывалі,
Мазурскай засталіся верныя радзіме.
Калі хто з іх даваў свайму дзіцяці імя,
Дык браў апякуном кароннага святога:
Барталамея ці Мацея — не другога.
Дык сын Мацея быў заўсёды Баўтрамеем,
А Баўтрамея сын мог толькі быць Мацеем,
Жанчыны ў іх былі ўсе Кахны ці Марыны.
Каб разабрацца сярод гэткай блытаніны,
Прымалі розныя мянушкі ад заганы
Ці якасці, з якой быў хто найлепей знаны.
Мужчыны мелі часам прозвішчаў і многа
То ў знак пашаны, то ад нораву якога.
Інакш часамі звалі шляхціца ў Дабрыне,
А іншым імем у чужой ён зваўся гміне.
Дык за Дабрынскімі паны, а потым служкі
Браць сталі прозвішчы, па-нашаму — м я н у ш к і .
І рэдкі ведае, хоць выдумка ўсё ў модзе,
Што нарадзілася яна ў Дабрынскіх родзе.

Ды там была патрэбнай, а па цэлым краі
Не йнакш, як перайманнем увайшла ў звычаі.

Дык Матыяш Дабрынскі, шанаваны дзеля
Старшынства ў родзе, зваўся Пеўнем на касцеле,
Але з Касцюшкаўскае эпапеі змрокам
Мянушку ён змяніў і звацца стаў Забокам,
У Дабрыне ён зваўся Каральком — як бацька,
А Літвіны празвалі Над Мацькамі Мацькам.

Як над Дабрынскімі ён сам, яго сяліба
Над вёскай панавала, і чужынец хіба
Не знаў, хто жыў паміж касцёлам і карчмою,
Дзе кожны кут паглядваў страшнай беднатою.
Двор без варот, платы ў развале, і бярозкі
На градах, але дом быў, як сталіца вёскі,
Бо лепш і раскашней за іншых збудаваны —
Ён правым бокам, дзе святліца, быў цагляны.
Паводдаль свіран, стайня, клуня і абора —
У гурце ўсё і ўсё прыгнутае ад гора
І надзвычайнай старасці. Вакол па даху,
Як быццам хто зялёную раскідаў бляху,
Свяціўся мох, і гойдаў травы ветру подых,
Нібы на лузе ці ў падвешаных гародах.
Там крапіва, а там чырвоныя кракосы,
Дзеванна жоўтая і шчыраў фарбных касы.
Тут розных птушак гнёзды — галубоў пад дахам
І ў вокнах ластавак, а з-пад дзвярэй са страхам
Трусы вылазяць, рыюць норы на палетку,
Дык двор нагадвае трусятнік або клетку.

А абаронны быў калісьці! Поўна знакаў,
Што многа помніць ён нападаў і атакаў.
За брамаю валялася паводдаль хаты,
Як галава дзіцячая, ядро гарматы
Ад шведскіх часаў; некалі крыло у браме
Абапіралі на яго, нібы на камень.
На панадворку ў палыне і розным зеллі
Магільныя старэнькія крыжы тырчэлі.
Іх больш дзесятка. Тут знайшлі сабе магілы
Забітыя раптоўна ўдарам страшнай сілы.

Каб хто прыгледзеўся бліжэй к будынкам,
Заўважыў бы ў бярвеннях, шчылінах, пад тынкам
Шрамы счарнелыя, а ў кожнай гэткай пляме
Засела куля, быццам чмель у цёмнай яме.

А ля ўваходу ў дом і клямкі ўсе, і гакі
Або абсечаны ці носяць шабляў знакі:
Тут, пэўне, правяралі гарт тых Зыгмунтовак,
Якімі можна нарубаць з цвікоў галовак
Ці крук рассекчы, не зрабіўшы ў шаблі шчэрбы.
Паверх дзвярэй віднеліся Дабрынскіх гербы,
Ды сыры іх з паліцай зараз абступілі,
І гнёзды ластавак вясёлых абляпілі.

У доме, стайні, клуні, нават і у садзе
Убачыш поўна зброі, нібы ў нейкім складзе.
Пад стрэхамі падвешаны чатыры каскі —
Прыгожасць марсавых галоў,— там абавязкі
Бацькоў спраўляюць галубы, Венеры птушкі.
Над жолабам кальчуга, звязана за вушкі,
І панцыр лускаваты служыць за драбіну,
Ў якую жарабкам кідаюць канюшыну.
Кухарка некалькі рапір адгартавала,
Бо іх замест ражноў, бязбожная, ўжывала,
Трафеем з Вены — бунчуком змятае жорны.
Багіні Цэрэс даў дарогу Марс праворны,
А тая з Флёраю, Памонай і Вяртумнам
Апанавала дом, хлявы, свіронак, гумны.
Але сягоння расступаюцца багіні:
Вярнуўся Марс.

Чуць свет з'явіўшыся ў Дабрыне,
Якісьці пасланец па вёсцы скача конна
І будзіць, як на паншчыну. Перш шляхта сонна
Ўстае і пачынае ў вуліцах таўпіцца —
Гудзе карчма, і свеціцца ў ксяндза ў святліцы.
Старэйшыя ідуць пытаць, што гэта значыць,
Парадзіцца, а хлопцы ўжо на конях скачуць.
Жанчыны ў крык, трымаюць, тыя з рук іх рвуцца,
Бягуць кагосьці біць, вяртаюцца, злуюцца
Ды ўсё ж спыняюцца. А у ксяндза плябана

Нарада доўгая вялася ўсхвалявана,
Але, калі надзеі не было на згоду,
Рашылі запытаць Мацея, бацьку роду.

Хоць семдзесят два годы меў Мацей старэчы,
Ды дужы быў, прысадзісты, шыракаплечы.
Яшчэ канфедэратам будучы, сваёю
Дамаскай шабляй ён праславіўся крывою,
Штыкі і пікі з-пад якой ляцелі сечкай,
Якую сціпла жартам называў *Рузэчкай*.
З канфедэрата потым манархістам стаўся
І Тызенгаўзавай палітыкі трымаўся,
Але, калі кароль прымкнуў да Таргавіцы,
Ён паспяшаўся зноў з ім хутка разлучыцца.
За тое, што змяніў ён партыяў так многа,
Пачалі *Пеўнем на касцеле* зваць старога,
Што ён, нібы той пеўнік, ветрам кіраваўся.
Прычыны гэткіх змен не кожны б дакапаўся:
Магчыма, што Мацей любіў так моцна войны,
Што іх усё шукаў яго дух неспакойны,
А мо, палітык быстры, толькі кіраваўся
Дабром радзімы і ўслужыць ёй лепш стараўся,
Хто знае! Толькі пэўна, што ані калісьці,
Ні потым не шукаў ён славы ці карысці
І не звязаўся з царскай партыяй ніколі,
І што цярпець не мог ён царскае няволі,
І каб не ўбачыць масказя, праседжваў дома,
Як той мядзведзь, што лапу ссе між буралому.

Апошні раз, пайшоўшы на вайну з Агінскім
У Вільню, дзе служылі разам пад Ясінскім,
Ён з Розгай проста цуды паказаў адвагі.
Вядома, што ён першы збег з акопаў Прагі
Пацея бараніць, які ляжаў стаптаны,
Ў баі тым атрымаўшы дваццаць і тры раны.
І доўга іх усе лічылі за забітых,
Ды вось вярнуліся, дзіравыя, як сіты.
Дык пан Пацей, дабраўшыся з вайны дахаты,
Свайму выбаўцы ахвяроўваў дар багаты:
Даваў фальварак з пяці хат у карыстанне
І злотых тысячу што год на утрыманне,

Але Дабрынскі мовіў: «Хай Пацей Мацея,
А не Мацей Пацея лічыць дабрадзеем».
Адмовіўся ад фальварка і ад платы,
І з працы ўласнай жыў, вярнуўшыся дахаты:
Рабіў вуллі, лякарствы рыхтаваў жывёле,
На торг слаў курапатак, што лавіў на полі,
І паляваў на звера.

Хоць было ў Дабрыне
Старых людзей не мала, што і па-латыні
Умелі, і закон маглі тлумачыць з ходу,
Было шмат багацейшых, з усяго ўсё ж роду
Мацей, прасцяк убогі, меў найбольш пашаны.
Не толькі ён праз Розгу быў навокал знаны,
Але як мудры чалавек, што ведаў многа
Пра родны край і род, і з роду пра любога.
Законы знаў і ведаў гаспадаркі справы,
Сакрэты знаў стральбы, знаў лекавыя травы,
А на'т хадзілі чуткі (толькі ксёндз пярэчыў),
Што ведае ён шмат чаго з таемных рэчаў.
Прытым усе надвор'я перамены знае
І лепш за каляндар пагоду угадае.
Дык і не дзіва, што ці то перад дарогай,
Ці перад працаю пыталіся старога.
Ні суд, сяўба, дажынкі, згода пасля звады —
Нічога не ішло без Мацькавай парады.
Мець гэткае значэнне Мацек не стараўся,
А нават на кліентаў часцяком злаваўся
І моўчкі выпіхаў іх цераз дзверы дому,
Бо радзіць не хацеў ніколі і нікому.
Аднак, убачыўшы каго ў цяжкіх умовах,
Часамі што сказаў і то ў кароткіх словах.
Дык думалі, што сёння дзеля важнай справы
Парадзіць ці захоча весці ў бой крывавы,
Бо ён любіў сутычкі ў маладыя годы
І з маскалём счапіцца ждаў адно нагоды.

Якраз стары хадзіў ля стайні і аборы
І ціха пеў *«Калі ўстаюць уранні зоры»*,
Пагодзе рады, бо імгла ішла не ўгору,
Як гэта ў слотную заўжды бывае пору,

А ападала. Вецер расхінуў далоні,
Імглу разгладжваў, рассцілаў па шэрым склоне,
А сонца ў той час зверху тысячай праменняў
Залоціць, серабрыць, румяніць рэшту ценяў.
Як слуцкія майстры ўдваіх ткуць пояс літы —
Дзяўчына распраўляе шоўк, на кросны ўзвіты,
І гладзіць фон, а зверху ткач у пасмы тыя
Кідае ніткі серабрыста-залатыя
І творыць кветкі; так зямлю сягоння дбала
Туманам вецер заснаваў, а сонца ткала.

Мацей сагрэўся ў сонцы, перастаў маліцца
І вось пачаў аб гаспадарцы клапаціцца:
Прынёс травы, лістоў, пад хатай сеў і свіснуў.
На свіст бялюткім пухам гурт трусіны бліснуў;
Нібы нарцысы, на траве трусы зайрдзелі
І квеццем беласнежным зацвіталі ў зеллі.
А вочкі свецяць, як крывавыя рубіны,
Ушытыя ў зялёны аксаміт раўніны.
Становіцца на лапкі кожны, рушыць вухам,
Глядзіць, пасля ўсе гуртам белапухім,
Прынаджаныя лісцем свежае капусты,
Бягуць да ног, калені абсядаюць густа.
Ён сам, як трус, бялюткі, любіць іх занадзіць
І белы цёплы пух іх далікатна гладзіць.
Другой рукою проса кідае ў бок плоту
Для вераб'інае, штоваліцца са стрэх, галоты.
І вось неспадзявана цераз паўхвіліны
Трусы прапалі ў норах, а ўвесь вераб'іны
Натоўп шугнуў на стрэхі з гоманам трывожным,
Дарогу даючы гасцям ці падарожным.
А гэта ад плябаніі пасля ўжо звады
Ішлі паслы прасіць Мацеевай парады.
Яшчэ здалёк аддаючы яму паклоны,
Прамовілі: «Хрыстос хай будзе пахвалёны»,
«На векі векаў, аман»,— адказаў старэча,
Пазнаўшы, што прыйшлі не для пустое рэчы;
У хату просіць. Увайшлі, абселі лаву,
А першы, стоячы, пачаў выкладваць справу.

Тым часам шляхты штораз болей прыбывала —

Дабрынскія амаль усе, чужых не мала
З суседства ўзброеных і без ніякай зброі,
У брычках, каламашках, конна, пехатою;
Вазы стаўляюць, коней да бярозак вяжуць,
І ўсім цікава, што нарады тут пакажуць.
Святліца поўная, і сені — да паловы,
А многія праз вокны ўціснулі галовы.

КНІГА СЁМАЯ • НАРАДА

З м е с т : Выратавальныя парады Бартака, празванага Прусаком. Салдацкае слова Мацька Хрысціцеля. Палітычнае слова пана Бухмана. Янкель заклікае да згоды, якую рассякае Сцізорык. Прамова Гервазага, у якой выяўляецца сеймавае красамоўства. Пратэст старога Мацея. Раптоўнае з'яўленне падмацавання абрывае нараду. Гайда на Сапліцу!

Спярша стаў Бартак Прус выкладваць справу.
За тое, што ў Крулевец ён хадзіў для сплаву,
Яго празвалі Прусаком аднасяльчане
У жарт, бо прусаў не любіў з пераканання,
Хоць часта ўспамінаў. Быў веку пажылога,
Нямала вандраваў па свеце, бачыў многа,
Палітыкай цікавіўся, чытаў газеты
І растлумачыць шмат што мог на зборы гэтым.
Дык вось ён так канчаў:

«Наш дарагі Мацею,
Мой браце, а для ўсіх, шаноўны дабрадзею,
Тут не малая дапамога. У французе
Я ўпэўнены, як быццам у казырным тузе:
Народ ваенны, а ад часаў Тадавуша
Касцюшкі (кожны з тым цяпер змірыцца змушан)
Няма ваякі большага за Банапарта.
Я помню, як французы перайшлі праз Варту.
Я за граніцай быў тады, у годзе панскім,
У тысяча васьмісот шостым, і пад Гданскам
Вёў гандаль. Сваякоў жа маю я ў Пазнанскім,
Дык ездзіў іх наведаць у той час з Юзэфам
Грабоўскім, што сягоння рэгіменту шэфам,

А ў той час жыў у вёсцы блізка Аб'язера,
І мы на дробнага там палявалі звера.
Было спакойна ў Велькапольшчы ў гэтым часе,
Ды ўміг аб страшнай бітве вестка разышлася;
Да нас прыймчаўся мігам пасланец Тадвэна,
Грабоўскі ліст счытаў і крыкнуў: «Ена! Ена!
Прусакі збітыя дазвання — перамога!»
Я на калені ўпаў з падзякаю да Бога.
У горад зараз жа мы коней павярнулі,
Як быццам так сабе, нібы навіны і не чулі,
Аж бачым, што ўжо ўсе ландраты і гофраты
Ды камісары — зброд нямецкі франтаваты
Нам кланяецца нізка, ажно глянуць гадка,
І ўецца, як прусак, апараны вараткам.
Мы рукі паціраем, просім з прыніжэннем
Сказаць, што новага чутно, як справы ў Ене?
Іх страх узяў, што мы аб перамозе новай
Пачулі, дык крычаць: «*А хары гот! О-о вэй!*»
Насы павесіўшы, ідуць дамоў, а там на ногі
Стаўляюць спешна ўсіх. І ўраз усе дарогі
Кішаць народам. Немцы ўюцца, як мурашкі,
Паўзуць, вязуць вазы, нагружаныя цяжка,
А ля вазоў ідуць мужчыны і жанчыны
І валакуць куфэркі, чайнікі, пярыны,
Бягуць, як могуць. Мы збіраем зараз раду:
Па конях! Перабіць нямчыскам райтараду!
Давай ландратам і гофратам гладзіць скабы,
А гэрам афіцэрам абрываць гарцабы.
І генерал Дамброўскі ўраз быў ля Пазнані
З загадам кесара: ўзнімацца на паўстанне!
За тыдзень наш народ так высцебаў прусакаў,
Што й на лякарства не знайшоў бы небаракаў!
А каб і нам сягоння справу так паставіць
І маскалям у нас такую ж лазню справіць?
Што думаеш, Мацей? Калі ўжо з Банапартам
Масква ў нязгодзе, то не скончыцца тут жартам:
Герой у свеце першы, войска многа мае,
Скажы нам, Каралёк, тут мысль твая якая?»

Замоўк, і ўсе з Мацея ўжо не зводзяць вока,
А ён маўчаў, відаць, задумаўся глыбока

І толькі зрэдку штосьці мацаў каля боку,
Як бы хапаў за шаблю (з дня няволі краю
Ўжо шаблі не насіў, але свайго звычаю
Не кінуў: на ўспамін Масквы за бок хапаўся,
Нібы намацаць Розгу там ён спадзяваўся,
І дзеля гэтага празваны быў Забокам).
Узняўшы галаў, слухаў ён з прытухшым зрокам
І доўгі час, супроць агульнага чакання,
Сядзеў схмурнелы, ўрэшце ўжо пасля маўчання
Усё ж загаварыў павольна і сурова,
З прыціскам вымаўляючы за словам слова:

«Ну ціха! Скуль жа вы навіну гэту бралі?
І дзе цяпер французы? Ці вайну пачалі?
Хто іх вядзе? Куды ідуць? Якой дарогай?
Пяхоты колькі? Конніцы? Гармат ці многа?
Кажыце зараз, што адкуль вядомым стала?»

А грамада глядзела вокал і маўчала.
«Я раджу пачакаць прыезду бернардына,—
Сказаў Прусак,— бо гэта ад яго навіна.
Тым часам трэба слаць шпіёнаў на граніцу
І ўзбройваць тых цішком, якія могуць біцца,
А покуль што з намерамі не адкрывацца
І да паўстання ўсёй акругай рыхтавацца».
«Чакаць? брахаць? цягнуць?— другі Мацей падняўся,
Які Крапіцелем праз доўбню зваўся,
Празваную Крапілам — меў яе з сабою,
І, рукі скрыжаваўшы па-над булавою
І ўспёршы бараду, крычаў:— Чакаць! Спрачацца!
І доўга думаць! Гэм, трэм, брэм, пасля змывацца!
Я ў Прусіі не быў, і розум крулявецкі —
Для прусакоў, а ў мяне ёсць свой, шляхецкі.
Хто хоча ў бой, павінен за крапіла брацца,
А хто ўмірае, тому трэба спавядацца!
Я жыць хачу і біць! Нашто нам бернардыны
Ці Робакі? З якой патрэбны нам прычыны?
Мы самі — рабакі і маскалёў падточым!
Чакаць! Цягнуць! Дзяды вы, я скажу у вочы!
І недарэкі! Хай сабака ходзіць нюхаць,
Ксёндз пабірацца, а мне трэ' крапілам рухаць!

Крапіць! крапіць! і ўсё тут». І даўбню пагладзіў.
За ім: «Крапіць! крапіць!»— пранеслася ў нарадзе.

Тут Бартак, што ад тонкай шаблі Брытвай званы,
Мацей з мянушкай Конаўка, бо пастаянна
Насіў з шырокай руляй стрэльбу і з якое
Мог тузін куль, як з конаўкі, лінуць ракою,
Крычалі гучна разам: «Хай жыве Крапіла!»
Прусак зноў слова браць хацеў, ды заглушыла
Яго шмат крыкаў: «Вон з ім трусам-прусачынам!
Хто трус, таму не быць байцом, а бернардынам!»

Тут галаву падняў стары Мацей з задумы,
І зараз жа заціхлі крыкі ўсе і шумы.
«Насмешкі з Робака,— сказаў ён,— без карысці,
Бо ён чарвяк, які арэхі можа грызці.
Я бачыў раз яго, ледзь толькі кінуў вокам,
Пазнаў, што ён за птушка; ён крутнуўся бокам
І рушыў, не хацеў, відаць, мне спавядацца.
А што мне? Што мне ў справы не свае мяшацца?
Сюды не прыйдзе, не чакайце бернардына.
Калі ж вось гэта ад яго прыйшла навіна,
Дык што ў яго за мэта? Бес ён, не ксянжына!
Як апроч гэтага не знаеце нічога,
Тады чаго вам трэба? Скуль уся трывога?»

«Вайна!» — крычалі. «З кім?»— спытаў. «З Масквой!
З Масквою!—
Крычалі ўсе.— Гайда на маскалёў! Гэй, к бою!»

Прусак перакрычаць усіх яшчэ стараўся
І голас узвышаў, які піскілвым стаўся,
Прасіў паклонам слова і махаў рукамі.

«І я,— крычаў, б'ючыся ў грудзі кулакамі,—
Хачу змагацца! Раз дык жэрдкай ад віціны
Аж чатыром прусакам справіў я хрысціны
За тое, што ўтапіць мяне хацелі ў Прэглі!»
«Ты, Бартак, зух! Крапіць, крапіць, каб зразу леглі!» —
Крычаў Хрысціцель. «Бог мой! Трэба ж, хіба, ведаць,
З кім мы ваюем,— рваўся Бартак,— трэ' ж разведаць,

Адкуль і як пачаць. Падумайце ж вы самі,
Адразу так народ не вырушыць за намі!
Браты! Паны! Уважце! Як жа лезці ў схватку,
Калі няма ў нас ладу ні парадку!
Вы хочаце вайны? Перш сарганізавацца,
Намеціць планы трэба — сканфедэравацца.
У Польшчы так было: вось бачым райтараду
Нямецкую, склікаем тайную нараду,
Прыводзім шляхту і вясковы люд да ладу
І так чакаем ад Дамброўскага наказу.
Пасля — гайда на коней і ў бой скачам зразу».

«Прашу даць слова!» — камісар ускрыкнуў клецкі,
Прыстойны, малады, у вопратцы нямецкай.
Ён зваўся Бухман, але быў палякам зроду,
Хоць невядома, ці быў шляхціцам; нагоды
Ніхто не меў навесці праўкі пра Бухмана.
Даволі, што ў вялікага служыў ён пана,
Быў добрым патрыётам, многа меў навукі
І з кніг чужых знаў гаспадарнічання штукі,
Адміністрацыю двароў вёў вельмі ўмела
І аб палітыцы судзіў заўсёды смела,
Пісаў прыгожа, вельмі гладка выслаўляўся;
Дык змоўклі ўсе, як толькі адазваўся.
«Прашу даць слова!— паўтарыў. Пасля з паклонам
Адкашляўся і так прамовіў зычным тонам: —

Мае прадмоўцы ў выступленнях красамоўных
Ужо да пунктаў дакрануліся галоўных,
Дыскусію на значную ступень узнялі,
Дык думкі трапныя, што вельмі ўсіх занялі,
Мне застаецца толькі ўзгодніць і адгладзіць,
Каб больш змястоўна нам дыскутаваць і радзіць.
Дыскусія дзве часткі ў нас сягоння мела,
І я трымацца буду гэтага раздзела.
Найперш: чаму мы маем узнімаць паўстанне?
Ў якім напрамку?— гэта першае пытанне.
А вось другое ўжо адносіцца да ўлады.
Падзел тут трапны. Але перш за ўсё — загады:
Калі мы ўладу неабходнай нам знаходзім,
То ўжо з яе з'яўлення мэту, сэнс выводзім.

Дык што да ўлады. Вось вачыма прабягаю
Гісторыю народаў і спасцерагаю,
Што дзікі род людскі яшчэ ў глыбінях лесу
Злучаўся для супольных спраў і інтарэсу
І радзіўся. Так перш паўсталі рады.
Тады ўжо кожны для агульнае улады
Сваёй свабоды частку аддаваў памалу,
І так статут і права паўставала.
Дык бачым, што законы не прыйшлі ад Бога,
А ад саміх людзей залежыць вельмі многа.
Дык на кантракце абапёршыся народным,
Падзел улады стаў з'яўляцца неабходным...»

«Няхай кантракт народны! Кіеўскі ці Мінскі,—
Сказаў стары Мацей,— няхай урад бабінскі!
Пан Бухман, Бог нам царскую ўдружыў уладу
Ці чорт, не дойдзем зараз з вамі мы да ладу.
Вось лепей, як цара пазбыцца, дайце раду».

«Вось загваздка,— сказаў Крапіцель,— каб так скокнуць
З Крапілам да прастола і цара раз «кокнуць»,
То ўжо ні Кіеўскім ён не вярнуўся б трактам,
Ні Мінскім, і ніякім Бухманскім кантрактам,
І ўваскрасіць яго ўжо сілы б не хапіла
Ні ў чорта, ні ў папоў. Дык хай жыве Крапіла!
Гаворыш ты, пан Бухман, гладка, безумоўна,
Ды гэта ўсё шум-друм. Крапіць трэ', пан шаноўны!»

«Во, во!— ускрыкнуў задаволены Брытэўка,
К Хрысціцелю ад Мацька скачучы, як цэўка,
У кросны закіданая — той самай сцежкай,—
Адно ты, Мацек, з Розгай, ты, Мацей, з даўбешкай,
Адно згадзіцеся, дальбог наробім сечкі
З маскалёў. Брытва пад каманду йдзе Рузэчкі!»

«Каманда,— зноў сказаў Хрысціцель,— на парадзе
Патрэбная, а ў нашай Ковенскай брыгадзе
Была кароткая: палохай, сам не бойся,
Бі, не давайся, наступай, сячы прыстройся:
Шах-мах!» «Во, во!— зноў Брытва піснуў,— во, як міла!
Нашто тут акты нам складаць, псаваць чарніла?

Канфедэрацыі нам трэ'? За гэта спрэчка?
Дык вось — маршалак! Наш Мацей з жазлом Рузэчкай!»
«Няхай жыве Мацей!» — крычаў Хрысціцель,
А шляхта крыкнула: «Няхай жыве Крапіцель!»

Ды па кутах пачуўся шум нездавальнення,
Відаць, што ў радзе пачалося раздваенне.
Тут Бухман крыкнуў: «Згоды я не пахваляю
Ніяк!» А хтосьці закрычаў: «Не дазваляю!»
Другія ім падтакваюць. У той час груба
Басіць пачаў прыбыўшы толькі што Скалуба:

«Што ж вы, паны Дабрынскія? У чым тут справа?
Ці вы не ўздумалі нас вылучыць з-пад права?
Калі наказ нам далі сённяшняга ранку,
А прыязджаў у наш засценак сам Мапанку,
Рубайла Ключнік, то казалі, што ўсю гэту
Нараду склікалі для цэлага павету,
Што справа не адных Дабрынскіх закранае.
Прагаварыўся ж Робак, бо ён болей знае,
Чым кажа, але, зводзячы канцы з канцамі,
Мы — тут, суседзяў павядоміўшы ганцамі.
Вы не адны, паны Дабрынскія, нарэшце,
З другіх засценкаў многа — чалавек мо дзвесце,
Дык радзьма ўсе. Калі маршалка выбіраем,
Дык галасуйма. Ўсе аднакі голас маем!
І роўнасць хай жыве!»

І тут два Тараевічы,
Чатыры Стыпулкоўскіх і тры Міцкевічы
Ускрыкнулі: «Няхай жыве!» А за Скалубам
Крычаць пачаў зноў Бухман: «Згода будзе згубай!»
Крапіцель надрываўся: «Выберам і самі!
Няхай жыве маршалак — Мацек над Мацькамі!»
Дабрынскія крычалі: «Мацька запрашаем!»
А ўсе прыезджыя крычаць: «Не дазваляем!»
І гэтак раздзяліўся збор на дзве паловы,
Крычыць усхвалявана натаўп шматгаловы:
«Не дазваляем!» тут і «Просім!» там візгліва.

Адзін стары Мацей сядзеў яшчэ маўкліва,

І ён адзін не рухаўся, не хваляваўся.
Хрысціцель перад ім на доўбні успіраўся
І галавой паверх яе круціў, нібыта
Вялікім гарбузом, на доўгі кій узбітым,
Папераменна ўперад, то назад ківаўся:
«Крапіць! Крапіць!»— крычаў і ажно надрываўся.
Тым часам Брытва штораз падбягаў рухавы
То да Хрысціцеля, то да Мацея лавы,
А Конаўка змірыць усіх шукаў нагоды:
Хадзіў між групамі і заклікаў да згоды.
У памяшканні ўсё «Крапіць!», «Галіць!» гудзела.
Мацей маўчаў, ды ўжо, відаць, яму дадзела.

І вось паверх галоў у зборышчы кіпучым
Пад бэльку шугануў слуп светлы і бліскучы.
Быў гэта меч, узняты моцнай даланёю,
Двухсечны, ў пядзь шырокі, ў сажань даўжынёю,
Відаць, яшчэ тэўтонскі з нюранбергскай сталі.
Заціхлі ўсе, на зброю моўчкі пазіралі.
Хто ўзняў яе, не ўбачыш, ды згадалі зразу:
«Сцізорык! — закрычалі, быццам бы з наказу.—
Няхай жыве Сцізорык!» «Хай жыве Мапанку!
Рубайла! Шчэрбец!» — нёсся крык без перастанку.
Гервазы (ён быў гэта) ўміг натоўп расціснуў,
К сярэдзіне пралез, Сцізорыкам зноў бліснуў
І, вастрыё схіліўшы ўніз, сказаў: «Мой пане,
Сцізорык Розачцы прыносіць прывітанне!
Браты Дабрынскія! Прыбыў я не спрачацца,
А расказаць, чаму прымусіў вас сабрацца,
А што і як рабіць, рашайце ўжо вы самі.
Вядома ўсім, што чуткі носяцца між намі,
Што справы важныя рашаюцца на свеце.
І Робак штосьці казаў, і самі мы не дзеці».
«Мы знаем!» — крыкнулі. «Дык мудрай жа галоўцы,—
Казаў,— даволі нават два-тры слоўцы.
Няпраўда?» «Праўда!» — мовілі. «Калі французскі
Адтуль надходзіць кесар, згэтуль жа цар рускі,
Тады вайна няўхільная паміж царамі.
Дык, калі так, тады падумайце ж вы самі,
Ці ж нам цішком сядзець? Вялікага вялікі
Хай б'е, малы малога — вось і ўсе тут крыкі.

Згары і знізу: гэты гэтага, той тога.
Як сеч пачнём, тады ачысціцца дарога
І шчасце ў Рэч Паспалітую завітае,
Няпраўда?» «Праўда!— крыкнулі.— Як з нот чытае!»
«Крапіць!— Хрысціцель крыкнуў.— Справа залатая!»
«А я галіць гатоў!»— тут Брытвачка азваўся.
«Змірыцца толькі трэба,— Конаўка ўмяшаўся,—
Адносна выбару маршалка-ваяводы».
Тут Бухман перабіў: «Дурны шукае згоды!
Дыскусіі для справаў не прыносяць шкоды.
Прашу маўчаць! На гэтым справа скарыстае!
Па-новаму яе пан Ключнік асвятляе!»
«А як жа,— мовіў Ключнік,— не патрэбны крыкі.
Аб важных справах думае няхай вялікі.

Ёсць цар, а будзе зноў кароль, сенат з пасламі,
Дык справы важныя, вы ведаеце самі,
Рашаюцца ў Варшаве, а не у Дабрыне,
І акты пішуцца па гэтай жа прычыне
На пергаменце, а не крэйдай на цагліне.
Не нам жа акты тут складаць. Пісцоў мы маем
Каронных і Літоўскіх, дык старым звычаем,
Мой доўг — Сцізорыкам змагацца!» «І Крапілам
Махаць»,— дадаў Крапіцель. «І выколваць Шылам!»—
Шыдэлка Бартак крыкнуў, выхапіўшы шпагу.

«З вас кожны,— мовіў Ключнік,— можа даць прысягу,
Што Робак гаварыў: пакуль спакойна ў свеце,
Падмесці трэба дом і выкінуць вон смецце.
А ведаеце вы, тым смеццем хто ў павеце?
Ці добра зразумелі? Хто забіў у здрадзе
Найлепшага з палякаў? Хто ўвесь час у звадзе
З Гарэшкамі? Астаткі вырваць хто маніцца?
Хто рабаўнік? Ці ж трэба вам казаць?» «Сапліца,—
Тут Конаўка сказаў.— Ён лотра!» «І душыцель!»—
Падтакнуў Брытва. «Дык крапіць!»— гукнуў Хрысціцель.
«Павесіць!— крыкнуў Бухман.— А чаго вазіцца?»
«Гайда!— падняўся крык,— гайда граміць Сапліцу!»

А Прус прамовіць за Суддзю ўсё ж меў адвагу,
Пачаў крычаць у абурэнні за знявагу:

«Паны! Браты! ай! ай! пабойцеся ж вы Бога!
Пан Ключнік! Што вы? Не звіхнуўся пан нямнога?
Ці ж тут пра гэта мова? Калі хто меў брата
Нягодніка, дык што? Цяпер яму адплата?
Якраз па-хрысціянску! Графа тут каншахты.
Падумайце! Няўжо Суддзя благі для шляхты?
Няпраўда! Далібог! Вы гэта толькі самі
Супроць яго пайшлі; ён хоча згоды з вамі,
З свайго адступіць ды яшчэ і страты плаціць.
Што з Графам судзіцца? Дык што? Ў іх грошай хваціць:
Ад спрэчкі між панамі што і хто з нас траціць?
Суддзя — душыцель? Ён жа адмяніў паклоны
Зямныя пану, аб'явіў сваім прыгонным,
Што гэта грэх. Не раз ён з мужыкамі разам
За стол сядае, служыць ім дабром і радай,
Падаткі плаціць за сялян. Не то што ў Клецку,
Дзе ты, пан Бухман, гаспадарыш па-нямецку.
Ён — здраднік? Што вы? Я ж калісьці з ім вучыўся,
Ён дзіцем добрым быў і сёння не змяніўся,
Радзіму любіць і звычай стары хавае,
Маскоўскіх новых мод і блізка не пускае.
Вяртаючыся з Прус, каб нямчыны пазбыцца,
Заходжу ў Сапліцова польскасцю абмыцца,
Бо там сапраўды нашых звычаяў сталіца!
Дальбог, Дабрынскія, я брат ваш, але знайце,
Суддзі не дам пакрыўдзіць, лепш не пачынайце.
Не так у Велькапольшчы шляхта немцаў біла:
Які быў дух і згода, проста ўспомніць міла!
І глупствамі ніхто не запыняў нарадаў».
«Не глупства тут,— ускрыкнуў Ключнік,— вешаць гадаў!»
Шум нарастаў, ды Янкель па-над грамадою,
На лаву стаўшы, белай бліснуў барадою,
Што венікам ажно да пояса звісала.
Каўпак лісіны ссунуў з галавы памалу,
А леваю рукой ярмолку ўміг паправіў.
Пасля, калі за пояс зноў руку уставіў,
Паклон даў каўпаком і распачаў прамову:

«Паны Дабрынскія, ну кіньце гэту змову.
Суддзя ні брат мне і ні сват, ну я Сапліцаў
Шаную; з імі можна жыць, ну і мірыцца.

Шаную і Дабрынскіх Барткаў і Мацеяў,
Ну як маіх суседзяў і як дабрадзеяў,
Дык так кажу: яшчэ вам можна запыніцца,
Не нападаць, бо вы ж там можаце пабіцца,
Забіць. А спраўнік? а турма? а асасоры?
А ў вёсках жа Сапліцы час ужо каторы
Стаіць гурма салдатаў. Хай асэсар свісне,
Дык батальён пяхоты мігам вас расцісне.
А што тады? Француз нам зараз не падмога,
Ну бо яму да нас далёкая дарога.
Габрэй я, мала знаю, ну але ў Бяліцы
Габрэйчыкаў я бачыў ажно з-пад граніцы.
Чуваць, француз стаіць над рэчкай Ласасною,
Вайна ж, калі і будзе, хіба аж вясною.
Ну я скажу: чакайце! Двор Суддзі Сапліцы —
Не будка крамніка, што можа ў воз змясціцца
І з'ехаць. Двор стаяў, стаяць і далей будзе.
Суддзя не арандатар, і ўсе знаюць людзі,
Што не ўцячэ, яго вы знойдзеце й налета,
Дык кіньце лепш, і хай заціхне справа гэта,
І аб гавораным тут раджу ўсім забыцца.
І, калі ласка, ўсіх прашу паклапаціцца
Зайсці ў карчму. Сынка мне Сора нарадзіла,
Я ўсіх частую, будзе музыка на дзіва,—
Заграем на басэтлі, скрыпках і на дудзе.
І мёд стары, які пан Мацек любіць, будзе,
Ну і мазуркі; маю новыя мазуркі
І *файн* спяваць свае я вывучыў бахуркі».

Прамова Янкеля, якога ўсе любілі,
У сэрцы трапіла сабраным той жа хвілі,
І шум вясёлы на двары на'т разгарнуўся.
Ды тут Гервазы к Янкелю з мячом рвануўся,
Той скокнуў з лавы. Ключнік крыкнуў: «Вон, жыдзішча!
Не сунь у дзверы пальцаў! Тут табе не йгрышча!
Пан Прусак! Калі пан Суддзёваю гандлюеш
Віцінаў паркай, дык яго вось як малюеш!
Ты помніш добра і павінен нам прызнацца,
Што бацька твой сплаўляў Гарэшкавых аж дваццаць
І што нажыўся ён з усімі сваякамі.
Стуль нажываліся Дабрынскія вякамі.

Старыя могуць голасам пацвердзіць згодным,
Што Стольнік быў для шляхты проста бацькам родным.
Хто камісарыў у яго маёнтках пінскіх?
Дабрынскі! Пісарамі браў каго? Дабрынскіх!
Буфета ў замку не даверыў ён нікому
Апроч Дабрынскіх. Меў Дабрынскіх поўна ўдому!
Ён падтрымоўваў вашы ў трыбуналах справы,
У караля выпрошваў хлеб для вас ласкавы
І копам вашай дзетвары даваў асвету
Ва ўсіх піярскіх школах нашага павету.
Дарослым памагаў у людзі, ў свет прабіцца.
Пра гэткага суседа грэх, браты, забыцца!
А сёння ваш сусед Сапліца робіць многа
Для вашага дабра? Скажыце мне!»

«Нічога!—
Падтакнуў Конаўка.— Я помню тую пору,
Як ён быў гол, а зараз нос дзярэ ўжо ўгору
І дзьмецца: пху, пху, пху! Паклікаў на вяселле,
Паю, а ён не п’е. «Я не магу,— мне меле,—
Так многа піць, як вы, без меры і граніцы».
Вось далікацік з марымонцкае мучыцы!
Не піў, мы ў горла ліць, ён зазлаваўся дужа.
Чакай, я з Конаўкі налью табе, мой дружа!»

«О ёсць,— сказаў Хрысціцель,— і ў мяне прычына
Яго крапіць. Мой сын разумны быў хлапчына,
А зараз, па віне Суддзі, мой небарака
Так адурэў, што ўсе яго зваць сталі Сакам.
Казаў яму: «Чаго ты прэшся ў Сапліцова?
Калі заловяць, лазня будзе там гатова!»
А ён ізноў — да Зосі цераз луг, каноплі.
Злавіў яго, давай драць вушы, сыпаць краплі;
Ён плача і крычыць: «Як, тата, ты б не біўся,
Туды ісці я мушу». Тут я разгубіўся:
«Ды што з табой?» «Я,— кажа,— ў Зосю улюбіўся!»
Ён хоча глянуць на яе! Вось небарака!
Кажу Суддзі: «Аддай, пан, Зосю нам за Сака!»
Ён кажа: «Замалая, пачакай тры годы,
І як сама захоча!» Лотра! Жджэ нагоды
Аддаць другому. Вось як скокну на вяселле

Ды крапяну сваім Крапілам па пасцелі!..»

«І гэты лотра,— ўскрыкнуў Ключнік,— тут пануе
І вось паноў даўнейшых грабіць і руйнуе!
Ці ж так Гарэшкаў памяць і імя ўжо згіне?
А дзе ж удзячнасць? Мо няма яе ў Дабрыне!
Браты! Вы ж з царскай сілай думалі змагацца,
А тут Сапліцы раптам пачалі баяцца!
Страх вам турмы? Браты! Ды я ж стаю пры праве!
Я вас не клічу на разбой! У гэтай справе
Ўжо выйграў Граф, дэкрэтаў мае ён нямала,
Адно іх выканаць! Заўсёды так бывала —
Дэкрэты трыбуналаў шляхта спаганяла,
А перш за ўсіх Дабрынскія, дык вось і стала
Расці ў вас слава. Бо, Дабрынскія, вы ж самі
Ў наездзе Мыскім ваявалі з маскалямі.
Прывёў іх генерал расейскі Вайніловіч
І лотра, друг яго, Воўк з вёскі Лугамовіч,
Вы ж помніце, як Воўка мы ў палон узялі
І як на бэльцы ў пуні вешаць ужо сталі
За тое, што сялян душыў, Маскве прадаўся.
Жывым тады праз літасць мужыкоў застаўся
(З маім Сцізорыкам аднак не размінецца).
Наездаў гэтулькі ўжо мне не давядзецца
Адбыць, з якіх выходзілі мы са здабычай
І славай, як шляхоцкі патрабуе звычай!
Ды што пра тое ўспамінаць! Пан Граф дэкрэты
Ўсё вырабляе, судзіцца за замак гэты,
А з вас ніхто не спачувае адзіноце
Яго і, з ласкі ворага, яго згрызоце.
Няма ў яго сяброў, апроч мяне, нікога
І вернага майго Сцізорыка старога!»

«Ну і Крапіла,— тут Хрысціцель адазваўся,—
Дзе ты, там я — плясь, плясь! Адзін ты не застаўся,
Што два, то два. Дальбог, ты маеш меч, Гервазы,
А я Крапіла. Будзем чысціць ад заразы
Вакол: шах-шах, плясь-плясь! Яны няхай гамоняць».

«Браты ж мо Бартка,— ўткнуўся Брытва,— не прагоняць;
Што вы намыліце, то Брытва зголіць чыста».

«Я з вамі,— Конаўка прамовіў урачыста.—
Калі яны ніяк не выберуць маршалка,
Нашто мне галасы ці галкі? Во дзе галка
(Тут выняў з кішані са звонам куляў жменю).
Вось галкі! Ўсе аддам Сапліцаў пакаленню!»
«І мы,— Скалуба крыкнуў,— пойдзем разам з вамі!»
«І мы ўсе!— шляхта крыкнула.— І мы з братамі!
Рубайла хай жыве! Гайда граміць Сапліцу!»

І ўсіх пераканаў Гервазы ў мове гладкі,
Бо кожны меў з Суддзём якіясь непаладкі,
Як часта у суседстве: то за шкоду ў полі,
То за парубку, то за межы, а найболей
Іх зайздрасць, што Суддзя багаты, падбівала.
Так пачуццё нянавісці ўсіх аб'яднала.
Вакол Гервазага падняўся гоман бурны,
Ўзняліся шаблі, палкі...

Мацек моўчкі хмурны
Падняўся з лавы і, зрабіўшы два-тры крокі
К сярэдзіне святліцы, рукі ўзяў у бокі.
Тут, глянуўшы вакол з дакорам і сурова,
Паволі вымаўляць пачаў за словам слова,
З прыпынкамі, з прыціскам: «Дурні вы, дурніцы!
Дык дурні ж вы! Мука камусьці, вам — кастрыца!
Пакуль вялася аб радзіме тут нарада
І аб агульных справах, дык вам, дурні,— звада,
Што нельга ні падумаць, ні дагаварыцца.
Замест парадку, ладу, дурні, вы — сварыцца!..
А хай за дробязь помсты здарыцца нагода
Вам, дурні, дык адразу лад у вас і згода!
Вон з хаты! Бо я, Мацек, вас... да міліёнаў
І тысяч тысячаў фур, бочак і фургонаў
Чарцей!!!..»

Заціхлі ўсе, як ляснутыя громам.
Ды раптам гоман, крык падняўся дзесь за домам:
«Ура! пан Граф!» Ён ўз'язджаў на двор Мацееў
Узброены і збройных дзесяць з ім жакеяў.
Пад Графам добры конь, і выгляд Графа панскі:
На ім плашч колеру гарэха, італьянскі,

Шырокі, без рукаў, як быццам пакрывала,
Што цераз плечы стройна долу ападала.
Пяро на капялюшыку тырчэла ззаду.
Крутнуўся Граф і шпагай прывітаў нараду.

«Ура! пан Граф!— ускрыкнулі,— з ім жыць, змагацца!»
Тут з хаты сталі ўсе праз вокны прыглядацца
І ўслед за Ключнікам на выхад прабірацца.
Гервазы выйшаў, сход за ім услед таўпіўся.
А Мацек, выгнаўшы апошніх, зашчапіўся
І, глянуўшы ў акно, сказаў: «Дурніцы!»

Тым часам шляхта каля Графа мітусіцца,
І ўсе ў карчму ідуць. З Гервазага наказу
Тры вяжуць паясы ад кунтушаў і зразу
На іх са склепа цягнуць бочкі для народу:
Гарэлкі бочку, бочку піва, бочку мёда.
Вымаюць шпунты, з шумам рвуцца тры крыніцы:
Адна гарыць агнём, другая серабрыцца,
Жаўцее трэцяя — вясёлкаю іграюць
І звонка ў розных сто начынняў ападаюць.
І шляхта з Графам п'е, балюе, весяліцца,
Ўзнімае тосты і крычыць: «Граміць Сапліцаў!»

А Янкель вышмыгнуў цішком. Таксама
Хацеў зрабіць і Прус, ён быў ужо за брамай,
Ды шляхта згледзела і — ў крык, што здрадзіў.
Міцкевіч аддзяліўся, не крычаў, не радзіў,
Але відаць па міне, што задумаў штосьці,
Дык з шаблямі — к яму! Ён ад усіх у злосці
Бароніцца, ўжо ранены, прыпёрты к плоту,
Ды за яго ўступіўся Зан і тры Чачоты.
Разнялі хутка ўсіх, ды ў часе той разрухі
Двух ранілі ў руку, адзін дастаў па вуху.
Сядаць на коней пачалі.

Граф і Гервазы
Наводзяць лад, узбройваюць, даюць наказы.
Нарэшце хваляй, што не ў сілах запыніцца,
Ўсе скачуць з крыкамі: «Гайда граміць Сапліцаў!»

КНІГА ВОСЬМАЯ • НАЕЗД

Змест: Астраномія Войскага. Заўвагі Падкаморага пра каметы. Таямнічая сцэна ў пакоі Суддзі. Тадэвуш, жадаючы спрытна выблытацца, трапляе ў вялікія клопаты. Новая Дыдона. Наезд. Апошні пратэст Вознага. Граф заваёўвае Сапліцова. Штурм і разня. Віначэрп Гервазы . Баль пасля наезду.

Маўклівы, ціхі час бывае перад бурай,
Калі на небе хмара ўздыбіцца панура,
На месцы стане, змусіць ветры запыніцца
І свет пачне абводзіць вокам бліскавіцаў,
Каб вызначыць, куды прарвацца можна з громам,—
Зацішак гэткі быў над Сапліцоўскім домам.
Як быццам прадчуванняў жудасных цяжары
Самкнулі вусны ўсім, цягнулі ўсіх на мары.

Пасля вячэры сам Суддзя і госці са святліцаў
На двор выходзяць пагуляць, ахаладзіцца.
Расселіся па прызбах, высланых травою,
Але ўсе сумныя сягоння, без настрою
Глядзяць на неба, што як быццам прыніжацца,
Цясніцца стала, да зямлі зблізжацца
І разам з ёю пад заслонай змроку цёмнай,
Як закаханыя, ўжо шэпчуцца таёмна,
Свае пачуцці выражаючы ва ўздыхах,
У шэптах, шумах, словах здушаных і ціхіх,
Якія твораць вечара канцэрт вялікі.

Вось з-пад страхі пранесліся начніцы крыкі,
Шапнулі лёгкім крыллем кажаны ў палёце
На дом, дзе шыбы ззялі ў светлай пазалоце.
А бліжай сёстры кажаноў — цьмы ўюцца роем
Над белай вопраткай жанчын і з неспакоем
Аб Зосін тварык б'юцца, ёй больш дакучаюць,
Бо вочкі ясныя за свечкі дзве прымаюць.
А хмара машкары, склубіўшыся ў паветры,
Гармонікай пяе і круціцца на ветры.
І вуха Зосі ловіць з гукаў блытаніны
Акорды мух і тон фальшывы камарыны.

У полі пачынаецца канцэрт вялікі:

Вось строіць інструменты скончылі музыкі,
Азваўся тройчы драч у лузе, і тым часам
Яму уторыць стаў брыдун з балота басам,
А бакасы, угору вырваўшыся, ўюцца
І бэкаюць, як быццам аб бубенец б'юцца.

Ў фінал мушыных шумаў, гоман птушак, здалі
Ставы два хорам здвоеным вось заспявалі,
Нібы каўказскія чароўныя азёры,
Што ўдзень маўчаць, а ўноч вядуць перагаворы.
Адзін стаў, што быў ясны, з берагам пясчаным,
Блакітнымі грудзьмі даў тон усхваляваны,
Другі, што з дном быў цёмным і абліччам мутным,
Яму адказваў крыкам жаласным, магутным.
Ў абодвух тых ставах спявалі жабы зважна,
То сола перарывіста, то ў хор працяжна.
Адзін фарціссіма пяе, другі сціхае,
Той быццам чымсь абураны, другі ўздыхае.
Так размаўлялі два ставы з сабой праз поле,
Як быццам арфы дзве чароўныя Эола.

А змрок гусцеў, і толькі недзе каля рэчкі
Ў лазе блішчэлі вочы воўчыя, як свечкі.
Далей на краявіду сцесненым палетку
Агні начлежнікаў там-сям блішчэлі зрэдку.
Вось месяц запаліў свой факел серабрысты
І асвяціў зямлю, і купал неба чысты.
Яны, адслоненыя з цемры ў палавіне,
Драмалі, быццам з жонкай муж; а той хвіліне
Шчаслівa неба сіняе ў абдымкі брала
Зямлю, што грудзі ў блісках месяца купала.

Вось зорка супроць месяца адна, другая
Бліснула, вось іх тысяча, мільён міргае.
Кастор з Палюксам, два браты перш заяснелі —
Славяне іх празвалі Леле і Палеле,
А ў нас сяляне іншае імя ім далі:
К а р о н а й і Л і т в о й назваць іх пажадалі.

Далей Вагі нябеснае дзве шалі ззяюць;
На той вазе сам Бог (старыя гэтак баюць)

Зямлю адважваў, а за ёй і ўсе планеты
Тады, калі ствараў і будаваў сусветы.
Пасля павесіў з золата вагу на небе,
Каб людзі пераняць змаглі яе ў патрэбе.

На поўначы іскрыцца зорным кругам С і т а ;
Цераз яго (як кажуць) Бог прасеяў жыта,
Калі яго пасыпаў праайцу Адаму,
Прагнанаму з гароду райскага за браму.

А там Д а в і д а ў   в о з скіроўвае свой дышаль
У бок палярнай зоркі, што яснее вышай.
Старыя літвіны пра той рыдван гадаюць,
Нібы няправільна яго так называюць,
Бо не Давідаў гэта воз, а воз злых духаў.
На ім Люцыпар, калі Бога не паслухаў,
Дык млечным шляхам рваўся ўжо ў нябёс парогі,
Ды Міхаіл спыніў яго і збіў з дарогі,
І воз той паміж зор зламаны кавыляе —
Міхал-архангел напраўляць не дазваляе.

І ведама таксама між старых літвінаў
(А звесткі тыя нейкі рабін ім пакінуў),
Што той даўжэзны Ц м о к між знакаў Задыяку,
Пакручаста віецца паміж зорак маку,
Які для астраномаў В у ж а м выдаецца,
Не вуж, а рыба. Што Левіятан завецца.
Жыла яна ў марах, але пасля патопу
Затхнулася на сушы ад вод недахопу.
Дык дзеля памяткі, ўсяму на дзіва свету,
Развесілі анёлы ў небе тушу гэту.
Так і ў касцёле Мірскім ксёндз каля арганаў
Павесіў косці выкапнёвых веліканаў.

Гісторыі такія, што з апавядання
Ці з кніжак знаў, расказваў Войскі ў час змяркання.
Хоць вечарам слабы зрок быў ужо ў старога,
Што ў акулярах на’т не бачыў ён нічога,
Ды знаў на памяць зор найменні, іх напрамкі
І ў небе пальцам крэсліў іх шляхі і рамкі.

Ледзь слухалі яго і не звярталі ўвагі
Ані на Сіта, ні на Цмока, ні на Вагу,
Бо сёння сцягвае і думкі ўсіх, і вочы
Госць новы, выплыўшы нядаўна з цемры ночы:
Камета, што ляцела праз нябёс абшары
На поўнач з захаду, накшталт чырвонай хмары.
Крывавым вокам на той воз яна глядзела,
Як быццам падмяніць Люцыпара хацела:
Касу адкінула і, неба болей трэці
Аблытаўшы, цягнула зоркі, нібы ў сеці,
Кудысьці у бясконцыя нябёс прасторы,
Ў напрамак, дзе палярныя мігаюць зоры.

Са страхам павяртаў народ на неба вочы
І паглядаў на тыя цуды кожнай ночы,
Варожачы нядобрае з прыкмет шматлікіх
І чуючы прадвесце зла ў птушыных крыках,
Бо птушкі часта хмарай пустыры ўкрывалі,
Вастрылі дзюбы, быццам трупаў шмат чакалі.
Заўважана, што і сабакі землю рылі
І, быццам чуючы бяду, працягла вылі
На голад ці вайну. На могілках ля бору
Раз леснікі заўважылі жанчыну мору,
Што йшла, вышэйшая за лес, паходкай жвавай
І хусткаю размахвала вакол крывавай.

Цівун казаў пра гэта, стоячы пры плоце,
Прынёсшы справаздачы пану аб рабоце.
Шаптаў аб тым і пісар нешта аканому.

Ды Падкаморы, што сядзеў на прызбе дому,
Спыніў размовы, захацеў сам мовіць штосьці,
Бо табакеркі бляск заўважылі ўсе госці
(Яна ўся з золата, з брыльянтамі аправа,
Ўнутры яе партрэт манарха Станіслава),
Дык пазваніў па ёй, нюхнуў і мовіў: «Пане
Тадэвуш, ваша гэтае апавяданне
Пра зоркі, толькі рэха чутага у школе,
А працякі пра цуды ведаюць шмат болей.
І я вучыўся астраноміі ці мала
У Вільні, дзе Пузыніна ахвяравала

Даход з сяла свайго у дзвесце душ халопаў
На закуп розных шкел і тэлескопаў.
Ксёндз Пачабут быў астраномам там год колькі
І рэктарам у акадэміі, ды толькі
З той кафедрай чамусьці хутка разлучыўся
І зноў у келлі манастырскай зачыніўся,
Дзе і памёр. Знаёмы мне і пан Снядэцкі,
Разумны вельмі чалавек быў, хоць і свецкі.
Дык вось жа астраномы гэтак на камету
Глядзяць, як нашыя мяшчане на карэту;
Вядома ім, што скіравалася ў сталіцу
Ці выязджае з горада дзесь за граніцу,
А хто ў ёй ехаў і пра што там размаўлялі,
Ці пасланца з вайной, ці з мірам пасылалі,
Таго не знаюць. У мае, я помню часы,
Калі Бранецкі ехаў у карэце ў Яссы,
То ўслед цягнуўся за ганебнай той карэтай
Таргавічанаў хвост, як тут вось за каметай.
Народ, хоць не мяшаўся ў панскія нарады,
Згадаў адразу, што той хвост быў знакам здрады.
Чуваць, мятлы імя ён гэтай даў камеце
І кажа, што мільён яна загорне ў смецце».

Тады сказаў з паклонам Войскі: «Праўда гэта,
Пан Падкаморы, мне напомніла камета,
Што ў нас расказвалі і, на астатак,
Што бачыў сам тады, як меў гадоў з дзесятак.
Панцэрнага палка паручнік, пан Сапега
Спыніўся, помню я, у нас дзеля начлега,
Той самы, што пасля быў маршалам дзяржаўным,
А потым канцлерам Літвы дагэтуль слаўным,
Ён жыў сто дзесяць год; пад Вену ў часы Яна
Хадзіў ён з войскам Ябланоўскага, гетмана.
Вось ён расказваў нам, што перад тою справай,
Якую Ян закончыў з гэтакаю славай,
Калі сам нунцый выпраўляў яго ў дарогу,
А пасланец аўстрыйскі цалаваў у ногу,
Як стрэмя падаваў (пасол граф Вільчэк зваўся):
«Што гэта робіцца?»— кароль спытаўся.
Глядзяць, аж над галовамі ляціць камета
Тым шляхам, дзе ступала войска Магамета,

З усходу ды на захад. І ксёндз Бартахоўскі
У панегірыку на той трыумф кракоўскі,
Пад назвай «*Orientis Fulmen*», піша многа
Аб той камеце. Ды чытаў я апроч тога
Ў «*Яніне*» — кніжцы, дзе разгледжана старанна
Кампанія уся — паход пад Вену Яна.
Там намалёваны і сцягі Магамета,
І гэткая ж, як бачым мы цяпер, камета».

«Амінь,— сказаў Суддзя,— я варажбу вашэці
Прымаю. Хай з зарой к нам з'явіцца Ян Трэці!
На захадзе вялікі ёсць герой, быць можа,
Ён за каметай прыйдзе к нам. Дай гэта, Божа!»

На гэта мовіў Войскі голасам спакойным:
«Камета часам спрэчкі значыць, часам войны.
Не добра, што стаіць яна над Сапліцовам,
Бо, можа, нашым пагражае што галовам.
Учора спрэчак, звад у нас было даволі
Спярша на паляванні, потым у застоллі.
Пан Рэент паспрачаўся з Асасорам зрання,
А вечарам ізноў паўстала замяшанне:
Прыйшлося за мядзведзя скуру пасварыцца.
Я ведаю, што змусіў бы іх памірыцца,
Калі б не трэ' было з расказам запыніцца.
Хацеў я расказаць выпадак вам цікавы,
Падобны да падзеі з нашае аблавы,
Што здарыўся з людзьмі не так далёкіх часаў,
З Райтанам і нямецкім князем фон Дынасаў.
Выпадак быў такі:

Пан генерал падольскіх
Зямель, праездам да сваіх маёнткаў польскіх
Ці, можа, едучы на сейм які ў Варшаву,
Дарогай к шляхце заязджаў, то на забаву,
То так — для папулярнасці. Прыбыў і к пану,
Цяпер ужо святое памяці, Райтану,
Які пазней паслом наваградскім з'яўляўся,
Той, у якога я з маленства гадаваўся.
З прычыны гасцявання князя генерала

Райтан зазваў гасцей. Іх прыбыло нямала.
Быў і тэатр (князь генерал любіў тэатры);
Дык феерверк даў Кашыц, што жыве у Ятры,
Танцораў Тызенгаўз прыслаў. Агінскі даў музыкаў,
А Солтан дзятлаўскі капэлію паклікаў.
Наладжаны былі шыкоўныя забавы
Ў двары, а па лясах вялікія аблавы.
Вядома кожнаму, не толькі самым блізкім,
Што хоць яны з крыві Ягайлаў, Чартарыскім
З вякоў не вельмі да спадобы паляванне —
Не тое, каб з ляноты, а ад выхавання
І ад замежных густаў. Дык і генерала
Больш кніга, чым сабакі і лясы, займала,
Ды й каля дам не мала ён збіваў абцасаў.

У свіце князя быў нямецкі князь Дынасаў,
Які нібыта ў афрыканскай пушчы дзікай
Старога тыгра закалоў звычайнай пікай,
Калі аднойчы быў між неграў пасяліўся.
А потым тым выпадкам вельмі ўсім хваліўся.
У нас хадзілі на дзікоў у тую пору,
І Рэйтан раз забіў агромную мацёру
З вялікай небяспекай, падпусціўшы блізка.
Усе дзівіліся, хвалілі, а нямчыска,
Той князь Дынасаў, пахвалы зусім не слухаў,
Пахаджваў толькі і пад нос сабе ўсё дзьмухаў,
Што трапны стрэл даказвае мо смеласць вока,
А зброя белая — і рук. І стаў шырока
Ізноў пра Лівію разводзіць небыліцы
І ўсё тым самым тыграм без канца хваліцца.
Пан Рэйтан дык аж трохі зазлаваўся,
Па шаблі жыва стукнуўшы, так адазваўся:
«Мой князь! Хто ўмее глянуць смела, б'ецца смела!
Варт тыгра дзік, за зброю ж трэба брацца ўмела!»
І распачаўся дыялог між імі жвавы,
Ажно князь генерал тут умяшаўся ў справы,
Французскай мовай іх змірыў. Сказаць даволі,
Што згода іх была, як попел на вуголлі;
Рэйтан прыняў да сэрца справу і пасля той згоды
Навучку немцу даць чакаў адно нагоды.

Кніга сёмая
Заклік Гервазага

Книга седьмая
Призыв Гервазия

Księga siódma
Wezwanie Gerwazego

Назаўтра ледзь жыццём не аплаціў выпадку
Таго, а як было, скажу ўсё па парадку».

Тут Войскі замаўчаў і з мінай абыякай
Да Падкаморага звярнуўся за табакай,
Час доўгі нюхаў, не канчаў апавядання,
Цікавасць разбудзіць паставіўшы заданне.
Урэшце пачынаў, ды зноў перапынілі
Расказ, а ўсе ж за ім з цікавасцю сачылі!
К Суддзі з'явіўся пасланец. Пачулі госці,
Што ў пільнай справе да яго прыехаў хтосьці.
Суддзя з усімі хутка нанач развітаўся.
Праз момант і з гасцей ніхто ўжо не застаўся —
Пайшлі ўсе спаць, хто ў дом, хто ў сена закапацца.
Суддзя ішоў са спозненым гасцём спаткацца.

Усе ўжо спяць — Тадэвуш круціцца у сенях
Ля дзядзькавых дзвярэй у змрочных шэрых ценях.
Яго сюды прыводзіць важнае пытанне,
Якое трэба вырашыць без адкладання.
Суддзя на ключ замкнуўся, з некім размаўляе,
Тадэвуш ўсё чакае, вушы настаўляе.

Перш чуе, быццам плач, дык, не крануўшы клямак,
Праз шчыліну замка глядзіць у той напрамак
І бачыць дзіва! Робак і Суддзя стаялі
Ў абдымках на каленях у слязах і ў жалі.
Ксёндз Робак з плачам рукі цалаваў Суддзёвы,
А пан Суддзя туліўся да яго без слова.
Пасля даўгой хвіліны плачу і маўчання
Сказаў ксёндз Робак ціха, як на развітанне:

«Брат, знае Бог, што я захоўваў таямніцы,
Якія абяцаў за грэх. Не час хваліцца,
Што Богу і радзіме ўсе аддаў я годы,
Ніякай не шукаючы узнагароды.
Я жыў дагэтуль і хацеў памерці бернардынам,
Схаваўшы прозвішча за манастырскім тынам,
Не думаў адкрывацца прад табой, ні сынам,
Хоць ксёндз правінцыял і даў мне пазваленне
Зрабіць *in articulo mortis* аб'яўленне.

Хто знае, ці жыў буду і на чым там стане
У Дабрыне! Брат! вялікае там замяшанне!
Француз яшчэ далёка, доўга давядзецца
Яго чакаць, а шляхта, пэўне, не дачакаецца!
Магчыма, я з паўстаннем лішне завіхаўся!
Вось дрэнна зразумелі! Ключнік умяшаўся!
І гэты дурань Граф панёсся ў бок Дабрына,
Не мог яго я папярэдзіць, ёсць прычына:
Стары Мацей мяне пазнаў, няхай адкрые,
З Сцізорыкам мая не размінецца шыя!
Нічога Ключніка не спыніць! Не баюся смерці,
Ды гэткае здарэнне план наш можа сцерці.

Я там быць мушу! Мушу знаць усе падзеі,
Хоць прыйдзецца мо згінуць; шляхта там шалее.
Здароў будзь, наймілейшы брат! Спяшацца мушу.
Калі загіну, за маю маліся душу.
У выпадку вайны, табе ўся таямніца
Адкрыта, помні справу і што ты Сапліца!»

Тут слёзы сцёр, каптур паправіў, зашпіліўся,
Адставіў аканіцу, ў сад з акна спусціўся,
І з бытнасці яго не засталося знакаў.
Суддзя, застаўшыся адзін, сядзеў і плакаў.

Тадэвуш, пачакаўшы трошкі, ўсе ж рашыўся:
Пастукаў, увайшоў і нізка пакланіўся.
«Прабачце, дзядзечка,— сказаў,— я ў вас дзён колькі
Пабыў. Час гэты здаўся мне хвілінай толькі,
Не меў калі нацешыцца я й домам родным,
Як выезд мой адгэтуль стаўся неабходным.
Я змушан вас пакінуць зараз, неадкладна:
Мы Графа вызвалі, вы ж знаеце дакладна,
Што паядынкі забаронены ў нас строга,
Але мяне стрымаць не можа ўжо нічога,
Пайду да Княжаства Варшаўскага граніцаў.
І Граф, хоць фанфарон, не зможа не з'явіцца
На месца, што ва ўмовах мы паставім,
Дык там сустрэнемся і ўсё, як трэба, справім.
Пасля, яго ўкараўшы, калі Бог паможа,
Да брацціяў за Ласосну ўдасца трапіць, можа.

Я чуў, што бацька мне тастамантам назначыў
Служыць у войску, ды хтось гэта перайначыў».

«Тадэвушак,— сказаў Суддзя,— ці ты купаны
Ў вадзе гарачай, ці так круціш, як ліс гнаны,
Што думае хвастом пушыстым засланіцца?
Мы выклікалі Графа, згодзен, трэба біцца.
Але сягоння ехаць? Як? З якой нагоды?
Ёсць звычай перш сяброў слаць, дабівацца згоды
Прад паядынкам. Граф адумацца'шчэ можа,
Перапрасіць, дык што спяшацца ў падарожжа?
А можа, іншая цябе ўкусіла муха?
Кажы, як ёсць, нашто такая завітуха?
Я дзядзька твой. І я меў сэрца маладое,
Кажы (і гладзіў твар яго сваёй рукою).
Маё мне прадчуванне раптам падказала,
Што з дамамі ў цябе штось склалася няўдала.
За дам бяруцца зараз хутка, проста дзіва!
Ну раскажы, Тадэвушак, мне ўсё праўдзіва».

«Яно,— сказаў Тадэвуш,— праўда, ёсць прычыны
Другія, дзядзя дарагі, мае тут віны!
Памылка! Што ж, няшчасце! Ў чым тут прызнавацца?
Не, дзядзя, ў Сапліцове нельга мне застацца.
Ах, мілы дзядзечка! На вашае пытанне
Скажу, што выехаць мне трэ'без адкладання».

«Га!— мовіў дзядзька,— дык любоўныя тут справы,
Я бачыў, што ты ўчора не крануў на'т стравы
І скоса углядаўся на адну дзяўчынку;
Яна штось кіслую таксама мела мінку.
Я знаю вашы глупствы: хай падлеткаў пара
Улюбіцца, то ў іх капа згрызотаў зараз!
То цешацца, то ходзяць, быццам у няшчасці,
Стараюцца са словам з'едлівым напасці,
То па кутах стаяць, не размаўляюць болей,
А нават уцякаюць ад людзей на поле.
Калі і ў вас чаргуецца любоў і звада,
Дык пацярпіце толькі — ёсць на гэта рада,
Я на сябе бяру прывесці вас да згоды.
Прайшоў і я ўсё гэта ў маладыя годы.

Скажы мне праўду ўсю, дык можа што дарадзім
Удвух і, разабраўшыся, усё наладзім».
Тадэвуш сарамліва мовіў: «Давялося
(Тут цалаваў руку Суддзі) сказаць, што Зося,
Ну, ваша выхаванка, дарагой мне стала,
Хоць я яе яшчэ і бачыў вельмі мала,
А мне ўсе навакол гудуць без перастанку,
Што ў жоны выбралі вы мне Падкамаранку.
Не можа жонкаю маёй быць панна Ружа,
Калі я Зосю гэту так кахаю дужа.
Нячэсна, любячы адну, з другой жаніцца.
Час вылечыць мяне, тут нельга мне спыніцца».

«Дзіўлюся,— мовіў дзядзька,— што вам да спадобы,
Кахаючы, ўцякаць ад мілае асобы!
Ну добра, што прызнаўся, а то даў бы маху,
Паехаўшы ад нас. Дык вось пазбудзься страху:
Я Зосю сватаю табе — скачы з уцехі!»

Тадэвуш мовіў: «Вам я ўдзячны, ды памехі
Усё ж ёсць. Вы — бацькам для мяне і дабрадзеем,
Ды не паможа ўжо нішто, канец надзеям!
Бо пані Талімэна не аддасць мне Зосі».
«Папросім»,— мовіў дзядзька.

«Не, яе не ўпросім!—
Сказаў Тадэвуш жвава,— надарма чаканне,
Я, дзядзя, выехаць павінен заўтра зрання.
Прашу благаславення вашага ў дарогу,
А там у Княстве я ў сяброў знайду падмогу».

Суддзя, вус круцячы, глядзеў на хлопца гнеўна:
«Дык так ты мне і сэрца адкрываў, напэўна?
Перш паядынак, а пасля ў яго каханне
І выезд гэты. Ой, тут бачу махляванне!
Мне ўжо казалі, я твае праверыў крокі!
Ты — баламут і пуставей, і лгун ты недалёкі!
А ну, расказвай, дзе надоечы бадзяўся,
Што ты ў двары учора вынюхаць стараўся?
Глядзі, Тадэвуш! Збаламучана мо Зося
Табой, і ты ўцякаеш, дык, малакасосе,

Табе не ўдасца гэта — хай і без кахання
Ўсёроўна Зося жонкаю тваёю стане,
А не, дык — бізуна, і заўтра, неадкладна!
Ён аб пачуццях мне яшчэ пляце нязкладна!
Ты — лгун! А-фэ! Яшчэ я з гэтай калатушы
Зраблю і следства! Я натру табе йшчэ вушы!
Сягоння клопатаў я меў і так даволі,
Спаць не даеш, мне галава трашчыць ад болю.
І ты йдзі спаць!» І тут на дзверы пальцам тыкаў
І распранацца Вознага ў пакой паклікаў.

Тадэвуш выйшаў, не сказаўшы больш ні слова.
Душу яго кранула дзядзькава прамова.
Аблаян ўпершыню так востра! Аж здзівіўся
Праўдзівасці ўсіх закідаў і прыпыніўся:
Як быць, калі да Зосі дойдзе гэта сцэна?
Прасіць рукі? А што тут скажа Талімэна?
Адзіны выхад — гэта месца перамена.

Ў задуме гэткай ледзь зрабіў мо крокаў пару,
Як штось зайшло дарогу. Глянуў — бачыць мару:
Уся у белым, тонкай выдала, худою,
Плыла к яму з настаўленай здалёк рукою,
Якую серабрыў бляск месяца ледзь значны,
І, падышоўшы, ціха енкнула: «Няўдзячны!
Шукаў ты позірку майго і ўжо ўцякаеш,
Размоў шукаў, а зараз вушы затыкаеш!
Скажы мне, ў чым жа гэткіх перамен прычына?
Так мне і трэба! Знала я, хто ты,— мужчына!
Не знаючы какецтва, я не стала мучыць
Цябе і ашчасліўіла. Як гэта вучыць!
Трыумф над мяккім сэрцам вельмі лёгкім здаўся,
Ты — бессардэчны, і з мяне ты насмяяўся!
Такою страшнаю навучаная спробай,
Я пагарджаю, больш чым ты, сваёй асобай!»

«Дальбог, не цвёрдае,— сказаў ён,— сэрца маю,
Табой жа, Талімэна, я не пагарджаю,
Але ты ўзваж сама: за намі сочаць зорка,
Ці можна так адкрыта? Вынікне гаворка,
Ды і грахом з'яўляецца такая ўцеха».

«Грахом!— сказала Талімэна з горкім смехам,—
Нявінненькі! Ягнятка! Я хоць і жанчына,
Зусім аб тым не дбаю. Гэта не прычына!
Няхай сабе і ўсё адкрыюць, хай зняславяць!
А ты ж мужчына! Вам яшчэ ў заслугу ставяць,
Калі вы маеце каханак дзесяць зразу».
Тут стала плакаць: «Кінуць здумаў? Так адразу?»
«Падумай, што сказаў бы свет аб чалавеку,—
Сказаў Тадэвуш,— што ў такім, як я вось, веку
Здаровы дома жыў, каханы і вясёлы,
Калі жанатыя кідаюць сем'і, сёлы
І прабіраюцца у войска праз граніцу.
Каб нават я й хацеў, дык не магу спыніцца:
Мне бацька перад смерцю загадаў ваенным
Аддацца справам. Той загад яго бяззменны,
Дык заўтра еду, я прыняў ужо рашэнне,
Дальбог, няма што думаць аб яго адмене».
«Я не хачу быць перашкодай на дарозе
Тваёй да шчасця й славы,— мовіла ў знямозе.—
Ты стрэнешся з каханкай, можа, больш прыгожай,
Больш вартаю кахання, багацейшай, можа!
Ды толькі мне для ўцехі перад раставаннем
Скажы, што пачуццё тваё было каханнем,
Не жартам, ні распустай, што нявіннасць губіць.
Хачу пачуць яшчэ: мяне Тадэвуш любіць!
Хачу пачуць «люблю» яшчэ хоць раз адзіны
І ў сэрцы захаваць шчаслівыя гадзіны.
Лягчэй прабачыць будзе, хоць цябе і страчу,
Ўсё ж будзе мне ўспамін...» І ўздрыгвала ад плачу.

Тадэвуш, бачачы, што плача і галосіць
Жанчына і адно такой драбніцы просіць,
Узрушыўся, праняў яго і жаль, і літасць.
І каб праверыў зараз дум і сэрца скрытасць,
Дык, можа, і не мог бы даць сабе адказу,
Кахаў яе ці не. Дык і прамовіў зразу:
«Дальбог жа, Талімэна, каб я мёртвым стаўся,
Калі не праўда, што ў цябе я закахаўся.
З табой прабавілі мы час такі кароткі,
Ды быў ён гэткі мілы, гэтакі салодкі!
І доўга-доўга, покуль сэрцу біцца,

Я пра цябе, дальбог жа, не змагу забыцца».

Тут Талімэна скочыла яму на шыю:
«Я так і думала! Ты любіш, дык не скрыю,
Што без цябе я ўраз пакончыла б з сабою.
О, дарагі! Мы не расстанемся з табою!
Я сэрца аддала табе, аддам багацце,
Пайду з табой усюды, на’т у беднай хаце
З табой шчаслівай буду! І ў пустыні дзікай
Мы створым рай любоўю нашаю вялікай!»

Тадэвуш вырваўся з яе абдымкаў сілай.
«Як што? куды?— спытаў,— што ты нагаварыла?
Ты за салдатам думаеш услед цягацца?
Ці маеш розум?» «Дык жа мы маглі б пабрацца» —
Сказала Талімэна. «Не, ніколі! Што ты?—
Тадэвуш крыкнуў.— У мяне няма ахвоты
Жаніцца ні кахаць, бо справа ёсць другая!
Падумай толькі, супакойся, дарагая!
Табе я ўдзячны, але нельга мне жаніцца.
Кахаймася здалёк. Старайся з тым змірыцца,
Што я застацца не магу, што ехаць мушу.
Бывай здарова, Талімэна! Заўтра рушу».

Сказаў, насунуў капялюш, стараўся бокам
Прайсці, ды тут яна яго стрымала зрокам
І тварам, як мядузы галавой. Застацца
Павінен быў і да яе стаў прыглядацца.
Збялелая стаяла ўжо амаль без духу!
Аж вось руку наставіла ў раптоўным руху,
Два пальцы натапырыўшы яму у вочы:
«Я так і знала!— выкрыкнула з цемры ночы.—
Ты з сэрцам яшчаркі, а твой язык — джыгала!
Няхай я Рэенту і Графу «не» сказала,
А ты зламаў мяне і кінуў сіратою,
Нічога! Ты ж мужчына і з душой пустою,
Дык так, як і ўсе іншыя, да здрадаў звычны,
Але не знала я, што лгун ты злаязычны!
Я пад дзвярыма дзядзькі чула ўсё дакладна.
Дык ты на гэта дзіцянё, на Зосю здрадна
Палюеш! Дык табе адной ахвяры мала!

Душа твая другой каля яе шукала!
Бяжы! Праклён мой пойдзе за табою ўсюды,
Ці заставайся, я тваё адкрыю бруды!
Тваім махлярствам больш не будзе ўжо спажывы!
Прэч! Грэбую табой! Ты подлы і ілжывы!»

Ад гэтакай абразы, што век не забыцца,
Якой ніводзін не пачуў яшчэ Сапліца,
Тадэвуш пабялеў, як паступіць, не знае,
Ды ў злосці, тупнуўшы нагой, гукнуў: «Дурная!»

Пайшоў, ды слова «подлы» рэха паўтарыла
У сэрцы. Ўздрыгануўся — так было няміла.
Адчуў, што крыўду учыніў ён Талімэне,
Дакорамі ў душы азвалася сумленне,
Але й яна яму цяпер здалася горам!
Пра Зосю, ах! было падумаць нават сорам,
Бо Зося гэткай мілаю была, прыгожай
І хутка жонкаю яго магла б быць, можа,
Каб не ўплятаў яго злы дух у грэх за грэхам,
З маны ў ману, пакуль не кінуў вось са смехам.
Аблаян, зненавіджаны, за дзён тых пару
Жыццё ўсё змарнаваў. Адчуў і грэх, і кару.

У бурах дум, як быццам якар супачынку,
Узбліснуў раптам успамін аб паядынку:
«Забіць трэ' лотру Графа!— ўецца думка злая.—
Загінуць або помсціць!» А за што — не знае.
І гэты гнеў так, як заняўся, ў момант вока
І выветраў. Зноў жаль праняў душу глыбока.
Стаў думаць: «Дык калі праўдзіва спасцярога,
Што Граф і Зося падружылі ўжо нямнога,
Тады што? Граф мо ў Зосю закаханы дужа,
Яна мо любіць, выбярэ яго за мужа!
Якое ж права маю я між іх мяшацца,
Зламаць іх шчасце, не дазволіць ім пабрацца?»

У роспачы не ведаў, як грахі зацерці.
Ўцякаць? Куды? Хіба ў абдымкі смерці!

Кулак прыціснуўшы да скрыўленага твару,

Бег на ставы, што пазіралі з траў гушчару.
Стрымаўся над балоцістым і зрок маркотны
Тапіў у цёмных водах, а той пах балотны
Уцягваў поўнымі грудзьмі, адкрыўшы вусны,
Таму што самагубства замысел спакусны
Ў ім спеў. Ён у мазгоў шалёным завароце
Адчуў жаданне утапіцца ў тым балоце.

Дык Талімэна, ўбачыўшы па ўспышцы дзікай
Яго адчай, хоць і ў злабе была вялікай,
Адчула страх, што можа быць бяды прычынай,
Бо ўсё ж ткі не благой была яна жанчынай.
Ёй жаль было, што ён ужо другую любіць,
Хацела пакараць, ■ ўбачыла, што губіць.
Пагналася за ім, аж косы расплялiся,
І клікала: «Пастой! Любі сабе, жаніся
Ці едзь, ды толькі стой!» А ён так разагнаўся,
Што бег далей і аж над ставам затрымаўся.
Выпадкам нейкім дзіўным лёсу, па-над ставам
Памалу ехаў Граф са слуг сваіх атрадам.
Захоплены прыгожасцю начы пагоднай,
Цудоўнаю ставоў гармоніяй падводнай
Тых хораў, што гудзелі арфамі Эола
(Нідзе такога хору не пачуеш болей),
Стрымаў каня, бо ўжо не ў памяці ўся справа.
Стаіць, паставіў вуха, слухае цікава,
Глядзіць на поле, неба доўга агладае,
Відаць, начны пейзаж у думках укладае.

А від сапраўды быў прыгожы, маляўнічы!
Ставы два пахілілі да сябе аблічча,
Як пара закаханых: правы быў глыбокі
Без траваў, чысты, гладкі, як дзяўчыны шчокі,
А левы чуць цямнейшы, як твар маладога,
З загарам і пушком абсыпаны нямнога.
Пяском залочаным свяціўся злёгку правы,
Як ясным воласам, а левы кучаравы,
Лазой наежаны і вербамі чубаты.
Абодва ж зелені вянком былі абняты.

Два ручаі з іх, быццам дзве рукі супольна

Сціскаюцца, і ўніз адзін ужо прывольна
Спадае, ды не гіне: ў рова павароты
Нясе на дробных хвалях бліскі пазалоты.
Вада ляціць пластамі, а на кожным пласце
Па жмені ўзбліскаў месяц рупіцца пакласці.
Святло ў канаве ў стужкі дробненькія рвецца,
А плынь, іх падхапіўшы, знесці ўдаль імкнецца,
А зверху жменямі бляск месяца кладзецца,
Як быццам Свіцязянка, сеўшы на раўніне,
Адной рукой ваду лье з шклянага начыння,
Другою з фартушка кідае ў хвалі тыя
Зачараваных скарбаў пліткі залатыя.

А далей, з рова выбегшы, ручай павольна
Раскручваецца, льецца па раўніне польнай,
І на яго рухомай дробнай лускавіне
Ўздоўж свет месячны дрыжыць, плыве і гіне.
Якраз, як той г і в о й т а с , жмудскі вуж прыгожы,
Што хоць нібы ляжыць на верасавым ложы,
Паўзе, бо срэбрам, золатам трымціць патроху,
Пакуль з вачэй не знікне паміж траў і моху,
Так і струмень хаваўся пад альшын завесу,
Што небасхіл адзначвалі падобна лесу,
Ўзнімаючыся формай шэрай і няяркай,
Як духі, напалову скрытыя за хмаркай.

Паміж ставоў над ровам млын стары схаваўся,
Як дзед, што закаханых падглядаць сабраўся.
Падслухаў іх размову, гневаецца, рвецца,
Балбочучы пагрозы, і ажно трасецца,
Так млын той раптам страсянуў чалом імшыстым
І кулаком крутнуў над ручаём празрыстым.
Скрыпучае старое закрахтала кола,
Зглушыла шэпты ўсе і спевы навакола,
І Графа разбудзіла.

Бачыць Граф, аж збоку
Стаіць Тадэвуш ля яго непадалёку,
Дык выкрыкнуў: «За зброю!» Скокнулі жакеі,
І ледзь Тадэвуш змог падумаць пра падзеі,
Ужо яго схапілі, рвуцца ў двор не жартам.

Двор будзіцца, сабакі ў брэх, у крыкі варта.
Суддзя бег паўраздзеты: што ўсё гэта значыць?
Падумаў, што бандыты, ажно Графа бачыць.
«Што гэта?»— ўскрыкнуў. Граф мільгнуў узнятай шпагай.
Але к бяззбройнаму аднёсся ўсё ж з увагай.
«Сапліца!— крыкнуў,— злосны вораг наш старынны!
Сягоння я цябе за ўсе ўкараю віны.
Сягоння ўсё захопленае вернеш зразу,
Перш чым табе адпомшчу за сваю абразу!»

Суддзя перажагнаўся: «У Айца і Сына!
Пан Граф! Вы ж нападаеце бандыцкім чынам!
Як гэта мірыцца, Граф, з вашым выхаваннем,
Паходжаннем, значэннем і самапазнаннем?
Не дамся ў крыўду!» Слугі беглі ўжо Суддзёвы
Хто з кіем, хто са стрэльбай, біцца ўсе гатовы.
А Войскі, стоячы паводдаль трохі збоку,
Меў нож у рукаве, а пана Графа ў воку.

Хацелі біцца, ды Суддзя тут перашкодзіў:
Дарма змагацца — новы вораг надыходзіў.
У вольхах бліснула, і стрэл раздаўся. Потым
Загрукаў мост ад конскіх ног за паваротам.
«Граміць Сапліцу!»— сотня галасоў раўнула.
«Гервазы там!»— у галаве Суддзі мільгнула.
«Нічога,— Граф сказаў,— нас будзе зараз болей,
Здавайцеся, Суддзя, лепш зразу мне ў няволю!»

Надбег Асэсар з крыкам: «Арышт за знявагу!
У імя імператара, аддай, Граф, шпагу,
А не — ваенную паклічу дапамогу!
Я арыштую вас! Бо хто зайшоў дарогу
Ці ўночы нападае, вінен, згодна ўказу
Ад...» Граф ударыў плазам цераз твар, і зразу
Асэсар моўчкі бухнуўся ў траву з ног збіты.
Ўсе думалі, што ранен быў ці мо забіты.

«Відаць,— сказаў Суддзя,— забойства пачалося!»
Завойкалі кругом, а больш за іншых Зося:
Яна дала, Суддзю абняўшы, крыкам волю,
Нібы яе жыды іголкамі паролі.

Тым часам Талімэна ўбегла паміж коней
І к Графу заламаныя ўзняла далоні.
«На гонар твой!— ускрыкнула ад слёз жалосна,
З распушчанай касою, выгнутая млосна,—
На ўсё святое, што ў душы і сэрцы носяць!
Ці ж нам адмовіце, пан Граф? Вас дамы просяць.
Бязлітасны, перш нас забі рукою ўласнай!»
І тут, самлеўшы, ўпала. Скочыў Граф к няшчаснай,
Задзіўлены, збянтэжаны такою сцэнай.
«Ах, панна Зося,— мовіў,— пані Талімэна!
Крывёй бяззбройных я не спляміў рук ніколі.
Сапліцы, слухайце! Вы ўсе ў мяне ў няволі.
Вось так зрабіў я і ў Італіі далёкай,
Між гор Сіцыліі ля скал Бірбанта-рокка:
Заняўшы лагер банды, збройных мы пабілі,
Бяззбройных жа ў палон адразу захапілі.
Яны трыумф мой упрыгожылі прыкметна,
Пасля павесілі мы іх ля спускаў з Этны».

Шчаслівa здарылася для сям'і Сапліцаў,
Што Граф на лепшых конях змог паклапаціцца,
Каб першаму прыбыць, бо рэшта шляхты ў пыле
Цягнулася за ім не бліжай як за мілю.
Атрад жакеяў, што скакаў за ім па-парна,
Адзінкай быў у значнай меры рэгулярнай,
А шляхта рухалася так, як хто захоча,
Была яна натоўпам вешаць, біць ахвочым.

Граф часу меў даволі, каб абдумаць справы
І бой правесці так, каб быў ён бескрывавы,—
Загадвае у доме зачыніць Сапліцаў,
І ля дзвярэй з жакеяў варце размясціцца.

Аж «Гэй, граміць Сапліцаў!»— рвецца шляхта бурна,
Двор вокал акружае і займае штурмам,
Бо правадыр забраны, войска паўцякала,
Ды шляхта ўсё йшчэ ў злосці ворага шукала.
Не ўпушчаныя ў двор, бягуць на фаліварак,
У кухню. Толькі ўскочылі, а тут пах скварак,
Агонь прытушаны і стравы водар свежы
Ды від сабак, што дагрызалі рэшткі ежы,

Мяняе думкі ўсіх, бярэ за сэрцы дзесьці,
Гнеў студзіць і распальвае патрэбу есці.
Нарадай стомленыя, доўгаю яздою,
«Гэй, есці!»— згоднай закрычалі грамадою.
А там зноў «піць» пачуўся вокліч, і нарэшце
Крычаць два хоры: тыя — «піць!» а тыя — «есці!»
І голас рэхам рвецца, а куды даходзіць,
Аскому ў вуснах, голад нестрыманы родзіць.
На даны з кухні знак, забыта ўміг змаганне,
І армія ідзе на фуражыраванне.

У дзверы да Суддзі Гервазы рваўся ўпарты,
Ды мусіў адступіць, стрыманы графскай вартай.
А як адпомсціць зброяй стала немагчыма,
Успомніў пра нашэсця мэты і прычыны.
Як чалавек практычны, даў сабе заданне
Легальна і фармальна ўвесці ва ўладанне
Сягоння Графа. Вознага вакол шукае,
Уканцы з дзіры якойсь яго вывалакае,
Схапіўшы за каўнер, і цягне ўміг на людзі.
Там, вастрыё Сцізорыка упёршы ў грудзі,
Гаворыць: «Граф вас просіць, паважаны пане,
Зрабіць аб'яву — хай усім вядомым стане,
Што Графу пераходзіць замак, двор Сапліцы
І ўся зямля яго па ўсе яе граніцы,
Як ёсць, *cum gais, boris et graniciebus,*
К *metonibus, sculletis et omnibus rebus*
Et quibusdam aliis. Так брашы, як знаеш,
Не прапускай нічога!» «Пан жа розум маеш,
Пан Ключнік,— смела адазваўся ўжо Пратазы,—
Гатоў я выканаць усе бакоў наказы,
Аднак жа праўнай моцы мець не могуць акты,
Уночы вымушаны гвалтам — вось вам факты».
«Што тут за гвалт?— прамовіў Ключнік.— Далікатна
Я вас прашу, калі ж вам цёмна і няздатна,
Дык я Сцізорыкам так красану вашэці,
Што свет, нібы ў сямі касцёлах, вам засвеціць!»

«Гервазанька,— прамовіў Возны,— што злавацца?
Я возны, і не мне у справах разбірацца,
Бо возны толькі абавязак свой спраўляе,

Калі дыктованае свету аб’яўляе.
Пасол законаў я, паслоў жа не караюць.
Чаму ж мяне тады пад вартаю трымаюць?
Я мігам акт спішу — ліхтарык прынясіце.
А зараз аб’яўляю: больш не гаманіце!»
І, каб лепш чутым быць, падняўся на бярвенні,
Што сохлі кучай каля саду ў зацяненні.

Узлез і знік, як бы яго ўміг вецер здзьмухнуў,
Пачулі толькі ўсе, як у капусту бухнуў,
Праз момант у каноплях блісНуў шапкай белай,
Што, нібы голуб, хутка ў цемры праляцела.
Даў выстрал Конаўка па ёй, ды не пацэліў.
Вось тычкі трэснулі — Пратазы ўжо у хмелі.
«Я пратастую!»— крыкнуў. Не баяўся болей,
Бо далей меў ён рэчку, луг балотны, поле.

І за пратэстам тым, што прагучаў, нібыта
Апошні стрэл гарматны з крэпасці здабытай,
Спынілася ў Сапліцаве супраціўленне.
Рабунак у двары пачаўся на здзіўленне:
Крапіцель правяраў абоpы засяленне,—
Вала і двух бычкоў між рог здзяліў Крапілам,
А Брытва горлы ім падрэзваў. Быццам шылам,
Калоў Шыдэлка кабаноў і парасятак,
Уторкваючы шпагу ім каля лапатак.
І птушкі ў небяспецы — вось гусей грамады,
Нашчадкі тых, што ратавалі Рым ад здрады,
Дарэмна гагаюць, іх крык людзей не ўзрушыць.
Ўварваўся Конаўка ў катух, адных з іх душыць,
Другіх за пояс затыкае, цягне, глушыць.
Надарма гускі б’юцца, шыі выгінаюць,
А гусакі шыпяць і ворага шчыпаюць,
Бяжыць ён цераз двор, акрыты светлым пухам,
Зусім як несены гусіных крылляў рухам,
Як быццам стаў дамавіком — крылатым духам.

Разня ж найбольшая, хоць і найменш там крыку,
Сярод курэй. Іх Сак сцягнуў ужо без ліку,
Пятлёй чапляючы ў падстрэшшы на драбіне.
Так род шурпатак і чубатак марна гіне,

Бо Сак іх душыць і складае труп на трупах
Курэй, што на пярловых выкармлены крупах.
О, Сак! Скуль злосці гэтулькі ў табе ўзялося?
Табе твайго учынку не даруе Зося!

Гервазы ўспамінаць пачаў старыя часы:
Ён, паясы звязаўшы, пограба запасы
Выцягвае наверх на радасць і на дзіва —
Сівухі бочкі, бочку дубняку і піва.
Адны з іх адчыняюць, а другія бокам,
Нібы мурашкі, коцяць з крыкамі, з падскокам
У замак. Там прадбачыцца начлег, вячэра
І штаба графскага галоўная кватэра.

Кладуць сто вогнішчаў. Вакол дыміць, скварэцца,
Сталы пад мясам гнуцца і гарэлка льецца,
А шляхта есць і п'е, пяе, не заціхае.
Аднак паволі той-сёй дрэмле, пазяхае,
За вокам гасне вока, вось ківацца сталі
І, дзе пілі і елі, там паападалі —
Той з місай, а той з куфлем ля валовай чвэрці.
Так перамог і пераможцаў сон, брат смерці.

КНІГА ДЗЕВЯТАЯ • БІТВА

Змест: Пра небяспекі, якія вынікаюць з бязладнага абозу. Неспадзяваная падмога. Сумнае становішча шляхты. Прыбыцце манаха прадвяшчае паратунак. Маёр Плут празмерным заляцаннем наклікае на сябе буру. Выстрал з пісталета — сігнал да бою. Подзвігі Крапіцеля, учынкі і небяспека Мацька. Конаўка засадай ратуе Сапліцова. Коннае падмацаванне, атака на пяхоту. Подзвігі Тадэвуша. Паядынак камандзіраў перапынены здрадай. Войскі ўдалым манеўрам перацягвае шалю бою. Крывавыя подзвігі Гервазага. Падкаморы — велікадушны пераможца.

А так храплі і гэтакім сном цвёрдым спалі,
Што іх не будзяць ліхтары, ні бляскі сталі,
Ні людзі, што напалі на безабаронных,
Як быццам павукі-касцы на мух паўсонных.
Няхай якая бзыкне, ў той жа міг кат строгі
Спаўе ёй крыллі павуціннем, звяжа ногі.

А сон шляхоцкі быў цяжэйшы, чым сон мухаў —
Не бзыкае ніхто, ляжаць зусім без духу,
Хоць сіла дужых рук іх брала, несла
І, як салому, адкідала ўбок і трэсла.

Ды Конаўка адзін, якому і ў павеце
Раўні не знойдзеш пры гарэлцы на банкеце —
Ён выпіць мог за раз не менш як дзве барылкі
І не ківацца, і гуторыць без памылкі,
Той, хоць і доўга піў, хоць і заснуў глыбока,
Ды знак жыцця даваў, адкрыў нямнога вока
І бачыць: што за мара? Два страшныя твары
Схіляюцца, на кожным з іх вусоў па пары,
Сапуць над ім і к вуснам бліжацца вусамі,
Рукамі ўзмахваюць, ківаюць карпусамі.
Спалохаўся, хацеў перахрысціцца скрыта,
Ды правая рука ля боку, як прыбіта.
Парушыў левай, ды дарма. Што гэта, духі
Так спавілі яго, як бабкі- павітухі?
Спалохаўся йшчэ больш, дык вока прымыкае,
Ляжыць, не дыхае — душа з яго ўцякае.

Крапіцель здумаў бараніцца, ды па часе!
Быў скручаны, ажно вяроўка ўпілася,
Але крутнуўся, прыпадняўся да паловы
І ўпаў на сонных, пакаціўся праз галовы.
Як рыба кідаўся па беразе пясчаным
І роў, нібы мядзведзь той ад смяротнай раны.
«Тут здрада!»— роў, і ўслед за ім тым самым складам
Узнялі крык другія: «Здрада! Гвалт! Тут здрада!»

А крык той далятае з рэхам да той залі,
Дзе Граф, яго жакеі і Гервазы спалі.
Гервазы ўміг прачнуўся, але дарма рвецца:
Так скручаны з мячом, што нават не кранецца.
Людзей чужых заўважыў ля акна ў прасветах —
У вопратках зялёных, чорных спрэс кашкетах,
Узброеных. Адзін са стужкаю з павагай
Каманду падаваў. Паказваючы шпагай,
Шаптаў: «Вяжы, вяжы!» Жакеі на падлозе
Ляжаць у путах, Граф сядзіць у беднай позе

Кніга сёмая

Прыезд Графа

Книга седьмая

Приезд Графа

Księga siódma

Przyjazd Hrabiego

Без пут, але й без зброі. Са штыкамі грозна
Стаяць над ім удвух. Пазнаў іх, ды запозна!
Ах, маскалі!

Знаў Ключнік гэткія трывогі,
Не раз яму ў жыцці вязалі рукі, ногі,
Ды вызваляўся — рваў і путы і вяроўкі,
Бо дужы быў, сакрэты знаў і меў снароўкі.
Задумаў моўчкі ратавацца: жмурыць вочы,
Выцягваецца ўздоўж, нібыта ў сне і ўночы,
Падцягвае жывот і грудзі, жмецца дужа
І раптам корчыцца і дзьмецца накшталт вужа,
Што хвост і галаву зацягвае ў пярсцёнкі:
Так стаў Гервазы тоўсты, як спярша быў тонкі.
Вяроўкі падаліся, скрыпнуўшы аб косці,
Але не лопнулі. Ад сораму і злосці
Крутнуў Гервазы моўчкі твар крывы ад гневу
І абыякавы ляжаў, падобны дрэву.

Вось бубны вухнулі, уперад зрэдку, потым
Штораз гусцей грымелі клічам ці зваротам.
Пад той сігнал загад салдаты атрымалі
Жакеяў з Графам зачыніць пад варту ў залі,
А шляхту ў двор гнаць, дзе была другая рота.
Дарма злуе Крапіцель, рвецца з тых цянётаў.

А на двары ўжо мітусіліся, гудзелі
Падгайскія, Грачэхі, Бірбашы, Бяргелі —
Сябры і сваякі Суддзі, што наляцелі
Са зброяй у руках, пачуўшы аб нападзе,
Тым больш, што век былі з Дабрынскімі у звадзе.

Хто змог прывесці з вёсак батальён салдатаў?
І хто так хутка засцянкоўцаў тых раскратаў?
Асэсар? Янкель, можа? Розна гаварылі,
Аднак не ведае ніхто да гэтай хвілі.

І сонца ўжо ўстае крывава з шэрых ценяў
І берагам тупым, пазбаўленым праменняў,
З хмурын сівых, парваных, збітых бесталкова
Высоўваецца, быццам з горана падкова.

Ўздымаўся вецер, гнаў натоўпы хмар з усходу —
Яны па-над зямлёй плылі, як крыгі лёду,
І кожная з тых хмар дождж дробны рассявае,
А вецер следам сушыць, росы абівае.
За ветрам тым пахмурак зноў ляціць вільготны:
Так дзень уперамежку быў халодны, слотны.

Маёр тым часам загадаў цягнуць бярвенні,
Якія сохлі кучаю на прыгуменні,
У кожным з іх сякерай дзіры прасякаюць
І ў тых калодах ногі шляхты замыкаюць.
Абодва бервяны ў канцах цвікамі збіты,
Змыкаюцца пашчэнкамі сабак сярдзітых.
Вяроўкамі ж мацней салдаты вяжуць рукі
У шляхты на плячах, а дзеля большай мукі
Маёр загад даў зняць з галоў канфедэраткі,
З плячэй плашчы, на'т кунтушы і тарататкі.
І так вось забіякі, стаўшы ўміг рабамі,
Трасліся і званілі з холаду зубамі,
Бо сыпаў дождж, мачыў зямлю, рабіў балота.
Дарма злуе Крапіцель, рвецца з тых цянётаў.

Дарма, што ў згодным шчырым льюцца суглоссі
Суддзёвы, Талімэны просьбы і плач Зосі,
Каб аблягчыць хоць трохі шляхты стан гаротны.
Што праўда, афіцэр Мікіта Рыкаў, ротны,
Не кепскі чалавек, не адмаўляўся крута
Ад просьб, ды мусіў слухаць сам маёра Плута.

Маёр жа быў паляк, і родам быў з Дзяровіч,
І называўся некалі, чуваць, Плутовіч,
Ды лотрам стаў, перахрысціўся. Так бывае
З палякам, калі ён край родны забывае.
Плут з люлькаю стаяў, у бокі падпіраўся,
Нос дзёр і на паклоны на'т не азіраўся,
А ў знак нездавальнення, дрэннага настрою,
Пусціў клуб дыму і пасунуўся ў пакоі.

Суддзя тым часам Рыкава усё лагодзіць,
Асэсара для гутаркі набок адводзіць:
Як справу скончыць без суда, вядуць нараду,

І як пазбавіцца праследу з боку ўраду.
Тады к маёру Плуту так азваўся Рыкаў:

«Вось пан Маёр сабе адно клапот наклікаў:
Што з вязнямі рабіць? Судзіць? Няшчасця многа
Для іх, а вам за гэта не дадуць нічога.
Вы знаеце, Маёр? Лепш справу залагодзіць,
А пан Суддзя за труд вас добра ўзнагародзіць.
Мы скажам, што прыйшлі сюды дзеля візіты,
Дык козы будуць цэлы, і воўк будзе сыты.
Ёсць прыказка: ўсё можна, толькі асцярожна,
І прыказка яшчэ: дзяры з казны, дзе можна,
І прыказка яшчэ: мір лепшы за нязгоду.
Заблытай вузел, а канцы уторкні ў ваду.
Не будзе рапарта, ніхто і знаць не будзе.
Бог рукі даў, каб браць, вось што гавораць людзі!»

Маёр на гэта аж запырскаўся ад злосці:
«Ты, Рыкаў, ашалеў? Тут служба, а не госці!
А служба, брат, не дружба, ты дурны, Мікіта!
Бунтаўшчыкоў пускаць? Ты ашалеў нібыта!
У гэткі час ваенны? Га, паны палякі,
Я навучу вас бунту! Дамся вам я ў знакі,
Паны Дабрынскія! Дык вось як вас прыпёрла!
(І гледзечы ў акно, смяяўся ва ўсё горла.)
А гэта той Дабрынскі! Вунь ён у сурдуце —
Гэй, зняць яму сурдут! Аднойчы на радуце
Пачаў ка мне чапіцца без ніякай меры.
Я ў танец, ён крычыць: «Вон злодзея, за дзверы!»
Што ў той час за ваеннай абкраданне касы
Вялося следства, ну і меў я амбарасы,
Дык што яму за справа? Я пайшоў мазурку,
А ён крычыць услед мне: «Злодзей!» Вось шляхцюрку
Я ўзяў і з тымі, што падтаквалі прыдурку.
Казаў я: «Эй, Дабрынскі, помні, прыйдуць козы
Да воза. Га, Дабрынскі, бачыш?— будуць лозы!»

Пасля, схіліўшыся, шапнуў Суддзі на вуха:
«Калі жадаеце, каб выйшлі ўсе насуха,
Ад кожнай галавы — па тысячы ў гатоўцы,
Па тысячы, не менш — апошняе вам слоўца».

Суддзя стаў таргавацца, ды Маёр не слухаў,
Зноў бегаў па пакоі, дымам густа дзьмухаў,
Падобны да ракеты з гэтае прычыны.
За ім хадзілі з плачам, просячы, жанчыны.
«Маёр,— сказаў Суддзя,— ў суд пойдзеш з гэтай справай,
Што выйграеш? Тут не было бітвы крывавай,
А што прапалі гусі, куры, парасяты,
Дык згодна Статута, мне вернуць тыя страты,
І з Графам без суда мы зробім прымірэнне —
Суседскае, не больш тут, непаразуменне».

«А з Ж о ў т а й К н і г а й вы знаёмы, пан Сапліца?—
Спытаў Маёр. «З якою кнігай?» — «Ды з крыніцай
Законаў лепшых за ўсе вашыя статуты,
Бо ў ёй, што слова: кнут, пятля, Сібір ды путы —
Правоў ваенных кніга, што запанавала
Замест статутаў вашых, вашых трыбуналаў.
За гэткую распусту, на аснове ўказу,
Найменей у Сібір вы пойдзеце ўсе зразу».

«Пастой,— сказаў Суддзя,— у нас ёсць губернатар!»
«Тут рады,— Плут сказаў,— не дасць і імператар,
Бо ведама, што цар, падпісваючы ўказы,
Ласкава кару павялічвае ў два разы.
Дык апеліруй, пан Суддзя, але, быць можа,
Ў патрэбе знойдзем і на вас кручок прыгожы.
Вось Янкель ваш — шпіён, за ім улада сочыць,
А ён у вас карчму дзяржыць, людзей марочыць.
Магу ўсіх вас, як ёсць, арыштаваць адразу».
«Мяне?— спытаў Суддзя.— А па якому ўказу?»
І ўсё што раз жывейшую вялі гаворку
У час, як новы госць з'явіўся ў панадворку.

Ўязджаў дзіўны натоўп. Сярэдзінай дарогі,
Нібы ляўфар, баран таўсты чатырохрогі
Бег й ўзмахваў галавой. Рагі два абадкамі
Віліся ля вушэй. Абвешаны званкамі,
Два іншыя рагі тырчэлі з ілба вонкі,
Пры руху галавы давалі голас звонкі.
Баран вёў коз, валоў, авечак, а за статкам
Чатыры грузныя вазы ішлі парадкам.

Усе згадалі, што над'ехаў ксёндз па зборы,
Дык і Суддзя, пакінуўшы перагаворы,
Пайшоў сустрэць гасця. Ён ехаў на падводзе
Пярэдняй, твар схаваўшы у каптур, па модзе
Манашай, ды яго пазналі. У спакоі,
Мінуўшы вязняў, глянуў, знак зрабіў рукою.
І хто другі фурман, пазнаць было не цяжка:
Мацей, хоць на плячах мужыцкая сярмяжка.
Убачыўшы яго, крычаць усе пачалі,
А ён сказаў ім: «Дурні!» Знак даў, каб маўчалі.
Прусак — на трэцім возе ў каптане пацёртым,
А Зан з Міцкевічам сядзелі на чацвёртым.

А Ісаевічы, Падгайскія, Бяргелі,
Бірбашы, Вільбікі ды Котвічы глядзелі
На здзек, які няслі Дабрынскія ў няволі,
І астывалі з гневаў даўнішніх міжволі.
Бо шляхта ў нас, хоць звады, бойкі вельмі любіць,
Ды помстай супраціўнікаў сваіх не губіць,
Дык да Мацея падаліся ўсе на раду.
А той парасстаўляў іх за вазамі ззаду,
Сказаў чакаць.

Ксёндз злез, падаўся ў бок пакояў.
Там ледзь яго пазналі — ў гэткім быў настроі
І новай форме. Сумны у любую пору,
Панурысты, ўзняў сёння галаву угору
І з мінай яснаю і рук шырокім махам,
Перш чым загаварыў, смяяўся:

«Ха-ха, ха-ха!
Вітаю, ха-ха-ха! вітаю! вось прыгожа,
Панове афіцэры! Хто ўдзень толькі можа
Хадзіць на ўлоў, а вы і ўночы! А звярыну
Я бачыў. Скубці шляхту! драць з яе лупіну!
Кілзайце брыкуноў, вучыце іх парадку!
Віншую, пан Маёр, што ты схапіў Графятка.
О, гэта тлусцячок, багач, з арыстакратаў,
Не выпускай яго без сотняў трох дукатаў,
А ўзяўшы, дай хоць грош манастыру ў падмогу,
Бо й за тваё збаўленне я малюся Богу!

На сан мой! мне не абыякі вашы душы!
І штабс-афіцароў хапае смерць за вушы!
Праўдзіва Бака піша — ў смерці многа працы:
Бярэ ў палацы і ў палотны б'е ахвотна,
І па сукне не раз шчаўкне, ды і ў мундзіры,
Так, як у каптуры, ахвотна робіць дзіры.
Матуля-смерць, казаў наш Бака, як цыбуля,
Слязою блісне, калі сцісне, і у люлі
Дзіця бярэ, і малайчыну ў часе гуляў!
Ах, ах! жывём, а заўтра, можа, загніёмся.
Ўсяго ў нас, пан Маёр, што пад'ямо, нап'ёмся!
Як, пан Суддзя, ці не пара падмацавацца?
Сядаю сам і ўсіх прашу не адмаўляцца.
Як, пан Маёр, пан Капітан? Закажам зразы?
Як думаеце? Мо і пуншыку з паўвазы?»

«Чаму ж,— абодва мовілі,— мы рады чэсці
І выпіць за Суддзю здароўе і паесці!»

Дзівіліся ўсе хатнія з ксяндза Рабака:
Чаму зрабіўся раптам ён такім гулякам?
Суддзя даў кухару патрэбныя наказы:
Уміг бутэлькі ўнеслі, вазу, цукар, зразы.
Плут з Рыкавым так спрытна пачалі ўвіхацца,
Піць часта і старанна ежай мацавацца,
Што ў паўгадзіны з'елі дваццаць і тры зразы
І пуншу выхілілі не малой паўвазы.

Дык Плут вясёлы, сыты разваліўся, потым
Дастаў тытун і люльку, прыкурыў банкнотам
І, вусны чыста выцершы канцом сурвэты,
Звярнуў на дам свой твар, напіткам разагрэты;
«Люблю я дам,— сказаў,— ды гэта ж не сакрэты!
Клянуся чэсцю, мне пасля падмацавання
Закускай лепшаю бывае размаўлянне
З такімі прыгажунямі, як вы тут, пані!
Вось што, паграйма ў карты! ў вэльба-цвэльба? ў віста?
Або хадзем мазурку! Га! Чарцякаў трыста!
Ды ў егерскім палку я ж першы з мазурыстаў».
Пры гэтым штораз бліжай к дамам нагінаўся
І з дымам кампліменты ім пускаць стараўся.

«У танцы!— крыкнуў Робак.— Дык не трацьма часу!
І я, хоць ксёндз, падпіўшы, падхіляю расу
І йду мазурку. Але ведаеш, Маёрку?
Мы тутка п'ём, а егры мерзнуць на падворку,
Гуляць, то ўсім гуляць! Суддзя, дай ім сівухі,
Маёр дазволіць еграм выпіць весялухі!»
«Прасіў бы,— Плут сказаў,— ды тут не мус, а проста...»
«Дай бочку,— ксёндз шапнуў Суддзі,— на... дзевяноста».
І так, калі ў двары піло, гуляла панства,
У войску каля дому пачалося п'янства.

Маўкліва Рыкаў толькі чаркай забаўляўся,
А вось Маёр і піў, і к дамам прыміляўся,
І ўсё да танцаў узрастала ў ім натхненне.
Пакінуў люльку, стаў чапляцца к Талімэне,
Цягнуў гуляць, але ўцякла, тады да Зосі
Пайшоў з хістаннем, кланяецца — ў танец просіць.
«Гэй, Рыкаў, люльку кінь, смактаць яе ўжо годзе,
Ты ж балалаечнік праслаўлены ў народзе.
Гітару бачыш вунь? Ідзі вазьмі гітару,
Мазурку грай! У першую пайду я пару».
Дык Капітан, гітару ўзяўшы, круціць, строіць,
А Плут зноў Талімэну просьбай непакоіць.

«Маёра слова! Мне не быць расіянінам,
Калі я лгу! Няхай я буду сукінсынам,
Калі я лгу! Спытай, пацвердзяць афіцэры
Усе, як ёсць, калі не хочаш даць мне веры,
Што ў арміі другой, у корпусе дзевятым
Дывіз'і першай, у палку пяцідзесятым
Егерскім, Плута лічаць першым мазурыстам.
Хадзі, паненка! Што ты гэтак наравіста!
Бо я па-афіцэрску пакараю злюку...»

Тут скокнуў і, схапіўшы Талімэны рукі,
Шырокім пацалункам у плячо ёй пляснуў.
І тут яму Тадэвуш ёмка ў шчоку ляснуў.
Цалунак з аплявухай так адначасова
Азваліся ў пакоі, як за словам слова.

Маёр стаў слупам, пабялеў і на знявагу

Ускрыкнуў: «Бунт! Бунтар!» — і, выхапіўшы шпагу,
Хацеў прабіць, ды ксёндз к Тадэвушу падскочыў,
Даў пісталет. «Смалі!— ускрыкнуў,— проста ў вочы!»
Схапіў, прыцеліўся Тадэвуш, пальнуў скора,
Ды толькі асмаліў і аглушыў маёра.
З гітарай скокнуў Рыкаў. «Бунт!— крычыць,— як можна!»
Бяжыць к Тадэвушу; тут Войскі бестрывожна
Махнуў рукой наводля, нож аж толькі свіснуў
Паміж галоў і перш ударыў, чым узбліснуў,
Трапляе ў дно гітары, б'е яго на чвэрці.
Схінуўся трохі Рыкаў і ўцёк так ад смерці.
Тады трывожна крыкнуў: «Егры! бунт! Ей Богу!»
І, шпагу вырваўшы, прасоўваўся к парогу.

А тут з другога боку, як паўстала спрэчка,
Праз вокны шляхта рвецца, камандзір — Рузэчка.
Вось Плут у сенях, Рыкаў з ім, крычаць трывогу,
І тры салдаты ім спяшаюцца ў падмогу.
Уміг праз дзверы ўлазяць тры штыкі, мушкеты,
А ззаду чорныя прыгнутыя кашкеты.
Мацей, падняўшы Розгу, стаў за вушакамі,
Сачыў цішком, як быццам кот за пацукамі,
Аж рубануў; усе мо збіў бы тры галовы,
Але стары не згледзеў, ці ўжо быў нярвовы,
Бо перш, чым шыі выткнулі, цяў па кашкетах,
Збіў іх, а Розга зазваніла па мушкетах —
Дык егры адступаюць, Мацек вон іх гоніць
На двор.

А там ужо бушуе ўсё, гамоніць.
Прыхільнікі Суддзі, не трацячы нагоды,
Бягуць Дабрынскіх ратаваць, знімаць калоды.
На гэта егры дай хапаць свае мушкеты,
Сяржант Падгайскага парнуў у часе гэтым,
Двух іншых раніў ля Хрысціцеля калоды,
Пасля даў стрэл. Хрысціцель блізкі быў свабоды,
Ужо меў рукі вольныя, дык без размовы
Падняў высока ўгору свой кулак пудовы
І гэтак стукнуў у хрыбет расіяніна,
Што ўплюшчыў твар яго ў жалеза карабіна,
Дык порах, кроўю змочаны, не запаліўся,

А сам сяржант ля ног Хрысціцеля зваліўся.
Хрысціцель гнецца, карабін бярэ за дула
І круціць, аж паветра загуло, раўнула.
Млынкуе, валіць двух салдат, ды гэтых мала —
За імі ўраз трапляе ў галаву капрала.
Другія адступаюць ад яго са страхам.
Вось так жывым Крапіцель прыкрываўся дахам.

Развязаны ўжо рукі, збіты ўсім калоды,
І шляхта на ксяндзоўскія бяжыць падводы,
З іх дастае рапіры, шаблі, стрэльбы, косы,
А Конаўка знайшоў два штурмакі. Калёсы
Ўмяшчалі і шмат куль. Узрадваўся ваяка,
Бярэ штурмак сабе, другі дзяржыць для Сака.

А еграў прыбывае, збіліся, таўкуцца,
І шляхце ўжо няма як шабляй размахнуцца.
Страляць не могуць егры, б'юцца гурмай зблізку:
Па сталі звоніць сталь, мігцяць іскрыста ўзбліскі,
Б'е шаблю штык, каса сячэ эфес, скуголіць,
Кулак таўчэ кулак, плячо плячо няволіць.

Дык Рыкаў кінуўся ў напрамку, дзе стадола
Сышлася з плотам; кліча еграў, каб наўкола
Спынялі бой такі дурны і бесталковы,
Дзе ўсе без выстрала паскладваюць галовы.
Злы быў, што сам страляць не можа, бо ў таўчэчы
Свайму, замест чужога, ўсадзіш кулю ў плечы,
Дык: «Стройся! Гэй ка мне!»— выкрыкваў Рыкаў,
Але яго каманда нікне сярод крыкаў.

Мацей, да рукапашнай бітвы ўжо не здольны,
Памалу адступаў і шлях праторваў вольны
Направа і налева: то канцом Рузэчкі
Сцірае штык з ствала, як быццам кнот са свечкі,
То зноў наводля замахнецца, рэжа, коле.
Так Мацек асцярожна адступаў у поле.

Але з найбольшым цісне на яго напорам
Гефрэйтар пажылы з інструктарскім задорам,
Мастак баёў штыковых. Ён, сабраўшы сілы,

Схапіў аберуч карабін, ідзе пахілы,
Адной рукой затвор, другою ствол сціскае,
Падскаквае і круціцца; то штык спускае,
То сам прысядзе, то зноў выцягнецца дужа
І штык папхне наперад, як джыгала вужа,
То ўзад рване і на калене апірае,
І так штораз мацней на Мацька насядае.

Стары Мацей пазнаў майстэрскія удары,
Уздзеў сабе на нос ляўшою акуляры,
А пры грудзях трымаў Рузэчкі рукаятку.
Здае назад, глядзіць, ды не ўступае ў схватку,
Сланяецца крыху, як быццам трохі п'яны.
Гефрэйтар цісне больш — Мацей ледзь не спайманы.
Дык каб лягчэй дагнаць, прабіць штыком старога,
Узняўся ды адну руку падаў замнога.
На карабін, папхнуўшы, гэтак наваліўся,
Што ад вагі той зброі значна нахіліўся,
А Мацек шаблі рукаятку ў тую ж пору
На стык ствала з штыком падставіў, б'е угору
І апускае Розгу на далонь салдата,
А потым рассякае твар яго вусаты.
Так паў фехтмайстар знатны з прымаскоўскіх даляў,
Крыжоў трох кавалер і чатырох медаляў.

Тым часам ля калодаў шляхта рускіх біла
І скрозь перамагала. Там граміў Крапіла,
Здалёку бачны, Брытва з ім — у самай гушчы;
Той рэжа напалам, а той галовы трушчыць.
Так, як машына, што германцы збудавалі,
А потым малатарняю яе назвалі,
Якая адначасна сечку рэзаць можа —
Сячкарняй быць і малаціць цапамі збожжа,
Так Брытвачка з Крапілам у варожым стане,
Той знізу, той згары, рабілі замяшанне.

Крапіцель раптам пакідае перамогу,
Бяжыць направа, бо ў душы адчуў трывогу
За Мацька. Там адпомсціць прапаршчык жадае
За смерць гефрэйтара, шпантонам насядае.
(Шпантон — сякеру з пікай рэдка хто ўжывае

Цяпер, але яшчэ бытуе ён у флоце,
А ў той час сустракаўся часта і ў пяхоце.)
Дык прапаршчык-юнак вёў наступленне ўмела:
Ледзь зброя ад удару ўгору падляцела,
Ён адступаў, бо бачыў — Мацек не дагоніць,
Што ён, не ранячы, адно сябе бароніць.
Ужо бердыш узняты быў на ўдар вялікі,
Ужо чапіў Мацея злёгку кончык пікі,
Хрысціцель не паспее — стаў сярод дарогі,
Крутнуў даўбню і кінуў ворагу пад ногі.
Скрышыў нагу, дык прапаршчык шпантон з рук кінуў,
Хістаецца. Тут шляхты гурт уміг нахлынуў,
За шляхтай гурма маскалёў услед валіла,
І тут нанова бой пачаўся ля Крапіла.

Хрысціцель, страціўшы сваю праз Мацька зброю,
З уласнай ледзь не развітаўся галавою,
Бо ззаду на яго напалі два салдаты,
Рукамі чатырма за валасы заўзята,
Упёршыся нагамі, цягнуць, быццам ліны,
Прывязаныя к мачце нёманскай віціны.
Дарма назад удары шле ён раз за разам,
Хістацца стаў, аж бачыць: б’ецца вось Гервазы,
Дык крыкнуў: «Божа мой! Сцізорык, на падмогу!»

Пачуўшы ў голасе Хрысціцеля трывогу,
Гервазы апусціў Сцізорык свой узняты
Ля галавы Хрысціцеля, на рукі тых салдатаў.
Адскочылі, падаўшы разам страшны голас,
Але адна рука, заблытаная ў волас,
Крывёй сцякаючы, матлялася, вісела.
Так орлік, кіпцюры ўсадзіўшы зайцу ў цела,
Другою лапай на бягу ствол дрэва зловіць,
А заяц, скокнуўшы, арла перапаловіць,
І ў лесе застаецца частка з лапай правай,
А звер ляціць у поле з леваю крывавай.

Крапіцель вольны, дык вачыма вокал водзіць,
Шукае з крыкам зброю, але не знаходзіць,
Тым часам кулаком таўчэ, ідучы ў кроку
З Гервазым, ля яго трымаючыся боку,

Ды раптам бачыць сына Сака недалёка.
Той праваю рукой дзяржыць штурмак, а левай
Валочыць за сабой даўгое ў сажань дрэва
З той крамянёвай, гузаватай булавою
(Хрысціцель толькі можа ўзняць такую зброю).
Крапіцель, згледзеўшы здалёк сваё Крапіла,
Падбег, схапіў, пацалаваў, настолькі міла
Было яно яму; крутнуў — паветра ўзвыла.

Што потым вытвараў ён і ў якім памеры,
Дарма пяяць, не будзе, знаю, музе веры,
Так як не верылі і ў Вільні той жанчыне,
Што, стоячы на Вострай Брамы лукавіне,
Убачыла, як Дэеў, генерал пяхоты,
Ішоў з палком казакаў, адчыняў вароты
І як тут мешчанін, што зваўся Чарнабацкі,
Збіў Дэева і знішчыў цэлы полк казацкі.

Даволі, што было так, як прадбачыў Рыкаў:
Хістацца сталі егры, вось чутно ўжо з крыкаў.
Аж дваццаць тры валяюцца на смерць забітых,
Больш трыццаці ўжо мучацца ад ран адкрытых,
Шмат іх пабегла ў сад, за рэчку, ў хмель ад здзекаў,
І колькі ў дом убегла пад жанчын апеку.

Дык шляхта з перамогі ўся у захапленні —
Той цягне ўжо трафей, там бочку ўжо абселі —
Абставін бою, як відаць, не разумелі.
Адзін ксёндз Робак справу знаў (яму каноны
Не дазваляюць біцца), ды, жыццём наўчоны,
Ён радзіў, як лепш біць, і пляц абходзіў бою,
Каманду падаваў і вокам, і рукою
І зараз заклікаў, каб у адно злучацца,
На Рыкава ударыць, з рэштай расквітацца.
А Рыкаву праз пасланца паведамляе,
Што той жыццё, хто кіне зброю, захавае.
Калі ж прадоўжыць далей капітан змаганне,
То ўміг атрад акружаць, высекуць да-звання.

А Рыкаў не намерваўся прасіць пардону.
Сабраўшы ля сябе палову батальёна:

«За зброю!» — крыкнуў. Па загаду каітана
Ўміг зброя хруснула, даўно панабівана.
Ён крыкнуў: «Цэль!» Ствалы заззялі шнурам цэлым.
Скамандаваў: «Агонь чаргой!»— б'е стрэл за стрэлам.
Страляе той, той набівае, той наводзіць,
Свіст куль, затвораў трэск з канца ў канец праходзіць,
Шарэнга выгінаецца, як звер паўзучы,
Які махае спрытна сотняй ног бліскучых.

Хоць кожны з еграў быў ад спірту моцна п'яны,
Цаляць не мог ніхто, ды ўсё ж наносяць раны,
А той-сёй і заб'е. Праз момант двух Мацеяў
Падбілі, і адзін забіты з Баўтрамеяў.
А шляхта б'е ў адказ ім з некалькіх рушніцаў,
На шаблі з еграмі жадаючы счапіцца,
Старэйшыя спыняюць, кулі ж свішчуць густа,
Трапляюць, гоняць. На двары ўміг будзе пуста,
Па шыбах дому звоняць часта, б'юць па рамах.

Тадэвуш, што павінен быў сядзець пры дамах
З загаду дзядзькі, чуючы, што справы горай
Пайшлі, дык выбег, з ім пабег і Падкаморы,
Якому шаблю ўжо Тамаш прынёс нарэшце.
Спяшаецца, камандуе, як бой правесці.
Бяжыць, падняўшы шаблю, шляхта — побач, радам,
А егры сыпанулі ў іх куль цэлым градам.
Паў Вільбік, Ісаевіч, Брытва злёг ад раны.
Тады напад той бесталковы быў стрыманы
Мацеем з Робакам. Дык шляхта халадзее,
Здае назад. Такая маскалям падзея
Ўзнімае дух, і Рыкаў меціць адным махам
Ачысціць двор і апынуцца ўміг пад дахам.

«Фармуйся!— крыкнуў.— На штыкі! Наперад! Жвава!»
І ўміг уся шарэнга са штыкамі лавай
Хінецца, рушыцца і прыбаўляе кроку.
Дарма страляе шляхта спераду і збоку,
Палову ўжо двара прайшоў атрад з адвагай,
А капітан, на дзверы паказаўшы шпагай,
Крычыць: «Суддзя! здавайся! двор спаліць прыкажам!»
«Палі!— крычыць Суддзя.— Цябе ў агні падсмажым!»

О, двор Сапліцаўскі! Калі цяпер ты цэлы
І свеціцца між ліпаў твой будынак белы,
Калі там шляхты грамада, суседзі
Сядаюць за сталы Суддзёвы пры абедзе,
То Конаўкі здароўе п'юць абавязкова,
Бо каб не ён, даўно б не стала Сапліцова!

Дагэтуль Конаўка не меў яшчэ нагоды
Адвагі доказ даць, хоць першы ўстаў з калоды,
Хоць конаўку знайшоў у возе дарагую —
Штурмак свой мілы, куляў торбачку-другую,
Ды біцца не хацеў, казаў, што мала варты
Бывае нашча, дык ішоў шукаць паўкварты.
Да бочкі спірту падышоў, зачэрпнуў жменяй,
І ўжо калі пачуў, што выпіў болей-меней,
Паправіў шапку, конаўку сваю пагладзіў,
Памацаў кулю шомпалам, затвор наладзіў
І аглядзеў пляц бою. Бачыць, доўгай хваляй
Блішчаць штыкі і гоняць шляхту штораз далей.
Дык пачынае супраць гэтай хвалі плысці,
Дае нырца ў быллё, паўзе ў густэчы лісця
І пасярод дзядзінца ў крапіве знікае,
Хаваецца і Сака жэстам заклікае.

А Сак са штурмаком парог аберагае,
Бо ў гэтым доме недзе Зося дарагая.
І хоць не раз ад Зосі быў ён адапхнёны,
Цяпер жыцця не шкадаваў для абароны.

Вось егры ў крапіву ўступаюць роўным крокам...
Тут Конаўка даў стрэл. Штурмак ствалом шырокім
Пускае тузін куль разных па грознай хвалі.
Другі — пускае Сак. І маскалёў стрымалі —
Спалоханы засадай рад канцы звівае
Назад, а раненых Хрысціцель дабівае.

Гумно далёка — каб не рассыпаць народу,
Дык Рыкаў падбягае пад паркан гарода,
Трымае ўцекачоў, камандуе талкова,
Зноў ладзіць строй, ды толькі ўжо манерай новай.
Рыхтуе трохвугольнік вострым клінам з ходу,

А цэнтр абапірае аб паркан гароду.
І правільна зрабіў, бо конніца йшла здалі.

А Граф, якога егры ў замку пільнавалі,
Калі ад страху збегла варта, той парою
Атрад сваіх жакеяў конных вёў да бою —
Сам на чале, жалеза ўгору ўзняў з фасонам.
Тут Рыкаў закрычаў: «Агонь! Паўбатальёнам!»
Цераз ствалы ўзвілася нітка прамяніста,
І з чорных дулаў раптам свіснула куль трыста.
Трох з коней скінулі, адзін ужо забіты,
Паў графскі конь, зваліўся Граф. Тут крык сярдзіты
Узняў Гервазы, што не йнакш, як праглядзелі
Апошняга з Гарэшкаў (хоць і па кудзелі).
Ксёндз Робак быў бліжэй, за Графа забягае,
Прымае рану за яго, ўстаць памагае,
Адводзіць. Шляхце даў загады расступіцца,
Лепш меціцца, страляць ды кулямі скупіцца,
Хавацца за платы, за студню, за будынкі,
А Графу пачакаць больш зручнае хвілінкі.

Тадэвуш, зразумеўшы думку бернардына,
З-за студні паражаць стаў еграў каля тына.
Цвярозы быў і біў з двухстволкі вельмі ўдала,
(Ў манету ўскінутую ўверх, трапляў, бывала),
Дык немалую ворагу наносіць шкоду:
Спярша фельдфебеля са строю выбіў з ходу,
Пасля з двух дулаў двух сяржантаў зразу валіць —
Цаляе ў галуны, або па цэнтру смаліць,
Дзе штаб стаяў. Дык Рыкаў злы аж лае матку,
Нагамі б'е, кусае шпагі рукаятку.
«Маёр!— крычыць,— што робіцца з той банды!
Яны ж пакінуць наша войска без каманды!»

Дык Плут крычыць к Тадэвушу з вялікім гневам:
«Гэй, пан паляк, што там хаваешся за дрэвам,
Не трусь, выходзь на пляц і біся ганарова,
Так, як салдат». А той яму на гэта слова:
«Маёр! Калі ты рыцар гэткі знакаміты,
Чаго ж сядзіш грудзьмі салдацкімі прыкрыты?
Перад табой я не ўцяку. Вылазь з-за плоту,

Ты ў твар дастаў, я стукнуць маю йшчэ ахвоту!
Пашто ліць кроў! Між намі спрэчка і знявага,
Хай вырашаць яе ці пісталет, ці шпага.
А зброю выбірайце там любую самі,
А не, дык выб'ю вас, як тых ваўкоў у яме».
Пры гэтым выстраліў яшчэ і не змыліўся:
Паручнік каля Рыкава ўміг з ног зваліўся.

«Маёр,— прамовіў Рыкаў,— выйдзі на расправу,
Адпомсці ты яму за ранішнюю справу,
Калі ж бо іншы хто таго шляхцюру знішчыць,
Тады табе не ўдасца ганьбы век ачысціць.
Яго нам трэба, як мага, на пляц занадзіць —
Калі не можа куля, хай з ім шпага зладзіць.
«Люблю без стуку штуку, гэткую, што коле»,—
Казаў стары Сувораў. Выйдзі, брат, на поле,
Бо ён нас выб'е ўсіх. Глядзі, які дасужы».
Тады маёр прамовіў: «Рыкаў, мілы дружа,
Ты добра б'ешся шпагай, выйдзі, браце Рыкаў,
А не, дык мо б каго з паручнікаў паклікаў.
Маёр я, нельга мне кідаць сваіх салдатаў,
Каманда батальёнам, знаеш,— справа свята».
На гэта Рыкаў шпагу ўзняў, выходзіць смела,
Сказаў спыніць стральбу, махае хусткай белай.
Тадэвуша спытаў, на чым той хоча біцца,
Рашылі ў той жа міг на шпагах запыніцца.
Не меў Тадэвуш шпагі, а у час шукання
Прыскочыў збройны Граф, навёўшы замяшанне,
Бо крыкнуў: «Пан Сапліца! Справа тут не пана!
Вы йшлі супроць маёра, а на капітана
Я маю гнеў, бо ён у замак мой варваўся
(«Кажыце, пане: ў наш»,— Пратазы умяшаўся),
Ускочыў,— Граф працягваў,— на чале зладзеяў,
Ён, Рыкава пазнаў я, павязаў жакеяў.
Я дам яму, як і ў Сіцыліі далёкай
Бандытам даў каля скалы Бірбанта-рокка!»

Заціхлі ўсе, вакол спынілася стралянне,
Глядзяць ваякі на смяротнае спатканне:
Граф з Рыкавым падходзяць, звернутыя бокам,
Рукою правай пагражаючы і вокам,

Пасля адкрылі левымі свае галовы
І кланяюцца (звычай гэткі ганаровы:
Перад забойствам ветліва йшчэ прывітацца).
Вось шпагі ўжо сустрэліся разоў са дваццаць,
Вось рыцары ўзнімаюць ногі, на калена
Прыкленчваюць і ўскакваюць папераменна.
А Плут Тадэвуша прыкмеціў перад фронтам,
Дык стаў шаптаць яфрэйтару, што зваўся Гонтам
І славіўся стралком найлепшым у той роце.
«Ты бачыш,— мовіў,— тога, што стаіць пры плоце?
Калі яму ты кулю ўткнеш пад скабай пятай,
Чацвёрка серабром за гэта будзе платай».
Дык Гонт рыхтуе карабін у той жа хвілі,
Таварышы яго шынелямі прыкрылі.
Не ў скабу, а на чэрап ён наводзіць мушку,
Папаў, але прабіў капялюша вярхушку.
Тадэвуш аж крутнуўся. Тут Крапіцель з рада
Рвануўся к Рыкаву, а шляхта ўзвыла: «Здрада!»
Тадэвуш капітана засланіў, дык Рыкаў
Ускочыў да сваіх сярод пагроз і крыкаў.

Зноў кінуліся ў бой дабрынцы і літвіны,
Забыўшыся пра звады для такой хвіліны.
Ваююць, як браты, таго той выручае:
Дабрынскім цяжка, дык Падгайскі прыкмячае,
Касой сячэ, у гушчу еграў убягае.
Дабрынскія крычаць: «Няхай жывуць Падгаі!
Гарой, Літва! Хвала літвінам, брацця нашым!»
Скалубы, Брытву згледзеўшы, што бег бясстрашна,
Хоць ранены, крычаць з глыбінь крывавай буры:
«Гарой, Мацеі, Барткі! Хай жывуць мазуры!»
Так заахвоціўшыся, рвуцца штораз далей,
Хоць іх Мацей і Робак, як маглі, спынялі.

Калі на роту еграў бег натоўп народу,
Задумаў Войскі скіравацца ў бок гароду.
З ім разам асцярожна сунуўся Пратазы,
А Войскі ціханька даваў яму наказы.

Стаяла там за плотам блізка, поруч з садам,
Дзе Рыкаў абапёрты быў сваім атрадам,

Старая сырніца, ў зруб складзеная рэдкі
З брусоў скрыжованых, падобная да клеткі.
У ёй свяцілі копы сыраў яснай беллю,
А навакол на ветры сохлі звязкі зелля:
Валошак, чабару, рамонку і шалфею —
Лячэбныя Вайшчанкі на зіму трафеі.
Уверсе меў будынак сажні тры з паловай,
А ўнізе на калодзе ўспёрты быў дубовай,
Як буслава гняздо. Той слуп ужо крышыўся,
Падгніў ад старасці і значна нахіліўся,
Збіраючыся ўпасці. Ўжо Суддзі калісьці
Казалі, што не будзе з сырніцы карысці,
Што лепш яе раскідаць. Дык Суддзя паправіць
Яе рашыў і ўжо збіраўся пераставіць,
Але рамонт адцягваўся час некаторы,
Тым часам пад той слуп уткнулі дзве падпоры.
Так падмацованая вельмі нетрывала
Будыніна на строй маскоўцаў пазірала.

Вось Возны з Войскім к сырніцы падходзяць ззаду,
А кожны захапіў, як піку, жэрдку з саду.
За імі ўслед каноплі ахмістрыня топча
І кухарчук, хоць і малы, ды дужы хлопчык.
Прыйшоўшы, тычкі ўпёрлі ў слупа верх пахілы
І пхнуць будынак знізу, колькі маюць сілы,
Так сплаўшчыкі, як стане на мялі, віціну
Каламі доўгімі спіхаюць на глыбіну.

Слуп трэснуў, крышыцца... Вось сырніца ў палёце,
Вось б'е цяжарам дрэва і сыроў па роце
І раніць, забівае войска й камандзіраў.
Так зleглі ў кучу: дрэва, трупы, груды сыраў.
Абліты мозгам і крывёй, трохкутнік рвецца,
І ўжо Крапіла ў ім гудзіць, і Брытва ўецца,
Сцябае Розга, падбягае шляхта звонку,
Жакеі гоняць еграў, б'юць наперагонкі.

Вось толькі восем еграў і сяржант з адвагай
Бароняцца. К ім Ключнік бег, яны з увагай
Аж дзевяць дулаў на яго накіравалі —
Ён бег пад праменем Сцізорыкавай сталі.

Ксёндз, гэта згледзеўшы, забег яму дарогу,
Сам паваліўся і падбіў старому ногі.
Зваліліся якраз, як дружны залп раздаўся.
Як прасвістала волава, Гервазы ўзняўся,
Ўбягае ў дым, двум еграм голавы ссякае.
Бягуць другія, Ключнік гоніць, не чакае.
Яны бягуць дваром, Гервазы — іх слядамі,
Яны — ў гумно і нікнуць там, бы ў цёмнай яме.
І ён туды бяжыць, не думае спыніцца,
Прапаў у цемры, ды і там працягваў біцца,
Бо крык чуваць, на ўдар мяча чуваць адказы.
Урэшце сціхла ўсё. З'явіўся зноў Гервазы
З мячом крывавым.

Шляхта ўжо займае поле,
Разбеглых еграў гоніць, забівае, коле.
А Рыкаў б'ецца смела, на перагаворы
Не згодзен. Да яго падходзіць Падкаморы,
Узняўшы шаблю, і паважным кажа тонам:
«Пан капітан! Не зганьбіш чэсці ты пардонам,
Ты смелы рыцар, без ніякага сумнення,
Але пакінь дарэмнае супраціўленне,
Здай зброю нам, пакуль цябе не закалолі,
Жыццё і чэсць з табой, бо ты ў мяне ў няволі!»

І Рыкаў цэніць Падкаморага павагу:
Зрабіў паклон, аддаў яму у рукі шпагу,
Скрываўленую ўсю, і мовіў: «Эх, камраты!
Бяда мне, што не меў я хоць адной гарматы!
Сувораў праўду гаварыў мне: «Рыкаў, браце,
На ляхаў ідучы, пяршынства дай гармаце!»
Што ж, егры п'яныя былі! Плут піць дазволіў.
Ох, гэты Плут! ён сёння вельмі пасваволіў!
Ён дасць цару адказ, яго былі загады,
А я, пан Падкаморы, сябрам вам быць рады.
Ёсць прыказка у нас: каго хто моцна любіць,
Той, пане Падкаморы, тога моцна чубіць.
Падпіць вы малайцы і ў бітве не калекі,
Але над еграмі пакіньце ўрэшце здзекі».

На гэта Падкаморы шаблю узнімае,

Праз Вознага пардон агульны аб'яўляе.
Загад даў раненых пабраць, ачысціць поле,
А еграў абяззброеных браць у няволю.
Шукалі доўга Плута, ён жа, як забіты,
Ляжаў у крапіве, быллём ад вока скрыты.
Калі заціхла ўсё, ён выйшаў для разведкі.

Ў Літве наезд апошні меў канец вось гэткі.

КНІГА ДЗЕСЯТАЯ • ЭМІГРАЦЫЯ. ЯЦАК

Змест: Нарада пра выратаванне лёсу пераможцаў. Перамовы з Рыкавым. Развітанне. Важнае адкрыццё. Надзея.

Аблокі ранішнія тыя, што ў разбродзе
Плылі спярша, як птушкі чорныя, на ўсходзе
Штораз гусцелі і, ледзь сонейка апала
З паўдня, іх грамада паўнеба ўраз заслала
Вялізнай хмараю. Яна ўсё напаўзала,
Клубілася, гусцела і ніжэй звісала,
І, адарваная ад неба палавіны,
Разгорнутая, быццам ветразяў тканіны,
К зямлі ўвагнутая, ўвабраўшы ветры к ходу,
З паўдня праз неба паляцела ў бок заходу.

Быў момант цішыні, паветра ўсцяж стаяла
Маўкліва, глуха, бы з трывогі замірала.
І нівы збожжа, што пад ветрамі густымі
Зямлю кранали каласамі залатымі
І хвалямі кіпелі, сталі нерухома
І ў неба пазіралі ўздыбленай саломай.
І вербы ў зелені, таполі пры дарозе,
Якія перш, як плачкі ля труны ў знямозе,
Рукамі трэслі і ў паклонах гнулі станы
Ды з ветрам распускалі волас серабраны,
Цяпер, як мёртвыя, з азнакамі жалобы,
Стаяць без шолаху, накшталт сыпільскай Ньобы.
Асіна толькі шэпча лісцем сіваватым.

І статак, што звычайна ледзь брыдзе дахаты,
Цяпер бяжыць, прынук пастушых не чакае,
Кідае ежу і дамоў з травы ўцякае.
Бугай нагою землю рве, капае рогам
І гурт свой запалохвае рыканнем строгім.
Карова штораз то ўзнімае ў неба вока,
Разінецца ад дзіву і ўздыхне глыбока.
Вяпрук злуе, вішчыць, з дарогі ўбок ступае,
Крадзе снапы і цягне — на запас хапае.

А птаства ў лес схвалася, пад стрэхі, ў травы.
Адных варон над ставам бачан гурт рухавы,
Яны паважна ходзяць кучкамі і ўпары,
Кіруюць вочы чорныя ўбок чорнай хмары,
Высоўваюць сухія языкі ад рання,
Разводзяць крыллі ўбок, чакаючы купання;
Ды і яны, у прадчуванні навальніцы,
Ляцяць у лес, як хмара, што гарой імчыцца.
Апошняй ластаўка, нібы стралы ударам,
Прашые чэрава навісшай чорнай хмары
І валіцца, як куля.

Вось у гэтай хвілі
Крывавы жорсткі бой праціўнікі спынілі,
І ўсе хаваюцца пад стрэхі грамадою,
Цяпер паспешна пакідаючы пляц бою
Для барацьбы стыхіяў.

Зямля на захадзе, дзе сонца залаціла,
Яшчэ панура-жоўтай чырванню свяціла.
А хмара, быццам сеці, распускае цені,
Ляціць за сонцам, заграбае ўслед праменні,
Нібы глынуць яго хацела прад заходам.
Вось віхры раз за разам прасвісталі сподам,
Ляцяць і кроплі дажджавыя раскідаюць,
Якія круглым, ясным градам ападаюць.

І раптам віхры збіліся, ўзяліся ўполы,
Качаюцца і ўюцца з посвістам вясёлым,
Ваду у ставе муцяць, кружаць па заставах,
На луг апалі, свішчуць у лазе і травах.

Трашчыць галлё лазы, ўзлятаюць траў пакосы
На вецер, быццам жменяй вырваныя косы
У гурце з кудрамі снапоў. Вятры ўжо выюць,
Спадаюць на раллю, качаюцца ў ёй, рыюць,
Рвуць скібы — трэцяму вятрыску б'юць праломы,
Што вырваўся з раллі слупамі чарназёму,
Ўздымаецца, рухомай пірамідай крочыць,
Ілбом грунт круціць, зоркам гоніць пыл у вочы,
Штокрок шырэе, дзьмецца ў страшную фігуру
І той трубой агромнай аб'яўляе буру.
Аж вось з усім хаосам вод расхваляваных,
Пяску, сукоў, лістоў, саломы, траў нарваных
Віхры на лес напалі і па нетрах пушчы
Мядзведзямі ўзраўлі.

А дождж палеткі плюшчыць —
Густы, як з сіт. Раўнулі раптам громы,
Зліліся зразу кроплі ў струны і без стомы
Касою доўгай вяжуць землю і нябёсы,
А часам бухнуць, як з вядра, вады палосы.
На землю і на неба змрок густы садзіцца,
Чарнейшая за ноч іх крые навальніца.
Часамі краявід прарвецца ўдаль бясконца —
Анёл грамоў, накшталт вялізарнага сонца,
Рассвеціць твар, ды зноў, акрыты цьмой грубою,
Захлясне перуном хмар дзверы за сабою.
Ізноў мацнее бурны лівень той навальны
І змрок грубы, густы, амаль што дакранальны.
Зноў ціхне дождж, задрэмле гром, ды па хвіліне
Прачнецца, зноў раўне і зноў вадою хлыне.
Аж вось заціхла ўсё, і толькі дрэвы
Шумяць ля дому разам з хлюпатам залевы.

І добра, што ў дзень гэты не было зацішша,
Бо навальніца, цемрай бою пляц акрыўшы,
Дарогі заліла, масты сарвала з рэчак
І аддзяліла двор ад вёсак і мястэчак.
Дык пра здарэнні грозныя ў двары Сапліцы
Адразу вестка не магла яшчэ прабіцца,
А шляхты лёс залежны быў ад таямніцы.

Ў Суддзі ў пакоі — важныя перагаворы.
Там ксёндз ляжаў у ложку стомлены і хворы,
І акрываўлены, ды ў памяці быў поўнай.
Загад яго Суддзя спаўняе безадмоўна:
Перш Падкаморага і Ключніка паклікаў,
І дзверы зачыняюць, як прыйшоў і Рыкаў.
Гадзіну ўжо трывала тайная размова,
Урэшце Рыкаў тут сказаў такое слова,
Адкінуўшы капшук, дукатамі напханы:
«Панове Ляхі, ёсць між вамі сказ, мне знаны,
Што кожны рускі — злодзей, хабарнік прапіты.
Дык знайце ж, што маскаль, якога зваць Мікіта
Мікітыч Рыкаў, ротны капітан, меў восем
Медаляў, тры крыжы, і гэта помніць просім!
Медалі за Ачакаў і за Ізмаілаў,
Вось за бітву пад Нові, вось за Прэйсіш-Ілаў,
А гэты вось ад Карсакова. За адвагу,
Апроч таго, я атрымаў таксама шпагу
І ад фельдмаршала аж тры пахвал ступені
Ды царскіх грамат дзве, чатыры адзначэнні —
Ўсе на пісьме».

«Але, але, мой капітане,—
Азваўся Робак,— дык на чым жа справа стане,
Калі не згодзішся? Бо ты ж даваў нам слова
Уладзіць справу».

«Слова даў і дам нанова,—
Сказаў зноў Рыкаў,— мне не трэба вашай згубы,
Я чэсны чалавек, а вы, паны, мне любы,
Што вы вясёлыя, ахвочы да напіткаў
І людзі смелыя, і здатныя да біткі.
У нас ёсць прыказка: той, хто на возе едзе,
Бывае і пад возам; той, хто папярэдзіў,
Назаўтра — ззаду. Б'еш сягоння, заўтра — біты.
Злаваць за гэта? Заўтра, можа, будзем квіты.
Адкуль бы чалавек набраў злабы такоўскай,
Каб гнявацца за ўсё? У бітве Ачакоўскай
Злягло ў нас шмат, пад Цюрыхам змялі пяхоту,
Пад Аўстарліцам жа маю скрышылі роту,
А перш Касцюшка ваш пасек ля Рацлавіцаў —

Я быў сяржантам — косамі мой ўзвод. Адбіцца
Я змог ля Мацеёвіц. У той бітве страшнай
Двух важных шляхціцаў забіў я ў рукапашнай.
Адзін быў Макраноўскі, ён за нашым валам
Касою кананіру ссек руку з падпалам.
Ой, ляхі вы! Айчызна! Я ўсё гэта знаю,
Я, Рыкаў. Тут загад цара, я праў не маю.
Нашто нам ляхі? І Маскоўшчыны нам годзе!
Хай Польшча будзе ляху! Што ж, як цар не згодзен».

Суддзя сказаў на гэта: «Пане капітане,
За чэснасць вашу вас мы маем у пашане,
І ўсе вакол сапраўднага ў вас бачаць мужа.
Не злуй на нас за падарунак, добры дружа,
Цябе мы скрыўдзіць не хацелі, а дукаты
Пасмелі даць, бо чалавек ты ж небагаты».

«Ах, егры!— ўскрыкнуў Рыкаў,— гэткія салдаты!
Мая ўся рота! І ўсё Плут тут вінаваты!
Ён камандзір, перад царом адкажа строга.
Вы ж гэтыя грашы схавайце, дзеля Бога.
Я маю грош мой сціплы царскага служакі,
І хопіць мне на пунш і люлечку табакі.
А вас люблю, вось з вамі вып'ю, пагуляю.
Паем, пагутару і гэтак пражываю.
Я вас абараню, як следства распачнецца,
Даю вам слова — справа на ваш бок схінецца.
Мы скажам, што прыйшлі сюды дзеля візіту,
Што тут сабе гульнулі, кожны быў падпіты,
А Плут «агонь» каманду крыкнуў выпадкова —
Бітва! І батальён разбілі, і гатова.
Вы ж следства мажце золатам, дзе толькі можна,—
Круціцца будзе. Але толькі асцярожна:
Казаў я шляхціцу таму з даўгой рапірай,
Што першы Плут, бо ён жа быў тут камандзірам.
А Плут жывы, ён можа так загнуць кручочак,
Што згінеце, бо гэта хітранькі паночак.
Яму заткніце горла банкавым білетам.
Дык што ж вы, пан з мячом, падумалі аб гэтым?

Былі ўжо ў Плута? Што і як ён вам парадзіў?»

Гервазы аглянуўся, лысіну пагладзіў,
Кіўнуў рукой нядбала, гэтым знак падаўшы,
Што справу скончыў. Капітан аднак, устаўшы,
Дапытваўся: «Што ж кажа Плут? Маўчаць захоча?»
А Ключнік злы, што Рыкаў гэтак лезе ў вочы,
Нагнуў вялілі палец да падлогі змрочна,
Пасля махнуў рукою. Гэтым відавочна
Хацеў пытанні скончыць і сказаў: «Вось слова,
Што змоўчыць Плут! Закончана яго размова!»
І хруснуў пальцамі, пасля спусціў далоні,
Як бы ўсю таямніцу збіў з іх у разгоне.

Той змрочны жэст усе ў пакоі зразумелі,
Глядзелі навакол, прагаварыць не смелі,
І доўгі час трывала гэткае бязмоўе.
Азваўся Рыкаў: «Воўк цягаў на безгалоўе!»
«*Requiescat in pace*»,— мовіў Падкаморы.
«Відаць,— Суддзя сказаў,— па Божым прыгаворы,
Ды я не вінен, я не ведаў гэтай справы».

Ўзарваўся ксёндз з падушак бледны, але жвавы.
Зрок скіраваў на Ключніка і ў неспакоі
Прамовіў: «Грэх забіць палоннага, без зброі!
Хрыстос вучыў не крыўдзіць помстаю нікога!
Ой, Ключнік! Цяжка ты адкажаш перад Богам.
Адно ёсць апраўданне,— іншым мовіў тонам,—
Калі не з помсты ты, а ... *pro publico bono*».
Дык Ключнік і рукой, і галавы наклонам,
Міргаючы патакваў: «*Pro publico bono!*»

І больш не ўспаміналі пра маёра Плута.
Дарма назаўтра кожны абышлі закутак,
Дарма назначылі за труп узнагароду,
Маёр бясследна знік, нібы ўваліўся ў ваду.
Аб тым, што сталася з ім, розна гаварылі,
Ды праўды ні тады, ні потым не адкрылі.
Пыталі ў Ключніка, ды той аднакім тонам
Усім адказваў толькі: «*Pro publico bono!*»
Хоць Войскі нешта ведаў, ды пад словам чэсці
Маўчаў і на ніштo умеў адказы звесці.

Пасля размовы выйшаў з кабінета Рыкаў,
А ксёндз цераз Суддзю ўсіх змагароў паклікаў.
Да іх прамовіў Падкаморы з асцярогай:
«Браты! Бог нам памог, за намі перамога,
Ды я павінен вам усім сказаць адкрыта,
Што справа гэтая не будзе нам забыта.
Зблудзіліся мы ўсе, і ўсе мы вінаваты:
Ксёндз Робак, што навіны нёс нам ранавата,
А Ключнік з шляхтаю, што кепска зразумелі.
Вайна пачнецца не тады, як мы б хацелі.
Тым часам, хто больш дзейна вёў сябе ў змаганні,
Таму падумаць зараз трэ' аб развітанні,
Бо ў Княства уцякаць з вас многім давядзецца.
Так вось Мацей, які Хрысціцелем завецца,
Тадэвуш, Брытва, Конаўка, ну і другія
За Нёман хай нясуць галовы дарагія.
А мы тут на адсутных звальваць будзем віны
І на Плута, бо хопіць нам тут цыганіны.
Бывайце, не надоўга, бо ўсё ж ёсць надзея,
Што нам вясной зара свабоды заяснее
І край, што вас сягоння гоніць у вандроўку,
Як збаўцаў, хутка будзе сустракаць вас зноўку.
Суддзя ўсё, што вам трэба, дасць вам на дарогу,
І я грашыма акажу вам дапамогу».

Было ўсім ясна: Падкаморы добра радзіў,
Бо хто з царом хоць бы адзін раз не паладзіў,
Той з ім ужо не змірыцца ніколі шчыра
І змушаны ці біцца, ці згніе ў Сібіры.
Дык у маўчанні сумным азірацца сталі,
Ўздыхнулі і галовамі ўсе züківалі.

Хоць наш зямляк, у чым усе даўно ўжо згодны,
І любіць больш жыцця і шчасця край свой родны,
Аднак яго пакінуць згодзіцца заўсёды,
Гатоў цярпець нястачы, здзек даўгія годы,
З людзьмі і лёсам ваяваць і ўсё падужаць,
Калі ў ім ёсць надзея, што радзіме служыць.

Дык заявілі ўсе, што выехаць гатовы,
Ды толькі Бухман не згаджацца меў асновы.

Разважны Бухман у змаганне не ўмяшаўся,
Але ў народзе голас свой падаць стараўся.
Праект знаходзіў добрым, толькі перайначыць
Хацеў яго, развіць, больш ясна растлумачыць,
А перш за ўсё яшчэ камісію назначыць,
Якая б эміграцыі раскрыла мэты,
Умовы, спосабы і іншыя сакрэты.
На жаль, сягоння шляхта часу мела мала,
Таму з тых Бухманавых рад не скарыстала.
Развітваюцца ўсе, каб у дарогу рушыць.

Суддзя стрымоўвае ў пакоі Тадавуша,
Ксяндзу гаворыць: «Расказаць намер я маю
Табе, што з дня ўчарашняга напэўна знаю,
Што наш Тадэвуш закаханы шчыра ў Зосю.
Хай перад выездам рукі яе папросіць.
Пытаў я ў Талімэны — не перашкаджае,
І Зося волю нашу згодай пацвярджае.
Няма як павянчаць іх сёння ў гэтай хвілі,
Дык можа б мы іх, браце, зараз заручылі,
Таму што сэрца маладое ў падарожных,
Як ведаеш, спакусаў многа мае розных.
А вось ужо, хоць маладому, пры пярсцёнку
Трудней забыцца будзе, што пакінуў жонку,
І так памалу ў ім гарачка прамінае,—
Такую сілу заручальны персцень мае.

Я сам афект вялікі меў таму год трыццаць
Да панны Марты, а дагэтуль не забыцца.
Былі заручаны мы, ды з Божай волі
Не суджана было нам мець шчаслівай долі —
Асіраціла беднага мяне Вайшчанка,
Майго прыяцеля дачушка, Грэчашанка,
І не пакінула на памятку нічога,
Апроч вось гэтага пярсцёнка залатога.
Дык гляну на яго, і мігам набягае
Яна на думку мне, і Бог мне памагае
Быць верным ёй і не забыцца век той страты.
Вось зараз я ўдавец, хоць і не быў жанаты
І хоць у Войскага і ёсць дачка другая,
Падобная да той, што мне так дарагая».

Пры гэтым, глянуўшы на персцень чулым вокам,
Слязу абцёр і ад душы ўздыхнуў глыбока.
«Дык як, заручым іх?—спытаў.— Бо ёсць прычыны:
Ён любіць і ёсць слова цёткі і дзяўчыны».

Але Тадэвуш падбягае ўсхваляваны
І кажа: «Ўдзячны я вам, дзядзечка каханы,
Што аб маім вы шчасці гэткі клапатлівы.
Ах, дзядзя! Невымоўна быў бы я шчаслівым,
Каб Зося сёння заручылася са мною,
Каб знаў, што будзе калісь жонкаю маёю,
Але скажу адкрыта: гэтае дзяўчыны
Пакуль што я не варт, на гэта ёсць прычыны...
Больш не пытайце. Зося ж, калі час назначыць
Чакаць, дык можа ўжо мяне другім убачыць,
Мо трохі лепшым буду, больш кахання вартым,
Даб'юся славы мо ў змаганні тым упартым.
Магчыма, хутка вернемся ўсе з вандравання,
Тады прыпомню, дзядзя, ваша абяцанне,
Тады, прыкленчыўшы, зноў Зосю прывітаю,
Застаўшы ж вольнаю, рукі ў яе спытаю.
А зараз жджэ мяне вялікая дарога,
І Зося можа палюбіць яшчэ другога.
Яе я звязваць не хачу, не маю права,
Не заслужыў я гэтага, і ўся тут справа».

Калі ён так з пачуццем гаварыў і з жарам,
Гарэлі шчокі юнака душы пажарам,
Як ягады, ў вачах дзве перлы зіхацелі
І ўніз з блакітных зрэнак хутка паляцелі.

Ды Зося, зацікаўлена, з глыбінь альковы
Сачыла за напрамкам гэтае размовы
І чула, як Тадэвуш проста, ясна, смела
Прызнаўся, што кахае. Сэрца задрыжэла
Ў яе, як слёзы ўбачыла ў вачах хлапчыны,
Ды зразумець была не ў сілах той прычыны,
З якой ён пакахаў і зараз пакідае.
Куды паедзе? Зося ж тога не жадае!
Вось сёння першы раз пачула нечакана
Вялікую навіну, што была каханай.

Пабегла к хатняму алтарыку святому,
Ўзяла іконку, ладанку — святыню дому.
На тым абразіку — святая Генавэфа,
А ў ладанцы рэліквія свяцейшага Юзэфа,
Апякуна ўсіх тых, хто хоча заручыцца,
І тыя святасці прыносіць у святліцу.

«Вы едзеце, так хутка? Я вам на дарогу
Дам дробны падарунак і перасцярогу:
Каб з гэтаю рэліквіяй не разлучацца,
Таксама і пра Зосю нельга забывацца!
Хай Бог вам у ва ўсім і ўсюды дапаможа
І хутка верне вас дадому з падарожжа».
Галоўку ўгнула, змоўкла і ледзь вачаняты
Самкнула, пырснуў з іх струменьчык слёз багаты.
І стоячы ля мілага ёй чалавека,
Брыльянты слёз губляла Зося з-пад павекаў.

Прыняў Тадэвуш дар, пацалаваў ёй рукі
І мовіў: «Пані! Час ужо настаў разлукі,
Бывай здарова, не забудзь, прашу маліцца
І за мяне!..» На болей слоў не мог здабыцца.

Ды Граф і Талімэна тут, над спадзяванне,
Угледзелі, ўвайшоўшы, гэта развітанне.
Граф быў узрушан, кінуў вокам к Талімэне
І мовіў: «Колькі ж прыгажосці ў гэтай сцэне,
Калі душа байца і маладой дзяўчыны,
Як лодка з караблём развітвацца павінны!
Ніколі сэрца так не можа разгарацца,
Як пад прымусам ад другога адрывацца.
Час, быццам вецер: ён малую свечку здзьмухне,
Але пажар вялікі з ветру не патухне.
Здалёку і ў мяне лепш сэрца разгарыцца.
Я вас сапернікам лічыў, мой пан Сапліца.
Памылка гэта сталася прычынай звады
І змусіла нас ажно ў шпаг шукаць парады.
Памылку бачу: ты ўздыхаў к пастушцы мілай,
А мне вось гэта німфа сэрца паланіла.
Ў крыві варожай хай патонуць гневы нашы,
Не будзем зброі на сябе ўзнімаць бясстрашна,

Няхай жа спрэчкі ў іншым скончацца змаганні:
Ваюйма за трываласць нашу у каханні!
І я, як вы, прадмет пакіну сэрцу мілы.
Спяшаймася на страшны бой і з поўнай сілы
Ваюйма між сабой цярплівасцю і ўвагай,
Ганяйма ворага рукою дужай і адвагай».
І тут жа скіраваў зрок чулы к Талімэне,
Яна ж не знала, што сказаць ад задзіўлення.

«Мой Граф,— сказаў Суддзя,— а вам дык не канечне
І выязджаць. Вы можаце сядзець бяспечна,
Бо ўрад са шляхтай беднай можа распраўляцца,
А вам, пан Граф, зусім няма чаго баяцца —
Знаёмствы маеце і досыць вы багаты,
Каб суд купіць і не папасціся за краты».

«Не, гэта ўсё з маім характарам не згодна.
Няма як быць каханкам, дык мне неабходна
Праславіцца, і я не пашкадую працы,
Каб мне, хоць сэрцам бедны я, героем стацца».

«Хто ж вам,— спытала Талімэна,— забароніць
Кахаць і быць шчаслівым?» «Лёс мяне мой гоніць,—
Прамовіў Граф,— прадчуццяў цемра рухам тайным
Вядзе мяне ў чужыну к справам надзвычайным.
Скажу, што сёння я збіраўся Талімэне
Развесці на Гімена алтары гарэнне,
Ды мне якраз навуку даў юнак вось гэты
Адмовай ад рукі каханае кабеты,
Каб бегчы сэрца правяраць у перашкодах
Нясталых лёсаў і ў вайны цяжкіх нягодах.
Маёй пачатак новай эры недалёка!
Грымела зброяю маёй Бірбанта-рокка,
Няхай жа і па Польшчы льецца тая слава!»
І па эфесе шпагі тут ударыў жвава.

«Што ж,— мовіў Робак,— нельга гэткую ахвоту
Спыняць, дык едзь, і можаш там узброіць роту,
Як той Патоцкі (што ўсю Францыю здзівіла),
Мільён дзяржаве даў, ці следам Радзівіла,
Які, прадаўшы шмат сваіх шэдэўраў панскіх,

Здаў грошы на ўзбраенне двух палкоў уланскіх.
Едзь, едзь з грашыма, бо людзей там досыць маем,
А грошай мала ў Княстве, едзь, благаслаўляем».

Дык Талімэна Графу ў вочы паглядае
І кажа: «Бачу, што ніхто вас не стрымае,
Мой рыцар! Апынуўшыся ж на ратным полі,
Зірні на гэты вось тваёй каханкі колер!
(І тут зняла ад сукні стужку, ўміг зрабіла
Какарду і на грудзі Графу прышпіліла.)
Хай гэты знак вядзе цябе на стрэлы, пікі
І на агонь гармат — на подзвіг твой вялікі.
Калі ж сябе ваеннай славай упрыгожыш
І лаўрамі бяссмертнымі абсыпаць зможаш
І акрываўлены свой шлем, і рэшту зброі,
Зірні на гэту вось какарду той парою,
Руку успомні, што яе прымацавала».
Тут падала руку. І Граф, як выпадала,
Прыкленчвае, цалуе, а яна ля вока
Дзяржыць хусціну, а другім глядзіць звысока
На Графа: ці ўсё гэта праўда? ці магчыма?
І, уздыхаючы, пацепвала плячыма.

Ды тут Суддзя сказаў: «Ідзі, Граф, бо ўжо позна».
А ксёндз: «Даволі, ўжо!— прамовіў з мінай грознай.—
Спяшайцеся!» Вось гэтак ксёндз з Суддзём Сапліцам
Іх праганяюць і змушаюць разлучыцца.
Тадэвуш у слязах, на доўгую разлуку
Абняўся з дзядзькам і ксяндза цалуе ў руку.
А Робак да грудзей прыціснуў яго скроні,
Злажыў на галаве накрыж свае далоні,
На неба глянуў і сказаў: «Сынок мой! З Богам!»
І плакаць стаў... Тадэвуш скрыўся за парогам.

«Як так?— спытаў Суддзя.— І ты яму нічога
Не скажаш зараз, нават і перад дарогай?»
«Не,— ксёндз сказаў,— не дам яму ніякіх знакаў
(І тут, закрыўшыся рукамі, доўга плакаў).
Няхай ад беднага лепш будзе гэта скрыта,
Што бацька змушан быў шмат год, накшталт бандыта,
Хавацца ад людзей. Сказаць я марыў,

Ды Богу за грахі зраблю яшчэ ахвяру».
«Тады пара,— сказаў Суддзя,— падумаць штосьці
І аб сабе, бо хвораму ў тваім узросце
Няма як з іншымі збірацца у вандроўку.
Ты ж мне казаў, што ўжо даўно нагледзеў схоўку,
Скажы мне, дзе яна? Вунь брычка ўжо гатова,
Някепскім сховам будзе хатка леснікова».
А Робак галавой крутнуў: «Да заўтра рана
Ёсць час,— сказаў,— пашлі, мой браце, па плябана,
Каб як мага хутчэй прыбыў сюды з прычасцем,
Адпраў усіх, астанься з Ключнікам — на шчасце,
Ён тут. І дзверы зачыні».

Яго наказы
Суддзя ўсе споўніў, сеў на ложак, а Гервазы
Стаіць, апёршы локці на мячы, а скроні,
Прыгнуўшыся, заціснуў у свае далоні.

А Робак, перш чым мовіць, Ключніка аблічча
Праверыў пільным вокам моўчкі, таямніча.
І як хірург перш мяккую руку ўскладае
На цела ў месцы, дзе яго прабіць жадае,
Так Робак быстрыню сваіх вачэй злагодзіў
І імі па Гервазага вачах праводзіў,
Ўканцы, як бы рашыўшыся, ўваткнуць нож зразу,

Прыкрыў рукою вочы і пачаў ад сказа:
«Я — Яцак Сапліца...»

І Ключнік, гэта слова
Пачуўшы, згорбіўся і, корпуса паловай
Нахілены наперад, звіс, прыгнуўшы ногі,
Як камень, спынены ў палёце ў паўдарогі,
Тапырыў вусы, вусны расчыняў шырока,
Грaзіў зубоў аскалам, страшным блескам вока,
Рапіру выпусціў, пасля каленьмі сціснуў
Каля зямлі, рукой хапаў, і меч павіснуў
Ля ног, з'язджаў назад, што раз распрасціраўся
І ў розныя бакі канцом сваім ківаўся.
Гервазы быў, як рысь паранены, што хоча
З густэчы дрэва кінуцца стральцу у вочы:

Кніга сёмая
Гайда на Сапліцу!

Книга седьмая
Гей на Соплиц!

Księga siódma
Hajże na Soplicę!

Ўздымаецца клубком, мармыча, зрок крывавы
Іскрыцца, вусы ходзяць, б'ецца хвост рухавы.

«Нішто мяне ўжо ўстрашыць,— ксёндз сказаў,— не можа,
Бо ўжо я, пан Рэмбайла, пад рукою Божай,
Але ў імя таго, які свет грэшны збавіў,
Благаслаўляў сваіх забойцаў і адправіў
Бандыта ў рай, прашу цябе, апамятайся
І выслухаць расказ мой гэты пастарайся.
Сам прызнаюся: я для сэрца аблягчэння
Прасіць хачу, хоць мо й не будзе, прабачэння.
Паслухай споведзі маёй, пасля са мною
Рабі што хочаш». Рукі склаў перад сабою,
Як пры малітве. Ключнік адступаў з вачыма
Адкрытымі, рукой біў лоб, сціскаў плячыма.

А ксёндз тут распачаў сваё апавяданне,
Як жыў з Гарэшкам, пра вялікае каханне
З яго дачкой і ад таго ўсе непаладкі.
Ды гаварыў бязладна, і былі выпадкі,
Што скаргі і папрокі споведзь абрывалі,
І быццам ён канчаў, ды зноў працягваў далей.

А Ключнік, знаючы падзеі ўсе дакладна,
Усю аповесць, што вялася так бязладна,
Парадкаваў, забытае ішло на памяць.
Але Суддзя ўсяго не мог дакладна ўцяміць.
Абодва слухалі, спусціўшы ўніз галовы,
А ў Яцка ўсё цяжэй зляталі з вуснаў словы,
І часта запынаўся.

* * *

«Ты ж ведаеш, Гервазанька, як Стольнік проста
І часта заклікаў мяне, узносіў тосты,
Крычаў не раз пры ўсіх — таго мне не забыцца,
Што друг яго найлепшы — гэта я, Сапліца.
А як ён абдымаў! Здавалася, са мною
Гатоў ён падзяліцца нават быў душою.
Прыяцель ён? Ён знаў, як там усё гарэла
Ў душы маёй...

* * *

Тым часам шэпты сталі навакол кружыцца,
Такі-сякі казаў мне: «Эй ты, пан Сапліца,
Дарма стараешся, саноўніка парогі,
Не йначай, завысокія на Яцка ногі!»
Смяяўся я, нібыта я ў нішто магнатаў
Стаўляў, а з імі дочкі ўсіх арыстакратаў,
Што быццам к ім хаджу па дружбе на гулянкі,
А ў жоны не вазьму другой, апроч шляхцянкі.
Але ў душу калолі гэтакія жарты.
Я малады быў, ведаў, колькі быў я варты
У нас, дзе шляхціц побач мог з арыстакратам
Стаць каралеўскае кароны кандыдатам!
Тэнчынскі ж некалі і ў каралеўскім родзе
Прасіў рукі і атрымаў яе па згодзе.
Імя Сапліцы горшае, скажы адкрыта,
Крывёю, службай для Рэч Паспалітай?

* * *

Як лёгка можна шчасце знішчыць чалавеку
За раз, і не паправіш на працягу веку!
Хапіла б толькі Стольніка на тое згоды,
І мы былі б шчаслівымі даўгія годы!
Мо жыў бы сёння ён тут пры сваім дзіцяці,
Пры Еве дарагой, і пры удзячным зяцю
І ўнукаў калыхаў бы з поўным супакоем,
А так, вось бачыш што? Загублены мы двое,
І сам — забойства гэта — і ўсіх бед прычыны,
І ўсе мае пазнейшыя грахі і віны...
Я абвіняць не ў праве, я свой гнеў пакінуў,
Я абвіняць не ў праве — праз мяне ён згінуў,
Але і ён...

* * *

Каб раз ужо адказ мне пэўны даў адкрыта,
Бо знаў пачуцці нашы, каб маіх візітаў
Больш не прымаў, хто знае, мо б я пасварыўся,
Пагневаўся, паехаў, болей не з'явіўся.
Але ён тут прыдумаў хітры план і новы:
Аб тым, як быццам, не магло быць мовы,
Каб я пасмеў пра сувязь вымавіць два словы.

А я яму патрэбны быў, бо у пашане
Быў я і ў шляхты, і ў магнатаў пры спатканні.
Дык ён, нібы маіх пачуццяў не заўважваў,
Прымаў мяне, як і даўней, са мной расхаджваў,
Прасіў часцей наведваць. А як толькі ў залі
Мы заставаліся удвух, уміг вязалі
Мае пачуцці, просьбы, план ужо гатовы
Яго сумысля абыякавыя словы
Пра сеймікі, суды, пра паляванні...

* * *

Не раз за чаркамі, пачуццям даўшы волю,
Ён кляўся ў дружбе, абдымаў мяне да болю,
Бо я патрэбны быў са зброяю ці ў сойме.
Калі я мусіў абдымаць яго, хто ж пойме,
Якая злосць ва мне кіпела! Ў вуснах сліну
Трымаў, рука сціскала шаблю. Думаў, кіну
Ўсё гэта, плюнуўшы на дружбу ваяўніча,
Ды Ева, бачачы мой зрок, маё аблічча,
Угадвала, не знаю як, што ўсё кіпела
Ва мне. Глядзела з просьбай на мяне, бляднела.
А гэта ж галубочак быў такі лагодны,
І зрок яе быў гэткі ветлівы, пагодны!
Такі анёльскі, што спыняў я пыл імклівы,
Не меў адвагі гневацца, сядзеў маўклівы.
І я, ва ўсёй Літве задзіра ўсім вядомы,
Перад якім дрыжалі панскія харомы,
Які не толькі Стольніка б не пабаяўся,
А нават каралю у крыўду б мо не даўся,
Што ў шал мяне прыводзіла любая спрэчка,
Я ў той час злы, п'яны маўчаў, нібы авечка!
Як бы *Sanctissimum* угледзеў!

* * *

Ці раз збіраўся сэрцам я яму адкрыцца,
Унізіцца да просьбаў перад ім, скарыцца,
Ды, глянуўшы у вочы, сустракаў пагляды
Халодныя, як лёд. Дык сам зноў быў не рады
Сваім пачуццям і стараўся зноў упарта
Аб іншых справах гаварыць ці строіць жарты.
Ўсё гэта, праўда, з гонару, каб мне не ўнізіць

Сапліцаў прозвішча, каб толькі не прыблізіць
Сябе да пана і не атрымаць адмовы,
Бо колькі ж паміж шляхтаю было б размовы,
Каб ведалі, што я, Яцак...

* * *

Гарэшкі за Сапліцу дзеўкі не аддалі!
Мне, Яцку, чорнай поліўкі на стол падалі!

Ўканцы, не ведаючы, што і як уладзіць,
Надумаў я са шляхты полк малы зграмадзіць
І, кінуўшы павет свой і свой край каханы,
Прабрацца ў бок Масквы ці дзе на басурманы,
І ваяваць. Паехаў я на развітанне
Да Стольніка з надзеяй, што калі ён гляне
На сябра даўняга, якога у пашане
Ўсё ж меў за вернасць і вялікія карысці,
Які вось зараз хоча выехаць кудысьці,
Дык можа ўзварухнецца ў ім пачуцце трошкі
І мо пакажа ён мне, як слімак той рожкі,
Крыху душы людской!

Ах, той, хто хоць крыху для сябра сэрца мае,
Хоць іскрачку пачуццяў у душы хавае,
Дабудзе тую іскрачку пры развітанні,
Як аганёк жыцця апошні пры скананні!
Калі апошні раз над сябрам схіліць скроні,
То вока найцвярдзейшае слязу аброніць.

* * *

Бядачка, чуючы, што еду, пабялела,
Як труп, звалілася без памяці — самлела.
Прамовіць не магла і колькі мела сілы,
Душыла страшны плач — такі я быў ёй мілы!

* * *

Я помню, першы раз тады слязьмі заліўся
Ад радасці і роспачы. Пра ўсё забыўся
І думаў кінуцца старому проста ў ногі
І віцца вужам, і крычаць: «Вярні з дарогі,
Вазьмі за сына ці забі!» А ён халодны,

Як з солі слуп, стаў весці ветліва, нягодны,
Гаворку, ды пра што? Пра доччына вяселле!
У гэткай хвілі! О, Гервазы, ты ж у целе
Душу людскую маеш!

Кажа: «Пан Сапліца,
Якраз ка мне прыехаў сват Кашталяніцаў.
Ты сябра мой, што скажаш мне аб гэтых сватах?
Дачка ж мая прыгожая, з сям'і багатай,
Каштэлян Віцебскі, як знаеш, у сенаце
Пачэснае займае крэсла! Дык як, браце?»
Зусім не памятаю я свайго адказу,
Здаецца, моўчкі выбег, на каня сеў зразу!»

* * *

«Ты, Яцак,— мовіў Ключнік,— мудрыя прычыны
Знаходзіш, ды твае не зменшацца тым віны!
Здаралася ж ужо, і то не раз на свеце,
Што дочку караля ці пана на прыкмеце
Хто меў, дык думаў, як схапіць яе, украсці,
Адкрыта помсціць. Але хітра так напасці
І пана польскага ў адно забіць з Масквою!»

«Не быў я ў змове!— ксёндз пярэчыў галавою.—
Браць гвалтам? Мог бы я яе з-за крат, з-за клямак
Забраць, разбіць бы мог у пыл яго той замак!
Я Добрынь меў з сабой і іншыя засценкі.
Ах, каб яна была, як іншыя паненкі,
Здаровая! Калі б уцёкаў і пагоні
Цяжары вынесці магла, каб зброя, коні
Яе не страшылі, не ждаў бы я й хвіліны!
Але ж яна была, як чэрвік матыліны —
Такая кволая, пястушачка! Дык сіла
Тут не падходзіла — яна б яе забіла.
Не мог я! Не!

Адкрыта помсціць, замак разваліць у грузы
Стыдаўся, бо сказалі б — помшчу за канфузы!
Ах, Ключнік! Сэрца простае тваё не знае,
Якое пекла ў сэрцы ўніжаны хавае!

А сатана шторaз то мне падсоўваў планы:
Крывава помсціць, а прычына каб нязнанай
Была нікому, і пра Еву каб забыцца,
У замку не бываць, з другою ажаніцца,
А там як-небудзь пашукаць якой зачэпкі,
Адпомсціць.
І мне здалося: зжыў я з сэрца дарагую,
Быў рады з выдумкі, і ўзяў сабе другую,
Якая трапілася, дзеўчыну-нябогу!
Нядобра я зрабіў, і кара ж была строгай,
Я не любіў яе. Тадэвушава маці
Мяне кахала, бедная, але, мой браце,
Сваім каханнем першым я быў з толку збіты,
Дык быў, нібы шалёны, заўсягды сярдзіты.
Дарма шукаў сабе заняткаў, інтарэсаў.
Надарма ўсё! Дык апантаны помсты бесам,
Не мог знайсці сабе ні месца, ні спакою
Нідзе на свеце. Стомлен доляю такою,
Я піць пачаў.

У хуткім часе жонка з той бяды памёрла,
Пакінуўшы дзіця. Мне сэрца роспач жорла!

* * *

Ах, як бясконца быў яе мне вобраз мілы!
Год столькі! Дзе не быў я! а не маю сілы
Аб ёй забыцца. Вечна твар яе каханы
Стаіць перада мной, нібы намаляваны!
Я піў, але не мог пазбыцца ўсё ўспамінаў
Аб ёй. Не мог, хоць гэтулькі прайшоў краінаў!
Вось зараз я манах, скрываўлены і хворы,
А гавару аб ёй праз час ужо каторы —
Пра гэта гаварыць цяпер? Хай Бог прабачыць!
Хачу свае пачуцці тыя растлумачыць,
Якія змусілі...

Было якраз пасля яе заручын, помню,
Ўсе толькі пра заручыны гудзелі, помню.
Расказвалі, што Ева, як пярсцёнак брала
Ад жаніха, прытомнасць страціла і ўпала,
Што хворая яна, што плача, засыхае,

Угадвалі, што некага тайком кахае.
А Стольнік рад быў і спакойны. Як заўсёды,
Збіраў сяброў і баляваў з тае нагоды.
Мяне не запрашаў — нашто ж я быў патрэбны?
І бедната мая, і ход жыцця ганебны
Пасмешышчам мяне зрабілі перад светам,
Мяне, які калісьці трос усім паветам,
Мяне, якога на'т Радзівіл зваў: каханку!
Мяне, які як бег на бойку ці гулянку,
То большая чым князя акружала світа.
Калі я шаблю выняў, то вакол сярдзіта
Бліпічэлі сотні іх для страху замкаў панскіх!
І вось я стаў пасмешышчам дзяцей сялянскіх!
Такой зрабіўся я ў людскіх вачах драбніцай!
Калісьці важны, слаўны Яцак, пан Сапліца!»

Тут бернардын аслаб і зноў апаў на ложак,
А Ключнік мовіў схваляваны: «Мой ты Божа!
І праўда, праўда! І няўжо ты гэта, Яцку?
Сапліца і манах? І жыў так па-жабрацку?
Ты той, якога помню, як здароў, румяны,
Прыгожы шляхціц быў панамі разрываны
І за якім шалелі ўсе жанчыны! Вусе!
Не так даўно! Ты так зблажэў! Я не змірусь,
Што не пазнаў цябе па стрэле тым удалым,
Такім цудоўным у мядзведзя, дасканалым!
Бо над цябе стралка Літва не знала наша,
І шабляй біўся не горш Мацька ты, манаша!
Сапраўды! пра цябе пялі ў нас паненкі:
«Як Яцак круціць вус, трасуцца ўсе засценкі,
Калі завяжа вус супроць тых, хто нямілы,
Дык хай дрыжаць, хоць бы і нават Радзівілы».
Вось гэткі вузел завязаў майму ты пану!
Няшчасны! Гэта ты? І ты надзеў сутану?
Вус-Яцак — ён манах! О мой вялікі Божа!
І зараз! га! Ды так табе прайсці не можа,
Я даў прысягу: хто Гарэшкаў акрывавіў...»

Тут ксёндз ізноў прыўстаў на ложку і дабавіў:
«Я ездзіў каля замка. Колькі бесаў выла
Ў душы маёй, ніякая не злічыць сіла!

Ён, Стольнік, дочку забівае! Я — забіты
І знішчаны! Пад браму чорт прывёў сярдзіты.
Зірні, як ён гуляе! Што дзень баль і п'янства!
Як свецяць вокны! Музыка! Гуляе панства!
І замак не абваліцца на чэрап лысы!
Падумай помсціць, дык чорт зброю дасць: хапіся.
Ледзь я падумаў, чэрці маскалёў наслалі!
Стаяў я, гледзячы, як замак штурмавалі.

* * *

Бо фальш, што быў я з маскалямі ў нейкай змове.

* * *

Глядзеў, ■ думкі розныя, на безгалоўе,
Віліся. Перш глядзеў на ўсё, скажу адкрыта,
Як на пажар дзіця, і з пачуццём бандыта
Чакаў, калі ўсё зваліцца і загарыцца.
Часамі думаў ратаваць яе пусціцца,
І нават Стольніка —

* * *

А бараніліся тады вы смела, ўпарта,
Хоць маскалі атакавалі не на жарты.
Страляюць кепска! Ўбачыўшы, што адступалі,
Я закіпеў ад злосці — Стольнік зноў на хвалі!
І так яму на свеце у ва ўсім вядзецца?
Дык і ад гэтага нападу адаб'ецца?
Я засаромлены пайшоў, а ўжо быў ранак,
Ажно гляджу, пазнаў: выходзіць ён на ганак
І запінкай брыльянтавай мігціць на сонцы,
І круціць вус, сабой здаволены бясконца.
І мне здалося, што смяяўся нада мною,
Што ён мяне пазнаў і ўзмахваў так рукою
З насмешкай і пагрозай. Карабін хапаю
Ў салдата, ледзь падняў — я стрэліў, не згадаю!
Ты знаеш!

Пракляты самапал! Бо той, хто забівае
Мячом — замахваецца, круціць, адбівае,
Раззброіць можа ворага або спыніцца,
А зброя агнястрэльная — абы схапіцца,

Адна хвілінка, іскарка...

* * *

Ці ж я ўцякаў, як ты ў мяне наставіў дула?
Стаяў я моўчкі, роспач сэрца агарнула
І з жалю нейкага я на'т не зварухнуўся.
Чаму ж ты, ах, Гервазы, ў той час прамахнуўся?
Зрабіў бы ласку! Ды, відаць, за грэх пакуты
Патрэбныя...»

Зноў задыхнуўся, болем скуты.

«Бог бачыць,— мовіў Ключнік,— што я шчыра мецію!
А стрэл твой колькі ж выпусціў крыві! Прыкмеціў,
Якой азваўся ў нашых сем'ях ён бядою?
А гэтаму ўсяму, пан Яцак, ты віною!
А сёння, калі Графа ледзь-ледзь не задзелі,
Апошняга з Гарэшкаў, хоць і па кудзелі,
Ты засланіў яго. Калі маскаль стараўся
Мяне забіць, то праз цябе я жыў застаўся.
Дык калі праўда, што ты стаў ксяндзом-манахам,
То ўжо не згінеш пад Сцізорыкавым ўзмахам.
Бывай, не праступлю больш вашага парога,
Цяпер мы квіты, дык пакіньма рэшту Богу!»

Тут Яцак працягнуў руку, але Гервазы
Адскочыў, кажучы: «Мне нельга без абразы
Крануць рукі тваёй — па гонару законах!
Яна скрываўлена не *pro publico bono*».

Дык Яцак на падушкі зноў апаў бяссільна,
Штораз бляднейшы, і пачаў распытваць пільна
Суддзю ізноў, ці пасылалі па плябана,
А Ключніку сказаў: «Вось я малю васпана
Застацца, зараз скончу, ледзь мне хопіць сілы
Сказаць. Пан Ключнік, я стаю ўжо ля магілы!»

«Што ты,— сказаў Суддзя,— я ж бачыў сам, што рана
Не страшная, а ты так пільна жджэш плябана?
Змяніць мо перавязку? Лекара, быць можа?
Ў аптэчцы ёсць...» Ксёндз перарваў: «Не дапаможа
Нішто. Была старая рана там з-пад Ены,

А сёння зачапілі, дык і ўсё — гангрэна.
А я на ранах знаюся — вось кроў, як сажа,
Ды гэта глупства ўсё... Дык што тут доктар скажа?
Раз паміраем, здаць цяпер ці потым душу...
Даруйце, пане Ключнік, я закончыць мушу!

* * *

І ў тым заслуга ёсць, не стацца вінаватым
Перад народам, хоць і здраднікам праклятым
Цябе завуць, так як было тады са мною!

* * *

І здрадніка імя ішло за мной чумою.
Знаёмыя са мной не сталі сустракацца,
Сябры мае мяне ўжо сталі выракацца.
Хто баязлівы, той здалёк ледзь прывітаўся.
Ды на'т габрэй які, мужык і той стараўся,
Хоць пакланіўшыся, правесці злосным смехам.
А слова «здраднік» адбівалася ўкруг рэхам
І цэлы дзень ад рання самага да змроку
Вілося прада мной, як пламя ў хворым воку.
Аднак не быў я здраднікам радзімы.

Маскоўскім сябрам гвалтам я пачаў лічыцца.
Зямлі Гарэшкаў частку аддалі Сапліцам
Таргавічаны ды надумалі і ўрадам
Мяне ушанаваць. Каб быў я здольны к здрадам —
Чорт радзіў, дык я стаў бы сільны і багаты.
Каб стаў я маскалём, дык першыя магнаты
Маёй шукалі б ласкі. Сын шляхоцкай хаты
І селянін, што землякоў так папракаюць
За службу маскалям, удачлівых не хаюць.
Я гэта ведаў — і не мог аднак жа.

* * *

Я ўцёк з радзімы!
Дзе я не быў! Чаго не перанёс!

* * *

Але мне Бог памог душу ад смерці збавіць:
Папраўіцца павінен быў я і направіць

Наколькі можна, тое...

* * *

Гарэшкі дочка ўмерла на Сібіры дзесьці,
І ваявода, муж, прапаў там дзесь без весці,
Пакінулі дзіцятка на радзіме, Зосю.
Я гадаваць яе загад даў...

* * *

Больш чым з кахання, з гонару хутчэй дурнога
Забіў я, дык стаў сціплым, стаў слугою Бога.
Як быў я рызыкантам, злоснікам, гулякам,
Дык галаву спусціў, манахам стаў Рабакам,
Што як чарвяк у пыле...

Злы прыклад для радзімы, падазрэнне здрады
Я адкупіць рашыў і заплаціць быў рады
Крывёй, самаадданасцю...

Я ваяваў за край, дзе? як? казаць не буду.
Я не баяўся стрэлаў, ні агню, ні труду.
Аднак мілей успамінаю я не войны,
А ўчынкі ціхія, малыя, час спакойны
І мукі, што ніхто...

Не раз мне давялося і ў свой край прабрацца,
Насіць загады камандзіраў, запазнацца
З жыццём падпольным. Знаюць і галіцыяне
Каптур мой бернардынскі, і велькапаляне!
Ля тачкі гніў я цэлы год у прускай яме,
І тройчы маскалі нявечылі кіямі,
Вялі ўжо і ў Сібір. Пасля зноў аўстрыякі
Ў Шпільберга падзямеллях мне даліся ў знакі,
Сядзеў у *carcer durum*, ды Бог проста цудам
Дазволіў мне памерці паміж родным людам,
З прычасцем...

А мо й цяпер я саграшыў, што так зарання,
Не па загаду ўладаў распачаў паўстанне!
Ды думка, што Сапліцы першыя ў радзіме
«Пагоню» ўзнімуць і сваё праслявяць імя...

Здаецца... думка чыстая...
Хацеў ты помсты? Маеш! Хопіць гэтай кары,
Што Бог тваім мячом разбіў мае ўсе мары.
Ты зблытаў планы шмат гадоў снаванай змовы
І мэты велізарнае сарваў асновы!
Апошнія мае пачуцці ў гэтым свеце,
Якія я насіў, што мне былі, як дзеці,
Ты ў бацькавых вачах забіў. І я прабачыў!
Ты!..»

«Каб таксама Бог і мне прабачыць рачыў!—
Прамовіў Ключнік.— Калі хочаш прычасціцца,
Дык я ж не лютар, не схізматык, пан Сапліца!
Хто крыўдзіць цяжка хворага, той моцна грэшыць.
Хачу сказаць такое, што цябе мо ўцешыць:
Калі нябожчык пан мой ранены зваліўся,
А я укленчыў ля яго і нахіліўся
Над ім, мячом крыві кранаючы, і кляўся
Адпомсціць, пан руку ўгару падняць стараўся
І крыж паветраны ў тваім напрамку значыў.
Не мог сказаць, дык знак даў, што табе прабачыў.
Я зразумеў, ды так паддаўся д'яблу злому,
Што пра той крыж ні слова не сказаў нікому».

Тут мукі хворага размову перарвалі,
І доўгія хвіліны цішыні насталі.
Ксяндза чакаюць. Вось падковы зазванілі
І арандар пастукаў у той самай хвілі:
Пісьмо ёсць важнае, пакажа толькі Яцку.
Дык Яцак перадаў пісьмо Суддзі па-брацку,
Прасіў чытаць. Пісьмо ад Фішара, ад шэфа
Са штаба войскаў Панятоўскага Юзэфа.
Даносіць ён, што ў кесаравым кабінеце
Вайна ўжо вырашана і па цэлым свеце
Ўжо аб'яўляецца. Варшаўскі сейм сабраны
З удзелам мазаўшан. Народ усхваляваны.
Літва ізноў павінна з Польшчаю злучыцца.

А Яцак, слухаючы, ціха стаў маліцца
Грамнічку пасвянцаную да сэрца ціснуў,
І зрокам абнадзееным у неба бліснуў.

Заліўшыся апошняй радаснай слязою,
Сказаў: «Цяпер пусці слугу твайго ў спакоі!»

Усе укленчылі, бо тут жа за парогам
Званок азваўся: ксёндз прыехаў «з Панам Богам».

Якраз ужо і ноч рассейваць стала цені —
Ружовыя ўжо беглі праз блакіт праменні.
Праз вокны ўскочылі брыльянтавыя стрэлы
І твар на ложку, ад пакутаў пастарэлы,
Прыгожа ўбралі, золатам акрыўшы скроні,
Што ззяў, нібы святы, у вогненай кароне.

КНІГА АДЗІНАЦЦАТАЯ • ГОД 1812

З м е с т : Вясенняя знаменні. Прыход войскаў. Набажэнства. Афіцыйная рэабілітацыя святой памяці Яцка Сапліцы. З гутаркі Гервазага з Пратазым можна зрабіць выснову пра блізкі канец судовай справы. Заляцанні ўлана да дзяўчыны. Развязваецца спрэчка пра Кусага і Сокала. Пасля гэтага госці збіраюцца на бяседу. Прадстаўленне камандзірам нарачоных пар.

О годзе той, як памятны ты ў нашым краі!
Цябе завуць дагэтуль годам ураджаю
І годам войнаў, і дагэтуль людзі баюць
Пра слаўны год і песні пра яго спяваюць.
Даўно ты быў прадказаны нябесным цудам
І звесткай папярэджаны глухой між людам.
На сэрцы літвіноў напала ў весну гэту
І прадчуванне, нібы прад скончэннем свету,
І сумна-радаснае нейкае чаканне.

І быдла ў полі першы раз вясною ранняй,
Хоць і заморанае голадам, худое,
На рунь не бегла, а лянівай грамадою
Паклалася, ўдыхаючы раллі пах свежы,
Раўло і перажоўвала астаткі ежы.

Сяляне, цягнучыся на палі з плугамі,
Не цешацца вясной ні полем, ні лугамі

І песняў не пяюць, варушацца ляніва,
Як быццам не чакаюць ні сяўбы, ні жніва.

Стрымоўваюць валоў і коней з бараною
І ўсё цікавяцца заходняй стараною,
Як быццам цуду выглядаючы якога.
На птушкі з выраю глядзяць усе з трывогай.
Вярнуўся бусел на гняздо і на світанні
Раскінуў крыллі белыя — вясны сцяг ранні.
За ім крыклівым статкам, дружнай грамадою
Ляцелі ластаўкі, кружылі над вадою
І мерзлае балота на дамкі насілі.
Вальдшнэпаў вечарам шуршэлі ў лесе крыллі,
І статкі дзікіх гусак неба пакідалі
І зморана і гулка на папас сядалі,
І дзесьці ў хмарах чуўся покліч жураўліны.
Начныя старажы ў такія вось хвіліны
Пытаюць здзіўлена: што птушак так трывожыць
І што іх гэткі ранні пералёт варожыць?

А вось і статкі новыя; як гурт сінічак,
Шпакоў і снегіроў, заззялі маляўніча
На стройных шапках кутасы, сцяжкі на піках.
Вось коннікі! Здзіўляе зброя, форма, лік іх!
Палкі, як талы снег вясною, нечакана
Плывуць дарогамі няспынна, нестрымана.
З лясоў чарнеюць шапкі, штык ільсніцца важкі,
Паўзуць пяхоты незлічонае мурашкі.

Усе на поўнач! Быццам в ы р а й пакідалі
За птушкамі і людзі, паляцеўшы ў далі,
Нібы іх гнаў інстынкт у гэты край нязнаны.

Гарматы, людзі, коні цераз змрок, туманы
Плывуць, а неба палымнее ад пажараў,
Дрыжыць зямля ад перуноў і ад цяжараў.

Вайна! вайна! Літва кутка таго не мела,
Дзе б гул яе не трапіў. Там, дзе зелянела
Густэча пушчаў, дзе мужык амаль ніколі
Граніц лясоў не парушаў, не быў на полі,

Не знаў другіх, апроч віхуры, ў небе зыкаў,
А на зямлі, апроч звярыны рыкаў,
Гасцей не бачыў, акрамя ваўкоў і дзікаў,
Заўважыў полымя на небе, дым кудлаты.
У пушчы грукат — там ядро з якойсь гарматы,
Зблудзіўшы, ў лес апала. І зубр барадаты,
Стрывожаны сукоў і пнёў трашчаннем жудкім,
Сарваўся з моху, ўздыбіў грыву рухам хуткім
І на пярэднія прыўзняўся мігам ногі,
Ўстрасае барадой ад дзіву і трывогі
І пазірае ў лом на бляскі папялішча.
А там граната круціцца, гудзе і свішча,
І з гукам рвецца, як пярун. І зубр баіцца
Ўжыцці мо першы раз і ў глуш бяжыць забіцца.

«Дзе бітва? у якім баку?»— хлапцы пытаюць
І зброю рвуць, жанчыны рукі узнімаюць.
Усе у перамогу вераць, са слязамі
Крычаць: «З Напалеонам Бог, а Напалеон з намі!»

О ты, вясна! так памятная ў нашым краю,
Вядомая вясна вайны! Вясна ўраджаю!
Якой жа ты была чароўнай і кіпучай,
Травою, збожжам, кветкамі, людзьмі бліскучай,
Багатаю здарэннямі, надзеяў поўнай!
Цябе я помню марай соннаю цудоўнай!
Народжаны ў няволі, скуты з год дзіцячых,
Адну вясну ў жыцці я гэтакую бачыў.

Двор Сапліцаў быў каля самае дарогі,
Якой вялі свае палкі да перамогі
Князь Юзаф і Вестфаліі кароль Геронім.
Занята ўжо Літва ад Гродна аж па Слонім,
І вось кароль даў войску тры дні адпачынку.
Ды польскія салдаты нават на хвілінку
Спыніцца не хацелі, ўголас наракалі,
Што з войскам царскім іх схапіцца не пускалі.

Непадалёк раскінуў князь свой штаб асноўны,
А ў Сапліцове войска з сорак тысяч поўных,
І са штабамі сталі генерал Дамброўскі,

Князевіч, Малахоўскі, Гедрайць і Грабоўскі.

Было не рана, як прыйшлі, дык дзе папала,
У замку, у двары, кватэрай войска стала.
Расстаўлены ўжо варты, выданы загады,
Дык кожны, маршам стомлены, прылегчы рады.
Ўначы заціхла ў замку, на двары, на полі,
І толькі цені патрулёў снуюць паволі.
Часамі ўзбліснe вогнішча там-сям у змроку
І пільнай варты поклічы чуваць здалёку.

Спаў гаспадар і камандзіры, і салдаты.
І толькі Войскі сном салодкім не абняты,
Бо Войскі думае бяседу заўтра справіць,
Якой жадае дом Сапліцы ўвек праславіць, —
Бяседу, вартую гасцей даўно чаканых
І сэрцу мілых, так здалёку пазбіраных,
Якая вінна і сямейным святам стацца,
Бо заўтра аж тры пары будуць заручацца.
А генерал Дамброўскі праявіў жаданне
Абед мець польскі.

Хоць і час ужо не ранні,
Ды з Войскім жвава аж пяць кухараў кухмарыць
З двароў суседніх. Вось у кухні гаспадарыць
Сягоння ён, і ён адказны за ўсе стравы,
На ім каўпак, фартух. Стары рухавы
Трымае бітку, каб гнаць бруд ёй усялякі,
Які так хціва налятае на прысмакі,
Другой рукою акуляры ускладае
І, з-пад палы дастаўшы кнігу, раскладае.

Завецца кніга тая «*Кухар дасканалы*»,
А ў ёй дакладна спісаны ўсе спецыялы
Сталоў у Польшчы. Раз у Рыме граф з Тэнчына
Па ёй гасцей прымаў такім раскошным чынам,
Што гэта нават папу Урбана здзівіла.
Пасля па ёй таксама ў князя Радзівіла
Прымалі ў Несвіжы манарха Станіслава.
Там гэтакі быў баль, якога слава
Ў Літве паўсюль й цяпер жыве ў сялянскай казцы.

Кніга восьмая
Роздум Суддзі

Книга восьмая
Размышления Судьи

Księga ósma
Rozwarzania Sędziego

Што вычытае Войскі, па яго указцы
У момант кухары умелыя рыхтуюць.
Кіпіць работа, пяцьдзесят нажоў шаткуюць.
А кухцікі уюцца, нібы чэрці ў пекле:
Той дровы носіць, той гаршкі, там штосьці секлі,
Лілі ў катлы і на патэльні; дым клубіцца,
Бо нехта з мехам-паддувалам мітусіцца.
А Войскі, каб у печы полымя не згасла,
Сказаў узліць на дровы топленага масла
(Дазволен гэткі збытак у багатым дому).
Пільнуюць кухцікі агню, забыўшы стому,
Другія на ражнах пякуць кускі дзічыны —
Казляціны, аленіны або ласіны.
Там птушкі скубленай уецца пух лятучы,
Ляжаць курэй, гусей, глушцоў, цяцерак кучы.
Курэй было не многа, бо ад той выправы,
Якую ў час наезду Сак зрабіў крывавы
На птушнікі, з былога Зосі валадарства
Не засталося птушкі нават на лякарства,
І не паспела птаства вырасціць нанова
Багатае курмі калісьці Сапліцова.
І так вялікі мяса маецца дастатак,
Сабранага ў двары і звезенага з ятак,
І з лесу, і з суседства, і адкуль трапляла.
Сказаў бы, малака ад птушак не хапала.
Дзве рэчы ў тым банкеце вінны спалучацца
З загаду панскага: дастатак і мастацтва.

Ўзыходзіў ясны дзень *святой Мадонны кветнай*
Цудоўнаю бясконца раніцаю летняй,
Дзе неба чыстае над соннаю зямлёю
Вісела сінім морам, поўным супакою.
Зор колькі свеціць, як жамчужыны, няярка,
А збоку адзінокая праходзіць хмарка
І, летучы, ў блакіце крылле акунае,
Якое нам анёла ўраз напамінае
Таго, што, на зямлі малітвай прытрыманы,
Спяшаецца цяпер у свой палац туманны.

Ужо на дне нябёсаў перлы зор здраблелі
І згаслі. Вось чало нябёс яснее ў белі

І правы бок яго ляжыць на мяккіх ценях,
А левы ружавее ў сонечных праменнях,
І круг, нібы павека, ўзносіцца шырока,
А там бялок віднее дзесьці ў цэнтры вока
І зрэнка-радуга. А вось прамень узбліснуў,
Па небе круглым дзённае святло працiснуў
І ў белай хмарцы залатой стралой павіснуў.
На гэты стрэл — дня знак — агнёў пук цэлы рвецца,
Крыжуецца на небе, ясным светам льецца,
І вока сонца ўсходзіць. Зразу сонна, быццам
Стараючыся жмурыцца ці прыпыніцца,
Ў сем колераў гарыць, і неба раз за разам
Крывавіцца ў рубін, залоціцца тапазам,
Яснее і крышталам свеціцца празрыстым,
Пасля агнём гарыць, блішчыць брыльянтам чыстым
І ўрэшце ззяе зоркай велічнай бясконца —
Вось так самотнае ішло па небе сонца.

Народ літоўскі сёння зрання мітусіцца,
Сабраўшыся з вакольных сёл каля капліцы,
Як быццам для якога цуду аб'яўлення.
Сабраліся сяляне часткай для малення,
А часткаю таму, што ўсіх цікавасць брала
Пабачыць войска, афіцэраў, генералаў —
Тых слаўных камандзіраў нашых легіёнаў.
Якіх народ любіў і памятаў імёны,
Якіх блуканні, бітвы, страты і ўсе справы
Былі евангеллем літоўскім, кнігай славы.

Снуюць вакол салдаты, ходзяць афіцэры;
Народ ледзь можа даць вачам уласным веры,
Што бачыць землякоў у вопратцы вайсковай,
Узброеных і з польскай выпраўкай і мовай.

Ішла імша. Не змесціць дробная капліца
Усіх, дык большасць звонку грамадой цясніцца,
Глядзяць на дзверы ўсе, адкрыты ўсе галовы,
І волас літвіноў жаўтавы ці сталёвы
Залоціцца, як быццам жыта на палетку.
Галоўкі баб, дзяўчат цвітуць між імі зрэдку,
Прыбраныя ў шматфарбных каснікоў палосы,

Ў жывыя кветкі, паўплятаныя у косы,
І так мігцяць, бы ў збожжы васількі, куколі.
Натоўп шматколерны ўкрывае густа поле,
І на званочак серабрысты, гаманлівы
Галовы гнуцца, як ад ветру колас нівы.

Сялянкі сёння к Багародзіцы алтару
Нясуць снапочкі свежых зёлак на ахвяру.
Усё прыбрана кветкамі, дык зеляніцца
Алтар, абраз, а нават ганак і званіца.
А калі ранні ветрык, дзьмухнуўшы з усходу,
Вянкі сарве і кіне на натоўп народу,
То льюцца вокал пахі ладана і мёду.

Пасля імшы ў касцёле і пасля казання
З'явіўся правадыр народнага сабрання —
Пан Падкаморы, выбраны на пору гэту
Маршалкам дэлегацыі ўсяго павету.
Быў ён у жупане, скрозь золатам расшытым,
І ў кунтушы з махром ядвабным. Пояс літы
Блішчэў над шабляй з рукаяткай лускаватай,
Пад шыяй ззяў брыльянт на зашчапцы багатай.
Канфедэратка белая, на ёй пук цэлы
Прыгожых рэдкасных чубоў ад чаплі белай.
(А гэткі кутасок чапляюць толькі ў свята,
Бо пёрку кожнаму цана не менш дуката.)
Вось так прыбраны, стаў на ўзгорку ля касцёла,
Салдаты і сяляне сціснуліся ў кола,
А ён прамовіў:

«Аб'явіў нам ксёндз з амбоны,
Што кесар дараваў, па прыкладу Кароны,
Свабоду Княжаству Літоўскаму. Вы чулі,
Што ўлады новую работу разгарнулі,
Агульны сейм збярэцца хутка ўжо ў сталіцы.
Я толькі коратка хацеў бы запыніцца
На справе, што датычыцца сям'і Сапліцаў,
Паноў тутэйшых.

Мы не будзем адракацца,
Вядома ўсім, што некалі рабіў пан Яцак.

Калі яго грахі ўся ведае акруга,
То трэба расказаць і пра яго заслугі:
Прысутныя тут нашых войскаў генералы
Прывезлі ў адрас Яцка многія пахвалы.
Пан Яцак не памёр (як гаварылі) ў Рыме,
Але змяніў жыццё сваё і стан, і імя,
І акупіў усе свае старыя віны
Жыццём святым і працай на карысць Айчыны.

Пад Гогэнліндэн, калі Рышпанс паўразбіты
Збіраўся адступаць за радаю ўсёй світы,
Не ведаючы, што надходзіць дапамога,
Ён, Яцак-Робак, небяспечнаю дарогай
Прынёс пісьмо Князевіча да генерала,
Што наша войска тыл варожы акружала.
Пасля ў Іспаніі, дзе польскія уланы
Гор Самасеры бралі пункт умацаваны,
Пры Казетульскім, ён быў ранены два разы!
А потым пераносіў тайныя наказы
У розныя краіны. Выпаўняў заданні
У тайных таварыствах, уздымаў паўстанні.
А потым дома зноў, дзе працы той не кінуў,
Рыхтуючы паўстанне, у наездзе згінуў.
Калі дайшла пра гэта звестка да Варшавы,
Было ўжо там вядома, што для Яцка славы
Ад кесара яму прыслалі ўзнагароду:
Адзнаку Легіі за працу для народу.

Вось гэта беручы цяпер на ўвагу,
Я тут, рэпрэзентуючы сабой павагу
Улады ваяводскай, гэтым аб'яўляю,
Што ласкай кесара і службаю для краю
Пан Яцак пляму змыў. Зноў будзе і ў пашане
Яго імя, і побач слаўных, чэсных стане.
Дык хто цяпер кране нябожчыка папрокам
За віны даўнія, пакрытыя ўжо змрокам,
Той панясе належную яму пакуту —
Gravis notae maculae, што па Статуту
Прадбачыцца на ўсіх, нягледзячы на станы.
І кожны можа быць за гэта пакараны,
Бо зараз маем роўнасць, і параграф трэці

Усіх датычыць, што прашу мець на прыкмеце.
І гэтыя, цяпер прыведзеныя факты
Запішуцца, і возны прачытае акты.

А што прыйшла запозна к Яцку ўзнагарода,
Дык гэта чэсці Яцкавай не перашкода.
Калі грудзей яго ўпрыгожыць мы не можам,
Дык ордэн гэты зараз на магілу ўзложым.
Тры дні вісець тут будзе, а пасля ў капліцы,
Як дар для Маці Божай, будзе залаціцца».

Сказаўшы гэта, выняў ордэн з пакрывала,
І вось на надмагільным крыжыку заззяла
Кукарда, сшытая са стужачкі чырвонай,
І белы зорны крыж пад залатой каронай.
А зоркі супроць сонца так зазіхацелі,
Нібы героя славу несці ў свет хацелі.
Народ тым часам на калені станавіцца,
Каб за ўпакой душы героя памаліцца.
Суддзя чаргой сялян і шляхту — ўсіх дазвання
У Сапліцова запрашае на гулянне.

А два старыя ўселіся на прызбе дома
З паўгарцамі мядку ліповага, вядома,
І ў сад глядзяць, туды, дзе паміж кветак маку
Стаяў улан прыгожы у бліскучым чаку,
Прыбраным бляхай залацістаю і пер'ем;
А побач вочкі сінія к яму з давер'ем
Дзяўчына прыўзняла ў зялёнай, быццам з руты,
Сукенцы. Над травой паненак гурт самкнуты —
Збіраюць кветкі, адварочваюць галовы
Ад маладых, каб ім не перабіць размовы.

Старыя мёд п'юць, табакеркаю ліповай
Частуюцца і забаўляюцца размовай.

«Так, так, Пратазаньку ты мой», — сказаў Гервазы.
«Так, так, Гервазаньку ты мой», — сказаў Пратазы.
«Ды так, так», — згодна паўтарылі са тры разы
З кіўкамі галавы. Урэшце мовіў Возны:
«Што спрэчка наша скончана ўжо, бачыць кожны.

Я помню прыкладаў такіх з жыцця не мала,
Дзе часта горшых на'т эксцэсаў шмат бывала,
А інтэрцыза ўвесь закончыла той клопат.
Вось так з Барздабагатымі згадзіўся Лопат,
Крапштулі з Купсцямі і Путрамэнт з Піктурнам,
З Адынцамі Міцкевіч, а з Квілецкім Турна.
Што тут казаць! У Польшчы горшыя замешкі
Былі з Літвой, чым у Сапліцаў і Гарэшкі,
А мудра каралева ўладзіла Ядвіга,
Што без судоў закончылася ўся інтрыга.
Някепска, калі ёсць паненкі або ўдовы
Для замужжа, дык кампраміс раз-два гатовы.
Найгоршая цяжба з духоўнымі бывае
Каталікамі, ці радство перашкаджае
І загародкі для жаніцьбы утварае.
Таму вось ляхі з русамі здаўна нязгодны,
Што продкаў мелі Леха з Русам — брацціяў родных.
Адтуль у нас працэсаў столькі месца мела
З тэўтонцамі, пакуль не выйграў наш Ягелла.
Так справа доўгімі цягнулася гадамі
Між Рымшам і дамініканскімі ксяндзамі,
Пакуль не выйграў *syndyk* манастырскі Дымша,
Адтуль і прыказка: Бог большы, чым пан Рымша,
А я дабаўлю: мёд шмат лепшы за Сцізорык».
І піў да Ключніка паўгарцам раз каторы.

«І праўда, праўда! — Ключнік адказаў з пачуццем.—
Лёс дзіўны Польшчы і Літвы. Яны ў пакуце
І ў шчасці так жылі, як з жонкай муж — сям'ёю!
Бог лучыць, а чорт рве, бог тое, чорт другое!
Ах, брат Пратазанька! Ізноў вось вочы нашы
Убачылі сваіх! Ізноў Караніяшы
Прыйшлі да нас! Я знаю іх — народ заўзяты,
З іх, помню, ёмкія былі канфедэраты!
Каб мой пан Стольнік дачакаўся гэткай хвілі!
Ах, Яцак! Яцак! — ды мы зноў загаласілі?
Калі Літва з Каронай зноўку аб'яднаны,
То гэтым беды ўсе забыты, пахаваны».

«І дзіўна, — тут сказаў Пратазы, — што аб Зосі,
Рукі ў якой сягоння наш Тадэвуш просіць,

Мінулым летам быў цікавы знак, бы з неба!»
«Яе зваць паннай Зосяй, — мовіў Ключнік, — трэба,
Бо, мабыць, вырасла яна даўно з дзяўчатка
Ды ўнучка ж Стольніка яна, арыстакратка».
«Дык вось, — канчаў Пратазы, — гэты знак прарочы
Пра лёс яе, на ўласныя я бачыў вочы.
Мінулым летам раз сядзела чэлядзь наша
Вось тут, аж бачым: бух! зваліліся з паддашша
Два вераб'і ў змаганні, два самцы старыя.
Адзін, відаць, малодшы з цёмна-шэрай шыяй,
Другі быў з чорнай. Б'юцца, разгарнуўшы крыллі,
Качаюцца, ажно зарыліся ўжо ў пыле.
Глядзім, аж слугі між сабою зашапталі
І чорнага Гарэшкам так, у жарт назвалі,
А шэрага Сапліцам, і як ён быў гарою,
Крычаць: «Гарэшка — трус! Сапліцы ў нас — героі!»
Як ападаў, крычалі: «Панаддай, Сапліца,
Бо сорам шляхціцу прад багачом скарыцца!»
Смяёмся і чакаем, хто каго з іх зможа.
Аж раптам Зося к рыцарам, што так варожа
Таўкліся, падбягае, ручкай іх прыкрыла,
А тыя біліся ўсё, аж фурчэлі крылы —
Такая злосць была у гэткім дробным ліху.
Тут бабы і давай шаптаць з сабой пацiху,
Што суджана, відаць, каб праз дзяўчыну гэту
Змірыліся дзве знатныя сям'і павету.
І, бачу, спраўдзіліся бабскія варожкі,
Хоць пра Тадэвуша не думалі ні трошкі
Тады, а больш пра Графа».

Ключнік жа на гэта:
«Дзівосна як на свеце ў тайны ўсё адзета!
Скажу і я вашэці штось. Мо менш цудоўна
Было, чым з птушкамі, ды дзіўна невымоўна.
Ты знаеш, што Сапліцаў я без дай прычыны
Гатоў быў нішчыць, а да гэтага хлапчыны
Я адчуваў бязмерную любоў заўсёды.
Калі ён біўся з кім яшчэ ў малыя годы,
Заўсёды верх браў. Я яго, пад замка мурам
Сустрэўшы, падстракаў да розных авантураў.
Выконваў ён усё: ці галубоў зняць з вежы,

Ці амялы з дубоў нарваць, ці з хвоі свежых
Набраць вароніх яек, ён без адгаворкі
Рабіў. Відаць, што пад шчаслівай светам зоркі
Прыйшоў на свет, я думаў, шкода, што Сапліца!
Хто ж знаў, што суджана яму так ажаніцца,
Стаць мужам панны Зофіі, маім быць панам!»

Тут змоўклі, справам дзівяцца неспадзяваным,
І толькі зрэдку чуюцца ўсё тыя ж фразы:
«Так, так, мой пан Гервазы», «Гэтак, пан Пратазы».

Над прызбай той у кухні вокны ўсе раскрыты,
З іх пара, быццам дым, узносіцца ў блакіты,
А з тых дымоў, як беленькая галубіца,
Мільгнула светлая кухмайстара шляфмыца,
І Войскі праз акно па-над старых галовы
Нагнуўся тварам, моўчкі слухаў іх размовы.
Урэшце ім падаў дзве філіжанкі, сподак
З бісквітамі і мовіў: «Хоць мядок салодак,
Ды закусіце і гісторыі цікавай
Паслухайце, што ледзь не сталася крывавай,
Калі ў Налібацкіх лясах за даўніх часаў
Падвёў пан Рэйтан штуку князю фон Дынасаў.
Ледзь ён жыццём не заплаціў за гэту звадку.
Я іх змірыў, а як — пачну казаць спарадку».
Ды повесць Войскага тут кухары спынілі,
Пытаючы, ці так сервіз распалажылі.

Пайшоў пан Войскі, а старыя зноў ля мёду
Глядзелі моўчкі, задуменна ў бок гароду,
Дзе стройны той улан стаяў з прыгожай дзевай.
Улан руку яе узяў рукою левай
(Бо правая рука была забінтавана)
І словы гэткія казаў усхвалявана:

«Зафія, трэ', каб ты нічога не ўкрывала
І, перш чым пабяромся, шчыра адказала.
Нічога, што калісьці ты была гатова
Даць слова мне. Я не прыняў у той час слова,
Не мог застацца я пры вымушаным слове.
Тады я вельмі мала жыў у Сапліцове,

І ў той час я не смеў чакаць таго ні мала,
Каб ты мяне вось так адразу пакахала:
Не фанфарон я, а хацеў заслугай, Зося,
Любоў тваю здабыць, хоць бы й чакаць прыйшлося.
Цяпер жа ты ізноў мне слова паўтарыла:
За што мяне ты гэткай ласкай надарыла?
А мо выходзіш за мяне ты не з кахання,
А толькі з дзядзькі слоў ці з цёткі намаўляння.
Але жаніцьба, Зося, справа немалая,
Парайся з сэрцам, хоць мо хто і намаўляе.
Пагроз не слухай дзядзькі, не зважай на цёцю.
Калі ж не па сваёй выходзіш мо ахвоце,
Тады заручыны на іншы час адложым,
Няма куда спяшацца, пачакаць мы можам,
Тым больш, што атрымаў я ўчора назначэнне
Ў інструктары, тут буду весці абвучэнне
Салдат, пакуль мае не выгаяцца раны.
Дык як, каханая?»

I Зося твар румяны
К яму ўзняла і стала гаварыць нясмела:
«Не помню, як яно тады ўсё стацца мела,
Ды ўсе казалі мне, што замуж трэба
За вас, а я заўсёды згодна з воляй неба
І са старэйшых воляй». Апусціўшы вочы,
Прамовіла: «Калі вы, помніце, той ночы,
Як ксёндз памёр у буру, двор наш пакідалі,
Заўважыла, што вы нас моцна шкадавалі,
Аж слёзы мелі у вачах. Скажу вам смела,
Што тыя слёзы помніла я й пэўнасць мела,
Што любіце мяне, і мне душа балела,
А ў час малітвы вы ў маім стаялі зроку
З бліскучымі вялікімі слязамі ў воку.
Пасля мяне Падкамарына ў Вільню брала
На зіму, але я там вельмі сумавала
Па Сапліцове і па тым сваім пакоі,
Дзе ў нас спатканне дзіўнае было такое
І дзе мы развіталіся. Вось так памалу
У сэрцы нешта, як расада, прарастала
Усю зіму; хоць не казала я нікому,
Ды вельмі сумавала і па гэтым дому,

І па пакойчыку, і нешта мне шаптала,
Што тут вас зноў убачу, — вось і прычакала.
Вас маючы ўсё ў думках, часта імя ваша
Я паўтарала, дык таварыства ўсё наша
Мяне ўвесь час лічыла ў Вільні закаханай.
Дык вось, калі кахаю, то, напэўна, пана».

Адчуў Тадэвуш немалую асалоду
З тых слоў, і пад руку пайшлі яны з гароду
Ў напрамку да пакойчыка малога,
Дзе пражываў Тадэвуш год таму ўжо многа.
У той пакой жаночы пара падалася,
Дзе жыў Тадэвуш некалі ў дзяцінства часе.

Цяпер там Рэент быў у новенькім убранні
І памагаў збірацца сэрца свайго пані,
Падносячы пярсцёнкі, скрыначкі, падушкі,
Флаконы, ланцужкі, то парашкі, то мушкі,
Ды на нявесту пазіраў з трыумфам, рады.
А маладая, скончыўшы ўціраць памады,
І пекнасць перад люстрам пільна правярала.
Дзве пакаёўкі шчыпчыкамі спрытна, ўдала
Падкручваюць астылыя ўжо кос пярцёнкі,
Другія, ўкленчыўшы, працуюць ля фальбонкі.

Калі так Рэент ля нявесты мітусіўся,
Ў акно пастукаў кухарчук: «Шарак з'явіўся.
Пракраўшыся з лазы вялізарнага куста,
Праз луг матнуўся ў сад тым бокам, дзе капуста,
Ды там сядзіць. Не цяжка ўзяць яго ні трошкі,
Калі хартоў паставіць пасярод дарожкі».
Бяжыць Асэсар, цягне Сокала ў бок саду,
І Рэент выбег, ён імчыцца з Кусым ззаду.
Паставіў Войскі іх з сабакамі ля плоту,
Сам з біткаю у сад пайшоў. Ля павароту
Дарожкі свіснуў, пляснуў — звера так трывожыў.
А кожны з цкавачоў зрок пільна насцярожыў,
Паказвае сабакам сцежку перад стартам
І цмокае сцішка. Глядзяць харты упарта,
Насы наставілі, дрыжаць нецерпяліва,
Як быццам дзве стралы адна дзяржыць цяціва.

Тут Войскі крыкнуў: «Выч-га!» Заяц — скок з-за плоту
На луг, харты — за ім, і ў той жа момант, з лёту
Сакол і Кусы зайца разам ухапілі,
Зляцеўшы з двух бакоў, як быццам птушкі крыллі,
І зубы, быццам кіпцюры, убілі ў плечы.
А заяц выдаў нейкі голас чалавечы,
Жалосны! Цкавачы бягуць: ляжыць без духу,
І ўжо харты кудлачаць шэрсць яго на бруху.

Сабак адводзяць, гладзяць. Войскі ў гэтым часе,
Дастаўшы нож, што ля папругі целяпаўся,
Абрэзаў зайцу лапы і сказаў: «Па праву
Харты аднолькавую заслужылі славу.
Іх роўная дасужасць, роўная і праца —
Палац быў варты Паца, а пан Пац палаца.
Яны ў вас роўныя, адзін другога варты,
Дык ваша спрэчка скончана ўжо не на жарты.
А я, што вамі запрашаны быў у суддзі,
Даю свой прыгавор: няхай пачуюць людзі,
Што выйгралі абодва, фанты не прайграны,
Дык падпішыце згоду». Тут усхвалявана
Абодва цкавачы у ветлівым паклоне
І ў шчырай радасці паціснулі далоні.

Пан Рэент мовіў: «Я стаўляў каня з нарадам,
Даў подпіс, нашым земскім сцверджаны урадам,
Што аддаю суддзі пярсцёнак мой прыгожы.
Фант, стаўлены ў заклад, забраны быць не можа.
Прашу, няхай жа персцень той пан Войскі прыме
І ўласнае на ім загад дасць выбіць імя,
А не, дык герб Грачэхаў — што больш да спадобы.
Рубін жа ў золаце адзінаццатай пробы!
Каня сягоння ў армію ўзялі уланы.
А той камплект пры мне, ён быццам маляваны,
Выгодны і трывалы, зроблены, як цацка.
Сядло па модзе ці турэцкай, ці казацкай,
Багата ўбранае ў каштоўныя каменні,
Падушачка з рубронту пушыцца ў сядзенні.
А як, ускочыўшы, у стрэмя ўставіш ножку,
Дык ты між куль сядзіш, нібыта ў ложку.
А як галопам пусціш (тутка пан Балеста,

Які, як ведама, ахвотнік быў да жэстаў,
Расставіў ногі, бы ў страмёнах падымаўся,
Пасля галоп паказваючы, ў такт ківаўся),
А як галопам скочыш, дык чапрак іскрыцца,
І проста золата пачне з каня валіцца,
Бо і табэнкі золатам панабіваны,
І пазалота на страымёнах серабраных.
На рамянях ад муштука і на аброці
Бялеюць ракавін кружкі, а колцы ў пазалоце.
Нагруднік зззяе месяцам, як герб Лялівы,
Накшталт маладзіка. Камплект той асаблівы
Здабыты у баі (здаецца) Падгаецкім
На нейкім знакамітым шляхціцы турэцкім,
Прыміце, пан Асэсар, ў знак маёй пашаны».

Тады Асэсар, вельмі рад і ўсхваляваны,
Сказаў: «Нашыйнікі цудоўныя я ставіў,
Якімі князь Сангушка калісь мяне ўславіў:
Яшчур і золата на іх — глядзець ахвота,
Пры іх ядвабны павадок. Яго работа —
Цудоўная, а ў ім каштоўны камень свеціць.
Я думаў, можа, ў спадчыне пяроймуць дзеці,
Напэўна ж буду мець дзяцей, бо вось жанюся.
Таму, пан Рэент, я таксама спадзяюся,
Што вы аброжкі прымеце з тае нагоды,
Што спрэчка наша, ўжо трываючая годы,
Нарэшце скончана так добра, ганарова
Для нас абодвух. Згода хай цвіце нанова!»

Пайшлі дамоў, каб чым хутчэй даць знаць наўкола,
Што спрэчка скончана за Кусага й Сакола.

Казалі, быццам Войскі зайца маладога
Хаваў пры доме ў клетцы ў таямніцы строгай,
Пасля ў гарод пусціў, каб лёгкаю здабычай
Зміріць двух цкавачоў. Зрабіў так таямніча,
Што аніхто не здагадаўся з Сапліцова.
Праз колькі год шапнуў пра гэта кухар слова,
Каб звесці Рэента з Асэсарам нанова,
Але дарма стараўся ў гэткім злым намеры:
Адрокся Войскі, дык не далі кухце веры.

Ужо сабраныя ў замковай пышнай залі,
Чакаючы бяседы, госці размаўлялі,
А тут Суддзя ў мундзіры ўрадавым заходзіць
І за сабой Тадэвуша і Зосю ўводзіць.
Паклон аддаў Тадэвуш леваю рукою
Гасцям і афіцэрам, што былі ў пакоі,
А Зося сарамліва вочкі апусціла
І прывітальны рэверанс гасцям зрабіла
(Прыгожа так, як цётка гэтага жадае).
На галаве вянок, бо Зося — маладая.
Яна была ў той самай вопратцы прыгожай,
Ў якой насіла ўранні зелле Маці Божай.
І зараз для гасцей снапок травы нажала.
Адной рукой прысутным кветкі раздавала,
Другой на галаве трымала серп бліскучы.
Бяруць героі кветкі, збіўшыся да кучы,
Цалуюць ёй руку, яна зноў чырванела.

Аж генерал Князевіч, падхапіўшы смела
І па-бацькоўску у чало пацалаваўшы,
На стол паставіў Зосю, перш высока ўзняўшы.
А ўсе ў далоні пляскалі, крычалі «брава»,
Захопленыя прыгажосцю і паставай,
А асабліва вопраткай яе народнай.
Бо ім, жаўнерам, што даўно з краіны роднай
Пайшлі ў чужыну ў войны, бітвы і паходы,
Былі надзвычай дарагімі люду моды —
Яны ж напаміналі маладыя годы,
Даўнейшае каханне. Дык усе глядзелі
На Зосю, аж у многіх слёзы заблішчэлі.
Дык просяць, каб яна ўзняла нямнога вочы,
Каб павярнулася. Хоць твар гарыць дзявочы,
Пакручваецца, з сэрцам поўным неспакою
І засланіўшы вочкі ясныя рукою.
Тадэвуш вельмі рады, ажно цёр далоні.

Ці Зосі ўрадзіў хто адзецца так сягоння,
Ці падказаў інстынкт (дзяўчына адгадае
Заўсёды, што ёй лепш да твару прыпадае),
Сказаць даволі, што, хоць Талімэнай зрання
Яна была аблаяна за гэта ўбранне,

Адмовілася з плачам ад сукенкі моднай
І гэтак засталася ў вопратцы народнай.

Спаднічку мела беленькую пад кароткай
Зялёнаю сукенкай з яснаю абводкай.
Зялёны быў гарсет, прыгожа вышываны
І стужкамі ружовымі зашнураваны,
Дык грудзі выглядалі, як бутоны кветак.
З плячэй рукаўкі белыя свяцілі гэтак,
Як крыллі матыля, стрыманага ў разгоне.
Ружовы каснічок сціскаў іх ля далоні,
А шыя сціснута прыгожай белай блузкай,
Каўнер якой абшыты стужачкаю вузкай.
У вушках завушнічкі з костачак ад вішні,
Якімі Сак Дабрынскі даў быў доказ лішні
Сваіх пачуццяў к Зосі (Сак на іх умелы
Вырэзваў спраўна сэрцы, ўздзетыя на стрэлы).
На шыі павісаюць два шнуркі бурштыну,
На галаве ляжыць вяночак з размарыну.
Ад косаў стужкі Зося кінула на плечы,
А над чалом у светлай валасоў густэчы
Свяціўся серп крывы, травой адшліфаваны,
Як ясны маладзік па-над чалом Дыяны.

Усе ў далоні плешчуць, хваляць. З афіцэраў
Адзін дастаў *portefeuille*, запоўнены папераў,
Расклаў, змачыў у вуснах алавік і значыў
Ім штось, на Зосю гледзячы. Суддзя пабачыў
Прылады, мастака па іх пазнаў самога,
Хоць за той час яго змянілі вельмі многа
Палкоўніка адзнакі і мундзір уланскі,
І вусікі з бародкай на манер іспанскі.
Суддзя сказаў: «Вітаю вас, яснавяльможны
Пан Граф. І ў патранташы носіце дарожны
Прыбор для малявання!» (Бо пан Граф быў гэта.)
Хоць толькі ў войску быў з мінулага ён лета,
Але за тое, што уланскі полк паставіў
За ўласны кошт і ўжо ў баях сябе праславіў,
Ён атрымаў палкоўніка сягоння званне.
Суддзя пачаў складаць яму павіншаванне,
Ды Граф маўчаў — яго займала маляванне.

Тут маладых з'явілася другая пара.
Асэсар, што нядаўна царскім быў жандарам,
Цяпер напалеонаўскай служыў уладзе.
І хоць і дня на новай не прабыў пасадзе,
Ужо насіў мундзір такі, як у палякаў,
Цягнуў крывую шаблю і у шпоры «звякаў».
Паважна побач крочыла яго каханка —
Прыбраная прыгожа Тэкла Грачашанка,
Бо ўжо даўно Асэсар Талімэну кінуў
І, каб какеткі боль сардэчны не пакінуў,
Свае пачуцці на Вайшчанку перакінуў.
Яна мо пражыла гадоў каля паўвеку,
Ды гаспадарлівай была і чалавеку
Пасагу ўносіла, апроч уласнай вёскі
І ад Суддзі ў гатоўцы значны дар сяброўскі.

А трэцяй пары ўсё няма, дык раз каторы
Суддзя шле слуг, каб там хутчэй канчалі зборы.
Вяртаюцца: няма ў пакоі маладога,
Пярсцёнка дзесь шукае, бо, як гнаў касога,
На лузе мо згубіў, а Рэентава дама
Яшчэ рыхтуецца. Хоць там прыладаў крама
І хоць спяшаецца з дзяўчатамі ад рання,
Усё ніяк не можа скончыць прыбірання.
Гатова будзе ля чацвертай мо гадзіны.

КНІГА ДВАНАЦЦАТАЯ • КАХАЙМАСЯ!

Змест: Апошняя старапольская бяседа. Архісервіз. Тлумачэнне яго фігур. Яго рухі. Адораны Дамброўскі . Яшчэ пра Сцізорык. Адораны Князевіч.ы Першы дзяржаўны акт Тадэвуша пры перайманні спадчыны. Заўвагі Гервазага. Канцэрт над канцэртамі. Паланез. Кахаймася!

Вось грукнулі дзвярэй абедзве палавіны.
Заходзіць Войскі ў залу з урачыстай мінай,
Ён не вітаецца і месца не займае,
Бо Войскі сёння ў новай ролі выступае:
Прыдворны маршал ён. Як знак сваёй пасады
Трымае посах, неабходны для абраду —

Паказваць, хто і дзе, ў якім парадку сядзе.
Найперш таму, хто сёння ў ваяводскай радзе —
Маршалку-Падкамораму, з пашаны к госцю,
Даў крэсла з аксамітам і слановай косцю.
Направа ад яго сеў генерал Дамброўскі,
А леваруч Князевіч, Пац і Малахоўскі,
Між іх — Падкамарына. Афіцэры, пані
І шляхта — ўсе прысутныя на святкаванні,
Мужчыны і жанчыны — кожны так сядае
Па пары, як пан Войскі сесці загадае.

Суддзя перапрасіў паноў усіх і паняў
І выйшаў на дзядзінец, дзе яго сяляне
Чакалі ля стала на гоні мо даўгога,
Дык там прысеў з канца, а плебан сеў з другога.
Тадэвуш ані Зофія за стол не селі,
А між сталамі ходзячы, пілі і елі.
Такі ўжо звычай, што павінны пані з панам
Падчас банкету першага служыць сялянам.

Тым часам госці, што знаходзіліся ў залі,
На велічны сервіз цікаўна пазіралі,
Бо гэтакіх яшчэ не бачылі дзівотаў.
Яго калісьці быццам Радзівіл-Сірота
Прывёз з Венецыі. У месце тым, быць можа,
Ён быў і зроблены на польскі лад, прыгожа.
Пасля ён трапіўся падчас напасці шведскай,
Няведама адкуль і як, сям'і шляхецкай.
Сягоння, выняты на дзень святочны гэты,
Ляжаў сярод стала, як кола ад карэты.

Сервіз той быў напоўнены аж вышай сценак
Бліскучай беллю цукраў, снегам лёгкіх пенак.
Нагадваў ён дакладна краявід зімовы:
У цэнтры быў з варэння чорны бор сасновы,
Паводдаль — хаткі, быццам вёскі і засценкі,
Абсыпаныя шэранню цукровай пенкі.
На беразе начыння шмат парасстаўляных
Было фігурак фарфуровых выдзіманых.
У польскіх вопратках усе, нібы на сцэне
Яны паказвалі якоесьці здарэнне.

Кніга восьмая

Наезд

Книга восьмая

Наезд

Księga ósma

Zajazd

Такая размалёўка, жэсты ў іх такія,
Што ледзь не загавораць зараз, як жывыя.

Якое ж іх значэнне, госці ўсе пыталі,
Дык Войскі мовіў, як прыціхла трохі ў залі
(Якраз разносілі гарэлку ў той часіне):
«З дазволу ўсіх гасцей, што расказаць прасілі
Пра гэты вось натоўп пярсон размаляваных,
Скажу, што сеймік польскі тут адлюстраваны,—
Галасаванне і трыумф, нарады, звады.
Я ўсё тут разгадаў і растлумачыць рады.

Вось тут направа бачым шляхты згуртаванне,
Відаць, што склікана яна для частавання;
Чакае стол накрыты, ды гасцей не садзяць,
Яны пасталі купкамі, аб чымсьці радзяць.
Глядзіце, ў кожнай купцы маем чалавека,
З якога вуснаў, рук, адкрытых воч, павекаў
Відаць, што прамаўляе, слухачам тлумачыць
І пальцам на далоні нешта цвёрда значыць:
Вядзецца агітацыя за кандыдатаў,
Ды з розным вынікам, не кожны ўсіх раскратаў.

У гэтай тутка купцы слухаюць ахвоча,
Той вуха прыхіліў, пачуць дакладна хоча,
Той з даланёй ля вуха, каб дакладна ўцяміць
І пільна нанізаць пачутае на памяць.
Прамоўца рад, што мова гэтак іх займае,
Дык гладзіць кішаню: іх галасы ўжо мае.

У трэцяй групцы ўжо зусім другія справы,
Прамоўца слухачоў хапае за рукавы,
Глядзіце! рвуцца, чымсьці ўгневаныя, пэўна.
А гэты во, глядзіце, як надзьмууся гнеўна,
Руку узняў, заткнуць прамоўцы вусны рвецца,
Бо той працаўніка стаў выхваляць, здаецца.
А гэты, быццам бык, нагнуўся злы і строгі,
Сказаў бы, што прамоўцу хоча ўзяць на рогі,
А тыя гэтых гоняць шаблямі з дарогі.

Адзін стаіць між групак шляхціц адзінокі,

Відаць, што баязлівы ён і недалёкі.
За кім падацца? Сам змагаецца з сабою,
Дык справу вырашыць надумаў варажбою,
Зажмурыўся і пальцам хоча ў палец цэліць,
Пакажа лёс, каго ён голасам абдзеліць:
Як пальцы сыдуцца, дык дасць афірматыву,
А калі не, тады укіне негатыву.

А тут другая сцэна: ў манастырскай залі,
Якую для нарадаў сёння скарысталі,
Старэйшыя сядзяць, малодшыя таўпяцца,
І ўсе к сярэдзіне стараюцца прабрацца,
Дзе з урнай у руках стаіць маршалак
І правярае колькасць там сабраных галак,
Апошнюю вось вытрас. Возныя чакаюць
І імя новага ўрадоўца аклікаюць.

Адзін, з ухвалаю агульнаю не згодны,
Глядзіце, высткнуў з кухні галаву, нягодны,
І пазірае смела, вылупіўшы вочы,
Разінуўся, як быццам з'есці залу хоча.
Згадаць не цяжка, што выкрыквае ён «*Veto!*»
Глядзіце, як рвануліся к дзвярам на гэта,
Як ціснуцца на кухню! Тыя ўсталі з лавы,
Там шаблі вынялі — пачнецца бой крывавы.

Але на калідоры, вунь з канца другога,
Прашу, паны, заўважыць там ксяндза старога —
Ігумен гэта, ён *sanctissimum* выносіць,
Хлапчына ў белым звоніць — расступіцца просіць.
Хавае шляхта зброю, х546546526рысціцца набожна,
А ксёндз туды ідзе, дзе ўсё яшчэ трывожна,
Пакуль пяройдзе, верне ўсіх да супакою.

Вы не знаёмыя ўсе з справаю такою,
Калі да шляхты самаўладнай, неспакойнай
Не трэ' было паліцыі ніякай збройнай.
Пакуль жыла ў ёй вера і пашана права,
Была свабода з ладам і з багаццем слава!
А на чужыне, чую, ўрад трымае драбаў,
Жандараў, паліцэйскіх, розных там канстабаў...

А дзе парадкі толькі меч аберагае,
Свабода ў краі тым, мяркую я, благая».

Тут з табакеркі звонам мовіў Падкаморы:
«Пан Войскі, адкладзіце вашы нагаворы
На потым. Згодзен я, што сеймік той цікавы,
Ды мы галодныя, пара ўжо ўносіць стравы».

На гэта Войскі адказаў: «Шаноўны пане,
Прашу, дазвольце скончыць мне апавяданне,
Вось сцэну растлумачу, і мой сказ гатовы.
Тут на руках прыхільнікаў маршалак новы
З сталовай вынесен, і ўся вакол нарада
Кідае з крыкам шапкі ўгору, вельмі рада.
А воддаль — пераможаны ў галасаванні
Стаіць адзін, відны яго перажыванні.
Насустрач жонка выйшла, праўду адгадала
І, бедная, на рукі пакаёўкі ўпала.
Ах, бедная, хацела быць яснавяльможнай,
А зноў трэ' быць вяльможнай, як шляхцянцы кожнай».

Тут Войскі скончыў сказ і апускае посах.
Ўваходзяць парамі лакеі, на падносах
Трымаюць пачастункі: боршч, што царскім звецца,
За ім расольнік старапольскі падаецца,
Ў які пан Войскі, маючы свае сакрэты,
Укінуў колькі перлаў і са дзве манеты
(Такі расольнік чысціць кроў, здароўю служыць).
Далей другія стравы. Хто ж бы мог падумаць
Запомніць невядомыя ўжо ў нашы часы
Кантузы розныя, аркасы і блямасы,
Пінэлі і памухлі ці там фігатэлі,
Цыбэты, піжмы і драганты, і брунелі.
А рыбы! Той ласось вядомы дунаецкі,
Ікра вянецкая і асяцёр турэцкі,
Шчупак галоўны, падгалоўны і лакетны,
І камбала, і карп стары, і карп шляхетны!
Ўканцы сакрэт кухарскі: рыбіна старанна
З канца падсмажана, а далей запякана,
А пры хвасце, як заліўная, зрыхтавана.

А госці не пыталі, як завуцца стравы,
Зусім іх не крануў і той сакрэт цікавы,
На ўсё салдацкія былі ў іх апетыты,
Абы часцей венгерскім келіх быў наліты.

Сервіз жа ў гэтым часе ў фарбах адмяніўся,
Ачышчаны ад снегу, зеленню пакрыўся,
Бо лёгкая, цяплом у залі разагрэта,
Растала ўжо плёнка беленькая гэта,
Адкрыўшы дно з-пад снегу і з-пад цукру-лёду,
Дык краявід ажыў другой парою года,
Заззяў зялёнаю шматколернай вясною.
Вось збожжа раптам узнімаецца сцяною:
Шафранавай пшаніцы ўстаў шнур залацісты,
Палетак жыта серабраны і квяцісты,
Расце і грэчка, зробленая з шакаладу,
І яблыкі, і грушы пазіраюць з саду.

Ледзь госці маюць час аддаць прызнанне лету
І дарма просяць, каб пару прадоўжыць гэту,
Сервіз, нібы планета, цвёрда кіраваны,
Пару мяняе. Краявід залататканы,
Сагрэты ў памяшканні, колеры згартае:
Пажоўклі травы, ліст чырвоны аблятае,
І ўжо асенніх ветраў чуюцца павевы.
І вось, нядаўна стройныя такія дрэвы
Стаяць аголеныя, бы ў чаканні скону.
Так засталіся толькі палкі цынамону,
Галінкі лаўравыя там, дзе лес быў цёмны.
Замест іголак хвоі, кмен застаўся скромны.

Дык госці, папіваючы віно, пачалі
Ламаць галлё, сукі — закусваць імі сталі.
А Войскі абыходзіў свой сервіз наўкола
І пазіраў на ўсіх з трыумфам і вясёла.

Дамброўскі Генрых выразіў сваё здзіўленне
І мовіў: «Ці кітайскія мы бачым цені?
Ці мо Пінэты бесаў вам прыслаў на службу?
Ці ўсе ў Літве з сервізамі трымаюць дружбу

І гэтакім старым балююць абычаем?
Скажы мне, бо я ўсё жыццё правёў за краем».

«О не,— прамовіў Войскі,— мой яснавяльможны
Пан генерал, тут не якісьці чар бязбожны!
А толькі памятка аб тых бяседах слаўных,
Якія у дамах бывалі старадаўніх,
Калі наш край яшчэ магутны быў, багаты!
А стравы ўсе вось з гэтай кнігі мною ўзяты.
Пытаеш, ці ў Літве звычай стары хаваем?
На жаль, сягоння новым сталі жыць звычаем.
Не раз крычыць паніч, што ён не церпіць збыткаў,
А скупіцца гасцей карміць, падаць напіткаў,
Венгерскага шкадуе, цешыцца шатанскім
Маскоўскім сфальшаваным нейкім там шампанскім,
А потым вечарам праграе столькі ў карты,
Што баль на сто пярсон сум гэтакіх не варты.
А нават (бо што маю, то скажу адкрыта,
І хай пан Падкаморы не глядзіць сярдзіта)
Калі задумаў за сервіз я гэты ўзяцца,
Дык на'т пан Падкаморы стаў з мяне смяяцца!
Казаў, што з гэтай старасвецкае махіны
Забаўка можа быць для дробнае дзяціны,
А гэтакіх гасцей яна напэўна знудзіць!
Суддзя і той казаў, што толькі ўсіх утрудзіць!
Аднак, на колькі бачу з вашага здзіўлення,
Сервіз мой быў прадметам нават захаплення.
Магчыма, што ўжо я ў мае старыя годы
Такіх гасцей прымаць не буду мець нагоды.
Пан генерал, відаць, толк ведае ў бяседзе,
Прашу ўзяць гэту кнігу — згодзіцца вам недзе,
Як будзеце прымаць манархаў, чэсці вартых,
А можа, нават і самога Банапарта.
Ды перш скажу, як кніга кухарскай навукі,
Вось гэта, трапіла дзівосна ў мае рукі».

Тут раптам галасы знадворку загудзелі:
«Ура! Няхай жыве наш Пеўнік на касцеле!»
Таўпяцца ўсе, убачыць Мацька ўсе хацелі.
Суддзя насустрач госцю зразу паспяшае,
Вядзе к гасцям за руку, сесці запрашае

І кажа: «Пан Мацей, нядобры мой суседзе,
Прыходзіш позна, ледзь не па абедзе».
«Ем рана,— кажа Мацек,— я тут не для стравы,
А для таго, што мне здаўна было цікава
Пабачыць зблізку наша войска удалое.
Шмат гаварыць!— яно ні тое ані сёе!
Мяне там шляхта акружыла, ты ж ледзь згледзеў,
За стол вядзеш адразу, дзякую, суседзе».
Сказаўшы, адвярнуў талерку дном угору
І змоўк з аблічнам поўным нейкага дакору.

«Дык, пан Дабрынскі,— мовіў генерал Дамброўскі,—
Ты гэта той рубака слаўны касцюшкоўскі,
Мацей, празваны Розгай! Ведаю з дзён славы!
А ты яшчэ бадзёры, бачу, і рухавы!
А колькі год мінула! Я ўжо стаў хіліцца,
Вунь і ў Князевіча ўжо волас серабрыцца,
А ты яшчэ супроць любога мог бы выйсці.
І Розга, пэўне, так цвіце, як і калісьці.
Я чуў, што маскалёў ты адсцябаў нядаўна.
А дзе ж твае браты, што б'юцца гэтак спраўна?
Пабачыць Брытвы і Сцізорыкі я мару —
Апошнія Літвы даўнейшай экземпляры».

«А после той,— Суддзя прамовіў,— перамогі,
Дабрынскія пайшлі ў далёкія дарогі,
Магчыма, што прыпісаны дзе й к легіёну».
«І праўда,— адазваўся збоку шэф швадрона,—
У нас у роце ёсць вусатае страшыдла,
Вахмістр Мацей Дабрынскі, прозвішчам Крапідла,
Мазуры ж называюць 'шчэ яго Мядзведзем,
Яго прывесці можна, ён тут блізка недзе».
«І ёсць, — сказаў хтось,— тут з Літвы другія родам,
Адзін з іх Брытваю празваны між народам,
Ёсць і другі, якога знаюць па трамблёне,
І гранадзеры ёсць два ў пешым батальёне
Дабрынскія».

«А дзе ж ваш, славаю акрыты,—
Прамовіў генерал,— Сцізорык знакаміты,
Так панам Войскім мне сягоння выхваляны,

Нібы той волат казачны ці легендарны?»
«Сцізорык,— Войскі адказаў,— не аддаляўся,
Ды следства баючыся, ад Масквы хаваўся.
Усю зіму правёў у лесе, небарака,
Цяпер вось толькі выйшаў. Ён герой-ваяка,
Пайшоў бы й на вайну, бо ваяваць заўзяты,
Але шкада, што ўжо даволі стараваты.
Ды вось і ён!..» Тут Войскі паказаў у сені,
Дзе ў слуг натоўпе і цікаўных акружэнні
У той час лысіна вялікая заззяла,
Як поўня месяца, і тройчы то знікала,
Бы ў хмары, то ўзнімалася з-паміж народу,
Бо Ключнік кланяўся. Пралезшы, зараз з ходу
Сказаў:

«Яснавяльможны пане наш Гетмане
Ці генерале, ды тут важнае не званне,
Вось я Рамбайла стаў на вашае жаданне
З маім Сцізорыкам, якому бой крывавы
І гарт, а не прыгожасць назбіралі славы,
Аж нават вы аб ім пачулі, генерале.
Каб ён мог гаварыць, дык можа б мы сабралі
Крыху пахвалаў і руцэ маёй вось гэтай,
Што, дзякуй богу, не адно служыла лета
Сям'і Гарэшкаў, ну і ўсё жыццё Айчыне,
Аб чым сярод народу памяць не загіне.
Мапанку! Мала дзе ў нас пісар павятовы
Так пёры вострыць, як Сцізорык мой галовы.
Іх не злічыць! Вушэй, насоў нарэзаў кучы,
А ўсё, як і калісьці, востры і бліскучы.
І ні адзін яго не сапляміў злы учынак,
А ўсё вайна адкрытая ці паядынак.
Раз толькі! Божа, вечны дай яму спачынак,
Бяззбройны чалавек прыведзен быў да скону,
Але Бог сведка мне, што *pro publico bono*».

«Ну пакажы,— сказаў з усмешкаю Дамброўскі.—
Вось гэта дык сцізорык! Чысты меч катоўскі!»
І аглядаў з здзіўленнем страшную рапіру.
І афіцэры ўсе дзівіліся ёй шчыра,
У рукі бралі, ды амаль ніхто са збору

Не мог падняць мяча адной рукою ўгору.
Казалі, што Дамбінскі, у руках магутны,
Парушыў бы мячом, але ён быў адсутны.
З прысутных жа адно швадрона шэф Двярніцкі
І камандзір узвода малады Ружыцкі
Маглі валодаць жалязякай не без мукі.
І так Сцізорык пераходзіў з рук у рукі.

Ды генерал Князевіч, ростам найвышэйшы,
Ў руках таксама аказаўся найдужэйшы.
Рапіру ўзяўшы, лёгка ўзняў яе, як шпагу
І зразу прыкаваў да ўзбліскаў сталі ўвагу,
Прыпомніўшы ўсе фехтавальныя прыёмы:
Крыжовы ўдар, млынок, не ўсім вядомы,
Так званы, *крадзены* і цэлы рад *тэрцэтаў*,
Якія знаў, бо быў з вучылішча кадэтаў.

Калі з усмешкай фехтаваў, Рамбайла ўкленчыў,
Схапіўшы за калені, са слязамі енчыў
За кожным рухам і узмахам генерала:
«Ці ж ты канфедэратам быў? Цудоўна! Ўдала!
Пуласкіх гэта ўдар! Так Дзержаноўскі біўся,
А гэтак Сава! І ў каго ж пан навучыўся?
Хіба ў Дабрынскага! А гэта? Пабажуся,
Пан генерал, мой гэта ўдар, я не хвалюся,
Ім карысталіся Рамбайлы! Без падманку,
Ён ад майго імя завецца «*ўдар Мапанкаў*».
Хто ж вас вучыў? Мой гэта ўдар, мае прытрымкі!»
Устаў і захапіў Князевіча ў абдымкі:
«Памру цяпер спакойна, бачу, не загіне
Маё уменне, і прытулак даць дзяціне
Ўжо ёсць каму, бо я не меў ужо надзеі,
Што гэты меч пасля мяне не заржавее!
Не заржавее, не! Прабач, яснавяльможны
Пан генерал, ражны, што ў вас тут носіць кожны,
Нямецкія кійкі, што ў вас завуцца шпагі,
Вам не да твару, не для вашае павагі!
Вось мой Сцізорык я ля вашых ног складаю —
Ўсё самае мілейшае, што толькі маю.
Ніколі жонкі я не меў, дачкі, ні сына,
Ён быў мне жонкай і дзіцём і быў няспынна

Заўжды пры мне. І я ад рання аж да змроку
Ласкаў яго, а ўночы спаў ён каля боку!
Цяпер вісіць над ложкам, як закон габрэя,
Бо я не той ужо, рука мая старэе.
Я думаў, што са мной ён пойдзе ў глыб магілы,
Ажно наследніка сваёй знаходжу сілы!»

А генерал напоў з усмешкай, паўузрушан,
Сказаў: «Адмовіцца ад дару буду змушан,
Бо ты, аддаўшы жонку мне сваю і сына,
На старасць будзеш і ўдаўцом і сірацінай!
Якая ж плата дар твой можа ўзнагародзіць,
І што тваё ўдаўство, сіроцтва асалодзіць?»
«Ці ж я Цыбульскі,— Ключнік скрыўдзіўся не ў жарты,—
Які прайграў салдатам рускім жонку ў карты,
Як песню ў нас пяюць? Я задаволен гэтым,
Што мой Сцізорык ’шчэ заззяе перад светам
У гэткіх вось руках. Ды толькі, генерале,
Глядзіце, каб тасьму далёка распускалі,
Бо доўгі ён. Ад левага бярыце вуха
Аберуч, дык з пляча разрэжаце да бруха».

Узяў Сцізорык генерал, ды ля папругі
Насіць не мог, у воз яго схавалі слугі.
Што сталася з ім потым, розна гаварылі,
Але ніхто не ведае да гэтай хвілі.

Дамброўскі мовіў Мацьку: «Дружа, я ў здзіўленні,
Няўжо не рад ты нашаму сюды з’яўленню?
Маўчыш скваснелы! Як табе не скача сэрца
Ад тых арлоў на сцягах? Трубы на паверцы
Табе над вухам слаўны марш Касцюшкаў граюць!
Мацей, ты не такі, як аб табе тут баюць.
Я думаў, што калі ты на каня не ўскочыш,
То хоць з усімі намі піць, гуляць захочаш!
За кесара падымеш тост і за надзеі!»

«Га! — адказаў Мацей,— я бачу ўсе падзеі!
Ды разам двух арлоў ніхто не зможа згнездзіць!
А ласка пана на кані пярэстым ездзіць!

Напалеон — герой, ніхто таго не скрые!
Але Пуласкія, мае сябры старыя,
Казалі, паглядаючы на Дымур'ера,
Што нам трэ' польскага героя-кавалера,
Не італьянца, не француза, але Пяста —
Юзэфа, Яна ці Мацея — вось і баста.
Тут, кажуць, войска польскае, ды фізільеры,
Сапёры, гранадзеры і кананіеры!
Нямецкіх назваў больш у гэтай зграі,
Чым нашых польскіх! Хто іх распазнае!
І, пэўне, ў вас татараў ці мо туркаў многа,
Схізматыкаў, што ў іх ні веры, ані бога:
Сам бачыў — на жанчын у вёсках нападаюць,
Касцёлы грабяць, падарожных абдзіраюць!
Яны ў Маскву ідуць! Далёкая дарога!
І калі толькі кесар выбраўся без Бога!..
Я чуў, што ён ужо духоўнымі пракляты.
А гэта ёсць...» Мацей спыніў тут сказ пачаты,
Хлеб памачыў у боршч і стаў жаваць без слова.

І Падкамораму не ўсмак была прамова,
І моладзь загула. Суддзя ўмяшаўся ў свары
Аб'явай пра з'яўленне ў залі трэцяй пары.

Быў гэта Рэент, рэентам ізноў назваўся.
Ніхто яго пазнаць не мог — ён апранаўся
Заўжды па-польску, а цяпер праз Талімэну
Зрабіць быў змушаны ў адзежы перамену
І апрануцца па-французску адмыслова.
Відаць, што фрак адняў яму душы палову:
Ідзе, як кій глынуўшы, проста, нерухава,
Як жораў, і ні ўлева не зірне, ні ўправа.
Хоць твар спакойны, ды на ім відочны мукі:
Не знае, як зрабіць паклон, куды дзець рукі.
Ён жэсты так любіў — за пояс рукі ўсаджваў,
А пояса няма — дык вось жывот пагладжваў.
Памылку згледзеўшы, сумеўся небарака
І ўсунуў дзве рукі ў адну кішэню фрака.
Ідзе між кпін наўкольных, рад бы быў схавацца,
Ды змушан, як злачынства нейкага, стыдацца.

Аж здрыгануўся, Мацька згледзеўшы у залі.

А Мацек з Рэентам заўсёды сябравалі.
Цяпер на Рэента стары так глянуў злосна,
Што той спалохаўся, яму ўміг стала млосна,
І ад няёмкасці руку ўзняў зашпіліцца.
Дабрынскі ж толькі двойчы вымавіў: «Дурніца!»
І так абурыўся за гэткае убранне,
Што з-за стала падняўся і без развітання
Сеў на каня крадком і вымкнуўся дахаты.

Тым часам Талімэна свой убор багаты
І прыгажосць паказваць цешыцца з нагоды,
Бо ўсё на ёй сягоння найсвяжэйшай моды.
Ў якой была сукенцы, галаўным уборы,
Дарма пісаць пяром, дарма ўсе абгаворы,
Мо пэндзаль паказаў бы цюлі і птыфэні,
Бландзіны, кашаміры, перлы і каменні,
Ружовасць твару, вока ўзбліскі, броваў цені.

Пазнаў яе і Граф, дык бледны ад знявагі,
Ускочыў з-за стала, шукаў ля боку шпагі:
«І гэта ты!— ускрыкнуў.— Ці тут злыя мары?
Ты на маіх вачах ідзеш з другім у пары?
Ілжывая, куды цябе нявернасць кліча?
І не схаваеш зараз пад зямлю аблічча?
Дык гэтак помніш тое, ў чым ты мне клялася?
Пашто ж мне стужка гэта вось твая здалася?
Бяда таму, хто так мяне зняважыў груба!
Праз труп мой хіба пойдзе ён з табой да шлюба!»

Усталі госці, Рэент страшна ўсхваляваўся,
Тут Падкаморы ворагаў змірыць стараўся.
А Талімэна, Графа клікнуўшы ў старонку:
«Яшчэ,— шапнула,— ён не ўзяў мяне за жонку.
Калі ты пратэстуеш, дык у чым тут гора?
Скажы мне толькі зараз проста, цвёрда, скора:
Ці ўсё кахаеш, ці ў пачуццях не змяніўся
І ці са мною зараз ты б тут ажаніўся,
Сягоння, зараз? Хочаш, Рэента пакіну!»
Граф адказаў: «І зразумей ты тут жанчыну!

Ты гэткаю была ў пачуццях паэтычнай,
А зараз сталася бясконца празаічнай.
І што ў вас за жаніцьбы? Хіба дзеля мукі,
Бо не кранаюць душ, а толькі вяжуць рукі.
Павер, прызнанні ёсць без лішніх слоў, без ласкі
І без абавязацельстваў ёсць абавязкі!
Два сэрцы закаханыя на'т і здалёку
З сабой вядуць размову, быццам зоркі ў змроку.
Хто знае! Можа ад таго зямля ад сонца
Імкнецца і так міла месяцу бясконца,
Што бачаць век сябе, бягуць к сабе заўсёды,
Ды зблізіцца з сабой няма у іх нагоды!»
«Даволі гэтага,— спыніла,— не планета
Я, з ласкі Божай, пане Графе, а кабета.
Даволі плесці тут ні тое ані сёе.
Прасцерагаю, піснеш слоўца хоць малое,
Каб шлюб сарваць, дык так, як Бог святы мне мілы,
Я скочу з кіпцюрамі ў твар і з цэлай сілы...»
«Не буду,— Граф сказаў,— разбурваць шчасце пані».
І сумны позірк адвярнуў без хвалявання.
Пасля, як пакараць нявервую каханку,
Звярнуў сваю ўсю ўвагу на Падкамаранку.

А Войскі з думкай, што зайздроснікаў пагодзіць
Разумным прыкладам, пачаў ізноў выводзіць
Гісторыю Налібацкую з даўніх часаў
Пра спрэчку Рэйтана і князя фон Дынасаў,
Але, марожанае скончыўшы і воды,
Усе на двор выходзяць дзеля ахалоды.

Канчаюць і сяляне. Мёд гарыць у шклянцы,
Збан кружыць, але вось рыхтуюцца ўжо танцы.
Тадэвуша шукаюць. Аж знайшлі нарэшце —
Шаптаў ён штосьці, адышоўшы ўбок, нявесце:

«Хачу я, Зофія, пра нешта запытацца,
Я з дзядзькам гаварыў, не будзе ён спрачацца.
Вось большасць вёсак, што маімі стацца маюць,
Табе, паводле права, ў спадку прыпадаюць,
Таму з'яўляюцца тваімі і сяляне.
Не смею лёсу іх змяніць без згоды пані.

А ў час, як зноў мы жыць у вольным краі сталі,
Ці ж хопіць, каб сяляне столькі скарысталі
У тым, што пана на другога памянялі?
Што праўда, і ранейшы пан быў к ім ласкавы,
Ды невядома, як павернуцца ўсе справы,
Вось я салдат, і мы смяротныя абое,
Магу і не заўсёды згодным быць з сабою,
Лепш будзе, калі я зракуся ўлады панскай
І пад апеку права лёс аддам сялянскі.
Мы вольныя, хай будуць вольнымі й сяляне,
Аддайма ім зямлю на вечнае ўладанне,
Бо за яе яны крывавай працай плацяць
І цэлыя вякі ўсіх кормяць і багацяць.
Але хачу напомніць: з земляў перадачай
Даходы ў нас паменшацца, бо як жа йначай?
Я змоладу прывык да сціплага даходу,
Ты ж, Зофія, з высокага паходзіш роду
І правяла ў сталіцы маладыя годы,
Ці згодзішся застацца ў вёсцы назаўсёды
Шляхцянкаю?»

Дык Зося сціпла адказала:
«Жанчына я, аб гэтых справах знаю мала,
Вы мужам будзеце, для рад я маладая,
Што міла вам, таго й мая душа жадае.
Калі, ім даўшы волю, будзеш і бяднейшым,
То для душы маёй ты станеш даражэйшым.
Пра род свой мала ведаю і мала дбаю,
Была я сіратой бяздомнаю і знаю,
Што я была ў Сапліцаў за дачку прынята
І з ласкі іхняе вось ты мяне засватаў.
Я вёскі не баюся, хай сабе і годы
Жыла я ў горадзе даўней, але заўсёды
Сяло любіла, і мілейшыя мне куры
Былі заўжды, чым горад той чужы, пануры.
Калі я па людзях, па гулях сумавала,
Дык гэта ў час дзяцінства, а цяпер пазнала,
Што ў горадзе сумую. Як была зімою
У Вільні, дык ніяк не мела супакою
І сярод гуляў думала пра Сапліцова.
Тут мне знаёма ўсё, я молада, здарова,

Умею і ключы насіць, і працы не баюся.
Убачыш, як я гаспадарыць навучуся!»

А ў час, як Зося словы тыя дамаўляла,
З ёй побач стаў Гервазы, здзіўлены нямала:
«Я чуў,— сказаў,— Суддзя казаў мне пра свабоду,
Але не ведаю, нашто яна народу!
Баюся, ці няма тут выдумкі нямецкай,
Бо воля толькі нашай справай ёсць, шляхецкай!
Хоць, праўда, ўсе мы род выводзім ад Адама,
Я чуў, што мужыкі ўрадзіліся ад Хама,
Габрэі ад Яфета, шляхта ўся ад Сіма,
Таму вось і пануем мы над абаімі.
Вядома, ксёндз іначай вучыць на амбоне...
Ён кажа, што ў старым было вось так законе,
Але калі Хрыстос, хоць з царскага быў роду,
Радзіўся ў стайні сярод простага народу,
Дык тым усіх зраўняў, прынёс любоў і згоду.
Няхай і гэтак будзе, калі йнакш не можна!
Тым больш, калі пачуў я, што з яснавяльможнай
Маёю паняй Зофіяй прайшла нарада.
Мне выпаўняць яе загад — пры ёй улада.
Але засцярагаю, каб вы ім не далі
Пустой свабоды, слоўнай, каб не прагадалі.
Нябожчык Карп пусціў сваіх сялян на волю,
А цар ім тройчы горшую прыдумаў долю.
Я раджу, мужыкам, даўнейшым абычаем,
Шляхоцтва даць і аб'явіць, што мы прымаем
Іх к гербам. Частцы даць, напрыклад, Паўказіца,
Другім сваю Ляліву хай дасць пан Сапліца.
Тады Рамбайла мужыка прызнае роўным,
Калі той стане ўжо вяльможным і гярбоўным.
А сейм пацвердзіць.

Хай вас толькі не трывожыць,
Што перадача земляў моцна вас зубожыць.
Не дасць Бог, каб мазольныя я ўбачыў ручкі
Маёй сучаснай пані, Стольніка унучкі.
На гэта спосаб ёсць. Я знаю ў замку скрыню,
Ў якой ляжыць Гарэшкавых сталоў начынне,
Пры тым нашыйнікі, сыгнеты, бранзалеты

І зброя дарагая — шаблі, пісталеты.
Маёмасць добра захавана ад растраты,
Вам, пані Зофія, належыць скарб багаты.
Яго бярог, як вока, я — чаго таіцца?
Ад маскалёў ды і ад вас, паны Сапліцы.
Апроч таго я маю торбачку сваіх дукатаў,
Сабраных мною з падарункаў і зарплаты.
Я думаў, калі замак вернецца к нам зноўку,
За гэты грош направіць мур і абмалёўку.
Спатрэбіцца ён вам у гаспадарцы новай,
Дык к вам звярнуся, пан Сапліца, з прапановай:
Дазвольце жыць пры вас, пад панінай аховай
Гарэшкаў трэцяе ўжо нянчыць пакаленне.
Як будзе ў пані сын, прывіць яму уменне
Сцізорыкам валодаць. Войны надыходзяць,
А ў час ваенны хлопчыкаў жанчыны родзяць».

Ледзь словы гэтыя сказаў стары Гервазы,
Калі паважным крокам надышоў Пратазы,
Схіліўся і дастаў з-за пазухі паперы.
Там панегірык быў вялізарны без меры,
Напісаны сяржантам з сённяшняй нагоды.
Раней пісаў ён рыфмай у сталіцы оды,
Пасля уздзеў мундзір ды ўсё быў белетрыстам.
Вось Возны прачытаў радкоў ужо са трыста,
А як дайшоў да месца: «Ты, якой прыгожасць
Прыемны будзіць боль і мучыць страшна можа!
Калі ты на Беллону звернеш твар цудоўны,
Зламаюцца шчыты і пікі, безумоўна.
Зваюй Гіменам Марса, з гідры злой нязгоды
Рука твая гадзюк хай вырве назаўсёды!..» —
Тадэвуш з Зофіяй уладкі пляскаць сталі,
Але, папраўдзе, не хацелі слухаць далей.
Вось, стаўшы на стале, ксёндз голасам магутным
Тадэвушаву волю аб’явіў прысутным.

Пачуўшы навіну так важную, сяляне
Да паніча падбеглі, кінуліся к пані.
«Няхай жывуць пан з паняю!» — крычалі ў згодзе.
Тадэвуш крыкнуў: «Роўнасць хай жыве ў народзе!»
Дамброўскі мовіў: «За народ падымем чашы!»

Народ крычаў: «Жывуць хай камандзіры нашы!
Хай армія жыве! Свабода! Люд наш просты!»
І так ішлі чаргой віваты, крыкі, тосты.

І толькі Бухман радасці прычын не бачыў,
Праект хваліў, але ахвотна б перайначыў,
А перш камісію б легальную назначыў,
Якая б... Часу грамадзе было замала,
Таму яна з яго парад не скарыстала.

Бо на замковага двара вялізарным абшары
Пасталі госці, пазбіраўшыся ўжо ў пары.
«Давайце паланез!» — чуваць навокал словы.
Прыводзяць афіцэры свой аркестр вайсковы,
Але Суддзя звярнуўся тут да генерала:
«Скажыце, каб капэлія крыху счакала,
Сягоння ж, знаеце, заручыны спраўляем,
А ў родзе нашым, страдаўнейшым звычаем,
У гэты дзень вясковыя музыкі граюць.
Вось дудары, скрыпач і цымбаліст чакаюць,
Вунь бедакі нярвуюцца, той скрыпку ўзносіць,
А вось дудар паклонам і вачыма просіць.
Калі адправіць іх, паверце мне, заплачуць.
Пры іхняй музыцы сяляне лепш паскачуць.
Няхай пачнуць, няхай пацешацца сяляне,
Тады паслухаем аркестравага грання».
Даў знак.

Скрыпач абодва закасаў рукавы,
Грыф сціснуў, барадой прыпёрся да падставы
І смык, нібы каня, пусціў у ход з наскоку.
На гэта дудары, што там стаялі збоку,
Як крыллямі б'ючы, няспынным локцяў рухам
Мяхі сціскаюць, твары надзімаюць духам.
Падумаеш, што вось яны з таго задору,
Нібы Барэя дзеці, узлятуць угору.
Цымбалаў нестае.

Было музыкаў многа,
Але не ўпросіш граць пры Янкелю нікога.
(А Янкель быў на ўсю зіму кудысьці скрыўся,

Кніга восьмая
Шляхта гуляе

Книга восьмая
Шляхта гуляет

Księga ósma
Szlachta hula

Цяпер з галоўным штабам войска зноў з'явіўся.)
Вядома ўсім было, што ён мастак удалы,
Што, як ніхто, любіў і разумеў цымбалы.
Дык інструмент нясуць, грацъ просяць цэлым хорам,
А ён бароніцца, што адчувае сорам,
Што агрубеў, бо грацъ даўно не давялося,
З паклонам уцякае. Бачыць гэта Зося,
Бяжыць к яму і з белай падае далоні
Кручкі, якімі цымбаліст у струны звоніць.
Другой рукою гладзіць бараду старога,
З паклонам просіць: «Ну паграйце, хоць нямнога,
Мае ж заручыны сягоння, вы ж хацелі
І абяцалі на маім пагр噢цъ вяселлі».

Любіў надзвычай Янкель Зосю. Барадою
Кіўнуў на згоду, дык таўпяцца грамадою
К яму, падносяць крэсла, падаюць цымбалы,
Кладуць іх на калені. Рад музыка ўдалы,
Глядзіць на ўсіх, як ветэран, калі унукі
Са сценкі меч яго цяжкі бяруць у рукі;
Смяецца дзед і, хоць даўно не кратаў зброі,
Упэўнен, што рука не выйшла йшчэ са строю.

Тым часам вучні два, прыкленчыўшы ў паклоне,
Наводзяць інструмент — у струны ціха звоняць,
А Янкель, зрок прыжмурыўшы шчасліва,
Трымае палачкі ў руках, сядзіць маўкліва.

І вось ударыў зразу тактам трыумфальным,
Пасля стаў сеч гусцей, нібы дажджом навальным.
Здзівіў усіх, ды гэта — толькі спробы гукі,
Бо ўраз спыніў іх, прыпадняўшы ўгору рукі.

Зноў грае: тон дрыжачы ледзь кранае вуха,
Нібы струну чапіла лёгкім крыллем муха,
Узняўшы ціхі зык працяглага бранчэння.
Мастак глядзеў у неба і чакаў натхнення.
Зірнуў з гары, інструмент змерыў вокам горда,
Узняў угору рукі і спусціў іх цвёрда.
Здумеліся усе...

Ўвесь струн набор вялікі
Так грымнуў, быццам яньічарскія музыкі
Ударылі ў званкі, ў талеркі, ў бубны, ў трубы.
Гудзе «*Маёвы паланез*»! Напеў той любы
Прыносіць радасць, радасцю слых поіць —
Гуляць дзяўчаты хочуць, хлопцы аж не ўстояць.
Але старых панеслі ў прошлае ўспаміны,
У час такі шчаслівы для ўсяе краіны,
Калі паслы з сенатам у агульнай залі
З народам зміранага караля віталі,
У танцах пяючы: «Віват кароль жаданы!
Віват саслоўі ўсе! Віват дэлегаваным!»

Мастак прыспешвае зноў такты з сілай дужай,
Ды вось пусціў акорд фальшывы, як сык вужа,
Як быццам бы па шкле жалеза скрыгатала,
Ажно дрыготка праняла ўсіх і скавала.
І ўсе з трывогай пазіралі неспакойна:
Музыка мыліцца, ці інструмент нястройны?
Не змыліцца такі! Сумысля ён кранае
Струну здрадлівую і песню абцінае,
Штораз мацней дае акорд расхваляваны,
Супроць акордаў згодных сканфедэраваны.
Аж Ключнік, зразумеўшы, ў чым тут таямніца,
Азваўся: «Знаю, знаю! Гэта — Т а р г а в і ц а!»
І раптам, пырснуўшы, струна аж засвістала.
Музыка рушыць прымы, такты рве нядбала,
Кідае прымы, звоніць гулкімі басамі.

Гудзіць інструмент тысячнымі галасамі:
Такт маршу, штурм, атака, крык чуваць і стрэлы,
Плач матак і дзяцей. Вось так мастак умелы
Аддаў страхоцце штурму, аж уздрыгваў смелы,
Аж плакалі сялянкі, бо прыпаміналі
Р а з н ю у П р а з е , пра якую з песняў знaлі.
Дык рады зноў, што пасля ўдару са ўсёй сілы
Ён гук зглушыў, бы ўгнаў яго у глыб магілы.

Ледзь слухачы маглі апомніцца з здзіўлення,
Зноў музыка другая — ціхае бранчэнне

Спярша ў струн некалькі, што енк іх рвецца, гіне,
Як зык ледзь чутны мух, прарваўшых павуцінне.
Ды струнаў прыбывае, адзіночкі тоны
Злучаюцца ў акордаў гучных легіёны
І ўжо ступаюць тактам смелым, роўным, згодным,
І льюцца песняю з напевам сумным, родным:
Пра беднага салдата, што брыдзе лясамі,
Нядоляй зморaны і голадам, часамі,
І ўрэшце падае з каня, бо страціў сілу,
А конік ножкай рые для яго магілу.
Старая песня! Як яе паслухаць міла!
Пазналі ўсе яе, дык войска абступіла
Цясней музыку. Слухалі і ўспаміналі
Той страшны час, калі радзіму пахавалі
І з гэтай песняй падаліся на ўскрай свету.
Прыпомнілі і ўсю сваю вандроўку гэту
Праз землі, моры, праз пустыні, па марозе,
Дзе між чужымі на папасе ці ў дарозе
Уцешылі не раз іх роднай песні словы.
І сумна пачалі скланяць свае галовы.

Ды ўраз узнялі іх, бо такт ужо жвавее
І з тонаў зменeных другое нешта вее.
Мастак ізноў з гары глядзіць на струны горда
І дзве рукі за раз на іх ускінуў цвёрда.
Удар быў гэткі ўмелы, так рвануў басамі,
Што струны загулі труб звонкіх галасамі,
І з труб тых голас песні пад нябёсы хлынуў —
Марш трыумфальны: «*Польскі край яшчэ не згінуў!..*»
«Марш, марш Дамброўскі ў Польшчу!» — ў ладкі ўсе пляскалі
І дружна: «Марш Дамброўскі!» — хорам усклікалі.

Самога мастака здзівілі песняў гукі,
Калочкі выпусціў, падняў угору рукі,
А шапка лісяя звалілася на плечы.
Развейваў ветрык бараду старэчы,
Пунсовым шчокі заірдзеліся адценнем,
А зрок яго юнацкім палымнеў натхненнем.
Як зноў Дамброўскага перад сабою ўбачыў,
Закрыў рукамі вочы і прамовіў з плачам:
«Пан генерал,— сказаў,— даўно Літва ўжо наша

Цябе чакала, як габрэі Месіяша,
Цябе і спевакі прарочылі між людам,
І неба твой прыход нам аб'явіла цудам,
Жыві, ваюй, ты наш...» І плакаў небарака,
Бо польскі край любіў не меней за паляка.
Руку падаў яму Дамброўскі ўсхвалявана,
Ён шапку зняў, пацалаваў руку з пашанай.

І паланез пачаць пара. Дык Падкаморы
Вылёты кунтуша закінуў, рушыў скора,
З паклонам ветлівым руку к вусам узносіць,
Зблiжаецца да Зосі і у танец просіць.
За Падкаморым пары сталі шчыльным радам,
Пачаўся танец — ён камандуе парадам.

Над зеленню чырвоныя ірдзеюць боты,
Б'е ззянне з шаблі, свеціць пояс пазалотай,
А ён ідзе памалу, быццам так, нарокам,
Але за кожным рухам і за кожным крокам
Танцора пачуццё і думка праглядае.
Вось стаў, як быццам даму запытаць жадае,
Схіляе к вушку галаву, глядзіць у вочы.
Саромеецца дама, выслухаць не хоча.
Ён зняў канфедэратку, просіць вінавата.
Зірнула дама, ды маўчыць яшчэ заўзята.
Ён памалей ступае, заглядае ў зрэнкі
І раптам засмяяўся. Рады, ля паненкі
Хутчэй ідзе, глядзіць навокал з недавер'ем,
Сваю канфедэратку з белай чаплі пер'ем
Насуне, то ізноў адслоніць волас русы,
Аж вось звярнуў яе на вуха, круціць вусы.
Ідзе, ■ ўсе зайздросцяць, даганяюць жвава,
А ён хацеў бы з дамай вымкнуцца з забавы,
Часамі стане, ветліва руку узносіць
І, каб яго міналі, ўсіх ласкава просіць.
А часам ухітраецца і ўбок захіліць,
Мяняе сцежку, думае, сяброў мо змыліць,
Але бягуць за ім дакучліва і хутка,
І нельга вырвацца з таго жывога скрутка.
Дык злы, руку кладзе на шаблі рукаятку,
Як бы казаў: «Зайздросных навучу парадку!»

І з выклікам адважным на чале і ў воку
Ідзе ў натоўп, а той яго не смее кроку
Спыніць і расступаецца, змяніўшы шыкі,
Аднак усе бягуць за ім.

Гудуць ускрыкі:
«Ах, мо апошні ён! Глядзіце на палетак!
Апошні мо, што паланез танцуе гэтак!»
За парай беглі пары гучна і вясёла,
Раскручвалася, зноў закручвалася кола,
Як вуж вялізарны, што ўецца між прастораў.
Пераліваюцца лускою фарбы ўбораў
Салдацкіх, панскіх, дамскіх і гараць бясконца
У пазалоце, што заходзіла ўжо, сонца,
Адбіўшыся на цёмным зелені ўзгалоўі.
Кіпіць гульня, гудзе аркестр, п'юць «за здароўі!»

Адзін капрал Дабрынскі Сак ані музыкаў
Не чуе, не гуляе, не ўзнімае крыкаў,
Стаіць з рукамі за спіною, з неахвотай
Успамінаючы даўнейшыя залёты —
Як абрываў для Зосі кветкі ля крынічкі,
Кашолачкі ёй плёў, вырэзваў завушнічкі.
Няўдзячная! Ўсе падарункі змарнаваны!
Хоць уцякала, хоць быў бацькам пакараны
Не раз, ішоў і на паркан стары ўзбіраўся,
Каб праз акно пабачыць. Праз каноплі краўся,
Каб толькі паглядзець, як палівала градкі,
Гуркі збірала ці карміла кураняткі.
Няўдзячная! Тут галаву ўцягнуў і свіснуў
Мазурку, а пасля кашкет глыбей націснуў,
Пайшоў у бок гарматаў, дзе стаяла варта
І, каб прагнаць нуду, пачаў граць у дружбарта
З сябрамі, чаркай асалоджваючы жаласць.
Такую меў да Зосі ён пачуццяў сталасць.

А Зося ўсё танцуе. Хоць у першай пары,
Аднак здалёк ледзь бачная на тым абшары
Зарослага дзядзінца, дзе натоўп быў гэткі.
Апраненая ў зелень, выстраена ў кветкі,
Між траў і кветак кружыцца няспынным лётам,

Кіруе танцам, як анёлы зор зваротам:
Згадаеш, дзе яна, бо Зосю бачыць кожан,
Бо кожны Зосяю сягоння заварожан.
І дарма Падкаморы цягне танца хвілі,
Зайздроснікі яе ў яго ужо адбілі.
Нядоўга і Дамброўскі шчасцем карыстаўся,
Другому адступіў, а там і трэці гнаўся,
І той, адбіты, пазірае ўслед з тугою.
Аж Зося, зморaная, ўбачыла чаргою
Тадэвуша і, баючыся вандравання,
З ім застаецца, пакідае круг гуляння,
Ідзе к сталу наліць гасцям віна ў келíхі.

А сонца гасла, вечар цёплы быў і ціхі,
Круг неба быў там-сям у хмарачкі спавіты,
На захадзе гарэлі ружамі блакіты.
Відаць, к пагодзе — хмаркі лёгкія ўрачыста
Плылі, як па траве авечак гурт пушысты,
А збоку дробныя, як качак статкі.
На захадзе хмурынка з беражком нягладкім
Фіранкай выглядае тонкай і ажурнай
З залочаным рубцом, з сярэдзінай пурпурнай.
Яна заходу блескам тлела, прамянела,
Але памалу зжоўкла, зблякла, пашарэла.
Спусціла сонца твар, фіранку зацягнула
І, уздыхнуўшы цёплым ветрыкам, заснула.

А шляхта п'е нястрымна, тосты бурна ўзносіць
За камандзіраў, за Тадэвуша, за Зосю,
За ўсе тры пары, злучаныя сёння ўранні,
За ўсіх гасцей, прысутных на гулянні,
За ўсіх сяброў, каго хто толькі спамятае,
За тых памёршых, памяць аб якіх святая.

І я там быў з гасцямі, піў і мёд, і віны,
А кнігі гэтыя — з тых часаў успаміны.

• К а н е ц •

[ЭПІЛОГ]

Пра тое ж марыць на парыжскім бруку
З вушамі поўнымі штодзённа стуку,
Праклящяў і ілжы, папрокаў позніх,
Пустых намераў, спрэчак злосных, розных!

Бяда, уцекачы, што ў час суровы
Мы неслі ў край чужы свае галовы!
Бо, дзе ступілі, ўслед ішла трывога,
І ворагаў мы сустракалі многа.
А зараз нам тут, сцесненым, замкнутым,
Жадаюць хуткай смерці ў ланцугу тым.

Калі не верыць свет слязам, пакутам,
Калі магільным рэхам звону
Іх страшаць звесткі з Польшчы, з-за кардону,
Калі ахова ім жадае скону,
Магільшчык-вораг вабіць іх з палону,
Калі і ў небе бачаць толькі злыдні,
Не дзіва, што ўсё вокал ім абрыдне,
Што, розум страціўшы ў вялікім горы,
Грызуцца, ўгразшы ў спрэчкі й абгаворы!

* * *

Хацеў мінуць я, птах малых узлётаў,
Мінуць маланкі, буры і грымоты
І толькі ценю пашукаць, пагоды
У тым баку, дзе дом, дзяцінства годы...

Шчаслівы той, хто шэраю гадзінай
Прысесці мог з сябрамі ля каміна,
Замкнуцца ад Еўропы амбарасаў,
Пабегчы думкай да дзяцінства часаў
І марыць, думаць пра сваю краіну...

Але пра кроў, што ў тыя дні лілася,
Пра слёзы, што ракой плылі ў тым часе,
Пра славу, што яшчэ не разышлася,
Аб іх падумаць не хапала сілы!

Бо гэткі здзек цярпеў народ мой мілы,
Што, скіраваўшы зрок на тыя мукі,
Сама адвага заламала б рукі.

Бо пакаленне чорнае з жалобы,
Цяжарныя кляцьбой паветра ўтробы
Не кіравалі нашых дум дадому,
Туды, дзе нават страшна птушкам грому!

О Маці Польшча! Ля тваёй магілы
Расказваць пра цябе не хопіць сілы!

Хто ж сёння ў нас настолькі лёгкакрылы,
Хто гэткае знайсці умее слова,
Што мармур роспачы прабіць гатова,
Што зніме з сэрца каменнае века,
Крыніцы воч развяжа ў чалавека
І зробіць, што сляза нанова пойдзе?
Пакуль такога знойдзем, век мо пройдзе.

Калісь, як сціхне помсты рык ільвіны,
І трубы роднай прагучаць краіны,
А вораг выдасць крык апошні болю,
Замоўкне і абʼявіць свету волю,
А нашыя арлы, як бліскавіцы,
Злятуць да Хробрага старой граніцы
І трупамі насыццаца, крывёю
Ды зложаць крыллі зноў на час спакою,
Тады з дубовымі вянкамі славы,
Пакінуўшы мячы, абсядуць лавы
Героі нашы слухаць спеў цікавы!
Калі зайздросціць будзе свет іх долі,
Час будуць меце пачуць пра дні няволі
Бацькоў сваіх і лёсы іх уцяміць,
І твару іх тады сляза не спляміць.

Мы ў свеце, як няпрошаныя госці.
І ў будучым, і ў тым, што на пагосце
Адзіны край такі існуе ў Бога,
Дзе шчасця для паляка ёсць нямнога:
Дзяцінства край! Ён прад вачыма ўстане

Святы і чыст, як першае каханне,
Ўспамінамі памылак не разбіты,
Абманутай надзеяю не ўзрыты,
Не зменены нічым і не забыты,
Дзе рэдка плакаў я і не злаваўся.
З тым краем я ахвотна б прывітаўся,
З дзіцячым краем, дзе вясёлы гэткі
Я лугам бег і ведаў толькі кветкі
Прыгожыя. Мінаў благія бокам
І на карысныя не глянуў вокам.

Той край убогі, цесны, але шчасны,
Як Божы свет, быў гэткі наш уласны!
І як жа нашым там усё бывала,
Як помнім тое, што нас акружала,—
Ад ліпы, што ў свой цень глухі хавала
Усіх дзяцей сяла ад спёкі сонца,
Да ручайка, каменьчыка... бясконца
Нам дарагіх, знаёмых, мілых
Аж вунь да тых суседскіх хат пахілых!

І толькі тых ваколіц грамадзяне
Не здрадзілі ні дружбе, ні каханню,—
Сябры мне верныя дагэтуль недзе!
Бо хто ж там жыў? Браты, радня, суседзі
І маці. А каго з іх нeставала,
Ах, колькі ж гутаркі аб ім бывала,
Як доўгае было там шкадаванне!
Там, дзе ў слугі да пана больш прызнання,
Чым тут у жонкі любасці да мужа,
Там, дзе салдат па зброі болей тужыць,
Чым тут па бацьку сын. Больш там парою
Па выжле плачуць, чым тут па герою.

Сябры мне памаглі тады размовай
І ў песню слова кідалі да слова,
Як жураўлі, што ў казцы той вясковай,
Калі над выспай з замкам раз ляцелі
І хлопцу даць ратунак захацелі,
Па пёрку скінулі — дар небагаты,
Той крыллі змайстраваў і ўцёк дахаты...

О, дачакацца б мне такой уцехі,
Каб кнігі гэтыя прыйшлі пад стрэхі
І каб, кудзелю прадучы, сялянкі,
Калі закончаць любыя спяванкі
Пра дзеўчыну, якая граць любіла
І цераз скрыпку гусак пагубіла,
Пра сірату прыгожую, як зоры,
Што гусак гнала ў спозненую пору,—
Каб кнігі простыя мае, як гукі
Іх песняў, узялі сялянкі ў рукі!

Калісьці так на вёсцы ў час гуляння
Збіраліся пад ліпай для чытання
Пра Веслава, Юстыну, пра каханне.
А ля стала, спавіты злёгку ў дрому,
Сядзеў пан аканом, а то й пан дому
І слухаў, а калі запінку бачыў,
Цяжэйшае малодшым растлумачыў,
Хваліў прыгожасць, што не так — прабачыў.

Зайздросцілі мы песнярам іх славы,
Што там яшчэ ў лясах гудзе і ў полі,
Якім мілей, чым лаўры Капітоля,
Вянок, сялянкі сплецены рукамі,
З лістоў зялёнай руты з васількамі.

ТЛУМАЧЭННІ [АЎТАРА]

У загалоўку твора:

АПОШНІ НАЕЗД У ЛІТВЕ

У часы Рэчы Паспалітай Польскай выкананне прысудаў было вельмі цяжкім — у краіне, дзе выканаўчая ўлада амаль не мела пад сваім кіраўніцтвам ніякай паліцыі, а багатыя грамадзяне трымалі прыдворныя палкі, некаторыя нават, як князі Радзівілы, больш чым дзесяцітысячнае войска. Такім чынам, скаржнік, атрымаўшы дэкрэт, быў змушаны дзеля спагнання прысуду звяртацца да рыцарскага саслоўя, г. зн. да шляхты, якая мела таксама і выканаўчую ўладу. Узброеныя сваякі, сябры, суседзі ехалі з дэкрэтам у руках і ў суправаджэнні з возным дабывалі, часта не без крыві, прысуджаную скаржніку ўласнасць. Такая ўзброеная экзекуцыя дэкрэту называлася н а е з д а м. У даўнейшыя часы, пакуль шанавалі закон, найбагацейшыя паны не смелі супраціўляцца прысудам, напады здараліся рэдка, а гвалт амаль ніколі не заставаўся без кары. Вядомы з гісторыі сумны канец Васіля Сангушкі і Стадніцкага, празванага Д'яблам. Упадак грамадскіх звычаяў Рэчы Паспалітай стаў прычынай павелічэння колькасці наездаў, якія бесперапынна парушалі спакой Літвы.

КНІГА ПЕРШАЯ
р. 5—6:

Святая дзева, што бароніш Чанстахову
І ў Вострай браме свеціш.

Усе ў Польшчы ведаюць пра цудатворную ікону Багародзіцы на Яснай гары ў Чанстахове. У Літве славяцца цудамі іконы прачыстай дзевы Вострабрамскай у Вільні, Замкавай — у Наваградку, а таксама Жыровіцкай і Барунскай.

р. 149:

Не думай, што ў Суддзі ўсе абы-як служылі.

Расійскі ўрад ніколі ў заваёваных краінах не руйнуе адразу законаў і грамадскіх устаноў, але памалу падкопвае іх указамі. У Маларусі, напрыклад, утрымаўся аж да апошніх часаў Літоўскі Статут, адменены ўказамі. Літве пакінута ўся даўнейшая структура судоў грамадскіх і крымінальных. Па-даўнейшаму выбіраюцца суддзі земскія і гарадскія ў паветах, галоўныя ў губернях. Але дзеля таго, што апеляцыя ідзе ў Пецярбург у шматлікія інстанцыі розных ступеняў, дык пры мясцовых судах застаўся толькі цень даўнейшай традыцыйнай павагі.

р. 150:

Яны загаду пана Войскага чакалі.

Войскі *(tribunus)* быў некалі на службе апекуном жанок і дзяцей ў часе агульнай мабілізацыі. Ад даўніх часоў чын гэты, без абавязкаў, стаўся тытулярным. У Літве ёсць звычай, што паважаным асобам даецца праз ветлівасць нейкі стары тытул, які праз ужыванне становіцца правамоцным. Называюць, напрыклад, суседзі свайго сябра Абозным, Стольнікам ці Падчашым, перш толькі ў гутарцы і ў карэспандэнцыі, а пасля нават і ва ўрадавых актах. Рускі ўрад не прызнаваў гэтых тытулаў, стараўся іх асмяяць, уводзячы замест іх тытуляванне паводле рангаў сваёй іерархіі, да якой Ліцвіны дагэтуль маюць вялікую гідлівасць.

p. 178:

Пан Падкаморы з жонкай, з дочкамі прыехаў.

Падкаморы, калісьці службовец выдатны і паважаны, *Princeps Nobilitatis* стаўся пры панаванні царызму толькі тытулярным. Часам яшчэ судзіў справы аб межах, але ўрэшце і гэту частку юрысдыкцыі страціў. Цяпер бывае замяшчае маршалка і прызначае каморнікаў або павятовых землямераў.

p. 250:

Бо Возны ўпотай, як падаўся Войскі з дому...

Возны, або генерал, выбраны трыбунальскім ці судовым рашэннем з мясцовай шляхты, разносіў позвы, аб'яўляў інтрамісіі, рабіў судовы агляд бягучых спраў, выклікаў актараты і г. д. Звычайна гэту пасаду займала дробная шляхта.

p. 439:

Народ хадзіў за ім, як за якім рарогам...

Рарог — птушка з сям'і ястрабаў. Вядома, што дробныя птушкі, асабліва ластаўкі, ганяюцца за ястрабамі гуртам. Адгэтуль прымаўка: лятаць, як за рарогам.

p. 525:

Што Банапарты чараваў...

Шмат кружыць аповесцяў сярод простых рускіх людзей пра чары Банапарта і Суворава.

p. 576:

Асэсар з Рэентам, стралкі два і гулякі...

Асэсары ўтвараюць земскую паліцыю павету. Паводле ўказаў, часамі выбіраюцца грамадзянамі, часамі прызначаюцца ўрадам. Тыя апошнія завуцца кароннымі. Асэсарамі завуцца і апеляцыйныя суддзі, але тут гаворка не пра іх.

Рэенты актавыя кіруюць канцылярыяй, дэкрэтавыя пішуць прысуды,

а ўсіх іх прызначаюць на пасаду судовыя пісары.

р. 790:

Што б Несялоўскі нам сказаў...

Юзаф граф Несялоўскі, апошні Навагрудскі ваявода, быў прэм'ерам рэвалюцыйнага ўрада ў часе паўстання Ясінскага.

р. 796:

Белапятровічу і то паслаў адмову!..

Юры Белапятровіч, апошні пісар В. Кн. Літоўскага, прымаў чынны ўдзел у паўстанні пад кіраўніцтвам Ясінскага. Судзіў у Вільні палонных за здраду народнай справе. Чалавек, справядлівы і патрыятычны, вельмі ў Літве паважаны.

р. 850:

Перш Возны пояс зняў з яго шырокі, літы.

У Слуцку знаходзілася слаўная на ўсю Польшчу фабрыка залатых тканін і літых паясоў, удасканаленая стараннем Тызенгаўза.

р. 872:

Была гэта ваканда трыбунала...

Ваканда — вузкая прадаўгаватая кніжачка, куды запісвалі прозвішчы скаржнікаў абодвух бакоў судовай справы паводле парадку рэгістрацыі. Кожны адвакат і возны павінен быў мець такую ваканду.

р. 922:

І як французам кінуў сто сцягоў крывавых...

Генерал Князевіч, выпраўлены італьянскай арміяй, перадаў Дырэктарыі здабытыя сцягі.

р. 924:

Як з'ехаў Ябланоўскі ў край вясны бясконцай...

Князь Ябланоўскі, камандуючы Наддунайскай Легіяй, памёр у Сан Дамінга, дзе загінула амаль уся легія. У эміграцыі ёсць некалькі ветэранаў, што засталіся ад той нешчаслівай экспедыцыі, між іншымі, генерал Малахоўскі.

КНІГА ДРУГАЯ
р. 228:

Яна ў арган і іншыя інструменты іграла.

У даўнейшых замках стаўлялі на хорах арган.

р. 282:

> І чорнай поліўкай яго пачаставалі.

Чорная поліўка, паданая на стол хлопцу, які сватаўся, азначала адмову.

р. 501:

> У горадзе або ў віціннікаў зярняты...

Віціны — гэта вялікія судны на Нёмане, якімі ліцвіны карыстаюцца для гандлю з прусамі, сплаўляючы збожжа і атрымоўваючы ўзамен каланіяльныя тавары.

р. 823:

> Князь Домінік, калі мы раз з ім палявалі.

Князь Дамінік Радзівіл, вялікі ахвотнік да палявання, эміграваў у Княства Варшаўскае і за ўласны кошт паставіў полк кавалерыі, якім камандаваў. Памёр у Францыі. На ім згасла мужчынская лінія князёў з Алыкі і Нясвіжа, найбольшых магнатаў у Польшчы і, пэўне, у Еўропе.

р. 824—825:

> ... з тым генералам Меенам.

Меен праславіўся ў нацыянальным паўстанні ў часы Касцюшкі. Дагэтуль паказваюць пад Вільняй Меенаўскія акопы.

КНІГА ТРЭЦЯЯ

р. 264—265:

> Паненкі дык баравіка ўсё выглядалі,
> Якога песні ў нас палкоўнікам назвалі.

Вядомая ў Літве народная песня пра грыбы, якія выходзілі на вайну пад камандай баравіка. У гэтай песні апісаны ўласцівасці ядомых грыбоў.

р. 620:

> Наш мастак Арлоўскі...

Вядомы мастак, за некалькі гадоў да смерці пачаў маляваць пейзажы. Памёр нядаўна ў Пецярбургу.

р. 750—751:

> Дзве п’яўкі, слаўныя заядласцю й навукай —
> Сабака Спраўнікам завецца, Страпчай — сука.

Парода англійскіх сабак малых і дужых, празваных п’яўкамі, прыдатная да палявання на буйнага звера, асабліва на мядзведзя.

Спраўнік, або капітан спраўнік — начальнік земскай паліцыі. Страпчы — пасада накшталт дзяржаўнага пракурора. Гэта чыноўнікі, якія, маючы часта нагоду перавышаць сваю ўладу, знаходзяцца ў вялікай

пагардзе ў грамадзян.

КНІГА ЧАЦВЕРТАЯ

р. 9:

Закалыханы, сніў ваўка ў жалезнай зброі.

Паводле падання, вялікі князь Гедымін сасніў на Панарскай гары жалезнага ваўка і з парады песняра Ліздэйкі заснаваў горад Вільню.

р. 20:

Кароль, што Вітаўтаў насіў каўпак сталёвы.

Жыгімонт Аўгуст быў уведзены на сталіцу Вялікага Княства Лўтоўскага старым звычаем — падперазаў меч і каранаваўся каўпаком. Вельмі любіў паляванне.

р. 27:

Ці той Баўбліс расце, старэча дуплаваты...

У Росенскім павеце ў маёнтку Пашкевіча, земскага пісара, рос дуб, вядомы пад імем Баўбліса, які ў часы паганства ўшаноўваўся, як святыня. У жарале гэтага выгнілага волата Пашкевіч абсталяваў кабінет літоўскай старыны.

р. 30:

Ці ёсць Міндоўгаў гай ля фарнага касцёла?

Недалёка ад фарнага наваградскага касцёла раслі старыя ліпы, якіх шмат высеклі каля 1812 г.

р. 40—41:

... Шмат падыктавана
І песняру-казаку дубам-многабаем.

Гл. паэму Гашчынскага *«Замак Канёўскі».*

р. 248:

Прыпеўкі з Галіча...

Каламыйкі — рускія песні, падобныя да польскіх мазурак.

р. 263:

І на віцінным гандлі збожжам добра знаўся.

Гл. «Тлумачэнні» да Кн. II, р. 501.

р. 278:

На покуці сягоння бернардын садзіцца...

Пачэснае месца, дзе даўней стаўлялі хатніх багоў, дзе дагэтуль рускія

вешаюць абразы. На покуці літоўскі селянін садзіць госця, якога хоча ўшанаваць.

р. 536—537:

Арол, якога дзюба так у круг сагнецца,
Што ўжо замкнутай назаўсёды застанецца...

Дзюбы старых драпежных птушак з гадамі закрыўляюцца штораз больш і ўрэшце верхняя частка, замкнуўшыся, дзюбу замыкае, і птушка павінна здыхаць з голаду. Гэту народную думку прынялі некаторыя арнітолагі.

р. 540—541:

Таму у месцах тых, дзе чалавек праходзіць,
Ніхто касцей звярыны дохлай не знаходзіць.

Сапраўды, няма прыкладу, каб быў калі-небудзь знойдзены шкілет мёртвага звера.

р. 724:

А што? Мая стральбінка — дробненькая пташка...

Пташкі — гэта стрэльбы дробнага калібра, у якія ўкладаецца невялікая куля. Добрыя стралкі з гэткіх стрэльбаў збіваюць птушку ў палёце.

р. 825:

Пакуль дно залатым не заблішчала лістам.

У пляшках Гданьскай гарэлкі бываюць на дне лісткі золата.

р. 981—982:

І гэтакі зямлі палетак старгавала,
Які б накрыць адной валовай скуры стала.

Каралева Дыдона загадала парэзаць на палоскі валовую скуру і гэткім чынам ахапіла вялікую плошчу, на якой пабудавала места Карфаген. Войскі вычытаў апісанне гэтага здарэння не ў *«Энеідзе»*, а, пэўне, у каментарыях схаластаў.

Nb. Некаторыя месцы ў чацвёртай песні належаць пяру Стафана Вітвіцкага.

КНІГА ПЯТАЯ
р. 330:

І ў справу, як Пiліп з канопляў, умяшаўся.

Аднойчы на сейме пасол Піліп з родавага сяла Каноплі, выступіўшы з прамовай, так далёка адступіў ад тэмы, што выклікаў у зале пасяджэнняў агульны смех. Адгэтуль паўстала прымаўка: вырваўся, як Піліп з канапель.

КНІГА ШОСТАЯ

Загаловак:

ЗАСЦЕНАК

У Літве ваколіцай або засценкам называюць шляхоцкае паселішча, у адрозненне ад вёсак або сёл, сялянскіх паселішчаў.

p. 169:

Гарэшкам ён — вадой на кісялі дзесятай...

Кісель — літоўская страва, род жэле, якая робіцца з аўсянай рошчыны; палошчуць яе вадой да тае пары, пакуль не аддзеляцца ўсе мучныя часткі. Адтуль прымаўка.

p. 333:

...Валадковіч, злоснік небывалы...

Пасля шматлікіх скандалаў, схоплены ў Мінску і расстраляны, паводле дэкрэту трыбунала.

p. 381:

Праз віці вёў мабілізацыю ў павеце...

Калі кароль збіраўся правесці ўсеагульную мабілізацыю, загадваў утыкаць у кожнай парафіі высокую жэрдку з прывязанай на канцы мятлой, т. зв. віццю. І гэта называлася: раздаць віці. Кожны дарослы мужчына рыцарскага саслоўя быў абавязаны пад пагрозай пазбаўлення шляхоцтва неадкладна з'явіцца пад ваяводскую харугву.

p. 416:

Браць сталі прозвішчы, па-нашаму — мянушкі.

Мянушкі — гэта сабрыкеты.

p. 525:

Пацея бараніць...

Аляксандр граф Пацей, вярнуўшыся пасля вайны ў Літву, памагаў землякам, якія прабіраліся за граніцу, і значныя сумы пераслаў у касу легіёнаў.

КНІГА ВОСЬМАЯ

p. 77:

А там Давідаў воз скіроўвае свой дышаль...

Давідаў воз — сузор'е, названае астраномамі *Ursa major.*

p. 97:

Так і ў касцёле Мірскім ксёндз каля арганаў

Павесіў косці выкапнёвых веліканаў.

Быў звычай вывешваць у касцёлах знойдзеныя выкапнёвыя косці, якія народ прымае за косці волатаў.

p. 109:

Камета, што ляцела праз нябёс абшары.

Памятная камета 1811 года.

p. 145:

Ксёндз Пачабут быў астраномам там год колькі.

Ксёндз Пачабут, экс-езуіт, слаўны астраном, выдаў працу пра задыяк у Дэндэрах і сваімі назіраннямі дапамог Лаланду вылічыць арбіту месяца. Гл. *Біяграфія*, напісаная Янам Снядэцкім.

p. 233:

У свіце князя быў нямецкі князь Дынасаў.

У сапраўднасці — князь *de Nassau Siegen*, слаўны ў тым часе ваяка і авантурыст. Ён быў рускім адміралам і пабіў туркаў на Лемане, потым самога ўшчэнт разбілі шведы. Жыў нейкі час у Польшчы, дзе атрымаў індыгенат. Паядынак князя *de Nassau* з тыграм грымеў тады ва ўсіх еўрапейскіх газетах.

КНІГА ДЗЕВЯТАЯ

p. 165:

А з Ж о ў т а й к н і г а й вы знаёмы, пан Сапліца?

«Ж о ў т а я к н і г а», за колер вокладак гэтак празваная,— кніга варварскіх ваенных рускіх законаў. Часта ў мірным часе ўрад аб'яўляе цэлыя правінцыі на ваенным становішчы і на аснове «Ж о ў т а й к н і г і» аддае ваеннаму камандзіру поўную ўладу над жыццём і маёмасцю грамадзян. Вядома, што ад 1821 года аж да рэвалюцыі ўся Літва падпарадкоўвалася «Ж о ў т а й к н і з е», экзекутарам якой быў вялікі князь-цэсарэвіч .

p. 456—457:

Валочыць за сабой даўгое ў сажань дрэва,
З той крамянёвай гузаватай булавою...

Літоўская булава робіцца гэткім чынам: наглядаюць малады дуб і насякаюць яго ад нізу да верху сякерай так, каб, разрэзаўшы кару і мяздру, злёгку параніць дрэва. У гэтыя насекі ўтыкаюць вострыя каменні, якія з часам урастаюць у дрэва і ўтвараюць цвёрдыя гузы. У старажытныя часы булавы з'яўляліся галоўнай зброяй літоўскай пяхоты; ужываюцца яшчэ часамі дагэтуль і завуцца «насекамі».

р. 468—469:

> І як тут мешчанін, што зваўся Чарнабацкі,
> Збіў Дэева і знішчыў цэлы полк казацкі.

Пасля паўстання Ясінскага, калі літоўскія войскі адступалі пад Варшаву, маскалі набліжаліся да пакінутай Вільні. Генерал Дэеў на чале штаба ўязджаў праз Вострую браму. Вуліцы былі пустыя, жыхары пазамыкаліся ў дамах. Адзін мешчанін, заўважыўшы гармату, пакінутую ў завулку і набітую карцеччу, накіраваў яе на браму і выстраліў. Гэты адзін стрэл выратаваў тады Вільню: генерал Дэеў з некалькімі афіцэрамі загінуў, а рэшта, баючыся засады, адступіла ад горада. Не ведаю дакладна прозвішча таго мешчаніна.

р. 762:

> Ў Літве наезд апошні меў канец вось гэткі.

Бывалі і пазней яшчэ наезды, хоць не такія слаўныя, аднак шумныя і крывавыя. Каля 1817 года грамадзянін У... ў Навагрудскім ваяводстве пабіў на наездзе ўвесь наваградскі гарнізон і ўзяў у палон камандзіраў.

КНІГА ДЗЕСЯТАЯ

р. 112:

> Вось за бітву пад Нові, вось за Прэйсіш-Ілаў...

Пэўне, *Preusisch Eylau.*

р. 811—812:

> Таргавічане ды надумалі і ўрадам
> Мяне ушанаваць...

Здаецца, Стольнік быў забіты каля 1791 года, падчас першай вайны.

КНІГА АДЗІНАЦЦАТАЯ

У змесце:

> Вясеннія знаменні.

Адзін рускі гісторык падобным чынам апісвае прыкметы і прадчуванні народу маскоўскага перад вайной 1812 года.

р. 12:

> На рунь не бегла...

Рунь — гэта зелянеючая азіміна.

р. 43:

> Усе на поўнач! Быццам вырай пакідалі...

Вырай у вясковай мове значыць час асенні, калі адлятаюць вандроўныя птушкі. Ляцець у вырай — гэта значыць ляцець у цёплыя краіны. Адсюль у пераносным сэнсе народ называе выраем цёплыя краіны і наогул нейкія

казачныя краіны, што знаходзяцца за марамі.

p. 117:

Завецца кніга тая «Кухар дасканалы».

Кніга гэта вельмі рэдкая, выдадзеная больш за сто гадоў таму назад Станіславам Чарнецкім.

p. 121:

Што гэта нават папу Урбана здзівіла.

Гэта рымскае пасольства не раз малявалі і апісвалі. Гл. *«Кухар дасканалы»,* прадмова: «Гэта пасольства задзівіла ўвесь заходні свет, давяла да ведама шаноўнейшага Папы рымскага як багацце дому так і роскаш стала, ...што адзін з рымскіх князёў сказаў: «Сягоння Рым шчаслівы, маючы гэткага пасла».

Nb. Чарнецкі сам быў кухмайстрам Асалінскага.

p. 218:

Маршалкам дэлегацыі ўсяго павету...

У Літве з уступленнем французскіх і польскіх войскаў былі арганізаваны па ваяводствах канфедэрацыі і выбраны дэлегаты ў сейм.

p. 246:

Пад Гогэнліндэн...

Вядома, што пад Гогэнліндэн польскі корпус пад камандай генерала Князевіча вырашыў лёс перамогі.

КНІГА ДВАНАЦЦАТАЯ

p. 28:

Яго калісьці бышцам Радзівіл-Сірота...

Радзівіл-Сірота зрабіў далёкія падарожжы і выпусціў апісанне свайго паломніцтва ў Святую зямлю.

p. 159:

Сервіз жа ў гэтым часе ў фарбах адмяніўся.

У шаснаццатым і на пачатку семнаццатага стагоддзя ў эпоху росквіту мастацтваў нават банкеты рыхтаваліся мастакамі і былі поўныя сімвалаў і тэатральных сцэн. На слаўным банкеце, наладжаным у Рыме для Льва X, знаходзіўся сервіз, які прадстаўляў пачаргова чатыры пары года; ён, пэўне, служыў узорам радзівілаўскаму. Сталовыя звычаі адмяніліся ў Еўропе каля паловы васемнаццатага стагоддзя, у Польшчы пратрымаліся найдаўжэй, чым у іншых краінах.

р. 189:

Ці мо Пінэты бесаў вам прыслаў на службу?

Пінэты — слаўны на ўсю Польшчу штукар. Калі ў нас гасцяваў, не ведаем.

р. 356—357:

Ці ж я Цыбульскі,— Ключнік скрыўдзіўся не ў жарты,—
Які прайграў салдатам рускім жонку ў карты.

Вядомая ў Літве жаллівая песня пра паню Цыбульскую, якую муж прайграў у карты маскалям.

р. 405—406:

Зрабіць быў змушаны ў адзежы перамену
І апрануцца па-французску адмыслова.

Мода насіць французскае ўбранне панавала на правінцыі ад 1800 да 1812 года. Моладзь большасцю мяняла стыль вопраткі перад шлюбам, па жаданню нявест.

р. 480:

Пра спрэчку Рэйтана і князя фон Дынасаў...

Гісторыя спрэчкі Рэйтана з князем *De Nassau*, не даведзеная Войскім да канца, вядомая з падання. Для чытача зацікаўленага падаем яе заканчэнне: Рэйтан, усхваляваны самахвальствам князя *De Nassau,* стаў ля яго на вузкай сцяжыне; якраз вялізарны адзінец, раз'юшаны страляніной і цкаваннем, імчаў на сцежку. Рэйтан вырывае ў князя з рук стрэльбу, сваю кідае на зямлю і, хапіўшы рагаціну, а другую падаючы немцу: «Зараз,— сказаў,— убачым, хто лепш валодае пікай». Ужо кабан надбягаў, калі Войскі Грачэха, які стаяў воддаль, трапным стрэлам зваліў звера. Паны перш гневаліся, а потым паміры́ліся і багата ўзнагародзілі Грачэху.

р. 555:

Нябожчык Карп пусціў сваіх сялян на волю.

Расійскі ўрад не прызнае іншых вольных людзей, апроч шляхты. Сяляне, вызваленыя ўладальнікам, зараз жа запісваюцца ў «сказкі» царскіх сталовых маёмасцяў і замест паншчыны змушаны плаціць яшчэ большы аброк.

Вядома, што ў 1818 годзе грамадзяне Віленскай губерні прынялі на сейміку праект вызвалення ўсіх сялян і назначылі з гэтай мэтай дэлегацыю да цара, але ўрад загадаў праект скасаваць і ніколі больш пра яго не згадваць. Пад рускім урадам няма іншага спосабу даць чалавеку «вольную», як толькі запісаць яго ў сваю «фамілію». Шмат хто такім чынам атрымалі шляхецтва з ласкі ці за грошы.

АДАМ МИЦКЕВИЧ

ПАН ТАДЕУШ

ИЛИ ПОСЛЕДНИЙ НАЕЗД В ЛИТВЕ

Шляхетская история
с 1811 и 1812 гг.
в двенадцати книгах
стихом



[illegible]

КНИГА ПЕРВАЯ • ХОЗЯЙСТВО

Содержание: Возвращение панича. Первая встреча в комнатке, другая за столом. Тонкие рассуждения Судьи об учтивости . Политические замечания Подкомория о модах. Начало спора о Куцем и Соколе. Сетование Войского. Последний Возный Трибунала. Взгляд на тогдашнее политическое положение в Литве и в Европе.

Отчизна милая, Литва, ты, как здоровье:
Тот дорожит тобой, как собственною кровью,
Кто потерял тебя! И я рисую ныне
Всю красоту твою, тоскуя на чужбине.

О Матерь Божия, Ты в Ченстохове с нами,
Твой чудотворный лик сияет в Острой Браме,
И Новогрудок свой Ты бережешь от бедствий,
И чудом жизнь мою Ты сохранила в детстве
(Едва я был вручен Твоей святой опеке,
Я поднял мертвые, сомкнувшиеся веки —
И с ложа смерти встал, хвалу Тебе читая,
Вернула Ты мне жизнь, заступница святая.), —
Так нас на родину вернешь, явив нам чудо.
Позволь душе моей перелететь отсюда
В леса любимые, к родным лугам зеленым,
Над синим Неманом раскинутым по склонам;
К пшенице налитой, на золото похожей,
К полям, расцвеченным серебряною рожью,
Где желтый курослеп в гречихе снежно-белой,

Где клевер покраснел, как юноша несмелый;
Все опоясано межою, лишь местами
Там груши вкраплены с поникшими листами.

Среди таких полей, на берегу потока,
В густом березняке, на горке невысокой
Шляхетский старый дом стоял в былые годы;
Скрывали тополя его от непогоды,
И стены белые за порослью лесною
Издалека еще сияли белизною,
Фундамент каменный, а домик деревянный,
И перед ригою виднелись постоянно
Две-три больших скирды, не могшие вместиться.
Округа славилась обилием пшеницы.
И видно по снопам, тяжелым и душистым,
Которые блестят, как звезды, в поле чистом,
И по числу плугов, что пар ломают рано
На тучных полосах, богатых нивах пана,
268 *infamija* (z łac.) — niesława, utrata czci.

332 *pendebat* (łac.) — wisiał, trwał.

352 *omen* (łac.) — wróżba.

642 *portefeuille* (z fr.) — teczka na papiery

KSIĘGA DWUNASTA

86 ... *da afirmatywę*... (z łac.) — głos potwierdzający, przychylny.

87 ... *rzuci negatywę*... (z łac.) — głos przeciw.

262 *tromblom* (z fr.) — strzelba z lufą szerszą u wylotu.

268 *egzulować* (łac. *exulere*, iść na wygnanie) — wyjść z kraju.

КАМЕНТАРЫ

Юбілейнае выданне паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш», прысвечанае 200-годдзю з дня нараджэння паэта, вызначаецца пэўнай навізной. Эпахальны твор упершыню з'яўляецца ў свет на трох славянскіх мовах пад адной вокладкай. Для шматмільённага чытача ўзнікае выдатная магчымасць параўнаць тэксты на гэтых цудоўных мовах. Для дасціпнага ж чытача — параўнаць беларускае і рускае ўзнаўленне твора з першакрыніцай.

Арыгінал паэмы друкуецца па выданню, камп'ютэрны набор якога ласкава прадстаўленым выдавецтвам *«Czytelnik»*. Звяртаем увагу на тое, што ў ім, як і ў некаторых іншых папулярных выданнях (у адрозненне ад навуковых, у прыватнасці — *«Biblioteki Narodowej»*), мова Міцкевіча некалькі асучаснена (замест *swemi — swymi, dawnemi — dawnymi, za temi — za tymi, za czem — zaczym, dziwnem — dziwnym* і г. д.), у ім падпраўлены аўтарскія знакі прыпынку, прабелы паміж радкамі і інш. Уведзена таксама двухрадкоўе, дапісанае на асобніку 1844 года выдання А.Міцкевічам для сябра паэты Яўстаха Янушкевіча *(Była wieść, że od przodka Dobrzyńskich ta klinga // Wydarta pod Grunwaldem z rąk mistrza Junginga.* VII, 265)

Беларускі пераклад П. Бітэля публікуецца ўпершыню па рукапісу, які захоўваецца ў сямейным архіве перакладчыка. Тэкст рукапісу запатрабаваў рэдактарскай працы.

Згодна пажаданню маскоўскага боку сумеснага выдавецкага праекта, рускі пераклад паэмы С. Мар (Аксёнавай) друкуецца па выданню Зборы твораў 1949 г. Аднак трэба адзначыць, што ў пазнейшых перавыданнях рускі тэкст больш дапрацаваны. Адзіным нашым адступленнем ад выдання 1949 г. з'яўляецца далучэнне да рускага перакладу «Тлумачэнняў [аўтара]» (далей «Тлумачэнні»), якія ў Зборы твораў паэта адсутнічалі (яны ўзяты намі з кнігі: Адам Мицкевич. Пан Тадеуш. М.: Книга, 1985). Зазначым, што нават у выданні 1985 г. аўтарскія «Тлумачэнні» няпоўныя, паколькі ў перакладзе С.Мар (Аксёнавай) не перададзены словы, звароты патлумачаныя А. Міцкевічам *(віціны, вырай, покуць, рунь).*

Дарэчы, у нашым выданні «Тлумачэнні», якія належаць Адаму Міцкевічу, пастаўлены не адразу за тэкстам апошняй XII кнігі паэмы, а за «Эпілогам». Відавочна, парушаецца традыцыя польскіх тэкстолагаў, якія «Тлумачэнні» падаюць перад «Эпілогам». Нам аднак уяўляецца, што мы не закранулі галоўнае: логіку размяшчэння тэкставага матэрыялу (тлумачэнні заўсёды ідуць за тэкстам, а не ў сярэдзіне яго); волю аўтара («Эпілог» да «Пана Тадэвуша» — магутны ўзлёт паэтычнага генія Міцкевіча — узнік, калі паэма была ўжо ў друку; пазней «Эпілог» загубіўся і адшукаўся пасля смерці песняра).

У польскім міцкевічазнаўстве назапашана багатая спадчына каментавання «Пана Тадэвуша» — працы К. Выкі, К. Гурскага, З.Новака, С. Піганя і інш. Нашыя «Каментарыі» грунтуюцца на зробленым пералічанымі літаратуразнаўцамі (у беларускай частцы каментароў выкарыстаны матэрыялы, падрыхтаваныя нябожчыкам П.Бітэлем). Аб'ём выдання абмежаваў памер тлумачэнняў, дазволіўшы спыніцца толькі на асобных рэаліях (гістарычных падзеях, персаналіях і барбарызмах), зафіксаваных у арыгінале і ў абодвух перакладах.

Чытаючы «Пана Тадэвуша», трэба ўлічваць, што Адам Міцкевіч, згодна тагачаснай традыцыі, слова «Літва» ўжываў у значэннях:

1/ гістарычным (скарочаная назва дзяржавы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага);

2/ геаграфічна-адміністрацыйным.

Літвой у першай палове XIX ст. і пасля афіцыйна называліся цэнтральныя і заходнія сучасныя беларускія землі — губерні Мінская, Гродзенская і Віленская, у адрозненне ад «беларускіх» губерняў — Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай, а таксама Жамойціі

(Жмудзі) — Ковенскай губерні. Этнічную Літву-Летуву паэт традыцыйна называў Жмуддзю, этнічных літоўцаў-летувісаў — жмудзінамі.

Так што «Літва» для песняра — яго Радзіма, першавыток. У арыгінале паэмы радзімае слова *«Litwa»* сустракаецца прыкладна 55 разоў, а тэрмін *«Polska»* прыблізна 15. (Пры складанні будучага Слоўніка мовы Адама Міцкевіча моваведы паправяць рэдактара-укладальніка, які першым звяртае ўвагу даследчыкаў на гэтыя прапорцыі.)

Вось чаму «Пан Тадэвуш» — унікальная паэтычная энцыклапедыя Літвы-Беларусі пачатку XIX ст. на польскай мове — блізкая і зразумелая беларусам, суайчыннікам Адама Міцкевіча. Шэраг рэалій твора, звязаных з тапанімічнымі назвамі, рознымі падзеямі, народным побытам, звычаямі і абрадамі, флорай, фаўнай і г.д., для беларускага чытача не патрабуе каментавання.

Каб пазбегнуць паўтору ў каментарнай часткі скароты тыпу *w*[ers], *p*[адок], *c*[трока] не ставіліся. Пачатковыя лічбы азначаюць не парадкавыя нумары, а толькі адпаведныя радкі песень з паэмы.

* * *

За дапамогу, парады і заўвагі, выказаныя ў часе працы над нашым выданнем, рэдактар-укладальнік шчыра ўдзячны Моніцы Банькоўскі *(Цюрых)*, Цэзарыю Галіньскаму *(Варшава)*, Таццяне Кабржыцкай, Генадзю і Яніне Кісялёвым, Адаму Мальдзісу, Максіму Чамярыцкаму *(Мінск)*, Вячаславу Рагойшу, Галіне Хінка-Янушкевіч, Фэліксу Янушкевічу *(Ракаў)*.

КНІГА ПЕРШАЯ

5 *Святая дзева, што бароніш Чанстахову...* — тут і далей зварот да славутых цудадзейных абразоў: Маці Божай Чанстахоўскай (патронкі Польшчы), віленскай Вострабрамскай (апякункі Літвы), абраза Маці Божай наваградскай; апошні захоўваўся ў неіснуючай ужо цяпер уніяцкай царкве на Замкавай гары.

57 *Касцюшка* Андрэй Тадэвуш Банавентура (1746—1817) — палітычны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай, кіраўнік вызваленчага паўстання 1794 г.

62 *Рэйтан* Тадэвуш (1742—1780) — палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай; паходзіў з в. Грушаўка на Навагрудчыне (цяпер Ляхавіцкі р-н); наваградскі пасол на сейм 1773 г.

64 *А перад ім «Федон» і жыццяпіс Катона...* — два старажытныя творы на грэцкай мове: Платона «Федон» (у ім асуджаны на смерць Сакрат разважае пра несмяротнасць душы); жыццяпіс Катона Малодшага *(Uticensis)* напісаны Плутархам. Рымлянін Катон да канца стаяў на баку Пампея ў ягонай вайне супраць Цэзара (сярэдзіна I ст. да н.э.). Пасля няўдалага змагання перад смерцю чытаў урыўкі з «Федона», а потым прабіў сябе мячом. У старажытнасці ўспрымаўся як узор чалавека непахісных перакананняў.

65 *Ясінскі* Якуб (1761—1794) — ваенны і палітычны дзеяч, паэт. Адзін з кіраўнікоў паўстання 1794 г. , камендант Вільні, потым генеральны камандуючы паўстанцкімі войскамі ў ВКЛ; загінуў пры абароне Прагі пад Варшавай.

66 *Корсак* Тадэвуш (174—1794) — дзяржаўны і вайсковы дзеяч ВКЛ. У пачатку паўстання 1794 г. прыбыў у Вільню на чале некалькіх дзесяткаў узброеных навакольных і уласных сялян; загінуў разам з Ясінскім пры абароне Прагі пад Варшавай.

67 *Прага* — прадмесце Варшавы, дзе 4 лістапада 1794 г. расейскія войскі пад камандаваннем Суворава выразалі разам з абаронцамі і цывільнае насельніцтва.

72 *марш Дамбpoўскага...* — песня-гімн «Яшчэ Польшча не загінула!..» на словы Ю. Выбіцкага паўстала ў 1797 г. у Італіі, дзе арганізоўваліся польскія легіёны; *Дамброўскі* Ян Генрык (1755—1818) — польскі генерал.

178 *Падкаморы* — службовая асоба ў ВКЛ: прыдворны падкаморы сачыў за парадкам і убраннем ў пакоях вялікага князя; павятовы — разглядаў зямельныя спрэчкі паміж шляхтай у падкаморскім судзе.

240 *свірсня* — журавель пры студні.

250 *Возны* — службовая асоба ў ВКЛ. Рассылаў судовыя позвы грамадзянам (пры

неабходнасці дастаўляў гэтых асоб у суд). У кожным павеце было некалькі возных, галоўнага з іх называлі генералам; *войскі* — службовая асоба ў ВКЛ. Пад час войнаў і агульнай мабілізацыі (паспалітага рушання), калі шляхта пакідала свае маёнткі, назіраў за парадкам у павеце.

447 *гарбайталь* (ням. *der Haarbeuteil*) — торбачка на валасы, сетка для падтрымання прычоскі.

470 *маркіж* — так вымаўляў Падкаморы слова маркіз.

514 *амністыцыюм* (лац.) — перамір'е.

569 *брабанцкія карункі* — вырабленыя ў Бельгіі (правінцыя Брабант).

653 *рараты* — адно з касцельных набажэнстваў (адпраўляецца звычайна досвіткам).

725 *базылішак* — д'ябал, чорт.

749 *рачыць* (польск.) — быць ласкавым, зрабіць ласку.

793 *І сецяў сто вазоў у замкуВаранчанскім...* — даўней у лясных паляваннях багатыя магнаты скарыстоўвалі сеці, якімі агароджваўся ладны кавалак лесу і куды трапляла розная дзічына; «замак» у Варончы быў драўляны на высокім каменным падмурку (цяпер в. Варонча ў Карэліцкім р-не; да Варанчанскай парафіі належалі Туганавічы, дзе жыла каханая паэта Марыля Верашчака).

897—900 *Лівія* — грэцкая назва Афрыкі. Тут згаданы егіпецкі паход (1798), памятны пераможнай бітвай пад пірамідамі; бітвы з туркамі ля гары Табар у Палестыне (1799); з аўстрыякамі пад Марэнга ў Італіі (1800) і пад Ульмам у Германіі (1805), з аўстрыйцамі і рускімі пад Аўстэрліцам (Слаўковым) на Маравіі (1805).

920 *Ламбардскае поле* — у Ламбардыі (Паўночная Італія) генерал Дамброўскі фармаваў (1796) свае першыя легіёны.

921 *Князевіч* Кароль (1762—1842) — удзельнік паўстання 1794 г., узначальваў польскія легіёны, камандаваў іх 1-й легіяй; генерал.

924 *Ябланоўскі* Уладзіслаў — генерал легіёнаў, нейкі час камандаваў Прыдунайскай «легіяй», аднак у экспедыцыі на Гаіці, дзе знаходзіцца востраў Сан Дамінга, камандаваў не польскімі легіёнамі, ▪ французскай паўбрыгадай,

936 *Так перайшлі Гурэцкі...* — Гарэцкі Антон (1787—1861), чыім прозвішчам распачаты пералік уцекачоў у княства Варшаўскае, паходзіў з Вільні; перабег у 1809 г. і стаў капітанам; блізкі сябар Міцкевіча, паэт, аўтар зборніка «Паэзія літвіна» (Парыж, 1834); памёр у эміграцыі.

КНІГА ДРУГАЯ

47 «*Surge, puer!*» — «уставай, хлопча!».

96 *апока* — скала, камень.

220 *бахмат* — конь татарскай гадоўлі.

232 *прымас* — найвышэйшы духоўны чын у часыф Рэчы Паспалітай.

286 *За «Трэці май» змагацца...* — 3 траўня 1791 г. ў Варшаве Чатырохгадовы сейм прыняў Канстытуцыю, паводле якой Рэч Паспалітая абвясціла сябе суверэннай унітарнай дзяржавай, ліквідаваўшы падзел на Карону і ВКЛ.

340 *... крэслы, стужкі і булавы...* — гэта значыць, меў у сваім родзе сенатараў і гетманаў, ганараваных высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі (булава — адзнака гетмана).

370 *бургграф* (ням.) — начальнік замка.

623—624 *...у альтарац'і ~ сэрца пальпітац'і...* — модныя ў XVII ст. «хваробы», ў асяродку вялікасвецкіх паняў залежна ад настрою і сітуацыі.

658 *мар'яш* (мар'яж) — назва гульні ў карты; *віна* — масць картах, пікі.

760 «*Pax vobiscum*!» (лац.) — «Супакой з вамі» («мір вам»; словы, якія прамаўляе святар у час імшы).

816 *salarium* — плата, падарунак на памяць.

818 *яшчур* — скура вужа (або імітацыя пад яе).

823 *Князь Домінік* — Радзівіл Дамінік (1786—1813), апошні прадстаўнік старшай лініі

Радзівіллаў. Пасля яго смерці канчаткова заняпала багацце «каралеўскага» роду на Беларусі; царскі ўрад канфіскаваў і разрабаваў радзівілаўскія ўладанні.

824-825 ...*і з тым генералам Меенам...* — Ян Якуб Меен быў палкоўнікам пяхотнага палка ў войску ВКЛ, удзельнічаў у абароне Вільні ўлетку 1794 г.

828 ...*на Купіскім полі...* — в. Купіск ля Наваградка.

КНІГА ТРЭЦЯЯ

61 ...*з зялёным слязам...* — сляз, адзін з гатункаў мальвы (іх на Беларусі налічваюць каля васьмі).

240 ...*думаў, што ён бачыць элізейскіх ценяў...* — старажытныя людзі верылі, што душы справядлівых людзей пасля смерці вялі спакойнае жыццё на падземных палях, якія называліся элізеўм.

399 *Быў у Пятркове, ў Дубне. То за трыбуналам...* — трыбунал, вышэйшая судовая інстанцыя ў ВКЛ. Трынул літоўскі адбываўся ў Наваградку; каронны ў «трыбунальскіх замках» у Пятркове (г. Пётркуў-Трыбунальскі ў Лодзінскім ваяводстве) і Дубне.

400 *палястрант* — юрыст, адвакат

410 *estyma* (з фр.) — пашана.

425 *фартуна* (лац.) — багіня лёсу, шчасця; тут у значэнні: багацце, маёмасць.

538 ...*Паўзыліпа страшныя пячоры...* — тунэль пракладзены праз гару Паўзыліп пад Неапалем.

552 *мянада* (міф.) — жрыца Вакха (бог вясёлага застолля, разгулу). Падчас піравання Вакха мянады насілі кіі, абвітыя павоем і вінаградам.

617-618 ...*два Брэйгелі ~ І апроч Рэйсдаля...* — Брэйгелі — сямейства нідэрландскіх мастакоў: Пітэр (1525—1569) і два яго сыны: Пітэр (1564—1638), празваны «Ван дэр Гэлле» (што азначае: пякельны) за напісанне ім сцэн з выявай пекла, і Ян (1568—1625); Рэйсдаль Якаб (1628—1682) — галандскі мастак-пейзажыст.

620 *Арлоўскі* Аляксандр (1777—1832) — польскі мастак; большую частку жыцця маляваў у Пецярбургу, дзе і пазнаёміўся з Міцкевічам. Польскіх краявідаў ён не стварыў.

747 *шарваркі* (шарварак) — прымусовая праца пры рамонце і пабудове шляхоў, гасцінцаў.

КНІГА ЧАЦВЁРТАЯ

2 *Панары* — горы, альбо ўзгоркі, якія цягнуцца ланцугом на паўднёвым захадзе Вільні.

4 *Вітэн* — Віцень (каля 1295—1316), вялікі князь ВКЛ; *Гедымін* (каля 1275 — 1341), вялікі князь ВКЛ, (1316 — 1341); у часы ягонага княжання фактычна завяршыўся працэс аб'яднання беларускіх земляў.

7 *Ліздэйка* — імя легендарнага вярхоўнага жраца.

20 *Вітаўтаў ~ каўпак сталёвы...* — Вітаўт (1350—1430), вялікі князь ВКЛ (1392—1430). Сын Кейстута, унук Гедыміна. Адзін з самых выдатных дзеячаў; правіў ва ўмовах складаных знешніх і унутраных абставін нямецкай агрэсіі, дыпламатычныай экспансіі Польшчы ў адну дзяржаву, прэтэнзій Маскоўскага вялікага княства на беларускія і ўкраінскія землі; *каўпак сталёвы* — ту у значэнні: каралеўская карона. У 1429—1430 гг. Вітаўт спрабаваў атрымаць ад папы рымскага тытул караля і каралеўскую карону, аднак нечаканая смерць спыніла гэтыя захады.

30 *Міндоўгаў гай ля фарнага касцёла...* — Міндоўг (1195?—1263), князь наваградскі, вялікі князь ВКЛ. У 1253 г. прыняў тытул караля, каранаваўся ў сваёй рэзідэнцыі ў Наваградку; у фарным касцёле 12.02.1799 г. быў ахрышчаны Адам Бернард Міцкевіч.

39 *Бо ліпа ж Чарналеская натхніла Яна..* — Кахамістаноўскі Ян (1530—1584), польскі паэт; маёнтак, у якім ён жыў і пісаў, называўся Чарналессе.

41 *пясняр-казак...* — маецца на ўвазе паэт Севярын Гашчынскі (1801—1876), аўтар паэмы «Канеўскі замак».

80 *дрыяда* (міф.) — згодна грэцкай міфалогіі, кожнае дрэва мела ад багоў уласную апякунку — дрыяду.

195 *Нібы ў Пізанскай вежы...* — славутая нахіленая вежа ў Пізе (Італія).

293 *Reverendissime* — прывялебны.

314 *Літоўскі кур'ер («Kurier Litewski»*, «Літоўскі веснік») — газета, якая выдавалася ў 1796—1840 гг.: да 1797 г. у Гродне, потым у Вільні (да 1833 г. на польскай мове, з 1834 — на рускай).

352 *Стрыйкоўскі* Мацей (каля 1547—1590?) — гісторык-храніст, паэт. Аўтар «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі» (Каралевец, 1582) — першай друкаванай гісторыі беларуска-літоўскай дзяржавы .

782 *... хоць і па кудзелі...* — сваяк па маці, жаночай лініі.

КНІГА ПЯТАЯ

816 *Зямлі аднялі шмат дзялягі Таргавіцы...* — Таргавіцкая канфедэрацыя атрымала такую назву ад мястэчка Таргавіца на Украіне, дзе 14 траўня 1792 г. была абвешчана падрыхтаваная ў Пецярбургу змова магнатаў Рэчы Паспалітай і расейскага ўраду, скіраваная супраць Канстытуцыі 3 траўня 1791 г.

КНІГА ШОСТАЯ

У змесце: *асоба Мацька Дабрынскага* — рэдактар-укладальнік палічыў неабходным адаптаваць у перакладзе П. Бітэля словы, якія ў беларускай мове маюць іншае вымаўленне (часам з пагардлівым адценнем): *бжытва (бжытэўка) — брытва, Дабжынскія — Дабрынскія*. Тым самым пазбягалася штучная дакладнасць (напрыклад, у рускім перакладзе слыннае мястэчка *Дзятлава* стала *Здзенцёлам*).

255 *прывезены з Крулеўца* — Кенігсберг (Каралевец); цяпер Калініград.

479-481 *Трафеем з Вены ~ Памонай і Вяртумнам...* — маецца на ўвазе перамога польскага караля Яна Сабескага над туркамі пад Венай (1683); *бунчук* — пук валасоў з конскага хваста, з'яўляўся адзнакай высокага вайсковага звання; *Цэрэс* (міф.) — багіня земляробства і ўраджаю, Памэна (міф.) — апякунка садоў, Флора — кветак, Вяртумнас — даспявання.

568 *«Калі ўстаюць ураннi зоры»* — рэлігійная песня на словы паэта Ф.Карпінскага (1741—1825).

КНІГА СЁМАЯ

27*Ена* — у 1806 г. пад Енай (Германія) Напалеон разбіў прускую армію.

32 *ландраты* і *гофраты* — прускія ўрадоўцы высокіх чыноў.

35 *варатак* — вар, кіпень.

39 Перакручаныя нямецкія словы: *«Ach, Her Gott! O, Weh!»* — «Ах, госпадзі, бяда!»

49 *гарцаб* (з ням. *Haarzopf*) — каса парыка, якія насілі прускія афіцэры.

265 Тут у польскім выданні *«Czytelnika»* пастаўлена двухрадкоўе, якое раней у асноўных тэкстах не прыводзілася, і таму ў перакладзе П. Бітэля адсутнічае (падрадковы пераклад : «*Была чутка, што ад продкаў Дабрынскіх той клінок, здабы пад Грунвальдам з рук магістра Юнгінга*».

378 *Ласосна* — рака, левы прыток Нёмана; пачынаецца яна ў Польшчы, цячэ ў Гродзенскім раёне. Нейкі час па ёй праходзіла мяжа з Княствам Варшаўскім.

458 *Ў наездзе Мыскім...* — пэўна, адносіцца да мясцовасці Новая Мыш ці Старая Мыш (каля Баранавіч), на якія зрабіў у канцы XVIII ст. наезд Несялоўскі.

КНІГА ВОСЬМАЯ

81 *Давідаў воз* — сузор'е Вялікая Мядзведзіца.

92 *Левіятан* — рыба з габрэйскай (талмудычнай) міфалогіі.

138-139 *Тадэвуш, ваша гэтае апавяданне пра зоркі...* — на думку міцкевічазнаўцаў, тут памылка аўтара: Тадэвушавага апавядання пра зоркі ў тэксце няма. Відаць, паэт намерваўся яго напісаць, а магчыма, напісанае выкрасліў перад здачай; адказ жа Падкаморага застаўся. Рэканструяваць дыялог не магчыма, паколькі рукапіс гэтай мясціны з кнігі VIII не захаваўся.

145 *Пачобут*-Адляніцкі Марцін (1728—1810) — астраном і асветнік, ксёндз, адзін з арганізатараў і дырэктар (1765—1807) Віленскай астранамічнай абсерваторыі.

149 *Снядэцкі* Ян (1756—1830) — астраном, матэматык, філосаф-асветнік, рэктар Віленскага універсітэта (1806—1825).

158 *Браніцкі* Францішак Ксавэры — гетман вялікі каронны, арганізатар Таргавіцкай канфедэрацыі.

183 *ксёндз Бартахоўскі* — Бартахоўскі Войцах (1640—1708), езуіт, аўтар празаічнага панегірыка *Fulmen Orientis* («Пярун Усходу»), выдадзенага ў Калішу (1684)

187 *«Яніна»* — твор Рубінкоўскага, выдадзены ў 1739 г.

211-212 *Генерал падольскіх зямель* — князь Адам Чартарыскі (1734—1823), пісьменнік і вядомы ў сваім часе палітык.

221 *...феерверк даў Кашыц, што жыве ў Ятры...* — Кашыц Язэп, чашнік смаленскі, палкоўнік войск ВКЛ. На думку міцкевічазнаўцаў, згадка пра Кашыца паўстала дзякуючы сяброўству паэта з ягоным унукам, таксама Язэпам Кашыцам (1795—1868), маршалкам шляхты Навагрудскага пав., удзельнікам паўстання 1830—1831 гг., родам з-пад Пінска і які памёр у эміграцыі; *Ятра* — вёска і маёнтак пад Навагрудкам.

222 *Танцораў Тызенгаўз прыслаў...* — Тызенгаўз Антон (1733—1785), прагрэсіўны грамадска-палітычны дзеяч ВКЛ, падскарбі надворны літоўскі, гарадзенскі староста; кіраваў каралеўскімі эканоміямі на Беларусі; асветнік-мецэнат.
Агінскі даў музыкаў... — верагодней за ўсё, меўся на ўвазе Міхал Казімір Агінскі (1730—1800), пісар польны літоўскі, гетман вялікі ВКЛ, кампазітар, паэт, мецэнат; жыў пераважна ў Слоніме.

223 *...Солтан дзятлаўскі капэлю паклікаў...* — Солтан Станіслаў, надворны маршалак літоўскі.

294 *in articulo mortis* (лац.) — у выпадку пагрозы смерці.

688 *Этна* — вулкан на востраве Сіцыліі.

733-735 *...cum gais, boris et graniciebus, K metonibus, scultetis et omnibus rebus Et quibusdam aliis...* — «...з гаямі, барамі, граніцамі, сялянамі, солтысамі, з усімі рэчамі і некаторымі іншымі». Прыклад даўнейшай макаранічнай лацінскай мовы ў судах ВКЛ, у якую ўплячалі польскія словы з лацінскімі канчаткамі.

КНІГА ДЗЕВЯТАЯ

141 *Аднойчы на радуце...* — рэдута (польск.), баль-маскарад.

162 *...згодна Статута...* — збор законаў ВКЛ; трэцяя рэдакцыя Статута 1588 г. дзейнічала на беларускіх землях да поўнай забароны царызмам у 1840 г.

186 *ляўфар* (ням.) — пасланец, скараход.

231 *Бака* Юзаф (1707—1780) — езуіт, аўтар вершаў рэлігійна-маралізатарскага зместу, такіх бязглуздых, што яны сталі сінонімамі графаманства.

352 *штурмак* — стрэльба з расшыраным пры канцы ствалом.

КНІГА ДЗЕСЯТАЯ

111 *Ачакаў, Ізмаіл* — былыя турэцкія крэпасці, заваёваныя рускімі ў 1788—1790 гг.

112 *Нові* — мясцовасць у Італіі, дзе Сувораў пабіў французаў у 1799 г.

187 *Reguiescat in pace* (лац.) — вечная памяць.

196 *Pro publico bono* (лац.) — для грамадскага дабра.

385 *Гімен* (грэч. міф.) — бог жаніцьбы; яго ўяўлялі з паходняй, сімвалам хатняга вогнішча.

572 *Sanctissimum* (лац.) — Святы Сакрамент.
849 *carcer durum* — карцэр, турма.

КНІГА АДЗІНАЦЦАТАЯ

246 *Пад Гогэнліндэн, калі Рышпанс...* — французскі генерал, які вызначыўся ў бітве з аўстрыякамі (1800 г.).
253 *Самасеры* — высокі горны перавал перад Мадрыдам.
642 *portefeuille* (з фр.) — папка на паперы.

КНІГА ДВАНАЦЦАТАЯ

86 *афірматыва* (лац.) — голас «за».
87 *негатыва* — голас «супраць».
100 *«Veto»!* (лац.) — забараняю.
189 *Пінэта* (Пінеці) — слынны італьянскі штукар канца XVIII—пачатку XIX ст.; пазней, па сведчанню мемуарыстаў, ягонае імя ўжывалася як назыўное.
262 *трамблён* — старадаўня стрэльба з шырокай руляй.
309 *Ружыцкі* Самуэль (1784—1834) — удзельнік вайны 1811—1812 гг.
382 *...паглядаючы на Дымур'ера...* — Дзюмур'е Шарль Франсуа (1739—1823), французскі палкоўнік, прысланы ў якасці вайсковага інструктара.

Т ЛУМАЧЭННІ [АЎТАРА]

...Рэчы Паспалітай Польскай... — тут паэт недакладна ўжыў назву дзяржавы: Рэч Паспалітая Абодвух Народаў (Кароны і ВКЛ).
Сангушка Дзмітры (у паэта памылкова *Васіль*) — магнат-авантурнік, прымусам вывез сабе нарачоную, а сам захапіў яе маёнткі; асуджаны на выгнанне, быў забіты ў Чэхіі ў 1554 г.
...аб'яўляў інтрамісіі... (лац.) — увядзенне новага гаспадара ў набытыя ім уладанні.
актараты (лац.) — бягучыя судовыя справы
У Слуцку ~ удасканаленая стараннем Тызенгаўза... — выраб славутых слуцкіх пасаў належаў Радзівілам; Тызенгаўзам належалі не менш слаўныя ткацкія варштаты ў Гародні.
Пашкевіч Дзяніс (1757—1830) — пісьменнік і даследчык культуры свайго краю.
рускія песні — дакладней сказаць, украінскія песні.
Стафан Вітвіцкі (1802 —1847) — польскі паэт-рамантык, блізкі сябра А. Міцкевіча ў эміграцыі.
сабрыкеты (ад фр. *sobriquets*) — мянушкі.
Ursa Maior — Вялікая Мядзведзіца
задыяк у Дэндэрах — вёска ў Егіпце, дзе французы знайшлі ў руінах тамтэйшай старажытнай святыні малюнак задыяку, які доўгі час прыцягваў увагу астраномаў.
Лаланд Юзаф Геранім (1732—1807) — французскі астраном, дырэктар абсерваторыі ў Парыжы.
...пабіў туркаў на Лемане... — у вусця Дняпры ля Чорнага мора. Паэт меў на увазе марскую бітаву пад Ачакавам, дзе дэ Насаў, як расійскі адмірал, разбіў турэцкую флатылію (1788).
індыгенат — шляхецтва, якое надавалася ў ВКЛ і Кароне іншаземцу.
экзекутар (лац.) — судовы выканаўца.
грамадзянін У... — маецца на ўвазе Ігнат Узлоўскі, уладальнік Чамброва ля Свіцязі. Як высветлілі міцкевічазнаўцы (Л.Падгорскі-Аколаў), падзея тая адбылася не «каля 1817 года», а ў снежні 1821 г. (Podhorski-Okołow L. Realia Mickiewiczowskie. Warszawa, 1952).
Леў X — папа рымскі (1513—1521), вядомы як апякун мастацтва і навук.
...у «фамілію»... — да свайго герба і прозвішча.

КОММЕНТАРИИ

Юбилейное издание поэмы Адама Мицкевича «Пан Тадеуш», приуроченное к 200-летию со дня рождения поэта, отличается определенной новизной. Впервые в истории книгоиздательского дела шедевр польской и всей мировой литературы выходит ■ свет одновременно на трех славянских языках под одной обложкой. Тем самым создается прекрасная возможность для многомиллионного читателя обратиться ■ более доступному для него тексту поэмы, а для читателя пытливого — сравнить белорусское и русское воспроизведения поэмы с ее первоисточником.

Оригинал поэмы печатается по изданию, любезно предоставленному варшавским издательством *«Czytelnik»*. Обращаем внимание на то, что в этом, как и в некоторых других массовых изданиях (в отличие от научных, в частности — *«Biblioteki Narodowej»*), язык Мицкевича несколько осовременен (вместо *swemi — swymi, dawnemi — dawnymi, za temi — za tymi, za czem — zaczym, dziwnem — dziwnym* и т.д.), в нем изменены некоторые авторские знаки препинания, пробелы между строками и др. Введено также двустишие, надписанное А. Мицкевичем на экземпляре поэмы 1844 года издания для своего друга Евстахия Янушкевича (*VII, 265*).

Белорусский перевод поэмы П. Бителя публикуется впервые по рукописи, хранящейся в семейном архиве переводчика. Текст рукописи потребовал определенного редакторского труда.

Согласно пожеланию московской стороны совместного издательского проекта, текст русского перевода поэмы С. Мар (Аксеновой) печатается по изданию Собрания сочинений 1949 г., хотя следует заметить, что позднейшие переиздания перевода С. Мар (Аксеновой) значительно доработаны. Единственное наше отступление от издания 1949 г. — присоединение к этому переводу «Объяснений [автора]», отсутствующих ■ данном издании (они перепечатываются из книги: Адам Мицкевич. Пан Тадеуш. М. , 1985). Отметим, что и в названном последнем издании 1985 г. авторские «Объяснения» неполные, поскольку в переводе С.Мар (Аксеновой) не переданы слова (в большинстве своем белорусские), встречающиеся у А. Мицкевича и объясненные им (*витины, вырай, покуть, рунь*). Часть из них введено ■ наше издание ■ переводе редактора-составителя.

Кстати, везде в нашем издании (в том числе и ■ публикации поэмы на польском языке) «Объяснения [автора]», принадлежащие Адаму Мицкевичу, приводятся не сразу за текстом последней XII книги поэмы, а непосредственно за «Эпилогом». Понятно, тем самым несколько нарушается традиция польских текстологов, до сего времени помещающих «Объяснения [автора]» перед «Эпилогом» поэмы. Однако, как нам кажется, при этом не нарушается главное: ни логика расположения текстового материала (объяснения всегда идут за объясняемым текстом произведения), ни воля автора (один из мощных взлетов поэтического гения Мицкевича — «Эпилог» к «Пану Тадеушу» — возник тогда, когда поэма, по сути, была уже напечатана, позже «Эпилог» вообще затерялся и отыскался уже только после смерти поэта. См. комментарий к «Эпилогу»).

В польском мицкевичеведении существует довольно значительная традиция комментирования «Пана Тадеуша», в частности — труды К. Выки, К. Гурского, З. Новака, С. Пигоня и др. Данные «Комментарии» в определенной степени зиждутся на созданном названными литературоведами. В белорусском корпусе комментариев использованы также материалы, подготовленные переводчиком П. Бителем. Часть русских комментариев заимствована из Собрания сочинений 1949 г. (Т. 2. Сост. Н. А. Славятинский). Вместе с тем, большой объем издания (более 800 страниц) ограничил размер самих

объяснений, позволив остановиться, главным образом, на трех реалиях: некоторых исторических событиях, лицах и варваризмах, зафиксированных как ■ оригинале, так и в обоих переводах.

Приступая к чтению «Пана Тадеуша», необходимо учитывать, что Адам Мицкевич, согласно современной ему традиции, слово «Литва» употреблял в двух значениях:

1/ историческом (сокращенное название бывшего мощного государства Великого Княжества Литовского, Русского и Жемойтского);

2/ административно-географическом.

Литвой в первой половине XIX в. (да и намного позже) официально назывались центральные и западные современные белорусские земли — губернии Минская, Гродненская и Виленская, в отличие от «белорусских» губерний — Витебской, Могилевской и Смоленской, а также Жемайтии (Жмуди) — Ковенской губернии. Этническую современную Литву (Летуву) поэт традиционно называл Жмудью, этнических жителей — жмудинами.

Так что Литва для гения — его Родина, первоисток. В оригинале поэмы родимое слово *«Litwa»* соотносится, например, со словом *«Polska»* примерно в соотношении 55:15. (При составлении будущего словаря языка Адама Мицкевича исследователи уточнят эту пропорцию, на которую обращает внимание редактор-составитель.)

Вот почему «Пан Тадеуш» — эта уникальная польскоязычная поэтическая энциклопедия Литвы-Беларуси начала XIX в. — особенно близок и понятен белорусам, землякам Адама Мицкевича. Вот почему масса реалий произведения, связанных с топонимическими названиями, разными событиями, народным бытом, обычаями и обрядами, флорой, фауной и т.д., для белорусского читателя вообще не требует комментирования.

Чтобы избежать повторов в ограниченной комментарной части, сокращения типа ***с***[трока], ***w***[ers], ***p***[адок] не ставились. Поэтому первоначальные цифры означают не порядковые номера ссылок, а соответствующие строки книг поэмы.

* * *

За помощь, советы и замечания, высказанные во время работы над данным изданием, редактор-составитель выражает благодарность Монике Баньковски *(Цюрих)*, Цезарию Голиньскому *(Варшава)*, Геннадию и Янине Киселевым, Татьяне Кобржицкой, Адаму Мальдису, Максиму Чемерицкому *(Минск)*, Вячеславу Рагойше, Галине Хинка-Янушкевич, Феликсу Янушкевичу *(Раков)*.

КНИГА ПЕРВАЯ

8 *И чудом жизнь мою Ты сохранила в детстве...* — Мицкевич рассказывал своему другу Одынцу, как он, еще совсем ребенок, «выпал из окна и не подавал признаков жизни», пока мать не поручила его милости Богоматери.

56 *Висели по стенам старинные портреты...* — подбор портретов в усадьбе не случаен. Это все портреты деятелей польского национально-освободительного движения, тесно связанных с Литвой (а Костюшко был даже родом из того же новогрудского воеводства, что и Мицкевич).

72 *Мазурка Домбровского* — песня, впоследствии национальный гимн Польши; возникла в 1797 г. в польских легионах, сражавшихся в Италии. Автор ее — Юзеф Выбицкий (1747 — 1822) — польский политический деятель, соратник Домбровского, известный литератор-мемуарист.

156 *...чтоб не встречать приезжих в пудермане...* — пудерман, или пудермантель (нем. *Pudermantel*) — полотняный халатик, надевавшийся, когда посыпали парик пудрой; в общем значении — полотняный плащик для защиты от пыли и грязи («пыльник»).

495 *Ты из-за Немана весть получил недавно...* — то есть из герцогства Варшавского,

границившего с Россией по Неману.

504 *Где русский капитан беседовал с гостями...* — живым прототипом капитана Рыкова послужил якобы генерал-лейтенант Рыков, выслужившийся из солдат; Мицкевич познакомился с ним в Одессе в 1825 г. (см. «Письма» А. Мицкевича. Т. IV. Париж, 1884. С. 74). Литературным же прототипом был, по всей вероятности, Федор Никитич Бебехов из «Литовских писем» Немцевича, вышедших в 1812 г.

858 Тут Возный развязал парчовый слуцкий пояс... — такой пояс был до десяти «локтей» длины и до трех «локтей» ширины. Самые дорогие были вытканы из серебряных и золотых нитей (по одну сторону серебро, по другую — золото) и отделаны ткаными шелком цветами. Пояс надевали на кунтуш, перехватывая им стан два или три раза, завязывая его спереди или сбоку в замысловатый бант и спуская к низу цветистые концы либо бахрому. Одевать такой пояс можно было только с посторонней помощью.

899 *Последний Возный спит, смежив глаза устало...* — этой строкой первоначально заканчивалась первая книга «Пана Тадеуша». Последующие стихи составляли окончание третьей книги. Работая уже над четвертой книгой, поэт решил сделать эту перестановку.

КНИГА ВТОРАЯ

47 *«Surge, puer!»* (лат.) — «Вставай, мальчик!»

231 *Примас* — архиепископ гнезненский, глава католической церкви в Польше, первая особа после короля.

337 *Противники Соплиц, мечтавшие о мести!* — между Мицкевичами и Соплицами в действительности существовала давняя родовая вражда, отраженная ■ судебных актах о земельном («граничном») процессе Соплиц и Мицкевичей, ■ также — преследовании Мицкевичей со стороны Яна Соплицы, убившего одного из родственников поэта и угрожавшего посягнуть на жизнь отца Адама Мицкевича, начавшего против него судебное дело.

338-339 *Так славный пан погиб ~ кресла, и булавы!* — в оригинальном тексте — «кресла, ленты и булавы» говорят о том, что предки Стольника были сенаторами, их награждали орденами, среди них были и гетманы (булава — знак гетманского достоинства).

350 *Он спекся, как пескарь, когда на Кореличи...* — то есть сгорел живьем (пескарей пекли или жарили живыми). Кореличи — местечко (городок) ■ 22 км к востоку от Новогрудка, возле речки Рута.

680 *Талер* — монета, которую стали чеканить ■ Чехии с 1518 г. В Польше чеканка их началась с 1528 г. Первоначально талер равнялся тридцати грошам, то есть он был одинаковой стоимости с польским злотым, но позднее ценность талера поднялась значительно выше.

759 *«...Pax vobiscum!»* (лат.) — «Мир вам!»

826 *Охотились тогда мы на Куписком поле...* — Куписк — урочище над Неманом в Виленском воеводстве, возле Щорс.

КНИГА ТРЕТЬЯ

551 *Орешины-менады...* — менады, по греческой мифологии, женщины из свиты бога вина Дионисия (у римлян — Вакха, вакханки); их изображали с жезлами (тирсами), обвитыми плющом и виноградом. Гроздья лесных орехов Мицкевич сравнивает с гроздьями винограда.

КНИГА ЧЕТВЕРТАЯ

293 *Reverendissime* (лат.) — почтеннейший. В старину так обычно обращались к ксендзам.

565 *Крепь* — так переводчик передает польское слово *matecznik*, означающее здесь «недра пущи», с заматерелым, вековечным лесом, естественные заповедники, где сохраняется и выводится всякий зверь. Мицкевич в описании *matecznika* опирался на народные поверья о недоступных человеку лесных недрах, куда знают доступ какими-то им одним известными тропами только звери, которые и отправляются туда умирать.

890 *Кирейка* — верхняя одежда, обычно на меху.

922 *Уша* — фольварк (хутор) в Новогрудском уезде в 39 км от Новогрудка, над речкой Уша, притоком Немана.

КНИГА ПЯТАЯ

329-330 *...Какая-то сутана, Бог весть откуда к ним попавшая нежданно...* — в оригинале дословно: «вырвавшаяся бог весть откуда, как Филипп из конопли». Мицкевич комментирует эти строки: «Однажды на сейме депутат Филипп из наследственной деревни Конопля, попросив голоса, так далеко отступил от темы, что возбудил всеобщий смех в палате. Отсюда-то и поговорка: вырвался как Филипп из конопли.» Это объяснение считается теперь неточным. Комментаторы указывают, что Филипп — это южноукраинское прозвище зайца. Заяц, одурев от острого запаха конопли, бежит из нее во весь дух, отсюда и поговорка.

506 *Один Денасов...* — принц де Нассау-Зиген (1745—1808), известный искатель приключений, много путешествовавший. Служил в войсках у французов, итальянцев, русских; принимал участие ■ одной из русско-турецких войн. В Польшу прибыл в 1780 г., был гостем знатнейших аристократов (например, Кароля Радзивилла) и женился на княжне Сангушко.

КНИГА ШЕСТАЯ

78 *Позыв* (польск. *pozew)* — означало в судопроизводстве вызов ответчика на суд; этот вызов осуществлялся истцом при посредстве судебных властей, обычно посылавших такую повестку через возного.

222 *Погоня лишь заржет, Медведь взревет на Жмуди...* — «Погоня» — герб Великого Княжества Литовского: на червонном поле изображен всадник, скачущий на белом коне; ■ правой руке у всадника меч, в левой — щит. «Медведь» — герб Жмуди.

269 *...от самого Биньона...* — Биньон Луи (1771—1848), французский дипломат, был ■ 1811 г. представителем Наполеона ■ столице герцогства Варшавского.

381 *...сзывал Ян Третий ■ ополченье...* — Ян III Собесский (1624—1696), сын краковскаго кастеляна, польский король с 1674 г.

КНИГА СЕДЬМАЯ

2 *Крулевец* — польское название Кенигсберга, бывшей столицы Восточной Пруссии.

219 *Вето (лат. veto)* — запрещаю, традиционная в Польше формула срыва сейма, на котором непременно требовалось единогласное решение. Эта формула так въелась в сознание каждого шляхтича, что даже после ликвидации Речи Посполитой ею, по создавшейся привычке, то и дело пользовались и в сильно сузившейся общественной жизни и в быту.

КНИГА ВОСЬМАЯ

109 *Комета яркая, что с Запада всходила...* — об этой комете писало множество мемуаристов. С нею связывалось ожидание крупнейших политических событий.

163 *«Комета названа была метлой народом...»* — на родине Мицкевича народ называл комету метлой, говоря, что, в какую сторону она обратит свой хвост, тот край будет начисто сметен.

КНИГА ДЕВЯТАЯ

182 *«Меня? — вскричал Судья. — Как смеешь без приказу?»* — судья — это хотя и выборный, но утвержденный царскими властями чиновник, и его нельзя было третировать, подобно остальной шляхте.

КНИГА ДЕСЯТАЯ

133 *Рацлавицы* — деревня в Краковском воеводстве, под которой Костюшко 4 апреля 1794 г. разгромил царские войска.

135 *Матьевицы* (Мацеевицы) — деревня в быв. Седлецкой губернии. Здесь 10 октября 1794 г. армия Костюшко потерпела поражение от царских войск.

519 *Пришлась Тенчинскому по сердцу королевна...* — Ян Тенчинский, воевода белзский, в бытность свою послом ■ Швеции обручился со шведской принцессой Цецилией. Женитьба его не состоялась, так как по дороге в Швецию он был арестован датчанами и умер в копенгагенской тюрьме (1562).

572 *Sanctissimum* — святые дары, символизирующие кровь и плоть Христа.

КНИГА ОДИННАДЦАТАЯ

1-2 *О год двенадцатый! ~ порою урожая...* — по свидетельству современников, 1812 г. был необычайно хлебородным в Литве ■ Белоруссии.

119 *Оссолинский* Ежи (1595—1650) — посол польского короля Владислава IV ■ Урбану VIII — папе римскому в 1633 г.

251 *Самосиерру брать...* — высоко расположенный перевал в хребте, с севера прикрывающем Мадрид. Испанцы хорошо укрепили его и не сдавались, несмотря на многократные атаки французской пехоты. Ко всеобщему изумлению, он был взят 30 ноября 1808 г., в результате кавалерийской атаки польскими уланами.

КНИГА ДВЕНАДЦАТАЯ

85-86 *...аффирмативу ~ негативу...* (лат.) — голоса «за» и «против».

188 *Пинети* — фокусник, по некоторым данным, не раз приезжавший ■ Польшу. Так, в 1796 г. он был в Гродно, где развлекал Станислава Августа, отрекшегося от польского трона.

391 *Сам видел, как они бесчинствуют в деревне...* — армия Наполеона с первых же недель вторжения отличалась мародерством и насилиями над мирными жителями. Вестфальцы Жерома Бонапарта в этом отношении были из первых.

595 *Беллона* (миф.) — богиня войны в римской мифологии.

597 *Гимен или Гименей* (миф.) — бог брака ■ греческой мифологии.

639 *Борей* (миф.) — бог северного ветра.

ЭПИЛОГ

Опубликован посмертно, в 1860 г. Долгое время его принимали за вступление к поэме. Но Мицкевич написал его, когда книга была уже ■ печати. В письме к А.Одынцу (21 июля 1834) поэт писал: «Быстрота печатания и мои тогдашние супружеские заботы были причиной тому, что я не имел времени поправить и поместить этот эпилог ».

117 *Сказаний про Юстину и Веслава...* — Юстина — возлюбленная поэта Францишка Карпинского (1741—1825), которую он воспевал в своих песнях и идиллиях; многие из них стали достоянием польского фольклора; «Веслав» — идиллическая поэма Казимира Бродзинского (1791—1835).

ЗМЕСТ

Навáградская Іліяда. *Прадмова Язэпа Янушкевіча* 5
Новáградская Илиада 11
Iliada Nowogródzka 17

PAN TADEUSZ
CZYLI
OSTATNI ZAJAZD NA LITWIE

Księga pierwsza. Gospodarstwo 25
Księga druga. Zamek 51
Księga trzecia. Umizgi 73
Księga czwarta. Dyplomatyka i łowy 94
Księga piąta. Kłótnia 121
Księga szósta. Zaścianek 145
Księga siódma. Rada 162
Księga ósma. Zajazd 177
Księga dziewiąta. Bitwa 199
Księga dziesiąta. Emigracja. Jacek 220
Księga jedenasta. Rok 1812 246
Księga dwunasta. Kochajmy się! 264
[Epilog] 288
Objaśnienia [poety] 292

ПАН ТАДЭВУШ
АБО
АПОШНІ НАЕЗД У ЛІТВЕ
Пераклад Пятра Бітэля

Кніга першая. Гаспадарка 307
Кніга другая. Замак 332
Кніга трэцяя. Заляцанні 355
Кніга чацвертая. Дыпламатыка і ловы 376
Кніга пятая. Звада 403
Кніга шостая. Засценак 427
Кніга сёмая. Нарада 443
Кніга восьмая. Наезд 458
Кніга дзевятая. Бітва 479
Кніга дзесятая. Эміграцыя. Яцак. 500

Кніга адзінаццатая. Год 1812 525
Кніга дванаццатая. Кахаймася! 543
[Эпілог] 567
Тлумачэнні [аўтара] 571

ПАН ТАДЕУШ
ИЛИ
ПОСЛЕДНИЙ НАЕЗД В ЛИТВЕ

Перевод С. Мар (Аксеновой)

Книга первая. Хозяйство 585
Книга вторая. Замок 611
Книга третья. Волокитство 633
Книга четвертая. Дипломатия и охота 654
Книга пятая. Ссора 681
Книга шестая. Застянок 705
Книга седьмая. Совет 721
Книга восьмая. Наезд 736
Книга девятая. Битва 757
Книга десятая. Эмиграция. Яцек 778
Книга одиннадцатая. Год 1812 802
Книга двенадцатая. За братскую любовь 820
[Эпилог] 843
Объяснения [автора] 847
PRZYPISY 861
КАМЕНТАРЫІ 866
КОММЕНТАРИИ 873

Міцкевіч А.

М 70 Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве. Шляхецкая гісторыя з 1811 і 1812 гг. у дванаццаці кнігах вершам/Агул. рэд., прадм. Я. Янушкевіча; Уклад. У. Гілеп і інш.; Пер. на бел. мову П. Бітэля; Пер. на рус. мову С. Мар (Аксёнавай); Камент. В. Рагойшы, Я. Янушкевіча; Маст. В.Шаранговіч. — Мн.: БФК, 1998. с. 880, [37] л. іл.

ISBN 985-6523-01-X

Адам Міцкевіч (1798-1855) — вялікі паэт славянскага свету, якога нарадзіла беларуская зямля. Ён пісаў па-польску, геніяльна ўзнаўляючы тагачасную рэчаіснасць.

Найбольш яскрава дух Літвы-Беларусі ўвасобіўся ў велічным мастацкім палатне паэмы «Пан Тадэвуш» — энцыклапедыі шляхецкага ладу жыцця, што грунтаваўся на традыцыях колішняй еўрапейскай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

У гэтым фаліянце славуты твор друкуецца на трох мовах — польскай, беларускай і рускай.

УДК 884-31
ББК 84(4П)6

Літаратурна-мастацкае выданне

Адам Міцкевіч

Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве. Шляхецкая гісторыя з 1811 і 1812 гг. у дванаццаці кнігах вершам.

Рэдактары Я. Я. Янушкевіч, В. А. Басава
Мастацкі рэдактар В. П. Шаранговіч
Тэхнічны рэдактар М. М. Кіслякова
Карэктар (беларуская і руская мовы) Р. А. Маслоўская
Верстка Н. А. Новік, І. В. Баранава
Камп`ютэрны набор Ж. В. Фіневіч
Камп`ютэрная апрацоўка графікі А. А. Первянкоў

Набор і карэктура польскага тэкста зроблены ў выдавецтве «Czytelnik».
Падрыхтавана да друку пры садзейнічанні камп`ютэрнага цэнтра ЗАТ «ТІМ На Ростанях». Кіраўнік А. Г. Дзігун.

Падпісана да друку 25.08.98. Фармат 70×108/16. Папера афс., іл.-мелав. Гарнітура Times New Roman. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 77. Ул.-выд. арк. 50. Тыраж 4000 экз. Заказ № 1148.

Выдавецтва «Беларускі фонд культуры». Ліцэнзія ЛВ № 241 ад 11.04.98 г. Рэспубліка Беларусь, 220039, г. Мінск, Камунальная узб. 6-Б.

Пры удзеле ТАА «Харвест». Ліцэнзія ЛВ № 32 ад 27.08.98. 220013, Мінск, вул. Я. Коласа, 35-305.

Калерападзел і друк ілюстрацый выкананы на Мінскай фабрыцы каляровага друку Рэспубліка Беларусь, 220024, г. Мінск, Каржанеўскага, 20.

Надрукавана з дыяпазітываў заказчыка на Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінаце ВПП імя Я. Коласа, Рэспубліка Беларусь, 220005, г. Мінск, Чырвоная, 23.